# Беларуская мова 9




*Пётр Мсціславец адрадзіў і ўзбагаціў традыцыі кнігадрукавання, закладзеныя першадрукаром Францыскам Скарынам.*

# Беларуская мова

Вучэбны дапаможнік для **9** класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі
навучання

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

МІНСК
НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ
2019

Правообладатель Национальный институт образования

УДК 811.161.3(075.3)
ББК 81.2Беи-922
Б43

А ў т а р ы:

**Г. М. Валочка** («Беларуская мова ў сям'і славянскіх моў і моў народаў свету», «Тэкст», «Паўтарэнне вывучанага ў V—VIII класах», «Стылі маўлення»);

**Л. С. Васюковіч** («Бяззлучнікавыя складаныя сказы», «Складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак», «Сінтаксічныя канструкцыі з чужой мовай»);

**В. У. Зелянко** («Складаназалежныя сказы»);

**С. М. Якуба** («Складаны сказ», «Складаназлучаныя сказы»);

**С. І. Байкова** («Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага за год»)

Р э ц э н з е н т ы:

кафедра беларускага мовазнаўства ўстановы адукацыі «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава» (кандыдат філалагічных навук, дацэнт *В. Э. Зіманскі*);

настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Гімназія № 1 імя Ф. Скарыны г. Мінска» *С. М. Шугніла*

## Умоўныя абазначэнні:

— правіла;

— рубрыка «Успамінаем вывучанае»;

— рубрыка «Скарбы мовы»;

— заданні, накіраваныя на ўзбагачэнне слоўнікавага запасу вучняў;

• — дадатковыя пытанні і заданні, накіраваныя на замацаванне ведаў і ўменняў па раней вывучаных тэмах;

— заданні творчага характару, накіраваныя на развіццё звязнага маўлення вучняў;

— дадатковы матэрыял, размешчаны на электронным адукацыйным рэсурсе «Беларуская мова. 9 клас» (нацыянальны адукацыйны партал: http://e-vedy.adu.by);

— спасылкі на заданні (QR-коды) для праверкі ведаў пры дапамозе смартфона ці планшэта;

*алюзія** — лексічнае значэнне слова тлумачыцца ў слоўніку;

*ёсць*[ф] — зрабіць фанетычны разбор слова;

*куфэрак*[л] — зрабіць лексічны разбор слова;

*нязвыкла*[с] — разабраць слова па саставе;

*непадалёку*[сл] — зрабіць словаўтваральны разбор слова;

*гняздо*[м] — зрабіць марфалагічны разбор слова;

*Ападае лісце.*[сн] — зрабіць сінтаксічны разбор сказа.

**ISBN 978-985-594-363-2**

© Афармленне. НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2019

Правообладатель Национальный институт образования

## § 1. Беларуская мова ў сям’і славянскіх моў і моў народаў свету

**1.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль, абгрунтуйце сваё меркаванне, назавіце асноўныя прыметы гэтага стылю.

Усе мовы свету падзяляюцца на асобныя групы. У адну групу ўваходзяць мовы, блізкія граматычным складам, фанетычнай сістэмай, лексікай.

Беларуская мова належыць да індаеўрапейскай сям’і моў, славянскай групы, якая дзеліцца на тры падгрупы: усходнеславянскую, заходнеславянскую, паўднёваславянскую. Блізкасць славянскіх моў тлумачыцца тым, што ў пэўны перыяд продкі сучасных славянскіх народаў жылі разам на параўнальна невялікай тэрыторыі і мелі цесныя сувязі, якія ажыццяўляліся з дапамогай мовы.

Сведчаннем роднасці славянскіх моў з’яўляюцца шматлікая лексіка, агульныя рысы ў фанетыцы і граматыцы. Параўнаем:

| **беларуск.** | **руск.** | **балг.** | **укр.** | **польск.** | **чэшск.** |
|---|---|---|---|---|---|
| дзесяць | десять | десят | десять | dziesięć | deset |
| хадзіць | ходить | ходя | ходити | chodzić | chodit |

Ва ўсіх славянскіх мовах ужываецца большасць аднолькавых галосных і зычных гукаў. Лексіка славянскіх моў уключае значную колькасць аднолькавых слоў. Гэта назвы частак цела чалавека *(рука, нага, галава)*, прадметаў побыту *(бочка, вядро)*, асоб паводле сваяцкіх адносін *(дзіця, нявестка)*, раслін *(дуб, яблык)*, атмасферных з’яў *(дождж, снег)*, часавых паняццяў *(год, месяц)* і інш.



Правообладатель Национальный институт образования

Кожная са славянскіх моў мае і свае, толькі ёй уласцівыя рысы, якія адрозніваюць яе ад іншых моў. Беларуская мова характарызуецца такімі спецыфічнымі рысамі ў галіне фанетыкі, як яканне *(сястра, вясна)*, дзеканне і цеканне *(дзеці, падзяліць)*, падаўжэнне зычных *(збожжа, вяселле)*, наяўнасць гука [ў], чаргаванне [ў] з [в], [л] *(траўка, жоўты)*, прыстаўныя гукі *(ільняны, вусны)*, чаргаванні галосных [ро] — [ры], [ло] — [лы] *(дровы — дрывотня, глотка — глытаць)* і інш.

На якой падставе мовы аб'ядноўваюцца ў групы? У якую групу моў уваходзіць беларуская мова?

Назавіце спецыфічныя рысы беларускай мовы, якія адрозніваюць яе ад іншых славянскіх моў.

**2.** Прачытайце табліцу.

| СЛАВЯНСКАЯ ГРУПА МОЎ | | |
|---|---|---|
| **Усходнеславянскія мовы** | **Заходнеславянскія мовы** | **Паўднёваславянскія мовы** |
| беларуская<br>руская<br>украінская | польская<br>чэшская<br>славацкая<br>верхнялужыцкая<br>ніжнялужыцкая<br>кашубская<br>палабская (мёртвая) | балгарская<br>сербская<br>харвацкая<br>славенская<br>македонская<br>стараславянская (мёртвая) |

Падрыхтуйце вуснае выказванне пра славянскія мовы. Пацвердзіце агульнасць славянскіх моў прыкладамі з папярэдняга тэксту.

**3.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль і тып, назавіце характэрныя для гэтага стылю моўныя сродкі, якія неабходна адэкватна ўзнавіць пры перакладзе.

Вусна перакладзіце тэкст на беларускую мову.

6 августа 1517 года в Праге вышла в свет одна из книг Библии на древнебелорусском языке — «Псалтырь», которую издал Франциск Скорина из Полоцка. Именно эта дата считается днём рождения белорусского книгопечатания.



Правообладатель Национальный институт образования

Библия Франциска Скорины стала первой печатной книгой для восточных славян. Она вышла раньше, чем английский и французский переводы, почти на 50 лет опередила «Апостол», изданный в московской типографии. Это был научный, духовный и образовательный прорыв.

Франциск Скорина оставил потомкам библейские книги, переведённые на язык, близкий к народному. Он всегда учил помнить свой долг перед родиной, подчёркивая, что «обязанность человека трудиться на благо родины, не жалеть всякого тружения и скарбов для… отчизны своея». «Понеже от прирожения звери, ходящие в пустыни, знають ямы своя; птици, летающие по возъдуху, ведають гнезда своя; рибы, плывающие по морю и в реках, чують виры своя; пчелы и тым подобная боронять ульев своих, — тако ж и люди, игде зродилися… к тому месту великую ласку имають», — писал в предисловии к одной из своих книг просветитель.

Книги Франциска Скорины оказали влияние не только на развитие духовной культуры Беларуси, но и стимулировали возникновение книгопечатания в Московском государстве, распространялись в многочисленных рукописных копиях *(По БелТА)*.

## Слоўнік

древнебелорусский — *старажытнабеларускі*
книгопечатание — *кнігадрукаванне*
опередить — *апярэдзіць*
потомок — *нашчадак*
долг — *абавязак*
стимулировать — *стымуляваць*
распространяться — *распаўсюджвацца*
многочисленный — *шматлікі*

Якая дата лічыцца днём нараджэння беларускага кнігадрукавання?

Якое значэнне для ўсходніх славян меў выхад у свет Бібліі Ф. Скарыны?

Зачытайце словы першадрукара пра адносіны чалавека да радзімы. У чым актуальнасць гэтых слоў сёння? Запішыце гэта выказванне на сучаснай беларускай мове. Праверце правільнасць выканання задання (гл. практ. 171). Падкрэсліце ў тэксце перакладу літары, якія перадаюць фанетычныя асаблівасці беларускай мовы.

Раскажыце пра значнасць дзейнасці Ф. Скарыны для культуры Беларусі і іншых краін.


Правообладатель Национальный институт образования

**4.** Прачытайце тэкст. Раскажыце пра ролю беларускай мовы ў станаўленні беларускай дзяржаўнасці ў пачатку XX стагоддзя.

Выключна важную ролю адыграла беларуская мова ў станаўленні беларускай дзяржаўнасці ў пачатку XX стагоддзя. Сапраўды, нацыянальнае адраджэнне беларусаў у XIX стагоддзі пачалося менавіта са стварэння новай літаратурна-пісьмовай мовы. Дзякуючы літаратурнай творчасці многіх выдатных дзеячаў беларускай культуры, сярод якіх выключнае месца займаюць постаці Максіма Багдановіча, Янкі Купалы і Якуба Коласа, беларускае пісьмовае слова шырока распаўсюдзілася па ўсёй тэрыторыі Паўночна-Заходняга краю Расійскай імперыі, а сама беларуская мова набыла ўсе прыметы літаратурнай мовы. Гэта было выключна важна. Таму што ў гэтым выпадку спрацавала формула: ёсць[ф] самастойная літаратурная мова — ёсць народ з уласнай адметнай культурай і мовай, які мае права на сваю дзяржаўнасць.

Усім сваім развіццём на працягу XX стагоддзя беларуская мова даказала сваю жыццёвасць і неабходнасць, яна заўсёды была бадай што асноўным фактарам захавання нацыянальнай культуры і падтрымання нацыянальнай свядомасці народа *(Паводле А. Лукашанца)*.

Чаму мова з'яўляецца асноўным фактарам захавання нацыянальнай культуры і падтрымання нацыянальнай свядомасці народа?

Выпішыце з тэксту прыклады слоў, якія перадаюць спецыфічныя рысы беларускай мовы (у галіне фанетыкі: аканне, яканне, дзеканне, цеканне, зацвярдзелыя зычныя, гук [ў] і інш.; лексікі; граматыкі).

**5.** Спішыце выказванні беларускіх дзеячаў пра родную мову, устаўляючы прапушчаныя літары, раскрываючы дужкі і расстаўляючы неабходныя знакі прыпынку.

1. Любіце і шануйце, як св..тыню, родна.. слова з якім вас літасцівы Бог на свет пусці.. *(Ф. Скарына)*. 2. Яно добра, а нават і тр..ба ведаць сусе*(дс/ц)*кую мову але найперш тр..ба ведаць сваю *(Ф. Багушэвіч)*. 3. Ніяка.. багацце людзей не бывае дараж..йшым за іх родную мову *(Я. Колас)*. 4. Мова — аснова не толькі нац..янальнай культуры але і існавання нац..і існавання этнасу *(В. Быкаў)*. 5. Мова — гэта ко*(д/т)* які адкрывае дзверы ў тую або іншую культурную прастору. А культура — гэта пераемнасць спа*(д/ч)*чына традыц..я алюзія* *(С. Абламейка)*.


Правообладатель Национальный институт образования

**6.** Прачытайце выказванне А. Разанава. Як вы разумееце сэнс гэтых слоў?

Кожны народ мае хаця б адзін геніяльны твор, і гэты твор — мова.

Складзіце ўласны тэкст-разважанне, даказаўшы (або абвергнуўшы) выказванне аўтара.

**7.** Прачытайце тэкст.

Мсціслаў цяжка ўявіць без помніка Пятру Мсціслаўцу, друкару, паслядоўніку Францыска Скарыны, паплечніку Сымона Буднага і Івана Фёдарава.

Помнікаў у горадзе два. Першы быў устаноўлены ў 1986 годзе. Ён знаходзіцца побач з езуіцкім касцёлам, а за помнікам стаіць будынак былой мужчынскай гімназіі. Па задумцы архітэктара друкар сядзіць на камені, які ў сваю чаргу размяшчаецца на пастаменце* з валуноў. Пётр Мсціславец як быццам задаў пытанне і чакае на яго адказу. Друкар на помніку малады, у манаскім адзенні.

Другі помнік быў адкрыты ў 2001 годзе да Дня беларускага пісьменства і друку. Помнік размяшчаецца на цэнтральнай плошчы Мсціслава. Скульптура беларускага друкара выканана з бронзы і стаіць на мармуровым пастаменце...

Помнікі Пятру Мсціслаўцу — даніна павагі беларускага народа і сусветнай супольнасці да аднаго з першых славянскіх друкароў. Заснаванне і развіццё друкарскай справы, распрацоўка ўнікальнага евангельскага шрыфту, а таксама далучэнне простых людзей да чытання — вось вынік жыцця знакамітага ўраджэнца беларускага горада Мсціслава (*«Славутасці Беларусі»*).

Раскажыце, выкарыстоўваючы інфармацыю з тэксту, пра Пятра Мсціслаўца, яго ролю ў развіцці друкарскай справы.
Разгледзьце помнік Пятру Мсціслаўцу, змешчаны на вокладцы вучэбнага дапаможніка. Дапоўніце (вусна) тэкст апісаннем помніка.

### КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Да якой сям'і, групы, падгрупы моў належыць беларуская мова?
2. Якія спецыфічныя рысы адрозніваюць беларускую мову ад іншых славянскіх моў?
3. Прывядзіце прыклады слоў, якія перадаюць спецыфічныя асаблівасці беларускай мовы.


Правообладатель Национальный институт образования

# Тэкст

## § 2. Тэкст і яго асноўныя прыметы (паглыбленае паўтарэнне)

**8.** Вусна дапоўніце сказы неабходнай інфармацыяй.

**Тэкст** — гэта выказванне, у якім сказы звязаны па ... і граматычна.

Тэматычнае адзінства, разгорнутасць, паслядоўнасць, звязнасць, завершанасць — гэта ... тэксту.

Сказы ў тэксце аб'яднаны тэмай і асноўнай ... .

**Тэма** — гэта тое, пра ...  ... ў тэксце.

**Асноўная думка** — гэта тое ..., што выказаў аўтар у тэксце. Яна перадае адносіны аўтара да таго, што ён піша, яго ацэнку падзеям ці з'явам.

Тэма тэксту, як і яго асноўная думка, можа быць выказана ў загалоўку. Напрыклад, ...: «У лесе», «Канікулы на моры», «Зімой»; ...  ...: «Кожная птушка і звер у лесе жывуць сваім жыццём», «Мае́ самыя цікавыя канікулы», «Зіма — прыгожая пара года».

**9.** Выпішыце з прапанаваных тэрмінаў тыя, якія называюць прыметы тэксту.

Звязнасць, сінанімічнасць, завершанасць, лагічнасць, тэматычнае адзінства, паслядоўнасць, мэтанакіраванасць, доказнасць, разгорнутасць, абгрунтаванасць.

**10.** Прачытайце сказы. Размясціце іх у патрэбнай паслядоўнасці, каб атрымаўся тэкст.

Асабліва калі пераскочыць з аднаго дрэва на другое яны не могуць. Вавёркі жывуць на дрэвах, але даволі часта спускаюцца



Правообладатель Национальный институт образования

на зямлю. Вясною[м], калі зімовыя запасы заканчваюцца, вавёркі, бывае, цэлымі калоніямі перасяляюцца ў іншыя лясы. Вавёрка і плавае добра. Тады яны ходзяць «пяшком», пераплываюць[сл] рэчкі, не баяцца нават шасэйных і чыгуначных дарог *(Я. Курто)*.

Вызначце тэму і асноўную думку тэксту. Чым забяспечваецца тэматычнае адзінства тэкстаў?

Запішыце тэкст, захаваўшы паслядоўнасць раскрыцця тэмы і асноўнай думкі.

**Тэматычнае адзінства** тэксту забяспечваецца падпарадкаванасцю яго зместу тэме і асноўнай думцы.

Тэма тэксту раскрываецца праз *апорныя (ключавыя) словы*, якія перадаюць змест тэксту. Яны нясуць у сабе асноўную сэнсавую нагрузку, таму па іх можна ўзнавіць тэкст пры пераказе.

У тэксце-апавяданні апорнымі словамі з'яўляюцца назвы ўдзельнікаў падзей, дзеянняў і прадметаў, з імі звязаных; у тэксце-апісанні — назвы прадметаў і іх прымет; у тэксце-разважанні ў якасці апорных слоў выступаюць абстрактныя назоўнікі і дзеясловы са значэннем тлумачэння.

**11.** Вызначце і запішыце тэму тэксту па прыведзеных апорных словах і словазлучэннях.

Гняздо, моцны вецер, птушаня, на зямлі, кот, маці, упала, падлятала, па́дала, кінуўся ўслед, адвяла ад птушаняці, узляцела.

Для якога тыпу тэксту характэрны прыведзеныя апорныя словы і словазлучэнні? Што яны перадаюць?

Такая прымета тэксту, як **разгорнутасць,** азначае, што развіццё тэмы і разгортванне асноўнай думкі адбываецца праз ***падтэмы*** і ***мікратэмы***. Падтэмы забяспечваюць шырыню разгортвання тэмы, а мікратэмы — глыбіню яе раскрыцця.

**12.** Прачытайце тэкст, вызначце яго тэму. Абгрунтуйце падзел тэксту на абзацы, вызначце падтэмы і мікратэмы. Дайце ім назвы.

Раніцаю, як звычайна, Арцёмка прыбег у альтанку, каб паназіраць за бусламі. Але ў той дзень яны паводзілі сябе неяк нязвыкла[с]:



Правообладатель Национальный институт образования

кружылі вакол дрэва, то апускаючыся амаль да самай зямлі, то зноў набіраючы вышыню, і ўвесь час трывожна клекаталі. Падышоўшы бліжэй, Арцёмка ўбачыў, што ў траве пад дрэвам бездапаможна[с] трапечацца малое бусляня. Напэўна, неасцярожна крутнулася і выпала з гнязда.[сн]

Арцёмка паклікаў дзеда. Удвух яны ўважліва агледзелі перапалоханае, насцярожанае бусляня. На шчасце, ні крылцы, ні лапкі ў яго не былі пашкоджаныя. Аднак самастойна вярнуцца ў гняздо птушаня не магло: ці то балюча ўдарылася, ці яшчэ не хапала сілы.

Дзеду з Арцёмкам самім рады даць не ўдалося. Залезці на высокае дрэва яны не змаглі, а такой лесвіцы, каб яна дастала да буслянкі, у іх не было. Тады дзядуля патэлефанаваў мясцовым ратавальнікам. Тыя прыехалі на машыне з кранам і за некалькі хвілін даставілі няўдачлівую малечу ў гняздо *(Паводле З. Прыгодзіча)*.

Складзіце і запішыце складаны план тэксту. Памятайце, што назвы падтэм звычайна суадносяцца з простым планам, а дабаўленне назваў мікратэм ператварае просты план у складаны.

Знайдзіце ў апошнім абзацы тэксту фразеалагізм, растлумачце яго значэнне.

**Паслядоўнасць** як прымета тэксту праяўляецца ў тым, што часткі тэксту размяшчаюцца ў ім у пэўным парадку, па пэўнай схеме, якая складае кампазіцыю тэксту.

Кампазіцыя (будова) тэксту залежыць ад таго, да якога тыпу маўлення належыць тэкст (апавяданне, апісанне ці разважанне).

**13.** Прачытайце тэксты. Вызначце, да якога тыпу маўлення яны належаць.

Суаднясіце тэксты са змешчанымі пасля іх кампазіцыйнымі схемамі тыпаў маўлення. Вусна дапоўніце схемы неабходнымі элементамі.

**I.** Была ціхая летняя раніца. Сонца яшчэ не паспела забрацца высока. Яно пералівалася мільёнамі агеньчыкаў у роснай мураве, на палянах, паблісквала на вільготных лісточках бяроз... А калі трапляла сонца на спелыя чырвоныя ягады, яны гарэлі, як камяні-самацветы. Ягады пахлі летам, сонцам, зялёнай муравою палян. Чым толькі яны не пахлі! *(Паводле М. Лынькова)*.



Правообладатель Национальный институт образования

**II.** Пайшлі раз Сярожка з Косцікам у лес па ландышы, дзеду на настойку ад сэрца. Усталі раненька, узялі па кавалку хлеба з маслам. Вось і лес. Пад нагамі шмат розных кветак, а ландышаў няма. Давялося хлопчыкам ісці ў глыб лесу. А там між зялёных лісткоў, што раслі з самай зямлі, на тоненькіх высокіх сцяблінках віселі, нібы завушніцы, белыя званочкі. Многа хлопцы не рвалі, толькі каб хапіла дзеду на лекі. Паклалі ландышы ў мяшэчак, шукаць дарогу назад пачалі *(Паводле Л. Арабей)*.

**III.** Жывая прырода да.. не толькі радасць для душы кожнага з нас. Яна дор.. нам свае багацці. Жыццё чалавека ў многім залеж.. ад прыроднага асяроддзя. Калі мы нядбайна будз.. адносіцца да лесу, раслін, то страц.. абаронцаў раслін ад шкоднікаў, не будз.. мець карысных прадуктаў харчавання, сыравіны для заводаў, у тым ліку для вырабу лекаў. Вось чаму лясы і тых, хто іх насяля.., трэба берагчы *(«Сусвет»)*.

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| а) | Пачатак дзеяння | → Развіццё дзеяння | → | |
| б) | Агульнае ўяўленне аб прадмеце | → | → | Ацэнка прадмета, адносіны да яго |
| в) | Думка, якая даказваецца | → | → | |

Спішыце тэкст III, дапісваючы канчаткі дзеясловаў. Растлумачце іх напісанне.

**14.** Вызначце, які спосаб сувязі сказаў у тэксце перададзены на першай схеме, а які — на другой.

1) 1 → 2 → 3 → 4

2)






Правообладатель Национальный институт образования

Пры **паслядоўнай сувязі** сказаў у тэксце думка развіваецца паслядоўна, ад аднаго сказа да другога. У кожным наступным сказе паведамляюцца новыя звесткі, якія дапаўняюць і пашыраюць папярэдні сказ. Пры такой сувязі сказы ў тэксце нельга памяняць месцамі. Сродкамі сувязі сказаў пры паслядоўнай сувязі з'яўляюцца ***займеннікі, прыслоўі, сінонімы, лексічныя паўторы, злучнікі*** і інш.

Пры **паралельнай сувязі** кожны наступны сказ тэксту звязаны з першым, раскрывае і дапаўняе яго. Моўнымі сродкамі паралельнай сувязі выступаюць ***аднатыпныя граматычныя формы*** (напрыклад, усе дзеясловы ў форме цяперашняга часу), ***аднолькавы парадак слоў*** (напрыклад, выказнік стаіць перад дзейнікам), ***прыслоўі*** і інш.

**15.** Прачытайце фрагмент тэксту. Ці можна сказаць, што ён завершаны?

З усёй птушынай сям'і вераб'і — самыя блізкія нашы суседзі. Яны заўсёды селяцца побач з людзьмі, а гняздзяцца пад стрэхамі ці ў шчылінах будынкаў. Таму іх называюць дамавымі вераб'ямі.

«Старога вераб'я на мякіне не правядзеш», — сцвярджае народная прыказка... *(У. Ягоўдзік).*

Раскрыйце сэнс прыказкі і прадоўжыце тэкст.

Такая прымета тэксту, як **завершанасць**, не мае лексіка-граматычных паказчыкаў і ўстанаўліваецца на зместавым узроўні. Завершаным лічыцца такі тэкст, у якім раскрыта тэма выказвання і рэалізавана яго асноўная думка.

**16.** Спішыце тэкст, раскрываючы дужкі, устаўляючы прапушчаныя літары і расстаўляючы неабходныя знакі прыпынку.

### Жалуды для вавёрачкі

З поўнымі кошыкамі грыбоў сябры в..рталіся дамоў. І тут хлапчукі ўбачылі вавёрачку. Скокнула на ду*(б/п)* а ў зубах — ж..лу*(д/т)*. Схавала яго ў дупло і зноў ..ніз па камлі спусцілася.

— Трэба дапама*(г/х)*чы вавёрачцы, — сказаў Алесь сябрам. — Зімой не толькі арэхі але і ж..луды ёй спатрэбяцца.



Правообладатель Национальный институт образования

І пачалі Алесь Сцёпка і Міхась збіраць ж..луды. Дома хлапчукі не сказалі, чаму затрымаліся ў лес.. . Перабіраючы грыбы кожны ўяўляў, як раду..цца ж..лудам у дупле вавёрачка (*Паводле Я. Галубовіча*).

Падкрэсліце ў тэксце словы, якія забяспечваюць яго тэматычнае адзінства.

## § 3. Сінтаксічная сінаніміка

Пад **сінтаксічнымі сінонімамі** разумеюцца розныя па будове, але блізкія па сэнсе сінтаксічныя адзінкі. Прыклады сінтаксічных сінонімаў:

а) сінонімы-словазлучэнні: *варэнне са сліў — слíвавае варэнне*;

б) сінонімы — розныя віды двухсастаўных сказаў: *Хто не любіць глядзець мультфільмы?! — Усе любяць глядзець мультфільмы*;

в) сінонімы — простыя і складаныя сказы: *Пачутае ўразіла мяне. — Тое, што я пачуў, мяне ўразіла*;

г) сінонімы — дзеепрыметнікавыя, дзеепрыслоўныя звароты і даданыя часткі складаных сказаў: *Вывучыўшы ўрокі, Марына вырашыла дапамагчы маці прыгатаваць вячэру. — Калі Марына вывучыла ўрокі, яна вырашыла дапамагчы маці прыгатаваць вячэру*.

З дапамогай сінтаксічных сінонімаў можна выказваць адны і тыя ж думкі па-рознаму, што дазваляе разнастаіць маўленне, рабіць яго больш выразным.

**17.** Суаднясіце выразы ў левым і правым слупках. Запішыце сінтаксічныя сінонімы. Растлумачце іх сэнс і граматычнае значэнне.

| | |
|---|---|
| кампот з яблыкаў | ішоў і спяваў песню |
| вечарэла | ішоў праз лес |
| шапка бацькі | яблычны кампот |
| ішоў, спяваючы песню | ляглі спаць, калі павячэралі |
| павячэраўшы, ляглі спаць | надыходзіў вечар |
| ішоў лесам | тое, што ўбачыў, засталося ў памяці |
| убачанае засталося ў памяці | бацькава шапка |


Правообладатель Национальный институт образования

**18.** Прачытайце сказ (злева) і яго сінтаксічныя сінонімы справа. Прааналізуйце сэнсавыя і граматычныя адрозненні паміж сказамі.

Раніцай насунуліся хмары, яны паступова зацягнулі ўсё неба.

Раніцай насунуліся хмары. Яны паступова зацягнулі ўсё неба.

Раніцай насунуліся хмары і паступова зацягнулі ўсё неба.

Раніцай насунуліся хмары, паступова зацягнуўшы ўсё неба.

Раніцай насунуліся хмары, якія паступова зацягнулі ўсё неба.

Хмары, якія насунуліся раніцай, паступова зацягнулі ўсё неба.

**19.** Перабудуйце сказы, замяніўшы іх сінанімічнымі канструкцыямі. Запішыце сказы парамі. Растлумачце іх сэнс і граматычнае значэнне.

1. Маці сумавала. 2. Максім, пасля таго як выканаў дамашняе заданне, пабег на вуліцу. 3. Кніга прачытана вучнем. 4. Захопленыя гульнёй, дзеці не звярталі ўвагі на дарослых. 5. Я адышоў убок, не ведаючы, што мне рабіць далей. 6. Прапаную пачаць урок.

**20.** Прааналізуйце два ўрыўкі. Які з іх больш выразны і дакладны, перадае дынамізм, напружанасць дзеяння? З дапамогай чаго гэта дасягаецца?

Новы звер раптам напаў на Мішку, ухапіўшы зубамі за нагу. То быў Жук, які прыбег, каб ратаваць Барадатага. Мішка налаўчыўся і ўкусіў Жука за хвост. Жук адскочыў як апанта́ны*, але з яшчэ большай злосцю накінуўся на Мішку, і яны, кусаючы адзін аднаго, пакаціліся па паляне, уздымаючы цэлыя горы пылу і пажоўклага лісця. І такі вэрхал паднялі, такую тузаніну... *(Міхась Лынькоў)*.

Новы звер раптам напаў на Мішку, ухапіў зубамі за нагу. То быў Жук, які прыбег, каб ратаваць Барадатага. Мішка налаўчыўся і ўкусіў Жука за хвост. Жук адскочыў як апантаны, але з яшчэ большай злосцю накінуўся на Мішку, і яны кусалі адзін аднаго, качаліся па паляне, уздымалі цэлыя горы пылу і пажоўклага лісця. І такі вэрхал паднялі, такую тузаніну...


Правообладатель Национальный институт образования

**21.** Перакладзіце тэкст (вусна) на беларускую мову. Абгрунтуйце выпадкі, калі неабходна выкарыстаць сінанімічныя канструкцыі.

### Бескорыстные помощники

Во время Первой мировой войны на канадском эска́дренном миноносце служил пёс по кличке Кубрик, отличавшийся необыкновенным слухом. Заслышав шум вражеской подводной лодки, который не улавливали судовые приборы, он давал сигнал боевой тревоги.

Теперь никто не скажет, сколько безвестных отважных собак погибло во время Второй мировой, разыскивая мины и спасая из-под обстрела раненых. Они и связистов заменяли, пробираясь в недоступных для человека местах.

Человек учит собак разыскивать людей, попавших в беду, погребённых под руинами во время землетрясений и заваленных снежными обвалами в горах, находить полезные ископаемые, пасти домашний скот.

В мире немало памятников собакам. Жители одного итальянского селения поставили памятник псу по кличке Верный. В течение долгих четырнадцати лет каждый день неизменно ходил он встречать своего хозяина, убитого фашистской бомбой *(По Б. Волынкиной)*.

## Слоўнік

бескорыстный — *бескарыслівы*
улавливать — *улоўліваць, лавіць*
разыскивать — *шукаць, адшукваць, вышукваць*
недоступный — *недаступны, недасягальны*
полезные ископаемые — *карысныя выкапні*
домашний скот — *свойская жывёла*
неизменно — *нязменна; заўсёды, заўжды*

Чым праславіўся сабака Кубрык?
З якой мэтай людзі выкарыстоўвалі сабак?
Помнікі якім жывёлам вы ведаеце? Чаму ім пастаўлены помнікі?

Запішыце па-беларуску сказы, пры перакладзе якіх трэба выкарыстаць сінанімічныя канструкцыі. Прааналізуйце спосабы перадачы на беларускую мову дзеепрыметнікаў і дзеепрыметнікавых зваротаў.


Правообладатель Национальный институт образования

**22.** Падбярыце і запішыце сінанімічныя словазлучэнні да прыведзеных выразаў.

**Пярсцёнак з золата, горы Каўказа, гладыш з гліны, акуляры бабулі, сляды зайца, ехаць полем, спяваць па-салаўінаму, агарод суседа, парк у горадзе, азёры Беларусі, бібліятэчная кніга, студэнт з Кітая, размаўляць на беларускай мове.**

**23.** Прачытайце верш. Вызначце яго тэму і асноўную думку. Растлумачце сэнс двух апошніх радкоў.

### Жытні хлеб

Расою і дожджыкам цёплым напоены,
Распешчаны ў сонечных промняў цяпле,
Напоўнены з чуйных далоняў любоўю —
Ляжыць жытні хлеб на святочным стале.

Бабулін ручнік атуліў клапатліва
Пахучага бохана спелы бачок.
Спакойна ляжыць наша ежа і сіла,
Гімн працы людзей і жыцця іх выток.

*С. Локтыш.*

Падбярыце сінтаксічныя сінонімы да словазлучэнняў *жытні хлеб, сонечныя промні, бабулін ручнік, праца людзей, выток жыцця*.

Назавіце сродкі сувязі сказаў у тэксце.

Выпішыце з апошняга чатырохрадкоўя апорныя словы. Карыстаючыся імі, запішыце гэта чатырохрадкоўе па памяці. Выканайце самаправерку.

● Знайдзіце ў вершы дзеепрыметнікі. Якую ролю яны выконваюць у разгортванні асноўнай думкі? Зрабіце марфалагічны разбор аднаго дзеепрыметніка (на выбар).

**КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Назавіце прыметы тэксту.
2. З дапамогай чаго забяспечваецца тэматычнае адзінства тэксту?
3. Якія спосабы сувязі сказаў у тэксце вы ведаеце? Назавіце моўныя сродкі, з дапамогай якіх рэалізуецца кожны спосаб сувязі.
4. Што такое сінтаксічныя сінонімы? Прывядзіце прыклады сінтаксічных сінонімаў.



Правообладатель Национальный институт образования

# Паўтарэнне вывучанага ў V—VIII класах

## § 4. Слова, словазлучэнне, сказ як асноўныя моўныя адзінкі

**24.** Выберыце з правага слупка адпаведныя характарыстыкі для кожнай моўнай адзінкі (слова, словазлучэння, сказа). Раскажыце пра іх у параўнальным плане.

| | |
|---|---|
| слова<br><br>словазлучэнне<br><br>сказ | — называе прадметы, дзеянні, прыметы прадметаў<br>— называе прадметы, дзеянні, прыметы прадметаў больш дакладна, чым слова, удакладняе іх характарыстыкі<br>— выражае паведамленне (інфармацыю), пытанне ці пабуджэнне да чаго-небудзь<br>— фанетычна і граматычна афармленая адзінка мовы з пэўным значэннем<br>— складаецца з галоўнага і залежнага слоў<br>— мае граматычную аснову<br>— выкарыстоўваецца як гатовая, вядомая адзінка мовы<br>— выступае ў якасці часткі паведамлення<br>— з'яўляецца сродкам зносін |

**25.** Прачытайце тэкст. Сфармулюйце яго тэму, адрасата і мэтанакіраванасць.

Гаворачы пра штучныя мовы, нельга абмінуць самую вядомую з іх. Яе ў 1887 годзе стварыў акуліст з Варшавы Лазар Заменгаф. Насамрэч эсперанта — гэта псеўданім аўтара, што на створанай ім мове азначае 'той, хто спадзяецца'. А сама яна называлася проста «міжнароднай мовай». Неўзабаве была створана Акадэмія эсперанта, а ў 1905 годзе адбыўся І Сусветны кангрэс эсперанта.



Правообладатель Национальный институт образования

Алфавіт гэтай мовы грунтуецца на лацінскім. Эсперанта мае 28 літар, аднаму гуку адпавядае адна літара (як чуецца, так і пішацца — зусім як у беларускай мове). Націск заўсёды падае на перадапошні склад. Слоўнікавы запас эсперанта стварaўся на аснове германскіх і раманскіх моў, таксама ёсць тут мноства каранёў з лацінскай і грэчаскай.

Граматыка эсперанта ўключае толькі шаснаццаць правіл. Ёсць два склоны, два лікі, а вось роду няма (дакладней, ёсць займеннікі *ён, яна, яно*, але яны не патрабуюць сінтаксічнай сувязі з прыметнікамі і дзеясловамі).

У свеце эсперанта валодае каля двух мільёнаў чалавек, на ёй выходзяць газеты і часопісы, выдаюцца кнігі, здымаюцца фільмы.

Разлічылі, што чалавек, які валодае адной з еўрапейскіх моў, можа асвоіць эсперанта прыкладна ў дзесяць разоў хутчэй, чым англійскую мову. Ці не надышоў час пашырыць свой моўны запас? *(Паводле М. Ізаіткі)*.

З якой мэтай была створана штучная мова эсперанта? Раскажыце пра яе асаблівасці, выкарыстоўваючы інфармацыю, прыведзеную ў тэксце.

Прачытайце ніжэйпрыведзеныя слоўнікавыя артыкулы. Чаму слова *штучны* падаецца ў розных слоўнікавых артыкулах? У якім значэнні яно ўжываецца ў гэтым тэксце?

Штучны[1], *-ая, -ае*. 1. Ненатуральны, зроблены накшталт сапраўднага. *Штучнае валакно*. 2. Прытворны, няшчыры. *Штучная ветлівасць*.

Штучны[2], *-ая, -ае*. 1. Які ўяўляе сабой асобную рэч, які нельга ўзважыць або адмераць. *Штучны тавар*. 2. Які праводзіцца, робіцца здзельна, за кожную штуку. *Штучная аплата*.

Складзіце ўласныя словазлучэнні са словам *штучны* ў розных значэннях, уключыце іх у сказы. Раскажыце, пацвярджаючы свой адказ прыкладамі, пра адрозненне слова, словазлучэння і сказа.

Ці жадалі б вы ведаць эсперанта? Чаму?

**26.** Складзіце і запішыце словазлучэнні. Вызначце склон залежных слоў.

Даравац *(сябар)*, жартаваць *(суседка)*, падарожнічаць *(гарады)*, клапаціцца *(дзеці)*, ехаць *(дарога)*, хварэць *(грып)*, паехаць *(сваякі)*, загадчык *(аддзяленне)*, падобны *(маці)*.

У чым адметнасць запісаных словазлучэнняў?


Правообладатель Национальный институт образования

**27.** Перакладзіце сказы на беларускую мову, запішыце.

1. Для увеличения жилого пространства и экономии свободной территории двора построили дом в два этажа. 2. Более полувека назад вышло в свет первое издание всемирно известного «Словаря русского языка» С. И. Ожегова. 3. Когда я в доме не один, я всегда читаю про себя. 4. Психолог дал рекомендации о том, как хвалить и поощрять ребёнка за хорошее поведение. 5. Из ромашки аптечной готовят отвары, настои, чаи, а также включают её в состав сборов.

Параўнайце асаблівасці будовы словазлучэнняў у беларускай і рускай мовах. Раскажыце пра асаблівасці дапасавання і кіравання ў беларускай мове.

**28.** Прачытайце тэкст. Вызначце межы сказаў. Спішыце тэкст, раскрываючы дужкі, устаўляючы прапушчаныя літары і расстаўляючы неабходныя знакі прыпынку.

### Азёры Беларусі

Чыстымі вачамі даверліва ўзіраецца Радзіма ў далёкі сусвет з *(н..)*запамятных часоў вабіла белару..кая з..мля сваёй прыгажосцю *(н..)*паўторнай прыродай *(н..)*звыкла прыемнымі пейзажамі[л] нашы далёкія продкі пакланяліс.. прыродзе шанавалі яе сілу як найвыш..йшую[сл] боскую праяву таму белару..кія багі называліся так спакойна і ласкава Сварог, Дажбог, Вялес, Бялун, Жыжа, Святавід, Зюзя, Цаца, Жыцень выш..йшыя сілы пранікаліся да тутэйшай прыгажосці вялікай павагай хіба ж стан..ш рабіць крыўды людзям і прыродзе калі пазіра..ш у даверлівыя вочы*(азёры)* у люстраную р..чную роўнядзь гэткіх чароўных люстэркаў на Беларусі — лічыць не злічыць... *(Паводле А. Бутэвіча)*.

Выпішыце з першага сказа ўсе словазлучэнні, абазначце галоўнае слова, запішыце пытанне да залежнага. Вызначце від сінтаксічнай сувязі.

я к і м і?

У з о р: *чыстымі вачамі* (дапасаванне).

Знайдзіце ў тэксце простыя сказы, ахарактарызуйце ў іх тыпы выказнікаў. Раскажыце пра азёры Беларусі, якія вы ведаеце.



Правообладатель Национальный институт образования

**29.** Прачытайце тэкст. Выдзеліце ў ім падтэмы і мікратэмы, якія дапамагаюць раскрыць тэму.

Пералік птушак Беларусі ўключае 290 відаў. Сярод іх шмат рэдкіх, незвычайных сваім выглядам, паводзінамі ці ўмовамі жыцця.

Вось, напрыклад, скапа́, рэдкая[ф] ў нас птушка і вельмі асцярожная. У асноўным па два-тры птушаняці бывае. Калі адна ляціць на паляванне, другая абавязкова дзяцей ахоўвае. А падрасце маладняк, то разам бацькі па спажыву лятаюць. Звычайна прыносяць[м] карасёў, плотак, іншую рыбу. І што цікава! У скапы вельмі арыгінальныя пальцы. У спакойным стане яны размеркаваны так: тры — наперад, адзін — назад. А ў час палявання, калі птах пікіруе і цаляе схапіць здабычу, адзін з пярэдніх пальцаў як бы пераварочваецца, і тады два пальцы павернуты наперад і два — назад. Такімі «абцугамі» скапе вельмі добра хапаць рыбіну.



А вось чорны бусел зусім іншая птушка. Праўда, таксама вельмі асцярожная, але і далікатная. Надта ж прыгожая! Жыве ў глухамані, а на жыроўку прылятае на Бярэзіну. Прылятае зусім рана. Калі бусел упадабае якое месца — кожную раніцу яго там сустрэць можна. *Рыбу ловіць падпільноўваючы.* Збірае жабак, уюноў, апалонікаў — усю водную жыўнасць. Часам чорны бусел разам з белым ходзіць. Не ваююць птушкі паміж сабою, не б'юцца — даволі мірна сябе паводзяць *(Паводле Я. Пархуты)*.

Вызначце спосаб сувязі сказаў у кожнай частцы тэксту. Прывядзіце прыклады сродкаў гэтай сувязі.

Растлумачце адсутнасць коскі ў выдзеленым сказе.

Выпішыце з тэксту сказ з аднароднымі членамі, у якім абагульняльнае слова стаіць пасля іх. Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку.

Выпішыце з тэксту (паставіўшы ў пачатковую форму) па тры іменныя, дзеяслоўныя і прыслоўныя словазлучэнні, размеркаваўшы іх па відах сінтаксічнай сувязі (дапасаванне, кіраванне, прымыканне).

Выкарыстоўваючы інфармацыю з тэксту, раскажыце пра звычкі скапы, чорнага бусла.



Правообладатель Национальный институт образования

## § 5. Тыпы простых сказаў паводле мэты выказвання і інтанацыйнага афармлення (апавядальныя, пытальныя, пабуджальныя; клічныя і няклічныя сказы)

**30.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго мэту і адрасата. Ці дасягнута мэта выказвання?

Паводле мэты выказвання і інтанацыйнага афармлення сказы падзяляюцца на апавядальныя, пытальныя і пабуджальныя.

**Апавядальныя** — гэта сказы, у якіх паведамляецца пра факт рэчаіснасці, з'явы, падзеі, наяўнасць або адсутнасць чаго-небудзь: *Чалавек падышоў да бярозкі, спыніўся побач з ёй і нейкі час моўчкі глядзеў на прыгажуню* (Г. Аўласенка).

Апавядальным сказам характэрна апавядальная інтанацыя з нязначным павышэннем голасу на слове (групе слоў), якое паведамляе новую, найбольш важную інфармацыю, і спакойным паніжэннем тону ў канцы сказа. У канцы апавядальных сказаў на пісьме, як правіла, ставіцца кропка.

**Пытальныя** — гэта сказы, якія заключаюць у сабе пытанне, што звернута да субяседніка, каб атрымаць ад яго адказ, пэўную інфармацыю.

Інтанацыя ў пытальных сказах павышаецца на тым слове, у якім заключаецца пытанне: ***Вы*** *ідзяце ў паход? Вы* ***ідзяце*** *ў паход? Вы ідзяце* ***ў паход?*** На пісьме ў канцы пытальнага сказа ставіцца пытальнік. Граматычнымі сродкамі афармлення такіх сказаў з'яўляецца пытальная інтанацыя, парадак слоў, пытальныя часціцы, займеннікі, прыслоўі (*ці, хіба, няўжо, што, хто, чаму, дзе, куды* і інш.), якія звычайна размяшчаюцца ў пачатку пытальнага сказа: *А* ***хто*** *там ідзе ў агромністай такой грамадзе?* (Я. Купала).

**Пабуджальныя** — гэта сказы, у якіх выражаецца загад, парада, пажаданне, запрашэнне, заклік, просьба. Іх мэта — пабудзіць субяседніка да пэўнага дзеяння, таму для пабуджальных сказаў характэрна пабуджальная інтанацыя: *Пачынайце дзень з усмешкі, з добрых, цёплых слоў...* (М. Маляўка).

Паводле інтанацыйнага афармлення сказы бываюць ***клічныя*** і ***няклічныя***.

Клічным можа быць любы па мэце выказвання сказ, калі яго вымавіць з клічнай інтанацыяй: *Добра ў лузе ў час палудны!* (Я. Колас).



Правообладатель Национальный институт образования

*Хто не любіць спякотным днём пасядзець на беразе возера?!* (А. Асіпенка). *Пакіньце мне мову маю, пакіньце жыццё мне!* (П. Панчанка).

Падзяліце тэкст на сэнсавыя часткі, дайце ім загалоўкі. Складзіце план тэксту, перакажыце яго па плане.

**31.** Прачытайце тэкст. Вызначце і ахарактарызуйце тып маўлення.

Чаму я люблю сваю краіну? Кожны чалавек шукае адказ на гэта пытанне. Аднак адказаць на яго не так проста. Аднойчы я запытала сябе: «А чаму мне падабаецца Беларусь? Чаму люблю і ганаруся сваёй роднай мовай, славутымі пісьменнікамі?»

Я выйшла на двор, а над маёй галавой праляцеў бусел. Ён сеў у сваё гняздо[м], дзе яго чакала сям’я. Я паехала на веласіпедзе ўздоўж поля. Каласкі, закалыханыя ветрам, мне прыхільна ківалі. З іх потым спякуць хлеб. Ён такі духмяны, што пах будзе адчувацца[ф] па ўсёй хаце. Зайдзіце ў лес, а там… Столькі ягад, грыбоў! Сакавітыя, буйны́я, спелыя… Смаката!

Заходжу ў бібліятэку ці кнігарню і натхняюся харастром беларускага слова. Дзякуючы дзівосным вершам і апавяданням пісьменнікаў-чараўнікоў яшчэ больш разумееш, якое шчасце нарадзіцца і жыць на гэтай зямлі *(Паводле Г. Лукашэвіч)*.

Ахарактарызуйце кожны сказ па мэце выказвання і інтанацыйным афармленні.
● Выпішыце з тэксту простыя сказы, падкрэсліце ў іх граматычныя асновы, ахарактарызуйце тыпы выказнікаў.

**32.** Прачытайце з адпаведнай інтанацыяй творы вуснай народнай творчасці. Вызначце іх жанр. Адгадайце загадкі, растлумачце сэнс прыказак.

1. Выходзь на поле з расою, дык будз..ш з ядою. 2. Ад л..ноты чакай б..доты. 3. Ч..рвонае цельца, каме..ае сэрца, прыемнае на смак, а завецца як? 4. За праўду стой гарой. 5. Хто л..ціць без крылаў? 6. Што без вады плавае? 7. Не чапай ліха, пакуль сядзіць ціха. 8. Хто ў ч..рвоных ботах ходзіць па балота..? 9. Не цані ч..лавека па твар.., а цані па душ.. .

Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў канцы сказаў. Што выражаецца ў загадках, прыказках?
Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары. Падкрэсліце дзеясловы, якія перадаюць пабуджэнне да дзеяння.


Правообладатель Национальный институт образования

**33.** Прачытайце тэкст. Назавіце часткі, на якія можна падзяліць тэкст. Дайце ім загалоўкі.

Замо́вы (загаворы, нагаворы, шэпты) — старажытны жанр народнай паэзіі, слоўная формула, якой надавалася магічнае значэнне.

У мінулым замовы былі шырока распаўсюджаны ў быце і мелі чыста практычнае значэнне: з дапамогай слова, магічнага дзеяння ператварыць жаданае ў рэальнасць — падобным выклікаць падобнае (*«На моры камень, на зямлі дуб, на небе месяц. Як ім усім траім разам не сысціся, так і ў ... (імя) зубам не балець»*).

Прынята дзяліць замовы на некалькі тэматычных груп: першая група — замовы, звязаныя з гаспадарчай дзейнасцю чалавека (паляванне, рыбацтва, пчалярства, збор ягад, грыбоў, захаванне жывёлы, ураджаю); другая група — замовы супраць хвароб (ліхаманка, зубны боль, укус пчалы і інш.); трэцяя група — замовы, звязаныя з сямейнымі адносінамі і прыватным бытам (любоўныя замовы); чацвёртая група — замовы, звязаныя з грамадскімі адносінамі, і інш.

Замовы каштоўныя тым, што ў іх знайшлі адлюстраванне многія бакі гаспадарчага і духоўнага жыцця чалавека. Яны з'яўляюцца помнікамі мастацкага слова народа, складаюць цікавую частку яго вуснай спадчыны (*«Беларуская народная творчасць. Замовы»*).

Якое значэнне надавалася замовам?
На якія тэматычныя групы яны падзяляюцца?
У чым каштоўнасць замоў сёння?

**34.** Прачытайце замову. Да якой тэматычнай групы яна адносіцца?

**Замова для пчол**

Стой, рой малады!
Не іграй, да сырой зямлі прыпадай!
Вось вам, пчолкі, святліца новая, цясовая, адмысловая*.
Жыць вам тут і жыць сто лет і зім, і дзвесце дзяцей павадзіць.
І ты, матка-ліпа Вапляна, ліпа — красная дзявіца, і ты, труцень Іван,
параней уставайце, сваіх дзетак пабуджайце
і пасылайце іх у цёмныя лясы, у шчырыя бары.
Мінайце шум баравы, мінайце роў прудавы,
мядзведжую лапу, воўчы рот.


Правообладатель Национальный институт образования

Саграбайцеся, змятайцеся.
Да чужых пчол не лятайце і чужых да сябе не пускайце,
як маці-зямлі, свайго месца пільнуйцеся.

*«Беларуская народная творчасць. Замова»*

З якой мэтай напісана замова? Каму яна адрасавана?

Назавіце апавядальныя, пабуджальныя сказы. Што ў іх выражаецца? Ахарактарызуйце інтанацыю, з якой яны вымаўляюцца.

**35.** Спішыце тэкст, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы прапушчаныя літары. Пастаўце знакі прыпынку ў канцы сказаў.

### Шкадаванне

Стаю пасяро*(д/т)* з..лёнага лугу — *(не/ні)*дрэўца вакол, *(не/ні)*кусціка Н..ма за што воку зачапіцца

Здаецца, быў бы мастаком — абавязкова па..шоў бы далей, *(не/ня)*затрымаўся, бо што тут маляваць Ну, *(не/ня/ні)*траву ж, праўда

Раптам чую: шух-шух Бусел зусім ні*(з/с)*ка нада мной праляцеў і, выставіўшы свае цыбатыя ногі, н..падалёку[сл] апусціўся на лу*(г/х)* Уважліва пагл..дзеў на мяне: маўляў, а ці *(не/ня)*пры..шоў ты, браце, па маіх жабак ды конікаў Пагл..дзеў — і за справу

І адразу змяніўся, пахараш..ў луг дзякуючы гэтай велічнай, пр..гожай птушцы І як тут *(не/ня)*пашкадаваць, што я не мастак *(Паводле А. Бадака)*.

## § 6. Тыпы простых сказаў па будове (двухсастаўныя, аднасастаўныя, няпоўныя, ускладненыя)

**36.** Прачытайце тэкст. Дайце яму загаловак, які перадаваў бы тэму тэксту.

Магнаты Агінскія — гэта старадаўні род. Многія прадстаўнікі роду Агінскіх займалі важныя дзяржаўныя пасады ў Вялікім Княстве Літоўскім. Галоўны маёнтак Агінскіх знаходзіўся ў горадзе Слоніме, дзе быў створаны оперны тэатр[л]. Адзін з роду Агінскіх быў вядомым кампазітарам. Пасля ўдзелу ў паўстанні ён быў вымушаны ўцячы за мяжу, доўгі час жыў у Венецыі і Парыжы. Жывучы на чужыне, ён усёй душой імкнуўся да родных мясцін. Гэта яму



Правообладатель Национальный институт образования

належыць славуты паланэз «Развітанне з Радзімай», які ўвайшоў у скарбонку сусветнага мастацтва *(Паводле У. Бутрамеева)*.

Вызначце спосаб сувязі сказаў у тэксце, назавіце сродкі гэтай сувязі. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў тэксце.

**37.** Прачытайце тэкст. Дайце яму загаловак, які перадаваў бы асноўную думку тэксту. Пакажыце, як гэта думка развіваецца ў тэксце.

Бабуля даставала з куфэрка[л] вядомыя і невядомыя рэчы... Наступным быў чырвона-белы, доўгі, нібыта сцяжынка, ручнік.

— Ведаю! — загаманіла дзяўчынка. — Гэта ручнік!

— Так, малайчына, Аленка! А хочаш, я табе прачытаю яго?



— *Бабулечка, ты што, жартуеш? Ці смяешся*[ф] *з мяне? Хіба ж можна прачытаць ручнік?! Чытаюць кнігу, часопіс, газету, а ручніком выціраюць рукі, твар!*

— Можна, мая лю́бая дзяўчынка, можна, мая зорачка ясная. Я табе зараз усё растлумачу.

Вось глядзі, унучка, на гэты знак — знак Маці-Зямлі, што прарастае. Гэта ромб, у якім ёсць яшчэ чатыры ромбікі. Такой продкі бачылі зямлю — ніву, якая яшчэ мае «вочы». А вось гэты ромб — гэта знак жанчыны, маці, нівы, сырой зямлі. А калі ромб раскрыжаваны[сл], з парасткамі і кручкамі, — гэта ніва ўзараная, квітнеючая, ураджайная. А вось тут, звярні ўвагу, у ромбе ёсць крыж — гэта знак жыватворнай сілы агню, сімвал сонейка, якое нам свеціць.

— Ой, бабулечка, як жа цікава! І хіба ж я магла падумаць ці здагадацца, што ўсе гэтыя крыжыкі, ромбікі, квадрацікі могуць пра нешта расказаць?

— Але, гэта так. Яны размаўляюць з намі — гэта голас нашых продкаў, а ткачыха, якая тчэ гэты цуд, падарожнічае ў свет продкаў *(Паводле Н. Нікіцінай)*.

Абгрунтуйце думку, што ручнік можна чытаць. Якую інфармацыю можна прачытаць у ім? Што можна прачытаць на ручніку на гэтым малюнку?

Пракаменціруйце пастаноўку знакаў прыпынку ў канцы выдзеленых сказаў.

Знайдзіце ў тэксце прыклады няпоўных сказаў.



Правообладатель Национальный институт образования

**38.** Прачытайце прыказкі. На якой падставе прыказкі можна аб'яднаць?

1. Ч..лавек без Радзімы як салавей без песні. 2. За Радзіму сваю будзь геро..м у баі. 3. На Радзіме сонца свеціць б..сконца. 4. Родная з..мля мя..чэйшая за чужую п..рыну. 5. На родным пол.. расце лепшая доля. 6. Бацькоў любі, старых паважай, здароўе беражы, Радзіме верна служы.

Выпішыце, устаўляючы прапушчаныя літары, спачатку прыказкі, будова якіх адпавядае аднасастаўным сказам, а потым — двухсастаўным.

**39.** Ператварыце наступныя сказы ў развітыя. Для гэтага спачатку запішыце залежныя словы з групы дзейніка, затым — з групы выказніка (карыстайцеся пры неабходнасці змешчанай ніжэй схемай). Потым запішыце сказ, складзены на аснове запісаных словазлучэнняў.

Пачуўся голас. Хор выступіў.

У з о р. Голас (я к і?) ціхі, нясмелы, рэзкі, гучны.
Голас (ч ы й?) ...
Пачуўся (я к?) ... і г. д.




Карыстаючыся схемай, складзіце паведамленне пра галоўныя і даданыя члены сказа.

**40.** Прачытайце тэкст. Што перадае загаловак: тэму ці асноўную думку? Чаму тэкст мае такую назву?

**Тут нараджаюцца паэты**

Свіцязь, якое ж ты прыгожае возера! Многіх таленавітых людзей натхніла ты на творчасць. І ў першую чаргу — нашага славутага земляка, генія сусветнай літаратуры Адама Міцкевіча. «Між дрэў, бы ў вяночку, адкрыецца воку там возера Свіцязь, як дзіва», — пісаў у тысяча восемсот дваццатым годзе паэт.


Правообладатель Национальный институт образования

Сёння возера Свіцязь з навакольным лесам аб’яўл..на помнікам прыроды. Тут расце шмат рэ*(д/т)*кіх парод раслін і дрэў якія нават занес..ны ў *(Ч/ч)*ырвоную кнігу. За выключэннем возера *(Р/р)*ыца і азёр *(Ш/ш)*вейцарыі Свіцязь самае прыгожае ў Е..ропе. Дзівоснае і чароўнае яно захоўвае ў с..бе многа та..мнічага н..зведанага.

Прыйдзе сюды неабыякавы чалавек — адразу стане зразумела, што тут, у наваколлі Свіцязі, якраз і ёсць той казачны куточак Беларусі, дзе нараджаюцца сапраўдныя паэты *(Паводле Я. Сіпакова)*.

Вызначце ў кожнай частцы сказы, якія перадаюць асноўны сэнс выказвання. Назавіце сказы, якія яго пашыраюць, развіваюць.

Спішыце другі абзац тэксту, раскрываючы дужкі, устаўляючы прапушчаныя літары і расстаўляючы неабходныя знакі прыпынку.

На аснове прыведзенай схемы складзіце вуснае выказванне на тэму «Просты ўскладнены сказ». Праілюструйце сваё выказванне прыкладамі з тэксту.

ПРОСТЫ ЎСКЛАДНЕНЫ СКАЗ

- → Сказ з аднароднымі членамі
- → Сказ са зваротkам
- → Сказ з пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі
- → Сказ з адасобленымі членамі
- → Сказ з параўнальнымі зваротамі

**41.** Прачытайце табліцу. Падрыхтуйце на яе аснове вуснае паведамленне.

| ЗНАКІ ПРЫПЫНКУ Ў СКАЗАХ З АДНАРОДНЫМІ ЧЛЕНАМІ | | | |
|---|---|---|---|
| **Коска** паміж аднароднымі членамі сказа **ставіцца**, калі яны спалучаны | | | |
| інтанацыяй (без злучнікаў) | злучальнымі злучнікамі | | |
| | супраціўнымі адзіночнымі ***а, ды (= але), але*** | паўторнымі спалучальнымі і размеркавальнымі ***і — і, то — то, ці — ці*** | парнымі ***як — так і, калі не — то, не толькі — але і, хоць і — але*** |



Правообладатель Национальный институт образования

| **Коска** паміж аднароднымі членамі сказа **не ставіцца**, калі яны | |
|---|---|
| звязаны адзіночнымі злучнікамі ***і, ды (= і), ці, або*** | уваходзяць у склад устойлівых спалучэнняў, звязаных паўторнымі злучнікамі ***і — і, ні — ні, ці — ці*** |
| Калі ёсць абагульняльнае слова, **ставіцца** | |
| **двукроп'е** | [⊙: ○, ○, ○]. |
| **працяжнік** | [○, ○, ○ — ⊙]. |
| **двукроп'е** і **працяжнік** | [⊙: ○, ○, ○ — … ]. |

**42.** Прачытайце тэкст. Назавіце словы, якія забяспечваюць тэматычнае адзінства тэксту.

## Дзіўная птушка

Чомга — птушка своеасаблівая не толькі з выгляду. Сваімі дзіўнымі звычкамі яна адрозніваецца ад усіх іншых птушак.

Малыя дзеці чомгі сядзяць на спіне ў маткі, калі тая плавае на вадзе. У выпадку небяспекі чомга нырае ў ваду разам з імі. Кажуць таксама, што разам з малымі на спіне чомга ўзлятае, калі трэба, у паветра.



Ногі ў чомгі настолькі адсунуты назад, што яна амаль не ходзіць і на зямлі можа стаяць толькі абапіраючыся на кароткі хвост. Каб рухацца па зямлі, чомга павінна паўзці, прыпадаючы грудзьмі і абапіраючыся на крылы. Узняцца з зямлі ў паветра чомга не можа. Яна ўзлятае толькі з вады. Спачатку шпарка плыве, лопаючы крыламі і высунуўшыся напалову з вады, і толькі потым, узяўшы разгон, адрываецца ад вадзяной паверхні.

Будовай цела чомга цалкам прыстасавана да жыцця ў вадзе. Нырае яна не галавой наперад, як качкі, а ўсім корпусам, нібы правальваючыся на месцы.[сн]

З выраю чомгі вяртаюцца ў красавіку і жывуць на радзіме да лістапада. Восенню, перад адлётам, збіраюцца ў чароды (*Паводле В. Вольскага*).


Правообладатель Национальный институт образования

Выпішыце з тэксту сказ, у якім ёсць тры дзеепрыслоўныя звароты. Падкрэсліце іх як члены сказа. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку. Знайдзіце і зачытайце іншыя сказы, у якіх ёсць дзеепрыслоўныя звароты.

Знайдзіце ў тэксце дзеепрыметнікі. Вызначце, якую ролю яны выконваюць у сказах. У якіх выпадках дзеепрыметнікі і дзеепрыметнікавыя звароты адасабляюцца?

Назавіце сказы з аднароднымі членамі. Чым выражаны аднародныя члены сказа і як яны звязаны паміж сабой? Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

Абапіраючыся на звесткі з тэксту і малюнак, апішыце дзіўны выгляд чомгі, раскажыце пра яе паводзіны.

Раскажыце пра іншых рэдкіх птушак Беларусі. Можаце выкарыстаць інтэрнэт-рэсурсы або выданне «Чырвоная кніга Рэспублікі Беларусь: Рэдкія і тыя, што знаходзяцца пад пагрозай знікнення, віды жывёл і раслін» (Мінск : БелЭн, 1993).

**43.** Прачытайце верш. Чаму аўтар захапляецца палявымі кветкамі? Прапануйце загаловак, які перадаваў бы тэму верша.

Ліловыя званочкі ля ракі,
Здаецца, зазвіняць, як дакрануся.
Між каласоў сінеюць васількі,
Пяшчотныя, як вочы Беларусі.
Рамонкі асыпаюць на мяжу
Цнатлівыя пялёсткі снегавыя.
Па іх, нібы дзяўчынка, варажу.
Па сцежках незабыўных я хаджу,
Схіляюся і ціхенька кажу:
— Дзень добры, кветкі,
кветкі палявыя!

*С. Басуматрава.*

Вусна ахарактарызуйце ўжытыя ў вершы простыя сказы (*двухсастаўныя* ці *аднасастаўныя, развітыя* ці *неразвітыя, поўныя* ці *няпоўныя, ускладненыя* ці *няўскладненыя*).

Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказе з простай мовай.

Знайдзіце ў тэксце ветлівы выраз. Да якой часціны мовы адносіцца гэта спалучэнне слоў? Складзіце сказ, у якім гэтыя словы ўжываліся б у ролі іншых часцін мовы.

Падбярыце сінонімы да слоў *цнатлівы, васілёк.*

Якая з кветак, згаданых у вершы, лічыцца неафіцыйным сімвалам Беларусі? Хто з беларускіх пісьменнікаў у сваіх творах згадвае гэту кветку?



Правообладатель Национальный институт образования

**44.** Прачытайце тэкст. Вусна перакладзіце яго на беларускую мову.

## День хризантем

И в Китае, и в Японии хризантеме посвящён 9-й день 9-го месяца. Считается, что цветок, сорванный в этот день, обладает магической силой.



В XVII веке растение появилось в Европе: голландец Рееде привёз его из Японии в Англию. Правда, французы считают, что хризантемы впервые появились в Марселе в 1789 году благодаря французскому путешественнику Пьеру Бланкширу. Однако цветы, похожие на ромашки, не произвели тогда особого впечатления. И только в 1829 году французский садовник Берне после многолетних опытов вывел красивые разновидности хризантем, и цветок получил любовь и признание.

Сегодня у восточной красавицы поклонников много. Её звёздный час наступает поздней осенью, когда большинство цветов уже не радуют своим цветением. Не зря же её называют «царицей холодов».

А зимой роскошный цветок приходит в наши дома и в горшках *(Л. Анисовец)*.

Вызначце, якое з выказванняў адпавядае зместу тэксту.

А. У Марселі хрызантэмы ўпершыню з’явіліся ў XVII стагоддзі.
Б. У 1829 годзе галандскі садоўнік вывеў прыгожыя разнавіднасці хрызантэм.
В. У XVII стагоддзі хрызантэма была прывезена з Японіі ў Англію.

Выкарыстоўваючы інфармацыю з тэксту, вызначце, на які дзень тыдня прыпадае свята, прысвечанае хрызантэмам, у гэтым годзе.

Знайдзіце ў тэксце словы і словазлучэнні, якія характарызуюць хрызантэму. Запішыце іх па-беларуску.

Апішыце хрызантэму, выкарыстоўваючы інфармацыю з тэксту і малюнак.

Выпішыце з тэксту (па-беларуску) тры простыя ўскладненыя сказы (на выбар). Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.


Правообладатель Национальный институт образования

# Стылі маўлення

## § 7. Паглыбленне паняцця пра стылі маўлення. Стылеўтваральная роля моўных сродкаў

**45.** Прачытайце тэксты. Вызначце, да якога стылю адносіцца кожны з тэкстаў. Дайце ім характарыстыку, выкарыстаўшы табліцу «Стылі маўлення».

**I.** Дамавыя вераб'і — вельмі асцярожныя і кемлівыя птушкі. Апроч таго, вялікія чысцёхі, бо любяць купацца ў лужынах або ў пяску. Некаторыя гаспадары лічаць, што вераб'і — нахлебнікі і шкоднікі, спусташаюць агароды і сады. Але ўсё ж гэта шчырыя нашы прыяцелі. Вясной і летам, калі кормяць сваіх птушанят, яны знішчаюць пражэрлівых вусеняў і мноства іншых насякомых *(Паводле У. Ягоўдзіка)*.

**II.** Дамавы верабей — найбольш распаўсюджаны від роду сапраўдных вераб'ёў, сямейства вераб'іных. Даўжыня цела — да 16 см, маса — 23—35 г. Самец у шлюбным уборы з шэрым верхам і карычневай патыліцай, з чорным «гальштукам». Узімку чорны колер робіцца больш светлым, маладыя асобіны падобны да самак. Жыве ў населеных пунктах і на тэрыторыях непасрэдна вакол іх. Можа сустракацца на збожжавых і кукурузных палях *(З кнігі «Птушкі Еўропы»)*.

**III.** 1 красавіка ў школе адбудзецца мерапрыемства, прымеркаванае да Міжнароднага дня птушак. Вучні змогуць наведаць фотавыставу, прысвечаную птушкам Беларусі, уласнаручна вырабіць птушак з паперы і пасля ўпрыгожыць імі кабінет біялогіі.

Старшыня гуртка «Сябры прыроды».

**IV.** Адкрыццё помніка ў горадзе Баранавічы адбылося ў рамках нацыянальнай кампаніі «Дамавы верабей — птушка 2003»,



Правообладатель Национальный институт образования




якую праводзіла рэспубліканская грамадская арганізацыя «Ахова птушак Бацькаўшчыны». Металічная птушка сядзіць на паўтараметровым пастаменце. На помніку надпіс: «Да вас я назаўсёды прыляцеў: не вырай вабіць, а Радзіма».

Пільная ўвага беларускіх арнітолагаў* да вераб'я невыпадковая. З'яўляючыся адным з найбліжэйшых крылатых суседзяў чалавека, дамавы верабей адносіцца да так званых біялагічных індыкатараў — відаў, па стане папуляцый* якіх можна меркаваць пра змены ў навакольным асяроддзі *(Паводле А. Заціркі)*.

Чаму верабей адносіцца да так званых біялагічных індыкатараў?

Як вы разумееце сэнс прыказкі «Дзяржыся з воронаю і вераб'ём, што ў вырай не ляцяць»? Чаму вучыць народная мудрасць?

Якія яшчэ птушкі Беларусі не адлятаюць у вырай?

| СТЫЛІ МАЎЛЕННЯ | | | |
|---|---|---|---|
| **Сфера выкарыстання** | **Задачы маўлення** | **Стылёвыя рысы** | **Асноўныя жанры** |
| **Гутарковы стыль** | | | |
| Бытавыя, сямейныя, сяброўскія зносіны | Абмяняцца думкамі, пачуццямі, інфармацыяй з блізкімі, знаёмымі людзьмі | Непасрэднасць, натуральнасць маўлення. Адносіны да прадмета маўлення выражаны | Бытавая гутарка, размова |
| **Кніжныя стылі** | | | |
| Мастацкі стыль | | | |
| Творы мастацкай літаратуры і вуснай народнай творчасці | Вобразна, маляўніча апісаць які-небудзь прадмет ці з'яву, выказаць свае адносіны да іх | Канкрэтнасць, вобразнасць, маляўнічасць выкладу. Адносіны да прадмета маўлення выражаны | Проза, паэзія, драматургія |


Правообладатель Национальный институт образования

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Навуковы стыль** | | | |
| Асвета, навука (падручнікі, навуковыя працы, выступленні і паведамленні на навуковыя тэмы) | Паведаміць дакладныя звесткі і факты, якія маюць тэарэтычнае значэнне, растлумачыць іх | Дакладнасць, доказнасць, лагічнасць выкладу. Адносіны да прадмета маўлення не выражаны | Навуковы артыкул, рэферат, манаграфія, энцыклапедыя і інш. |
| **Афіцыйны стыль** | | | |
| Афіцыйныя зносіны, справаводства, заканадаўства | Паведаміць звесткі, якія маюць практычнае значэнне, даць дакладныя парады, указанні, рэкамендацыі | Прадпісальны характар маўлення, дакладнасць, стандартызаванасць. Адносіны да прадмета маўлення не выражаны | Закон, пастанова, указ, дагавор, пагадненне, аб'ява, заява, аўтабіяграфія і інш. |
| **Публіцыстычны стыль** | | | |
| Грамадска-палітычная дзейнасць (газеты, часопісы, выступленні) | Паведаміць інфармацыю, якая мае грамадска-палітычнае значэнне. Уздзейнічаць на думкі і пачуцці людзей | Эмацыянальнасць, доказнасць, дакладнасць, надзённасць, даходлівасць выкладу. Адносіны да прадмета маўлення выражаны | Выступленне, артыкул на грамадска-палітычную тэму, нататка*, інтэрв'ю* і інш. |

**46.** Параўнайце стылі тэкстаў I і II (практ. 45). Якія моўныя сродкі адпавядаюць задачам стыляў гэтых тэкстаў?

Для **навуковага стылю** характэрна аб'ектыўнасць, абагульненасць і дакладнасць выкладу, што абумоўлівае ўжыванне слоў з прамым значэннем, шырокае выкарыстанне тэрмінаў, абстрактнай лексікі. У навуковым стылі амаль не сустракаюцца клічныя і пытальныя сказы, а таксама іншыя сродкі эмацыянальнасці



Правообладатель Национальный институт образования

і экспрэсіўнасці. У навуковых тэкстах выкарыстоўваюцца пераважна складаныя сказы, простыя сказы ўскладненай будовы (з аднароднымі і адасобленымі членамі сказа, пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі і інш.).

У **мастацкім стылі** ўжываюцца ўсе пласты лексікі з яе прамым і пераносным значэннем, экспрэсіўна-эмацыянальнай афарбоўкай, усе сродкі граматыкі, багатая фразеалогія беларускай літаратурнай мовы і нават розныя нелітаратурныя моўныя адзінкі (дыялектызмы, жарганізмы і інш.). Гэты стыль вызначаецца вобразнасцю, эмацыянальнасцю, экспрэсіўнасцю і выразнасцю, сродкі выражэння якіх самыя разнастайныя.

**47.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль. Назавіце характэрныя для гэтага стылю моўныя сродкі.

— Колькі будзе, калі да пяці дадаць пяць? — пытаецца настаўнік у першакласніка Андрэйкі.

Андрэйка задумаўся.

— Ну, я табе даў пяць яблыкаў, а потым яшчэ пяць. Колькі ты мне павінен аддаць?

— Дванаццаць! — выпаліў Андрэйка.

— Дрэнна, сядай, — сказаў настаўнік.

— Эх ты, разява! Сказаў бы дзесяць, і ўсё добра было б, — шэпча яму яго сусед Саўка.

— Ага, дзесяць... Я дванаццаць прапанаваў, і то ён не згадзіўся *(В. Феранц)*.

**Гутарковы стыль** супрацьпастаўляецца ўсім іншым (кніжным) стылям маўлення. Ён абслугоўвае сферу неафіцыйных зносін, таму для яго характэрна ўжыванне слоў з канкрэтным значэннем *(бяроза, вуліца, завод, сонца)*, гутарковых слоў і выразаў *(бездар, прысунуцца, смяльчак)*, выразаў маўленчага этыкету *(Добры дзень! Бывай! Дзякуй!)*. Шырока выкарыстоўваюцца выклічнікі, мадальныя часціцы *(Эх, як добра! Ух, які вялікі! Ого!)*, няпоўныя, безасабовыя сказы, сказы са звароткамі.


Правообладатель Национальный институт образования

**48.** Прачытайце тэкст. Абгрунтуйце яго прыналежнасць да афіцыйнага стылю. Назавіце характэрныя для гэтага стылю лексічныя, марфалагічныя і сінтаксічныя сродкі.

Шлюб, сям'я, мацярынства, бацькоўства і дзяцінства знаходзяцца пад аховай дзяржавы.

Жанчына і мужчына пасля дасягнення шлюбнага ўзросту маюць права на добраахвотнай аснове ўступіць у шлюб і стварыць сям'ю. Муж і жонка раўнапраўныя ў сямейных адносінах.

Бацькі або асобы, якія іх замяняюць, маюць права і абавязаны выхоўваць дзяцей, клапаціцца аб іх здароўі, развіцці і навучанні. Дзіця не павінна падвяргацца жорсткаму абыходжанню або знявазе, прыцягвацца да работ, якія могуць нанесці шкоду* яго фізічнаму, разумоваму або маральнаму развіццю. Дзеці абавязаны клапаціцца пра бацькоў, а таксама пра асоб, якія іх замяняюць, і аказваць ім дапамогу.

Дзеці могуць быць аддзелены ад сваёй сям'і супраць волі бацькоў і іншых асоб, якія іх замяняюць, толькі на падставе рашэння суда, калі бацькі або іншыя асобы, якія іх замяняюць, не выконваюць сваіх абавязкаў...

Моладзі гарантуе..а права на яе духоўнае маральнае і фізічнае разві..ё.[сн]

Дз..ржава стварае неабходныя ўмовы для свабоднага і эфект..ўнага ўдзелу моладзі ў паліт..чным сац..яльным эканамічным і культурн..м разві..і *(Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, артыкул 32)*.

Якія правы і абавязкі маюць бацькі і дзеці ў адносінах адно да аднаго? Як вы выконваеце свае абавязкі?

Запішыце два апошнія сказы тэксту, устаўляючы прапушчаныя літары і расстаўляючы неабходныя знакі прыпынку. Абгрунтуйце правапіс.

Адметнай рысай **афіцыйнага стылю** з'яўляецца шырокае выкарыстанне стандартных сродкаў, або канцылярскіх штампаў *(за справаздачны перыяд, прымаючы пад увагу, у адпаведнасці са сказаным)*, дзеясловаў 3-й асобы са значэннем 'так трэба рабіць' *(гарантуе, забяспечвае, ахоўвае)*, спецыяльнай справавой тэрміналогіі *(работадаўца, адказчык, заказчык)*


Правообладатель Национальный институт образования

і адназначных слоў. У ім адсутнічаюць словы з пераносным значэннем, з адценнямі эмацыянальнасці і экспрэсіўнасці, вобразныя сродкі мовы. Сінтаксіс характарызуецца развітымі сказамі, двухсастаўнымі або аднасастаўнымі (безасабовымі), канструкцыямі з дзеясловамі ў неазначальнай форме, якія маюць прадпісальны характар (напрыклад: *забяспечыць, развіваць*), у спалучэнні са словамі *неабходна, трэба, абавязаны, забараняецца, мець права*.

**49.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль, абгрунтуйце сваё меркаванне. Ахарактарызуйце моўныя сродкі, уласцівыя гэтаму стылю.

Адной з самых істотных, вызначальных якасцей беларускага характару трэба лічыць надзвычайную талерантнасць — гэта значыць спагадлівасць, цярпімасць беларусаў да прадстаўнікоў розных нацый[л], канфесій, сацыяльна-саслоўных катэгорый насельніцтва, павагу да людзей з іншым светаўспрыманнем, складам мыслення.

Сапраўды, пра наяўнасць у беларусаў гэтай рысы можа сведчыць той факт, што на Беларусі практычна ніколі не было моцных канфліктаў на нацыянальна-рэлігійнай глебе.

Увогуле, традыцыі талерантнасці былі закладзены на Беларусі яшчэ ў старажытныя часы, аб чым могуць даць некаторае ўяўленне, напрыклад, такія факты, як спакойны, негвалтоўны характар увядзення хрысціянства на нашай зямлі ў канцы X—XI стагоддзяў, якое досыць доўга працягвала існаваць адначасова з язычніцкімі вераваннямі мясцовых жыхароў *(Паводле Э. Дубянецкага)*.

Назавіце вызначальную рысу характару беларусаў. Як вы разумееце значэнне гэтага слова?

Выберыце сцвярджэнне, якое раскрывае сутнасць паняцця *талерантнасць*:

1) шырокае і глыбокае пачуццё да сваёй Радзімы, да сваёй Айчыны, гатоўнасць падпарадкаваць свае асабістыя і групавыя інтарэсы агульным інтарэсам краіны, верна служыць ёй і абараняць яе;

2) цярпімасць да чужых поглядаў, паводзін, веравызнання;

3) хлебасольнасць, уменне прыняць і пачаставаць гасцей.

Якія назвы рыс характару беларусаў адпавядаюць іншым прыведзеным азначэнням?

● Назавіце ўжытыя ў тэксце сказы з пабочнымі словамі. Вызначце іх ролю.



Правообладатель Национальный институт образования

**50.** Спішыце тэкст, раскрываючы дужкі, устаўляючы прапушчаныя літары і расстаўляючы неабходныя знакі прыпынку. Падкрэсліце ў тэксце апорныя словы, якія задзейнічаны ў разгортванні тэмы тэксту.

### Флейта

Ужо трэ*(ц/цц)*юю летнюю раніцу Ліна прачыналася[с] ад лагодных гукаў. І гэта быў не клапатлівы голас маці і не голас кошкі. Ужо трэ*(ц/цц)*юю раніцу дзяўчынка прачыналася з першымі прамен..чыкамі сонца, яна быццам чула, як яно жартаўліва выглядае *(з)*за р..чкі. Ліна ішла ў пакой бацькоў але яны яшчэ сало*(д/т)*ка спалі.[сн] Адкуль жа гэтыя чаро..ныя гукі?

Яна ўбачыла ў ра..чыненае акно дзяўчыну якая стаяла на балконе суседняга дома і прыцiскала да вуснаў нейкую ср..бную дудачку.

Дзяўчынка пазней даведалася, што гэта флейта. Музы́ка прыціскае яе да вуснаў і ўдзімае ў яе паветра, і чуем мы: нібы птушкі размаўляюць, ці расінку на траве асвяціў першы прамен..чык сонейка, а недзе ўдалечыні журчыць празрысты ручай.

Ліна пазнаёмілася з *(дзяўчынай)*флейтысткай. А наступнае лета пачалося ўжо з дуэта ср..бных флейт *(Паводле В. Прохаравай)*.

Разгледзьце малюнкі. Вызначце, на якім з іх паказана флейта. Апішыце гэты музычны інструмент.









Правообладатель Национальный институт образования

# Складаны сказ: будова, значэнне, ужыванне

## § 8. Паняцце пра складаны сказ

**51.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль і тып. Падбярыце да тэксту загаловак у адпаведнасці з асноўнай думкай.

Радзіма для кожнага адна. І я ўпэўнены, што яна заўсёды толькі вялікая. Мой родны горад — лю́бы і мілы мне куточак на неабсяжнай планеце Зямля. Тут я адчуў веліч жыцця і сваю саўдзельнасць у ім, цёк крыві ў сабе, дух і дыханне сваіх бацькоў і продкаў. Няхай і неасэнсавана. Асэнсаванне прыйдзе пазней, але перад гэтым кожнага з нас чакае найвялікшае ў свеце адкрыццё. І найперш самога сябе.

А потым будзе адкрыццё таго, хто даў табе жыццё. Будзе бласлаўленне твайго роду і тваёй зямлі, з якой ты знітаваны ад першага твайго крыку, ад першага матчынага слова (*Паводле В. Казько*).

Выпішыце з першага абзаца тэксту: а) просты ўскладнены сказ; б) складаны сказ, у якім граматычныя часткі звязаны пры дапамозе злучальнага злучніка; в) складаны сказ, у якім граматычныя часткі звязаны пры дапамозе падпарадкавальнага злучніка.

Вызначце граматычныя асновы ў сказах другога абзаца. Зрабіце вывад пра іх будову. Якімі часцінамі мовы з'яўляюцца сродкі сувязі частак у гэтых сказах?

Сказ, які складаецца з дзвюх ці больш частак, аб'яднаных па сэнсе, граматычна і інтанацыйна, называецца **складаным:** [1]*Кожны з нас прыпасае Радзімы куток,* [2]*каб да старасці чэрпаць адтуль успаміны* (П. Панчанка).



Правообладатель Национальный институт образования

Кожная частка складанага сказа мае граматычную аснову. У сказе частак столькі, колькі ў ім граматычных асноў: [1]*Змоўк шпачыны звонкі спеў, а* [2]*ў цяністых спратах саду штрыфель сонечны паспеў — пахкі, буйны́, паласаты* (Х. Гурыновіч). [1]*Усіх сабрала навальніца:* [2]*грому ўцешліва грыміцца,* [3]*дождж ліецца,* [4]*град стукоча,* [5]*бліскавіца жмурыць вочы* (М. Мятліцкі).

По форме частка складанага сказа суадносіцца з простым сказам, але адрозніваецца ад яго тым, што не мае сэнсавай і граматычнай завершанасці.

Складаным сказам можна перадаць большы аб'ём інфармацыі, чым простым. У сувязі з гэтым складаныя сказы найчасцей ужываюцца ў тэкстах-разважаннях навуковага і публіцыстычнага стылю, дзе трэба аргументаваць выказаную думку.

**52.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль. Ці можна аднесці тэкст да тыпу разважання? На колькі частак можна падзяліць тэкст? Падбярыце загаловак да кожнай часткі.

**Дзве пілы**

Каля сяла
Сустрэлася з пілой піла.
Адна, як срэбра, ззяе,
А другая —
Зусім іржавая была.
І вось, як кажуць, слова к слову,
Сяброўкі завялі размову.
— Галубанька, не пазнаю́!
*Скажы мне, родная сястрыца,*
*Як ты сумела заіскрыцца?*
— А я да сонейка ўстаю
І ў лесе ці на рыштаванні
З людзьмі працую да змяркання.
*У тым і ўвесь сакрэт,*
*Што я адшліфавалася як след.*
— Ну, праца не па мне, я лепей паляжу
Ці пад страхой дзе-небудзь павішу,


Правообладатель Национальный институт образования

Чым дрэва пілаваць у зімнія завеі.
Ты мне адно, сястра, скажы —
Як трэба ратавацца ад іржы?
— Дык і дзіцё ж малое разумее,
Што нават сталь без працы іржавее!

*М. Скрыпка.*

Вызначце, якое слова з тэксту мае значэнне 'збудаванне з дошак для правядзення будаўнічых работ'.

Выпішыце сказ, у якім заключаецца асноўная думка тэксту. Падкрэсліце ў ім граматычныя асновы, зрабіце вывад пра пастаноўку знака прыпынку паміж часткамі сказа.

Дакажыце, што выдзеленыя сказы з'яўляюцца складанымі.

- Знайдзіце ў тэксце звароткі. Растлумачце іх ролю.

**53.** Прачытайце. Вызначце стыль і тып тэксту. Абгрунтуйце сваю думку, карыстаючыся кампазіцыйнай схемай разважання.

### Сусветная памяць ЮНЕСКА

Вы, напэўна, бывалі ў Мірскім замку, а мо і ў **Нясвіжскім.** Магчыма, хадзілі па таемных сцежках **Белавежскай** пушчы, наведвалі Дугу Струвэ. А ці ведаеце вы, што гэтыя аб'екты належаць не толькі да нашага **нацыянальнага** багацця, а і да агульнаеўрапейскіх чалавечых каштоўнасцей і набыткаў?

Паводле рашэння ЮНЕСКА, Мірскі і Нясвіжскі замкі, Белавежская пушча, Дуга Струвэ ўключаны ў Спіс сусветнай культурнай **спадчыны**. А гэта азначае, што нашы нацыянальныя скарбы становяцца на адзін узровень з Егіпецкімі пірамідамі, Вялікай Кітайскай сцяной і іншымі сусветнымі **шэдэўрамі.**

Афіцыйнымі мовамі ЮНЕСКА з'яўляюцца англійская, арабская, іспанская, кітайская, руская і французская, аднак арганізацыя вітае развіццё і захаванне іншых нацыянальных моў. Асаблівая ўвага надаецца і беларускай мове. Вывучаючы нашу мову, размаўляючы па-беларуску, вы тым самым дапамагаеце ажыццяўляць карысную дзейнасць ЮНЕСКА, што спрыяе захаванню культурнай і моўнай разнастайнасці.

Знайдзіце свой шлях удзелу ў праграмах ЮНЕСКА, каб садзейнічаць захаванню беларускай і сусветнай культурнай спадчыны (*Паводле А. Бутэвіча*).


Правообладатель Национальный институт образования




Якая тэма ўзнята аўтарам у тэксце? Каму ён адрасаваны?
Што вы ведаеце пра дзейнасць ЮНЕСКА?
Спішыце другі абзац. Падкрэсліце граматычныя асновы ў складаным сказе.
- Растлумачце арфаграмы ў выдзеленых словах.
- Вызначце род назоўніка ЮНЕСКА.

Падзяліце тэкст на часткі. Складзіце яго план.

Разгледзьце малюнак. Што на ім адлюстравана? Раскажыце пра беларускія шэдэўры культуры, занесеныя ЮНЕСКА ў Спіс сусветнай культурнай спадчыны.

**54.** Прачытайце прыказкі. Вызначце, у якіх сказах граматычныя часткі звязаны: а) пры дапамозе злучальных злучнікаў; б) пры дапамозе падпарадкавальных злучнікаў ці злучальных слоў (адносных займеннікаў); в) без удзелу злучнікаў. Зрабіце вывад пра пастаноўку знакаў прыпынку ў складаных сказах.

1. Пра..да як сонца: далон..ю *(не/ня)*закры..ш. 2. Хвалі..ся баравік прыгожай шапкай, ды пад ёй г..лавы няма. 3. Іржа есць[ф] ж..леза, а зайздрасць — сэрца чалавека. 4. *(Не/ня)*сорам маўчаць, калі н..ма чаго сказаць. 5. Ён больш забыўся, чым ты веда..ш. 6. Хоч..ш есці блінцы — добра цэпам* малаці. 7. Дзе гаспадар хо..іць, там ніўка родзіць. 8. Чаму *(не/ня)*навучыўся Янка, таго *(не/ня)*будзе ўмець Іван.

Запішыце асобна кожную групу прыказак, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы прапушчаныя літары.


Правообладатель Национальный институт образования

## § 9. Сродкі сувязі частак у складаных сказах. Тыпы складаных сказаў

**55.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль і тып. Які загаловак вы падабралі б да тэксту ў адпаведнасці з яго асноўнай думкай?

*Дзе жыве шчасце?*
*Невядома...* Але ўсё ж такі
яно жыве там, дзе жывём мы.
У нас адзін вялікі дом.
*У ім няма сцен, дзвярэй, акон.*
*Затое ў ім ёсць*
*Неба, Сонейка, Вада, Глеба...*
Колькі ў нашым доме жыхароў!
Вялікіх і не вельмі...
*Мы ўсе жывём разам!*
*Мы звязаны паміж сабою*
*тонкімі нябачнымі стужкамі.*
Мы жывём у адным доме,
назва якому — Зямля.
Які ён прыгожы, наш дом!

*В. Караткевіч.*

Перабудуйце выдзеленыя ў тэксце простыя сказы ў складаныя і запішыце іх. Падкрэсліце граматычныя асновы, назавіце сродкі сувязі частак у складаных сказах.

Часткі складанага сказа звязваюцца двума асноўнымі спосабамі:

1) пры дапамозе інтанацыі і злучнікаў ці злучальных слоў (адносных займеннікаў або прыслоўяў). Напрыклад: [1]*Над лесам неба ў жураўлях,* ***і*** [2]*ўвосень напрарочаць гусі і новы дзень, і светлы шлях, і росквіт мілай Беларусі* (В. Гардзей). [1]*Нам край належыць,* [2]***пакуль*** *ззяюць зоры* (А. Александровіч). [1]*І чуюць хай на ўсіх планетах,* [2]***як*** *пахнуць кветкі і ранеты ў нашых вёсках ля азёр* (А. Пісьмянкоў);

2) пры дапамозе інтанацыі (без удзелу злучнікаў і злучальных слоў). Напрыклад: [1]*Глядзі,* [2]*вунь зацвітаюць ільны:* [3]*возера мяккага блакітнага колеру разляглося на даляглядзе* (М. Гамолка).


Правообладатель Национальный институт образования

Інтанацыя, злучнікі і злучальныя словы з'яўляюцца **сродкамі сінтаксічнай сувязі граматычных частак** у складаных сказах.

У залежнасці ад таго, удзельнічаюць ці не ўдзельнічаюць злучнікі або злучальныя словы ў сувязі частак, складаныя сказы падзяляюцца на **злучнікавыя** і **бяззлучнікавыя**.

**56.** Прачытайце. Устанавіце адпаведнасць паміж граматычнымі часткамі крылатых выразаў.

1) Мы хоч..м
2) Добра быць у даро..е
3) Раны го..цца часам
4) Лю..ское с..рца бы..ам мора

а) якую ты сам с..бе выбіраеш *(Я. Колас)*.
б) а дружбаю — гора *(А. Куляшоў)*.
в) у ім бывае шторм і штыль *(П. Броўка)*.
г) каб мірнае неба не знала пажар.. в..йны *(А. Бачыла)*.

Запішыце сказы, устаўляючы прапушчаныя літары і расстаўляючы знакі прыпынку. Падкрэсліце ў сказах граматычныя асновы. Назавіце сродкі сувязі частак.

Якія сказы называюцца *злучнікавымі*, а якія — *бяззлучнікавымі*?

Злучнікавыя складаныя сказы падзяляюцца на складаназлучаныя і складаназалежныя.

У **складаназлучаных сказах** граматычныя часткі звязаны пры дапамозе інтанацыі і злучальных злучнікаў (***і, а, але, ды, затое, толькі*** і інш.). Напрыклад: 1)*А восень звоніць у звон свой медны, **і** 2)вецер трубіць у доўгі рог* (П. Панчанка).

Сувязь, пры дапамозе якой злучаюцца часткі ў складаназлучаных сказах, называецца ***злучальнай***.

У **складаназалежных сказах** граматычныя часткі звязаны пры дапамозе падпарадкавальных злучнікаў (***што, каб, бо, калі*** і інш.) ці злучальных слоў (адносных займеннікаў ***хто, што, які, чый, каторы*** і інш. і прыслоўяў ***дзе, адкуль, куды, калі*** і інш.). Напрыклад: 1)*Адно я знаю,* 2)***што*** (злучнік) *пустога слова не выцерпіць глыбінная душа* (Я. Янішчыц). 1)*І ва ўсіх нас ёсць Радзіма,* 2)***што*** (злучальнае слова) імёны нашы


Правообладатель Национальный институт образования

помніць (М. Танк). [1]*Там,* [2]*дзе* (злучальнае слова) *гулі́ пшаніцы і жыты,* [1]*стаяць снапы, як рыжыя браты* (П. Панчанка).

У складаназалежным сказе вылучаюцца ***галоўная частка*** і ***даданая*** (ці даданыя), якая падпарадкоўваецца галоўнай. Даданая частка з галоўнай звязана ***падпарадкавальнай*** сувяззю.

У **бяззлучнікавых складаных сказах** граматычныя часткі звязваюцца па сэнсе і пры дапамозе інтанацыі. Напрыклад: [1]*Над намі словы ўладараць:* [2]*мы чуем і гаворым іх* (С. Грахоўскі). Часткі ў такіх сказах звязаны ***бяззлучнікавай сувяззю.***

**57.** Запішыце асобна, устаўляючы прапушчаныя літары, складаназлучаныя, складаназалежныя і бяззлучнікавыя складаныя сказы.

1. Дарогі Палес..я мяне зачаруюць — спынюся ля[м] вёскі над ціхай р..кой *(М. Башлакоў)*. 2. Нават ця..ка стала верыць, што нарэ..це зазвіняць, як званок, аднойчы ў дзверы ц..плыня і чысціня *(Н. Гальпяровіч)*. 3. У кожнага адна свая маці, якую мы Ра..імаю завём *(А. Звонак)*. 4. Недзе ў м..дзведжым куце, то..чыся ў трысці, папараць-кветка цв..це, толькі яе не знайсці *(Х. Гурыновіч)*. 5. Хай жа над светам і кра..м сцяг[ф] наш заўсёды крыляе, вечна над плошчаю гэтай пам..ць і слава лунае *(М. Мятліцкі)*. 6. З ліст..падамі, з ліст..падамі завітаю я зноў сюды, дзе ў с..юдзёную студню падаюць, ціха падаюць ж..луды *(М. Башлакоў)*. 7. Блі..чаць даж..ынкі на плашчах прахожых рэ..кіх, вісяць антона..кі ў садах, як сонца рэшткі *(Н. Гальпяровіч)*.

Падкрэсліце граматычныя асновы. Вызначце сродкі сувязі граматычных частак. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

**58.** У польскай мове беларускаму злучніку ***што*** адпавядае слова ***że*** ([жэ]), а злучальнаму слову ***што*** — слова ***co*** ([цо]). Прачытайце тэлефонную размову. Вызначце, якія словы будуць ужывацца пры размове па-польску замест выдзеленых.

— Прывітанне, Бажэна! Я памятаю, ***што*** ты добра фатаграфуеш. Мне патрэбна твая дапамога.

— Рада цябе чуць, Ева! Ты выбрала, ***што*** хочаш сфатаграфаваць?

— Зразумела. Гэта помнік літары ў.



Правообладатель Национальный институт образования

— А нічога, ***што*** ён знаходзіцца ў Полацку?

— Нічога. Заўтра туды паедзем з бацька́мі.

— Не забывайся: у Полацку жыве сама Гісторыя. Фатаграфаваць будзем многа. Усё, ***што*** звязана з беларускай культурай.




Узор. 1. *Ежы разумеў, **што** не зможа патрапіць на гэту выставу (што = **że**).* 2. *Агата паказала паштоўкі, **што** яна набыла ўчора (што = **co**).*

Назавіце сродкі сувязі ў складаназалежных сказах.

Выпішыце бяззлучнікавы складаны сказ. Падкрэсліце ў ім граматычныя асновы, назавіце сродкі сувязі частак.

Разгледзьце фотаздымак. Як выглядае помнік? Карыстаючыся рознымі крыніцамі, даведайцеся, што напісана на помніку. Складзіце складаныя сказы са словамі-надпісамі.

Напішыце невялікае сачыненне-разважанне пра помнік літары ***ў***, выкарыстоўваючы складаныя сказы рознай будовы.

**59.** Выканайце інтэрактыўнае заданне па тэме «Складаны сказ: будова, значэнне, ужыванне»: размяркуйце сказы па групах у залежнасці ад іх тыпу.

Граматычныя часткі ў складаным сказе могуць адначасова звязвацца пры дапамозе розных відаў сувязі (напрыклад, злучальнай і падпарадкавальнай, падпарадкавальнай і бяззлучнікавай і інш.). Напрыклад: [1]*Гэта наша зямля дарагая,* [2]*гэта нашы лугі і палі,* [3]***над якімі*** *спрадвеку лунае бусел — сімвал бяссмерця Зямлі* (А. Грачанікаў) (бяззлучнікавая і падпарадкавальная сувязь). [1]*Я дамоў прыеду,* [2]***калі*** *ліўні адшумяць і пойдуць за сяло,* ***а*** [3]*ў зацішку поўня светлай грыўняй скоціцца мне проста ў далонь* (В. Гардзей) (падпарадкавальная і злучальная сувязь).

Такія сказы называюцца **складанымі сказамі з рознымі відамі сувязі частак.**



Правообладатель Национальный институт образования

**60.** Прачытайце тэкст. Карыстаючыся кампазіцыйнай схемай (с. 11), дакажыце, што тып тэксту — разважанне.

Чалавек не ўзнікае так —
Ён збываецца, адбываецца
Як ратáй*,
Як дзівак,
Як мастак,
Ад якога свет адбіваецца.
Чалавек не ўзнікае так,
Бы ў кішэні вякоў пятак.
Ён сціраецца аб дарогі,
Разбіваецца аб адчаі,
Пераходзіць ва ўсе трывогі
**Веку,**
Што яго прыручае.
Перш чым вочы засloняць **векам,**
Чалавек хоча стаць чалавекам.

*Р. Барадулін.*

Якія тыпы складаных сказаў сустракаюцца ў тэксце?

Выпішыце складаны сказ з рознымі відамі сувязі частак, падкрэсліце граматычныя асновы. Назавіце сродкі сінтаксічнай сувязі частак.

- Запішыце выдзеленыя ў тэксце словы ў пачатковай форме. Падбярыце да іх аднакаранёвыя.
- Растлумачце напісанне слоў з арфаграмай «Правапіс прыставак на зычны».

**61.** Прачытайце тэкст. Падбярыце да яго загаловак у адпаведнасці з асноўнай думкай. Вызначце стыль і тып тэксту. Абгрунтуйце сваю думку, карыстаючыся кампазіцыйнай схемай тыпу тэксту (с. 11).

Што з'яўляецца прадметам мастацтва? Пытанне гэта апошнім часам выклікае самыя гарачыя спрэчкі.

Нацэльваць мастацтва толькі на праблемы сённяшнія, канкрэтна-практычныя як быццам не выпадае. Для гэтага ёсць публіцыстыка. Але як можна адгарадзіцца ад таго, што хвалюе людзей?

Для мастацтва няма дробных, н..значных праблем. Хутчэй за ўсё, ёсць дробныя, н..значныя мастакі, якія да р..чаіснасці ставяцца


Правообладатель Национальный институт образования

абыякава, а некаторыя з іх нават і пагардліва. Калі ж мастак — асоба, грамадзянін, то заўсёды будзе ў самым вір.. жы..я, а за будзё..ымі справамі ён здолее заўважыць і тое глыбінна істотнае, што мастацтва а..носіць да кат..горыі вечнага, агульнач..лавечага. Сапраўдны мастак добра ведае, што задача мастацтва[с] — зв..ртацца да душы чалавека, уплываць на яго пачу..і і думкі *(Паводле З. Прыгодзіча)*.

Ці існуюць для мастацтва неістотныя праблемы? Якога мастака варта лічыць сапраўдным?

Спішыце апошні абзац тэксту, устаўляючы прапушчаныя літары.

У сказах з рознымі відамі сувязі вызначце межы граматычных частак, падкрэсліце граматычныя асновы. Назавіце сродкі сувязі частак.

Падзяліце тэкст на часткі. Складзіце план, выкарыстоўваючы пытальныя сказы. Перакажыце тэкст паводле складзенага плана.

**62.** Разгледзьце схему. Дапоўніце яе звесткамі, атрыманымі на ўроках.




**КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Які сказ называецца складаным? Прывядзіце прыклады складаных сказаў.
2. Якую ролю адыгрываюць інтанацыя, злучнікі і злучальныя словы ў складаных сказах? Абгрунтуйце сваю думку.
3. Назавіце віды сувязі, што існуюць паміж часткамі складанага сказа. Якія сказы называюцца злучнікавымі, а якія — бяззлучнікавымі? Прывядзіце прыклады такіх сказаў.
4. Раскажыце пра складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак.


Правообладатель Национальный институт образования

# Складаназлучаныя сказы: будова, значэнне, ужыванне

## § 10. Паняцце пра складаназлучаны сказ. Сродкі сувязі частак у складаназлучаных сказах

**63.** Прачытайце тэкст. Падбярыце да яго загаловак.

Мы лічым, што ствараем самыя дасканалыя рэчы. Але нашы продкі ў нечым былі значна больш вынаходлівыя за нас.



Якім вы ўяўляеце тэатр ценяў? *Сёння для паказу спектакля замацоўваецца белая тканіна, а за ёй акцёры выконваюць свае ролі*. У эпоху Сярэднявечча ўсё было па-іншаму. Нашы продкі здолелі стварыць тэатр без акцёраў, але гэта была не батлейка[л]. Тагачасны тэатр ценяў — гэта маленькая скрыначка. *У цэнтры гэтай скрыначкі ставілі свечку, а вакол размяшчалі папяровую выцінанку. Свечку запальвалі — і паветра награвалася і прымушала паперу круціцца*. Так з’явіўся правобраз мультфільма. А як папера не загаралася, знаходзячыся побач з полымем? Беларусы выкарыстоўвалі спецыяльную вадкасць, састаў якой навукоўцы так і не змаглі вызначыць (*Паводле П. Забела*).

- Спішыце выдзеленыя ў тэксце сказы. Падкрэсліце граматычныя асновы. Вызначце ролю злучнікаў ***і*** і ***а***.
- Растлумачце напісанне слова *Сярэднявечча* з вялікай літары.

Разгледзьце фотаздымак. Ці адлюстроўвае ён змест тэксту? Складзіце складаназлучаны сказ са словам *батлейка*.


Правообладатель Национальный институт образования

Сказ, граматычныя часткі якога звязваюцца пры дапамозе інтанацыі і злучальных злучнікаў, называецца **складаназлучаным**.

У складаназлучаным сказе можа быць некалькі граматычных частак. Напрыклад: [1)]*Схавай выбуховае слова на ворага, **а** [2)]другу хай будзе адкрыта душа* (П. Макаль). [ ______ ], ***а*** [ ______ ______ ].

[1)]*Час свой мерны крок чаканіць, **і** [2)]лятуць гадзіны, дні, **толькі** [3)]доўжыцца чаканне цеплыні і чысціні* (Н. Гальпяровіч).

[ ______ ______ ], ***і*** [ ______ ______ , ______ ], ***толькі*** [ ______ ______ ].

**64.** Прачытайце сказы. Вызначце межы граматычных частак у кожным з іх. Растлумачце, з якім простым сказам (аднасастаўным ці двухсастаўным) суадносіцца кожная частка сказа.

1. Вецер хмары на небе рве, і да долу хінуцца дрэвы, і надзея пад **сэрцам** дрэмле, і пяшчота[ф] ў душы жыве *(Н. Гальпяровіч)*. 2. І кожны колас — паслухмяны клавіш, а кожная **саломіна** — струна *(В. Вітка)*. 3. На ўсходзе заружавелася неба, але **сонца** яшчэ не было *(Я. Сіпакоў)*. 4. Прычасаліся вербы, і стаўкі́ паглыбелі, і дзяўчаты пад ліўнем, дальбог, пастрайнелі *(Е. Лось)*. 5. Гэты бераг быў **пясчаны**, і пясок з абрыву спаўзаў у рэчку, засыпаў яе *(І. Шамякін)*. 6. На кожным кроку навіна, і душна ад **чабору**, і песню кожная сасна свайму спявае бору *(А. Вялюгін)*. 7. Марознай зорнай **ноччу** на шашы то прасунуцца ціхія сані, то зноў прамчыцца машына *(Я. Брыль)*.

Спішыце сказы з трыма граматычнымі часткамі. Абгрунтуйце свой выбар. Складзіце схемы сказаў.

- Растлумачце напісанне арфаграм у выдзеленых словах.

**65.** Прачытайце прыказкі.

1. Прыкінуўся во..к авечкаю, ды зубы выдалі. 2. Аднаму шчасце ракою плыве, а другі ў *(не/ня)*шчасці ўвесь век ж..ве. 3. Каўнер ш..рокі, а пяты голыя. 4. Па*(д/т)*садзі на печ дз..дулю, і цябе


Правообладатель Национальный институт образования

ўнукі па*(д/т)*садзяць. 5. Хоць *(не/ня)*багаты, але зухаваты[л]. 6. Па з..млі ходзіць, а неба *(не/ня)*бачыць. 7. Малы ар..х, але пал..цамі яго *(не/ня)*раздуш..ш.

Размяркуйце па групах прыказкі, будова якіх адпавядае складаназлучаным сказам і простым сказам з аднароднымі членамі. Спішыце, раскрываючы дужкі, устаўляючы прапушчаныя літары.

Зрабіце вывад пра сродкі сувязі граматычных частак і пастаноўку знакаў прыпынку ў складаназлучаных сказах.

**Асноўнымі сродкамі сувязі граматычных частак у складаназлучаным сказе з'яўляюцца злучнікі:**

- спалучальныя (***і, ды*** (у значэнні ***і***), ***ні—ні***):

*І* [1)]*мокне ліст над галавой, і* [2)]*мокне горад* (Н. Гальпяровіч).

*І* [ ═══ ─── ], *і* [ ═══ ─── ];

- супраціўныя (***а, але, ды*** (у значэнні ***але***), ***затое, толькі, аднак***):

[1)]*Замоўкла ў лесе ўсё зімой, а* [2)]*крыжадзюб пяе* (М. Хведаровіч).

[ ═══ ─── ], ***а*** [ ─── ═══ ];

- размеркавальныя (***або, або — або, ці, ці — ці, то — то, не то — не то, ці то — ці то*** і інш.):

***Ці то*** [1)]*сонца свеціць,* ***ці то*** [2)]*месяц ясны вам смяецца з неба весела і шчасна* (Я. Купала).

***Ці то*** [ ─── ═══ ], ***ці то*** [ ─── ═══ ].

**66.** Утварыце з простых сказаў складаназлучаныя. Ужывайце злучнікі ***і, а, але, ды.*** Сказы запішыце. Пабудуйце схемы двух сказаў (на выбар).

Узор. *Сад шумеў. У цьмяным небе заміргцелі зоры* (Я. Журба). — [1)]*Сад шумеў, і* [2)]*ў цьмяным небе заміргцелі зоры.* [ ─── ═══ ], ***і*** [ ═══ ─── ].

1. Зноў выпаў снег. Па цаліку́* яшчэ ніхто не вывеў след *(У. Марук)*. 2. Ішла над ціхім лесам поўня. Расы чакалі верасы *(Р. Барадулін)*. 3. Усе дарогі вядуць не ў Рым. Усе дарогі вядуць да мамы *(М. Пазнякоў)*. 4. Дрыготка шапоча лістота. Вятрыска нямее над гаем *(У. Мазго)*.



Правообладатель Национальный институт образования

Злучальныя злучнікі не толькі аб'ядноўваюць часткі ў складаназлучаны сказ, але і выражаюць сэнсавыя адносіны паміж імі. Паміж часткамі складаназлучанага сказа існуюць **спалучальныя, супраціўныя** і **размеркавальныя адносіны** (паводле назвы злучальных злучнікаў). Напрыклад:

[1)]*Надыходзіў вячэрні змрок*, ***і*** [2)]*ад гэтага яшчэ ўтульней было каля агню* (Я. Маўр) (спалучальныя адносіны; значэнне прычыны і выніку).

[1)]*Працавіты наш дзень адпачыць адышоў*, ***толькі*** [2)]*стужка зары дагарае над садам* (М. Танк) (супраціўныя адносіны; значэнне супастаўлення).

***То*** [1)]*гром гучнабежны пракоціцца ў хмарах*, ***то*** [2)]*грукне над лесам пярун* (Я. Колас) (размеркавальныя адносіны; значэнне чаргавання з'яў).

**67.** Прачытайце табліцу. Падбярыце да яе загаловак. На аснове табліцы падрыхтуйце вуснае паведамленне пра сродкі сувязі граматычных частак у складаназлучаным сказе і сэнсавыя адносіны паміж імі.

| Злучальныя злучнікі | Прыклады злучнікаў | Сэнсавыя адносіны |
|---|---|---|
| спалучальныя | ***і, ды*** (у значэнні ***і***),<br>***ні — ні*** | *спалучальныя:*<br>а) адначасовасць;<br>б) паслядоўнасць;<br>в) прычына і вынік |
| супраціўныя | ***а, але, ды*** (у значэнні ***але***),<br>***толькі, затое, аднак*** | *супраціўныя:*<br>а) супрацьпастаўленне;<br>б) супастаўленне |
| размеркавальныя | ***або, або — або,***<br>***ці, ці — ці,***<br>***то — то,***<br>***не то — не то,***<br>***ці то — ці то*** | *размеркавальныя:*<br>а) чаргаванне;<br>б) узаемавыключэнне |


Правообладатель Национальный институт образования

**68.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль, тып і жанр. Падбярыце да тэксту загаловак у адпаведнасці з асноўнай думкай.

Пасадзіла Жанчына Насенне... Незвычайнае Насенне ў Жанчыны. Ма́е чалавек думкі светлыя — і Насенне прарасце хутка, і расліна тая потым ужо ніколі не завяне.



Пасадзіла Жанчына Насенне... Няшмат часу прайшло, і з'явілася з яго танюткая Сцяблінка. Хутка расце Сцяблінка, а неўзабаве разгарнуўся і першы лісток. Ён маленькі, сціплы пакуль яшчэ, але глядзіць на яго Жанчына і радуецца. «Вось і з'явілася мая Вера, — думае. — Вера ў тое, што ў кожнага на зямлі заўсёды ёсць светлае». Расце Сцяблінка — і мацнее Вера Жанчыны.

А хутка і наступны лісток да сонейка пацягнуўся. Ці то Вера дапамагае, ці то сонейка спрыяе росту. Глядзіць на яго Жанчына, радуецца: «Вось і Надзея мая з'явілася. Надзея на тое, што добрае на зямлі ніколі не знікне».

Трэці[м] лісток на сонейку заблішчаў, а яго абодва першыя падтрымалі! «Вось і Любоў мая з'явілася, — думае Жанчына. — Любоў да тых, хто на зямлі жыве».

Пасадзіла Жанчына Насенне... Многа часу прайшло, але не знікла тая Сцяблінка! Блішчаць на сонейку яе лісткі — Вера, Надзея, Любоў. Радуюць усіх прыгажосцю сваёй *(Паводле В. Караткевіч)*.

Што за насенне пасадзіла Жанчына? Чаму яно прарастала хутчэй, чым у іншых людзей?

Чаму некаторыя словы ў тэксце напісаны з вялікай літары?

Выпішыце з тэксту 2-3 складаназлучаныя сказы, падкрэсліце граматычныя асновы. Назавіце сродкі сувязі граматычных частак. Вызначце сэнсавыя адносіны паміж часткамі. Пабудуйце схемы сказаў.

● Якую ролю адыгрываюць у тэксце дзеясловы?

На колькі частак можна падзяліць тэкст? Вызначце апорныя словы ў кожнай частцы. Складзіце план тэксту.

Вусна перакажыце тэкст, ужываючы складаназлучаныя сказы.



Правообладатель Национальный институт образования

**69.** Прачытайце. Вызначце сэнсавыя адносіны паміж граматычнымі часткамі сказаў.

1. Час настае, і на загне́це дымяцца боханы — лепшыя ў свеце *(А. Вярцінскі)*.
2. Мой тата нарадзіўся[м] ў Курску, а мама — родам з-пад Гальшанаў *(А. Зэкаў)*.
3. Білі ўнізе агню языкі, і стагнала зямля валунамі *(А. Пысін)*.
4. Ці жаўрук звінеў у небе, ці свістаў на ліпе шпак *(Ц. Гартны)*.
5. Дождж прайшоў, і на траве, на лісці зіхацяць, гараць брыльянты-росы *(Н. Гілевіч)*.

а) супрацьпастаўленне
б) адначасовасць
в) прычына і вынік
г) паслядоўнасць
д) узаемавыключэнне

Якое слова мае значэнне ‘месца з правага або левага боку прыпечка, куды заграбаюць жар’?

**70.** Выканайце тэставыя заданні па тэме «Складаназлучаныя сказы: будова, значэнне, ужыванне».

## § 11. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназлучаных сказах

**71.** Прачытайце тэкст. Растлумачце, чаму ён так называецца. Вызначце стыль і жанр тэксту.

### Прынцып

Адзін падарожнік бачыць, як яго сябар па падарожжы кладзе ў канверт чысты аркуш паперы, заклейвае канверт, прыклейвае марку і піша адрас.

— Чаму ты гэта робіш? — пытаецца зацікаўлены.

— Бачыш, — кажа той, — ёсць прычына. Перад выездам я пасварыўся з лепшым сябрам, і цяпер мы не размаўляем *(Паводле У. Ліпскага)*.

Што выклікала ў вас усмешку?

Знайдзіце ў тэксце складаназлучаны сказ. Абгрунтуйце пастаноўку знака прыпынку перад злучнікам ***і***.

Якія словы ветлівасці выкарысталі б вы для таго, каб памірыцца з сябрам? Паразважайце пра ролю пошты ў жыцці сучаснага грамадства.



Правообладатель Национальный институт образования

Граматычныя часткі складаназлучанага сказа могуць аддзяляцца адна ад адной *коскай, працяжнікам* і *кропкай з коскай*.

Звычайна паміж часткамі складаназлучанага сказа, звязанымі адзіночнымі і паўторнымі злучнікамі, с т а в і ц ц а **коска**. Напрыклад: [1]*Дагарае на ветры мая залатая дуброва, **і** [2]Паўночная зорка адзіны кірунак дае* (В. Зуёнак). [ ═══ ─── ], ***і*** [ ─── ═══ ]. ***Ці то*** [1]*ішло свята, **ці то** [2]прыйшла вясна* (А. Вярцінскі). ***Ці то*** [ ═══ ─── ], ***ці то*** [ ═══ ─── ].

**Працяжнік** паміж часткамі с т а в і ц ц а тады, калі ў другой частцы перадаецца вынік, супрацьпастаўленне, рэзкая змена падзей. Напрыклад: [1]*Вазьму шурпаты каласок на чуйным провадзе саломы — **і** [2]адзавецца мне здалёк мой продак — сейбіт незнаёмы* (А. Пысін). [ ═══ ] — ***і*** [ ═══ ─── ].

**Кропка з коскай** с т а в і ц ц а ў складаназлучаным сказе, калі адна з частак ці часткі маюць ускладненую будову і свае знакі прыпынку, а сэнсавыя адносіны паміж часткамі аслаблены. Напрыклад: [1]*Рыбак быў дзядзька наш Антоні, як і работнік, адмысловы; **а** [2]Уладзік пасвіў дзесь каровы, травіў чужыя сенажаці; **а** [3]дома з дзецьмі была маці* (Я. Колас).

[ ═══ ─── , ***як...***, ═══ ]; ***а*** [ ─── ═══ , ═══ ]; ***а*** [ ═══ ─── ].

**72.** Прачытайце строфы з вершаў. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў складаназлучаных сказах.

Мільгаюць старонкі твае [кнігі] —
І мы размаўляем з вякамі,
І продак да нас дастае
Радкамі, нібыта рукамі.

*П. Макаль.*

Канцы з канцамі ледзьве зводзіць лета —
няўжо прырода гэткая скупая?
То луг травою буйнай не адзеты,
то пчолам мёду ў кветках не хапае.

*М. Дукса.*

Пабудуйце схему сказа, аўтарам якога з'яўляецца П. Макаль.



Правообладатель Национальный институт образования

**73.** Спішыце сказы, раскрываючы дужкі, устаўляючы прапушчаныя літары і расстаўляючы знакі прыпынку.

1. Дубы на позні дол *(з/с)*сыпаюць лісце і ў кожнага з..мны кароткі век *(А. Пысін)*. 2. Люляла ружа кропельку расы п..лёсткамі пя..чотна затуляла ды сонца ціха іх пац..лавала і *(з/с)*нікла ўраз іскрыначка красы *(М. Аляхновіч)*. 3. І ў сцюжу нечай ласкай ты сагр..ты і ў спёку пекане ц..бе зіма *(П. Панчанка)*. 4. Было ўжо позна аднак *(ні/не)*хто не спаў *(У. Краўчанка)*. 5. Калыш..цца жыта радамі бяж..ць а хваля паветра др..жыць і др..жыць *(Я. Колас)*. 6. Днём яшчэ было горача затое но..у дацінаў хола.. *(А. Асіпенка)*. 7. У лесе ўсё *(не/ня)*рухома. Дакране..ся да лапак і пакоці..а холад за каўнер між лапатак *(Н. Гілевіч)*.

Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах. Вызначце сэнсавыя адносіны паміж часткамі.

- Якое значэнне мае слова *дол* у 1-м сказе?
- Выпішыце з 3-га сказа займеннікі. Дайце ім граматычную характарыстыку.

**Коска** паміж часткамі складаназлучанага сказа, звязанымі пры дапамозе адзіночных злучнікаў ***і, ды*** (у значэнні ***і***), ***ці, або*** не ставіцца, калі яны маюць дадзены член сказа, часціцу ці пабочнае слова, якія аднолькава адносяцца да кожнай з частак.

Напрыклад: 1)***Там, удалечыні, за полем,*** *прытулілася вёсачка* ***і*** 2)*ў адной з яе хатак запалілі святло* (В. Праўдзін). 1)***Толькі*** *недалёка ціха булькала крынічка* ***і*** 2)*да хрыпаты надрываўся недзе драч* (М. Ваданосаў). 1)***Можа,*** *з часам завяне бадзёрасць* ***і*** 2)*гады лягуць шэрагам плям* (Ю. Жаўрук). 1)***У небе*** *спявалі жаваранкі* ***ці*** 2)*шчабяталі ластаўкі* (З. Бядуля).

**74.** Прадоўжыце сказы, каб атрымаліся складаназлучаныя. Растлумачце, чаму паміж часткамі гэтых сказаў не ставяцца знакі прыпынку.

1. Учора зранку абляцела лісце на бярозе і... 2. Пад вокнамі новага дома з'явіліся прыгожыя кветкі або... 3. Магчыма, новыя словы прыйдуць да мяне ды... 4. На ўзгорку махаў крыламі вятрак ці... 5. Вось і закружыліся першыя сняжынкі ў паветры ды... 6. Даўно ўжо пагаслі зоры і...

Пабудуйце схемы сказаў.



Правообладатель Национальный институт образования

**75.** Прачытайце тэкст, устаўляючы замест пропускаў злучнікі ***і, але, ды*** (у значэнні ***але***). Вызначце яго асноўную думку. Які загаловак можна падабраць да тэксту?

Аднойчы зайшоў др..васек у пушчу. Пачаў секчы дрэвы ... у яго зламалася тапарышча. Др..васек папрасіў дубка стаць тапарышчам ... той а..мовіў. Звярну..ся да іншых дрэў ... усюды атрымаў а..моўны а..каз.

Тады др..васек забраўся ў гушчар і сказаў чэзлай* елцы:

— Згаджайся ты. Чаго будзеш тут выстойваць?! Усё роўна не прабіцца табе да сонца скрозь кроны волатаў. *Пройдзе год-два — і зусім засохнеш.*

Елка згадзілася. І ўпалі векавыя дубы, стромкія сосны, выносныя бу́кі ад невялічкай сякеры з яловым тапарышчам *(Паводле А. Карпюка).*

Спішыце першы абзац тэксту, устаўляючы прапушчаныя літары, злучнікі і расстаўляючы неабходныя знакі прыпынку. Абгрунтуйце свой выбар.

Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў выдзеленым сказе.

● Запішыце назоўнікі *дрывасек, тапарышча, елка, пушча* ў форме меснага склону адзіночнага ліку.

Перабудуйце апошні сказ тэксту ў адпаведнасці са схемай і запішыце сказ, які ў вас атрымаўся. Дайце яму граматычную характарыстыку.

[ ═════ ───── ], і [ ═════ ───── ], і [ ═════ ───── ].

**76.** Складзіце сказы на экалагічную тэму паводле прапанаваных схем.

1. [Мусіць, ═════ ───── ] або [ ═════ ───── ].
2. [ ───── ═════ ], і [ ───── ═════ ], але [ ───── ═════ ].
3. [ ═════ ───── ], затое [ ═════ ───── ].
4. Ці [ ═════ ───── ], ці [ ═════ ───── ].

**77.** Прачытайце тэкст. Вызначце, да якога стылю ён адносіцца, з якой мэтай напісаны і каму адрасаваны. Абгрунтуйце сваю думку. Падбярыце да тэксту загаловак.

Для белорусского пейзажа природа выбрала акварель, и чуть размытые родниковой водой краски оказались здесь самыми подходящими. В Беларуси нет резких контрастов и нет крутых гор, вулканов и каньонов. Границы её не омывают бурные моря, а ледя-


Правообладатель Национальный институт образования



ной Север и жаркие тропики находятся слишком далеко от нашей земли. В связи с этим она почти не знает разгула стихий.

И потому белый аист, которому нужен покой, родным берегом на востоке Европы признал Беларусь. Он не зимует у нас, но каждой весной, возвращаясь из тёплых краёв, возвещает о любви к Беларуси. Этот голубовато-зелёный край — его родина, а он — её символ. Символ миролюбия, тихой прелести и потаённо-мудрой силы *(По В. Ждановичу)*.

Якія фарбы падабраў аўтар, каб перадаць прыгажосць Беларусі?
Якую ролю адыгрываюць у тэксце складаназлучаныя сказы?
Запішыце тэкст па-беларуску. У складаназлучаных сказах падкрэсліце граматычныя асновы, вызначце сродкі сувязі частак і сэнсавыя адносіны паміж імі. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.
Разгледзьце малюнак. Ці адпавядае ён зместу тэксту?

## *Слоўнік*

родниковый — *крынічны*
самый подходящий — *самы прыдатны*
признать — *прызнаць, абраць*
возвещать — *абвяшчаць, паведамляць*
миролюбие — *міралюбнасць*
тихая прелесть — *сціпанае хараство*

**78.** Выканайце інтэрактыўнае заданне па тэме «Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназлучаных сказах»: размяркуйце складаназлучаныя сказы па групах у залежнасці ад пастаноўкі знакаў прыпынку.


Правообладатель Национальный институт образования

## § 12. Складаназлучаныя сказы са спалучальнымі злучнікамі

**79.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго кампазіцыйную будову.



Зялёныя травы
    пажухлымі сталі,
І цёмнаю
    светлая стала вада.
І дзікія гусі
    расстайна* крычалі,
Нібыта іх гнала
    якая бяда.
Іх крык усю ноч
    над зямлёю насіла,
І сын мой малы
    не зажмурыў павек,
Ён ціхенька раптам
    спытаўся пра крылы:
— Тата,
    дзе крылы падзеў чалавек?
Я доўга
    маўчаў вінавата.
Пакуль не прыдумаў
    банальны адказ...
А гусі расстайна
    крычалі над хатай,
Кружылі
    і
    клікалі нас.

*А. Пісьмянкоў.*

Пра якія крылы гаварылі сын і бацька? Як бы вы адказалі на пытанне хлопчыка?

Вызначце, якім паводле будовы з'яўляецца 1-ы сказ тэксту. Якія сэнсавыя адносіны выражае злучальны злучнік?

Паміж граматычнымі часткамі складаназлучанага сказа, звязанымі пры дапамозе злучнікаў ***і, ды*** (у значэнні ***і***), ***ні — ні***, могуць існаваць розныя адносіны: **адначасовасці, паслядоўнасці, прычыны** і **выніку.**



Правообладатель Национальный институт образования

Адначасовасць і паслядоўнасць дзеянняў перадаецца пры дапамозе злучніка ***і***. Напрыклад: [1)]*Стаяў калісь тут бор стары, і* [2)]*жыў лясун у тым бары* (М. Багдановіч) (значэнне адначасовасці з'яў). [1)]*А май ужо адбушаваў,* ***і*** [2)]*адгукала, мабыць, лета* (М. Стральцоў) (значэнне паслядоўнасці з'яў).

Злучнік ***і*** служыць і для перадачы прычынна-выніковых адносін паміж часткамі. Напрыклад: [1)]*Лес сякуць,* ***і*** [2)]*ад стуку сякер далей уцякаюць і птушка, і звер* (А. Вярцінскі) (птушка і звер уцякаюць, бо сякуць лес).

Пры дапамозе злучніка ***ды*** найчасцей перадаюцца адносіны адначасовасці. Напрыклад: [1)]*У ім* [небе] *хадзіў срэбраногі месяц* ***ды*** [2)]*пераліваліся такія яркія і пухнатыя зоры* (М. Лынькоў).

Калі часткі складаназлучанага сказа звязваюцца пры дапамозе злучніка ***ні — ні***, то ў іх пералічваюцца падзеі ці з'явы, якіх няма ці не можа быць. Напрыклад: ***Ні*** [1)]*зоркі не свецяць,* ***ні*** [2)]*месяц не паказваецца* (І. Гурскі).

**80.** Спішыце сказы, устаўляючы прапушчаныя літары і расстаўляючы знакі прыпынку. Вызначце, якія адносіны паміж часткамі перадаюцца пры дапамозе спалучальных злучнікаў (адначасовасці, паслядоўнасці, прычыны і выніку).

1. В..сенняя ночка, як стой, праляцела і раніца з неба ..плывае н..смела *(Я. Купала)*. 2. Хата нейкі час ра..чынена і холад лянівым белым мядзведзем коціцца па падлозе *(А. Кудравец)*. 3. І матылёк зноў круж..ць над ла..чынай і зноў на кветкі падае пч..ла *(В. Гардзей)*. 4. А пройдзе месяц-два і зноўку даймае клопа.. без канца *(М. Дукса)*. 5. Слабе..ць нашы к..рані і кроны меней пл..даносяць *(Л. Галубовіч)*. 6. Для нас цв..туць сады і агароды і жытнія звісаюць каласы *(Я. Купала)*. 7. І вёдры по..ныя вады і вочы по..ныя цяпла *(А. Пісьмянкоў)*. 8. У новым будынку трымаўся х..ладок і панавала цішыня *(І. Шамякін)*.

Знайдзіце фразеалагізм, які мае значэнне 'вельмі хутка'.


Правообладатель Национальный институт образования

**81.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль і тып. Падбярыце загаловак у адпаведнасці з асноўнай думкай.

Быў на вечары сустрэчы з выпускнікамі. Пакуль рыхтавалася ўрачыстая частка, я неўзаметку пакінуў кампанію і прайшоў школьным калідорам, пастаяў у класах… Тыя ж парты, дошкі, наглядныя дапаможнікі.

Тое — і ўжо нешта няўлоўна іншае было ва ўсім. І калідор стаў, здаецца, нейкі вузейшы, і класны пакой нібыта паменшаў.

Школа… *(Не/ня)*раз, бывала, на а..іноце я перабіраў у пам..ці розныя эпізоды і сэрца агортвала ціхая журба і рабілася да бол.. шкада* гэтай *(непаўторна)*чароўнай пары́. Здавалася, сё..я многае рабіў бы *(па)*іншаму і не марнаваўся* б час.

Нешта падобнае хацелася сказаць мне і на ве́чары, калі мяне папрасілі выступіць. Выйшаў на сцэну — і разгубіўся. Ні словы не падбіраліся, ні думкі не ішлі. Гаварыў нешта нязвязнае, выдаваў нудныя* прапісныя ісціны… *(Паводле З. Прыгодзіча).*

Чаму, на вашу думку, у былога вучня не атрымалася выступленне?

Спішыце трэці абзац тэксту, раскрываючы дужкі, устаўляючы прапушчаныя літары і расстаўляючы знакі прыпынку. Вызначце, якія сэнсавыя адносіны існуюць паміж часткамі складаназлучаных сказаў.

Знайдзіце ў тэксце сказ, які адпавядае схеме ***Ні*** [ ____ ═══ ], ***ні*** [ ____ ═══ ].

Падрыхтуйце віншавальную прамову на Дзень настаўніка.

**82.** Прачытайце тэкст. Якое значэнне мае фразеалагізм *за круглым сталом*?

Фразеалагізм **за круглым сталом** звычайна ўжываецца пры словах «сустрэча», «нарада». Паходжанне гэтага фразеалагізма звязваецца з паданнямі пра легендарнага англійскага караля Артура. Круглы стол Артур атрымаў у падарунак ад свайго сябра і заступніка чарадзея Мерліна. *За круглым сталом усе рыцары былі роўныя. Размова вялася нязмушана.* Сустрэчай **за круглым сталом** сёння называюць нараду, усе ўдзельнікі якой маюць роўныя правы *(Паводле І. Шпадарука, В. Рудакоўскага).*

Якія значэнні маюць устойлівыя выразы *стол знаходак, адрасны стол*?

Перабудуйце выдзеленыя простыя сказы ў складаназлучаны з прычынна-выніковымі адносінамі паміж часткамі. Сказ запішыце, падкрэсліце граматычныя асновы. Назавіце сродак сувязі частак.



Правообладатель Национальный институт образования

**83.** Прачытайце выказванні беларускіх пісьменнікаў. Прадоўжыце выказванні, каб атрымаліся складаназлучаныя сказы са спалучальнымі адносінамі паміж часткамі.

1. І чарсцвее душа ад карозіі безадказных, бяздумных слоў *(В. Вітка)*. 2. Пралескі ўсіх лясоў і стужкі рэк я падарыла б маме *(Э. Агняцвет)*. 3. Сваімі дзецьмі цешыцца зямля і славіць дабрабыт[с] у росных гімнах *(Е. Лось)*. 4. Слова — жывы сувязны стагоддзяў, шырот і народаў *(П. Макаль)*.

Запішыце складзеныя вамі сказы. Вызначце граматычныя асновы, сродкі сувязі частак і сэнсавыя адносіны паміж імі. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

Падбярыце сінонім да слова *безадказны*.

**84.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль і тып. Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

В какой-то степени сложность конструкции предложения связана с его размером. Обычно сложные предложения длиннее простых. Но и простые предложения могут быть весьма большими по размеру. Это характерно для официальной речи.

Широкое употребление сложноподчинённых предложений в научной речи связано со строгой последовательностью и логичностью изложения. Для разговорной же речи более свойственна сочинительная связь. В разговорной речи сложные предложения есть, но они обычно отличаются простотой конструкции. Научная же речь характеризуется усложнённым синтаксисом *(По М. Кожиной)*.

## Слоўнік

длиннее простого — *даўжэйшы за просты*
весьма большой — *вельмі вялікі, завялікі*
изложение — *выклад, паведамленне*
разговорная речь — *гутарковае маўленне*
отличаться — *вызначацца*
усложнённый — *ускладнены*

Пабудуйце схему складаназлучанага сказа.



Правообладатель Национальный институт образования

## § 13. Складаназлучаныя сказы з супраціўнымі злучнікамі

**85.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго асноўную думку.

Характарам Янка Маўр быў спакойны, стрыманы, разважлівы. Ніколі, здаецца, не павышаў голасу.

— Як Вам гэта ўдаецца? — бывала, пытаўся я ў яго.

— Характар трэба выхоўваць, як і ўсе іншыя добрыя якасці чалавека, — адказаў ён. — У мяне звычайныя нервы і эмоцыі, але я прыглушаю іх свядомасцю. Зрабіў гэта раз, другі, а там і ў прывычку ўвайшло *(Паводле А. Якімовіча)*.

Якім быў Я. Маўр? Ці згодны вы з яго меркаваннем пра выхаванне характару?

Выпішыце з тэксту сказы з супраціўнымі злучнікамі. Для перадачы якіх сэнсавых адносін паміж часткамі яны служаць?

Часткі складаназлучанага сказа, паміж якімі існуюць супраціўныя адносіны, аб'ядноўваюцца пры дапамозе злучальных злучнікаў ***а, але, ды*** (у значэнні ***але***), ***толькі, затое, аднак.*** Напрыклад: [1]*Мне рукі азяблыя полымя грэла,* ***а*** [2]*роднае слова сагрэла душу* (С. Грахоўскі). [1]*Звіслі ўніз каласы і пад месяцам спяць,* ***толькі*** [2] *кроплі расы на вусах іх блішчаць* (А. Бачыла).

Супраціўныя злучнікі служаць для перадачы ***адносін супастаўлення*** ці ***супрацьпастаўлення*** з'яў, дзеянняў, прымет.

Пры супастаўляльных адносінах паказваецца адрозненне ці неадпаведнасць з'яў, дзеянняў, прымет у адной частцы складаназлучанага сказа ў параўнанні з другой. Напрыклад: [1]*Мне вечна бачыць сонца маладое,* ***а*** [2]*нада мной заўжды шумець барам* (П. Прыходзька). [1]*Поўнач пеўні пракрычалі,* ***але*** [2]*не спіць маці* (Я. Колас).

Калі змест адной часткі рэзка супрацьпастаўляецца зместу другой, то паміж імі існуюць адносіны супрацьпастаўлення. Напрыклад: [1]*Нам нічога не відаць,* ***затое*** [2]*яны* [фашысты] *зверху аглядаюць усе нашы пазіцыі, траншэі* (В. Быкаў). [1]*Ірка паказвала сваю спрытнасць,* ***а*** [2]*мой кожны крок выходзіў нязграбным* (І. Грамовіч).



Правообладатель Национальный институт образования

**86.** Спішыце сказы, устаўляючы прапушчаныя літары і расстаўляючы знакі прыпынку. Вызначце, якія сэнсавыя адносіны выражаюцца паміж часткамі складаназлучаных сказаў.

1. Ла..чыць і лечыць чалавечую[м] душу часіна згоды ў прыродзе але найлепшая згода для чалавека — згода з самім с..бой, са сваім сумле..ем *(М. Стральцоў)*. 2. Народы розныя і мовы ды ўсіх адна з..мля галубіць *(А. Зэкаў)*. 3. Не хацелася выходзіць з дому ў такую непага..ь але ў мяне была патрэба наведаць знаёмага *(В. Вольскі)*. 4. Ідэі твораць чалавека а чалавек — тв..рэц ідэй *(М. Лужанін)*. 5. К ночы вец..р памалу сціхаў затое аднекуль з шумлівай цемра..і пачаў накрапваць до..дж *(В. Быкаў)*. 6. Добры ч..рпак з рэшата ды толькі з яго не піц..ё *(М. Танк)*.

Перабудуйце складаназлучаныя сказы ў простыя.

- З першага сказа выпішыце словы, у якіх колькасць гукаў і літар не супадае.

**87.** Прачытайце тэкст, устаўляючы замест пропускаў злучнікі ***а, але, ды, толькі, аднак***. Вызначце колькасць частак у тэксце.




Вясной 1916 года думка напісаць беларускую граматыку цалкам авалодала свядомасцю Браніслава Тарашкевіча.

Граматыка патрэбна была як паветра. Напісаць яе — гэта яго святы абавязак, ... неабходна многа працаваць. Праўда, нельга сказаць, што праца пачыналася на пустым месцы. Адзін з буйны́х беларусазнаўцаў Я. Ф. Карскі ў сваёй фундаментальнай працы «Беларусы» даследаваў і апісаў фанетыку беларускай мовы, яе марфалогію. Вучоны абагульніў вялікую колькасць фактычнага матэрыялу, ... яму штосьці перашкаджала завяршыць даследаванне.

Вучню ж свайму, Браніславу Тарашкевічу, Я. Ф. Карскі ахвотна дапамагаў у нялёгкай працы. А ў дапамозе малады вучоны меў вострую патрэбу. Малады даследчык абагульніў асноўныя факты, моўныя з’явы беларускай цэнтральнай гаворкі, ... яму патрэбна была дапамога ў выпрацоўцы беларускай лінгвістычнай тэрміналогіі.


Правообладатель Национальный институт образования

Граматыка Бранiслава Тарашкевiча складалася з пяцi невялiкiх раздзелаў i была прыстасавана перш за ўсё да практычнага выкарыстання ў школе. Аўтар свядома не ўскладняў матэрыял, ... напiсанне «больш навуковай граматыкi» было аднесена на лепшы час.

Сёння Бранiслаў Тарашкевiч — прызнаны ў свеце лiнгвiст, ... правапiс, унармаваны iм, ляжыць у аснове правапiсных норм беларускай лiтаратурнай мовы *(Паводле А. Лiса)*.

Што вы ведаеце пра асоб, якiя згадваюцца ў тэксце?

Спiшыце сказы, у якiх на месцы пропускаў трэба паставiць злучнiкi, падкрэслiце граматычныя асновы. Вызначце сродкi сувязi частак i сэнсавыя адносiны памiж iмi.

Разгледзьце фотаздымак. Што на iм адлюстравана? Калi выдадзена i каму адрасавана граматыка Б. Тарашкевiча?

**88.** Прадоўжыце прыказкi i запiшыце iх.

Не сена iдзе да казы

Усе бабры дабры

Трэба вучыцца кожнаму

Крылы дужэюць у палёце

**а, але, толькi**

выдра лiхая

талент — у рабоце

нельга вучыцца ў кожнага

каза да сена

Вызначце сэнсавыя адносiны памiж часткамi сказаў. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

**89.** Прачытайце. Растлумачце значэннi слоў. Выкарыстоўваючы пары слоў, складзiце складаназлучаныя сказы з супрацiўнымi адносiнамi памiж часткамi.

Абанент — абанемент, грэцкi — грэчаскi, глiнiсты — глiняны, фармiраваць — фармаваць, адрасат — адрасант, планiраваць — планаваць, аўтабiяграфiя — бiяграфiя.



Правообладатель Национальный институт образования

**90.** Прачытайце тэкст, размяшчаючы сказы першага абзаца ў адпаведнасці са схемамі. Вызначце стыль і тып тэксту. Растлумачце выбар загалоўка.

1. [ ═════ ───── ], а [ ═════ ]. 2. [ ═════ ───── ], толькі [ ───── ═════ ]. 3. [ ───── ], аднак [ ═════ ───── ].

### Лісце

Засохлае восеньскае лісце, аднак з кожным лістком у мяне звязана нешта дарагое сэрцу. На стале ў тонкай крыштальнай вазачцы стаіць лісце, толькі яно не зусім звычайнае. На двары гуляе мяцеліца, а ў мяне ў пакоі восенню пахне.

Вось ся..у на пні а ногі па калені патана..ць у ружовай пене верас.. . На паляне сола..ка пахне мёдам аднак пчолы чамус..ці не гудуць. Каля но.. стаіць кошык з грыбамі. Раптам бачу: павольна па́дае на зямлю адзінокі жоўты лісток. Б..розавы. Пэўна*(б)* не звярнуў увагі на яго[м] але на фоне *(цёмна)*зялёнага хвойнік.. нельга было не заўважыць гэтага з..лацістага пасланца восені. Я асцярожна ўзяў лісток паклаў яго ў кошык з гр..бамі і пакрочыў *(да)*дому *(Паводле Р. Ігнаценкі)*.

Спішыце другі абзац тэксту, раскрываючы дужкі, устаўляючы прапушчаныя літары і расстаўляючы знакі прыпынку. У складаназлучаных сказах падкрэсліце граматычныя асновы. Вызначце сродкі сувязі частак і сэнсавыя адносіны паміж імі.

Разгледзьце карціну В. Цвіркі «Прыпяць». Ці перадае яна змест тэксту? Што адлюстравана на карціне? На аснове карціны складзіце некалькі складаназлучаных сказаў з супраціўнымі адносінамі паміж часткамі.





Правообладатель Национальный институт образования

## § 14. Складаназлучаныя сказы з размеркавальнымі злучнікамі

**91.** Прачытайце тэксты-жарты. Да якога стылю яны адносяцца? Абгрунтуйце сваю думку.

### I. Гультай

Быў калісь у нашым сяле вельмі лянівы чалавек, гультай, па мянушцы Дубей.

*Адным днём ён ляжаў на печы не то сумны, не то задуменны.* Раптам прыбягае сусед і крычыць:

— Дубей, твая хата гарыць!

— Ну, — адказвае, — і як ты не ленаваўся гаварыць?

### II. Здзіўленне

Дзеці падбеглі да бацькі, каб нешта цікавае яму паведаміць. *То сынок дзеліцца навінамі, то дачушка нешта стракоча.*

— Ціха вы, сарачаняты! Няхай хто з вас адзін гаворыць, а то ж я не магу адразу абаіх слухаць.

— А хіба ты, татка, на адно вуха дрэнна чуеш? *(З народнага)*.

Знайдзіце ў выдзеленых сказах злучнікі, вызначце іх разрад паводле значэння і ролю ў сказах.

Размеркавальныя адносіны паміж часткамі ў складаназлучаным сказе перадаюцца пры дапамозе адзіночных злучнікаў ***ці, або*** і паўторных ***ці — ці, або — або, то — то, ці то — ці то, не то — не то***.

Адзіночныя і паўторныя злучнікі ***ці, або*** і ***ці — ці, або — або*** ўжываюцца для перадачы адносін ***узаемавыключэння*** паміж часткамі складазлучанага сказа (згаданыя ў адной частцы з'ява, падзея, дзеянне поўнасцю выключаюць з'яву, падзею ці дзеянне, што згадваюцца ў другой частцы). Напрыклад: [1)]*Над возерам кружылі чайкі* ***або*** [2)]*зрэдку з крыкам пралятала варона* (Т. Хадкевіч). ***Ці*** [1)]*ў верасах іскрыцца павуціна,* ***ці*** [2)]*руні зелянее аксаміт* (К. Кірэенка). ***Або*** [1)]*відная ноч стаіць над лесам,* ***або*** [2)]*займаецца на дзень* (А. Якімовіч).



Правообладатель Национальный институт образования

Паўторныя злучнікі ***ці — ці***, ***то — то*** служаць для выражэння паміж часткамі адносін ***пералічэння*** ці ***чаргавання***. Напрыклад: ***То*** [1]*свяціла ясным сонцам вера*, ***то*** [2]*нявер'е кідала ў адчай* (П. Панчанка). ***Ці*** [1]*там сасну выслухвала жаўна*, ***ці*** [2]*на вяршку падругу клікаў голуб?* (М. Лужанін).

Злучнікі ***ці то — ці то***, ***не то — не то*** ўжываюцца для перадачы паміж часткамі значэння ***меркавання***. Напрыклад: ***Ці то*** [1]*галінка трэснула*, ***ці то*** [2]*птушка спрасонку крыллем устрапянула* (З. Бядуля). ***Не то*** [1]*сякера мерна чэша*, ***не то*** [2]*хтосьці кашляе і брэша* (Я. Колас).

**92.** Прачытайце. Выпішыце складаназлучаныя сказы.

1. То салавей зальецца ўдала, то шпак пасобіць ценарком *(П. Броўка)*. 2. Ёсць у мяне адна ці то добрая, ці то дрэнная рыса — упартасць *(А. Федарэнка)*. 3. І вятры, ад сцюжы ашалелыя, то журботна свішчуць, то равуць *(П. Панчанка)*. 4. Ці дзяцел застукае дзе на сасне, ці шышка пакоціцца з елкі наніз, ці пройдзе, павольна ступаючы, ліс, ці заяц праскочыць па свежым сняжку *(П. Глебка)*. 5. У карых вачах чалавека свяцілася[с] не то хітрынка, не то прарывалася лёгкая ўсмешка *(М. Лынькоў)*. 6. Ці то птушкі спяваюць у гаі, ці то вецер свішча сваю песню *(У. Дубоўка)*. 7. Буду пець я свае песні ці то ў будні, ці то ў святы *(Я. Купала)*.

Падкрэсліце граматычныя асновы ў выпісаных сказах. Вызначце, з якімі простымі сказамі суадносяцца часткі складаназлучаных сказаў. Якія адносіны існуюць паміж гэтымі часткамі?

Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

● Выпішыце з 3-га сказа дзеепрыметнік, пакажыце, як ён утварыўся.

**93.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль і тып.

— Сцэна — месца асноўнага тэатральнага дзеяння, — паведаміла настаўніца.

— Давайце я раскажу, — прапанавала Валя. — Мы былі на экскурсіі ў *(В/в)*ялікім тэатры *(Б/б)*ел..русі і нам ра..казвалі.


Правообладатель Национальный институт образования

Сцэна тэатра а..сталявана па апошн.. слов.. т..хнікі. Яна падобная да робата*(трансформ..ра)* а яе плошча — 597 квадратных метр.. . Сцэна складаецца з 21 пл..цоўкі і кожная з іх можа ці падымацца амаль на 5 метраў над узроўн.. сцэны ці апускацца на гл..біню больш за 3 метр.. . *Не то там ёсць спецыяльныя люкі-правалы не то нейкія фуры там стаяць...*

— Люкі-правалы, — удакладніла настаўніца, — дапамагаюць артыстам хутка з'яўляцца на сцэне або знікаць. А фуры — гэта накладныя падлогі з паваротным кругам. Пры іх дапамозе або акцёры круцяцца адносна глядзельнай залы, або дэкарацыі перамяшчаюцца.

— А яшчэ... — хацела працягнуць Валя.

— Пачакай, Валянціна, — перапыніла настаўніца. — Прапаную вам заданне: на сайце Вялікага тэатра Беларусі знайдзіце інфармацыю пра тое, чым адметная сцэна гэтага тэатра *(Паводле А. Радзікевіч)*.

Як афіцыйна называецца Вялікі тэатр Беларусі? Якія оперы ці балеты, прысвечаныя гісторыі Беларусі, у пастаноўцы гэтага тэатра вы ведаеце?

Запішыце аповед Валі, раскрываючы дужкі, устаўляючы прапушчаныя літары і расстаўляючы знакі прыпынку. Колькасна-іменныя спалучэнні запішыце словамі.

У складаназлучаных сказах вызначце сродкі сувязі частак і адносіны паміж часткамі. Складзіце схему выдзеленага сказа.

Выканайце заданне настаўніцы з прачытанага тэксту. Раскажыце пра сцэну Вялікага тэатра Беларусі, ужываючы складаназлучаныя сказы.

**94.** Прачытайце тэкст, размяркоўваючы складаназлучаныя сказы чацвёртага абзаца ў адпаведнасці са схемамі. Вызначце колькасць частак у тэксце.

1. [Як ..., ____ ===== ], але [ ____ ===== ].
2. Ці [ ____ ===== ], ці [ ____ ===== ].
3. То [ ____ ===== ], то [ ____ ===== ].

### Кош смецця

Паездку ў грыбы запланавалі яшчэ вечарам.

У лесе дождж накрапваў зусім рэдкі, і перашкодай для грыбнога палявання ён ніколечкі не быў. Але як ні стараўся Лёшка, як ні пераглядаў кожную травінку, нічога не знаходзіў.



Правообладатель Национальный институт образования

Хлопец пайшоў далей. А найлепшыя памагатыя не толькі пільны зрок, але і добрыя ногі. Хацеў разагнацца, але позірк выхапіў нешта бялюткае каля старой бярозы. *Ці то белы гры.. прыхава..ся ці то сырае..ка лісцікам прыкрылася.* Падышоў бліжэй і разгледзеў поліэтыленавы пакет, а побач з ім ляжала металічная бляшанка з-пад кансерваў. Лёшка загарнуў бляшанку ў пакет і паклаў у кошык. Не пакідаць жа смецце ў лесе.



Як на злосць, грыбы не трапляліся на вочы, але погляд спыніўся на нечым іншым. То пластмасавыя бутэлькі згрувашчаны ў кучы, то пластыкавыя стаканчыкі параскіданы. Ці чарговы пакет ляжыць ледзь не праз кожную сотню крокаў, ці металічная бляшанка валяецца.

Хлопец добра ведае, якую шкоду наносіць смецце навакольнаму асяроддзю. Ён і ў горадзе наладжвае суботнікі[сл]. Вось нядаўна палову дня ў нядзелю правёў у Севастопальскім парку. І бутэлькі збіраў, і шмат іншай драбязы да сметніц перанёс.

Калі хлопец вярнуўся да машыны, мама з дзядулем былі ўжо там з двума кошыкамі грыбоў. Яны ўсё зразумелі *(Паводле А. Карлюкевіча)*.

Чаму хлопец збіраў смецце? Якая карысць ад збору смецця паасобку? Абгрунтуйце сваю думку.

Запішыце чацвёрты абзац тэксту, захоўваючы логіку размяшчэння сказаў. Назавіце сродкі сувязі граматычных частак складаназлучных сказаў і вызначце тып сэнсавых адносін паміж імі.

● Запішыце выдзелены сказ. Растлумачце напісанне арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку ў ім. Складзіце схему сказа.

Разгледзьце фотаздымак. Пры асвятленні якой тэмы яго можна выкарыстаць як ілюстрацыю?

**95.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль. Вусна перакладзіце тэкст на беларускую мову. Падбярыце да яго загаловак.

Синтаксический анализ предложения начинается с определения количества частей. Необходимо правильно определить количество частей, чётко разграничить их. При этом возможны следующие



Правообладатель Национальный институт образования

ошибки: 1) простое предложение принимается за сложное (выделяется большее количество грамматических частей); 2) сложное предложение принимается за простое (выделяется меньшее количество частей). *В первом случае за самостоятельную часть ошибочно могут приниматься причастный, деепричастный и сравнительный обороты, но они только осложняют какую-либо из частей, выступая в роли обособленных членов предложения.* Следует помнить, что главный критерий при определении количества частей следующий: в предложении столько частей, сколько в нём грамматических основ. Поэтому синтаксический разбор всегда начинается с поиска главных членов предложения (или одного главного члена) *(По Е. Долбик).*

Запішыце па-беларуску выдзелены сказ. Падкрэсліце граматычныя асновы, пабудуйце схему сказа.

**96.** Карыстаючыся «Слоўнікам моўных і маўленчых тэрмінаў», паўтарыце тэарэтычны матэрыял пра ўскладнены сказ. Як адрозніць просты ўскладнены сказ ад складанага?

Са сродкаў масавай інфармацыі выпішыце прыклады простага ўскладненага сказа.

**97.** Прачытайце тэкст. Растлумачце, чаму ён мае такую назву.

**Клён**

Клён рос сярод такіх жа як і ён дрэў каліс..ці вельмі даўно паса..аных уздоўж старога вузен..кага за..улка горада. Увесну сады і кветнікі цудо..на расцв..талі. Усюды спявалі птушкі і стракаталі конікі. А двары напа..няліся звонкімі дзіцячымі г..ласамі. Клён быў старым але дужым а па сва..й прыгажосці ён вызначаўся сярод усіх дрэў гэтага за..улка. Дзеці бега..чы па тратуары мімаволі любаваліся старым клёнам а ён хаваў іх ад летн..й спёкі. І здавалася, што так будзе заўсёды.

Але час ішоў. Дзеці падрасталі, а іх бацькі старыліся. А горад рос, і яго ўжо[м] не задавольвалі старэнькія вузенькія вулачкі. Жыхароў драўляных хат пачалі перасяляць у новыя добраўпарадкаваныя кватэры, а іх хаты пастулова знеслі. Цяпер клён жыў зусім адзін, і побач з ім не засталося ніводнага старога дрэва. Але ні халодныя вятры яго не сагнулі, ні сонца не асмаліла.


Правообладатель Национальный институт образования

Аднойчы ўвесну да яго падышоў стары з палачкай. Ён пагладзіў ствол дрэва, агледзеўся навокал і сказаў:

— Так, нікога ўжо тут няма, толькі ты, дзед, адзін застаўся з майго маленства.

Ад гэтых слоў старога клён страпянуўся, і яго лісцікі зашамацелі. З таго дня клён зразумеў, што ён не самотны... *(Паводле Т. Дамаронак)*.

Дзе рос клён? Чаму ён узрадаваўся сустрэчы са старым чалавекам?

Спішыце першы абзац тэксту, устаўляючы прапушчаныя літары і расстаўляючы знакі прыпынку. Назавіце часткі складаназлучаных сказаў, будова якіх адпавядае простым ускладненым сказам. Абгрунтуйце сваю думку.

Зрабіце сінтаксічны разбор двух складаназлучаных сказаў з другога абзаца (на выбар) (парадак і ўзор разбору змешчаны ў Дадатку, с. 202).

● Знайдзіце ў тэксце зваротак. Растлумачце яго ролю ў маўленні.

Выкарыстоўваючы матэрыял тэксту, паразважайце на тэму «Маё маленства».

**98.** Размяркуйце сказы па групах: а) са спалучальнымі; б) з супраціўнымі; в) з размеркавальнымі адносінамі паміж часткамі. Запішыце сказы, устаўляючы прапушчаныя літары і расстаўляючы знакі прыпынку. Абгрунтуйце свой выбар.

1. У ..ачах тваіх іскрыцца сонца поўня, а мае аве..ны сіняю смугой *(А. Звонак)*. 2. І салоўка да..но не сп..вае і туман разаслаўся густы *(В. Вабішчэвіч)*. 3. Не то самалёт у вышын.. гудзіць не то машына нейкая грукоч.. *(З. Бядуля)*. 4. Слухачы засм..яліся але іх смех быў прыязны *(І. Мележ)*. 5. Крані глыбей з..мныя жылы і казачны пабач..ш край *(М. Танк)*. 6. У камінк.. гудзе вятрыска[л] і бор за вокнамі шуміць *(Р. Баравікова)*. 7. То возера ў багн.. ляжыць то рэчка як сту..ка удалеч бяжыць[сн] *(А. Астрэйка)*.

Пабудуйце схемы 2-3 сказаў (на выбар).

**99.** Прачытайце тэкст. Падбярыце да яго загаловак у адпаведнасці з асноўнай думкай. Вызначце колькасць частак у тэксце.

Старая хроніка данесла да нас горкую гісторыю. Тэўтоны захапілі землі прусаў і старая прус..кая мова паступова знікла. І вось на турнір паэтаў-сп..вакоў прыйшоў апошні прус..кі сп..вак і паэт. Ён сп..ваў дзівосныя песні пра под..вігі про..каў пра кахан..е і смеласць пра вернасць і дружбу. Ён апяваў прыгажосць сва..й з..млі



Правообладатель Национальный институт образования

але яго н..хто не разумеў. Яму нават не далі ма..чымасці дасп..ваць а р..цары рагаталі як ашалелыя.

Глыбокі сэнс гэтай гісторыі зразумелы. Чалавек забыў мову продкаў, і ён не можа спаўна праявіць сябе.[сн]

У новы час знікненне немагчыма для кожнай развітой мовы. Ян Баршчэўскі ў дзевятнаццатым стагоддзі напісаў па-польску «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях», але мала хто з такой выразнасцю[с] паказаў побыт беларуса, псіхічны склад ягонай душы, яго нацыянальны характар і саму Беларусь. Адам Міцкевіч пісаў па-польску, аднак яго творы страката перасыпаны мноствам беларускіх слоў.

Мова неўміручая. Бо мова — душа народа, і толькі на ёй можа народ найбольш поўна выказаць сябе *(Паводле У. Караткевіча)*.

Чаму ніхто не разумеў песні прускага спевака?

Калі ў свеце адзначаецца Міжнародны дзень роднай мовы?

Якое слова з тэксту мае значэнне ‘спаборніцтва’?

Спішыце першы абзац тэксту, устаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары і расстаўляючы знакі прыпынку. Падкрэсліце граматычныя асновы ў складаназлучаных сказах, назавіце сродкі сувязі частак і сэнсавыя адносіны паміж імі.

На аснове тэксту складзіце складазлучаныя сказы са злучнікамі ***ні — ні, толькі***, ***ці то — ці то***.

Выпішыце з тэксту апорныя словы. Вусна перакажыце тэкст.

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Якія сказы называюцца складаназлучанымі? Прывядзіце прыклады.
2. Якія сродкі сувязі выкарыстоўваюцца паміж часткамі складаназлучанага сказа?
3. Раскажыце пра пастаноўку знакаў прыпынку ў складаназлучаным сказе. Прывядзіце прыклады.
4. Якія адносіны могуць выражацца паміж часткамі складаназлучанага сказа пры дапамозе спалучальных, супраціўных і размеркавальных злучнікаў? Прывядзіце прыклады.
5. Уявіце, што вы выступаеце на навуковай канферэнцыі з дакладам «Складаназлучаныя сказы ў беларускім фальклоры». Па якіх прыметах вы будзеце выбіраць складаназлучаныя сказы з тэкстаў вуснай народнай творчасці?

Падрыхтуйце вуснае паведамленне на тэму «Складаназлучаныя сказы ў сучаснай беларускай мове».



Правообладатель Национальный институт образования

# Складаназалежныя сказы: будова, значэнне, ужыванне

## § 15. Паняцце пра складаназалежны сказ

**100.** Прачытайце тэкст. Дайце яму загаловак, які перадаваў бы тэму тэксту.

Вясной і ў першай палове лета, ідучы па гарадскіх вуліцах, можна пачуць кароценькую звонкую песеньку, якую не заглушае нават грукат буйнога горада. Калі ўважліва агледзішся па баках, то заўважыш і самога спевака. Гэта рудахвостка-чарнушка.

Выглядае гэта невялічкая птушачка вельмі імпазантна: усё цела самца попельна-шэрае, галава, горла і грудка чорныя, ніз цела і хвост рудыя. Самка афарбавана больш сціпла: яна ўся буравата-шэрая, з рудым хвастом.



Для жыцця гэтай птушачцы патрабуецца дрэва, на якім самец мог бы выконваць сваю песеньку, і ніша на каменным будынку для пабудовы гнязда.

Песенька, якую старанна выконвае чарнушка, складаецца з дзвюх частак. Першая частка — ціхія траскучыя гукі, быццам нехта сыпануў на стол жменю гароху. Яе можна пачуць, калі знаходзішся побач са спеваком. Другая частка — кароткая звонкая трэлька. Яна даносіцца да слухачоў, якія знаходзяцца далёка ўнізе. Чуваць гэту частку песні за сто метраў ад высачэзнага крана, на самым версе якога ўладкаваўся спявак *(Паводле В. Зуёнка)*.

Карыстаючыся прыведзенай у тэксце інфармацыяй, растлумачце, чаму птушка атрымала такую назву. Ці адпавядае малюнку прыведзенае ў тэксце яе апісанне?

Выпішыце з тэксту складаназалежныя сказы. Вызначце ў іх галоўную і даданую часткі.

Чым адрозніваецца складаны сказ ад простага?

Назавіце сродкі сувязі частак складанага сказа.



Правообладатель Национальный институт образования

**Складаназалежны сказ** — гэта сказ, у якім адна з граматычных частак падпарадкоўваецца другой і звязваецца з ёй пры дапамозе падпарадкавальнага злучніка ці злучальнага слова.

У складзе складаназалежнага сказа вылучаюць **галоўную** (сінтаксічна незалежную) і **даданую** (залежную) часткі. Даданая частка можа паясняць у галоўнай слова, словазлучэнне або адносіцца да ўсёй галоўнай часткі.

Даданая частка можа стаяць перад, пасля або ў сярэдзіне галоўнай часткі.

Напрыклад:

1. [1)]*Хоць адразу стала ціха,* [2)]*Дубадзел не спяшаўся гаварыць* (І. Мележ). — Даданая частка *хоць адразу стала ціха* стаіць перад галоўнай часткай і паясняе ўсю галоўную частку.




2. [1)]*Стадыён здаваўся Сямёну Міхайлавічу велізарнай чашай,* [2)]*якую да краёў запаўнялі стракатыя ручайкі балельшчыкаў* (А. Камароўскі). — Даданая частка *якую да краёў запаўнялі стракатыя ручайкі балельшчыкаў* стаіць пасля галоўнай часткі і паясняе ў ёй слова *чашай*.




3. [1)]*У ваколіцах вёскі Селішча,* [2)]*куды прыехаў Рыгорка на зімовыя канікулы да дзеда Хведара,* [1)]*вельмі многа такіх зручных для лыжнікаў узгоркаў* (Т. Хадкевіч). — Даданая частка *куды прыехаў Рыгорка на зімовыя канікулы да дзеда Хведара* стаіць у сярэдзіне галоўнай часткі і паясняе спалучэнне слоў *вёскі Селішча*.






Правообладатель Национальный институт образования

**101.** Спішыце складаназалежныя сказы. Пастаўце пытанне ад галоўнай часткі да даданай. Пабудуйце схемы сказаў.

Узор. [1)]*Раману неабходна было затрымацца яшчэ на некалькі дзён,* [2)]*каб падтрымаць сястру і брата.*

з якой мэтай?

[ ], (*каб*…).

1. Работа яму падабалася, бо давала шмат вольнага часу *(М. Касцюкевіч)*. 2. Раптам каля грэблі плюхнуліся ў ваду дзве-тры невялікія жывёліны, падобныя да выдры, якую хлопцы бачылі раней *(Я. Маўр)*. 3. Маладыя людзі, захопленыя ўсім гэтым відовішчам, не заўважылі, як неўзабаве апынуліся на сярэдзіне вадаёма *(Д. Пятровіч)*. 4. Коннікі спыніліся, каб не спалохаць звера, і сталі чакаць *(У. Караткевіч)*. 5. І без лішніх размоў ухапіў Мішка абедзвюма вулей і кінуўся з ім наўцёкі, туды, дзе стаяў яго трэцім батальён *(М. Лынькоў)*. 6. На свята, калі збіраліся госці, гаспадыня даставала з куфра абрус *(М. Маляўка)*.

**102.** Складзіце складаназалежныя сказы па прапанаваных схемах. Запішыце.

1. [ ], (*таму што*…).

2. (*Калі*…), [ ].

3. [ , (*якая*…), ].

4. [ ], (*дзе*…).

5. (*Хоць*…), [ ].

**103.** Пісьмова перакладзіце тэкст на беларускую мову.

Костёр разгорелся! Генка подпрыгнул от радости и повесил над кострищем котелок, наполненный родниковой водой. Сегодня он был дежурным поваром, а ребята отправились в ближайшую деревню на закупку продуктов. Правда, Нина и Рита, которые героически поднялись чуть свет, успели начистить картошки. Генке оставалось только её измельчить и забросить в кипяток. А приготовить ему предстояло грибной суп. Грибы собирали вчера всем лагерем. Вот они, очищенные и промытые, дожидаются в походной алюминиевой



Правообладатель Национальный институт образования

миске. Генка всыпал в котёл пару горстей перловки и стал крошить лисички с маслятами. Когда заправил ими суп, принялся нарезать колечками лук. Луковицы от золотой кожуры очищать не стал, надеясь, что это в какой-то мере предохранит его от слёз.

Ветерок тоже поучаствовал в приготовлении блюда, когда шевельнул ветки сосен и закинул в котёл щепотку пахучих сосновых игл *(По С. Кряжевой)*.

## Слоўнік

кострище — *вогнішча*
ребята — тут: *хлопцы і дзяўчаты*
чуть свет — *на досвітку, на золку*
измельчить — *скрышыць*
предстояло — *трэба было*
горсть — *жменя*
кожура — *лупíна*
предохранить — *засцерагчы*
щепотка — *дробка*

У тэксце перакладу знайдзіце складаназалежныя сказы, падкрэсліце ў іх граматычныя асновы.

**104.** Утварыце з простых сказаў складаназалежныя. Запішыце. Пабудуйце схемы складаназалежных сказаў.

У з о р. *Ад гарачыні ажно плавілася паветра. Верабейкі схаваліся ў свой домік і не вылазілі з яго.* — [1)]*Верабейкі схаваліся ў свой домік і не вылазілі з яго,* [2)]*бо ад гарачыні ажно плавілася паветра.*

па якой прычыне?

[ × ], (*бо*…).

1. На ўвесь свет праславіліся слуцкія паясы. Іх ткалі з шаўковых, залатых і сярэбраных нітак *(М. Маляўка)*. 2. Мама і бабуля завіхаліся на кухні. Праз гадзіну прыйдуць школьныя сябры Данілы, аднакласнікі *(Г. Васілеўская)*. 3. Сяргейка першы кінуў пошукі. У яго ўжо не было ні сілы, ні жадання *(М. Корзун)*. 4. На беразе раслі высокія магутныя дубы. Лісце[ф] на іх яшчэ не пажаўцела, трымалася *(Я. Галубовіч)*. 5. Дзяўчынка паглядзела ўверх. Па сінім небе плылі шэрыя аблокі *(М. Бусько)*.


Правообладатель Национальный институт образования

**105.** Спішыце складаназалежныя сказы, устаўляючы прапушчаныя сродкі сувязі частак. Пастаўце пытанне ад галоўнай часткі да даданай.

У з о р. *Жабы вясною выдаюць такія канцэрты* (я к і я?), *што сталічнаму аркестру і не сніліся* (У. Ліпскі).

1. Міколка хацеў прагнаць коціка, але ўспомніў, ... сам шмат разоў не даваў Мурзіку паспаць *(Т. Крэнь)*. 2. Мне захацелася, ... мяне зразумеў хоць адзін чалавек *(А. Крэйдзіч)*. 3. У гасцініцу мы вярталіся, ... было ўжо зусім светла *(Н. Гальпяровіч)*. 4. Фарту́х — паясная адзежа, ... надзявалі спераду на спадніцу *(М. Маляўка)*. 5. Праз нейкі час выбраўся на ўзлесак, ... сярод жаўталістых бярозак стаяла невялічкая альтанка *(Я. Галубовіч)*. 6. Можна ўявіць, ... балелі жаночыя рукі летам на жніве[м] *(М. Маляўка)*.

Які знак прыпынку ставіцца паміж галоўнай і даданай часткамі складаназалежнага сказа?

У складаназалежным сказе паміж галоўнай і даданай часткамі с т а в і ц ц а **коска**. Напрыклад: *Сон мяне зморвае толькі на світанні, калі пачынаюць ужо добра шарэць вокны* (А. Васілевіч).

Калі даданая частка стаіць у сярэдзіне галоўнай, яна в ы д з я л я е ц ц а **коскамі з двух бакоў**. Напрыклад: *Арцёмка паказаў на страказзу, што шклянымі крыльцамі заблыталася ў павуціне, і кінуўся яе вызваляць* (М. Бусько).

**106.** Спішыце сказы, расстаўляючы знакі прыпынку. Пазначце лічбамі граматычныя часткі складаназалежных сказаў.

1. Закружыўся паміж дрэў рой таго лісця якое восень ужо спаліла сваім дыханнем *(І. Шамякін)*. 2. Між тым над полем і ляском што ўжо зачарнеўся наперадзе патроху пачало світаць *(В. Быкаў)*. 3. Калі алешнік расступіўся вачам адкрылася шырокая і гразкая ўпадзіна залітая вадой *(В. Гардзей)*. 4. У свой вольны час Якім Каваль імчаў у родную вёску каб душой зліцца з прыродай з краскамі ў полі з птушыным шчабятаннем[сл] *(С. Давідовіч)*. 5. Хатка дзе я адпачываю летам самая крайняя ў вёсцы *(А. Бадак)*. 6. Ён яшчэ цэлую гадзіну чакаў на станцыі пакуль прыйшоў поезд *(Я. Колас)*.



Правообладатель Национальный институт образования

**107.** Прачытайце тэкст. Растлумачце, як адрозніць падпарадкавальны злучнік ад злучальнага слова. У якасці прыкладаў выкарыстайце сказы з папярэдняга практыкавання або прывядзіце ўласныя прыклады.

Сродкамі сінтаксічнай сувязі частак складаназалежнага сказа з'яўляюцца падпарадкавальныя злучнікі і злучальныя словы. У ролі злучальных слоў выступаюць адносныя займеннікі (*які*, *чый*, *хто*, *што* і інш.) і прыслоўі (*дзе*, *адкуль*, *калі*, *як* і інш.).

Для таго каб адрозніць падпарадкавальны злучнік ад злучальнага слова, трэба кіравацца наступным:

- злучнік не з'яўляецца членам сказа, а злучальнае слова з'яўляецца. Напрыклад: 1. *Павел паабяцаў сыну, **што** яны абавязкова прыйдуць да мяне ў наступныя выхадныя, на Новы год* (К. Хадасевіч-Лісавая). Злучнік ***што*** не з'яўляецца членам сказа. 2. *Толькі мох, **што** ўсю восень цвіў зялёнымі купінамі на старых хатах і гумнах, цяпер зрабіўся жаўтлявы* (В. Адамчык). Злучальнае слова ***што*** (адносны займеннік) з'яўляецца дзейнікам;
- злучальнае слова ў даданай частцы можна замяніць словам з галоўнай часткі. Напрыклад: *Сустрэліся зноў у горадзе, у медыцынскім тэхнікуме, **дзе** Люба вучылася на адным курсе з Сашай* (І. Шамякін). Злучальнае слова ***дзе*** (прыслоўе) можна замяніць назоўнікам ***(у) тэхнікуме***;
- злучальныя словы могуць размяшчацца не толькі ў пачатку даданай часткі, але і ў сярэдзіне яе. Напрыклад: *Высокія дрэвы ў глыбіні яра, вяршаліны **якіх** амаль дасягалі мастка, былі напалову ў вадзе* (У. Федасеенка);
- злучальнае слова можа ўжывацца з прыназоўнікам. Напрыклад: *Я прыгледзелася і ўбачыла сцежку, **па якой** мы ішлі ўчора праз дзюны* (М. Прохар).

**108.** Прачытайце тэкст. З якой мэтай ён напісаны?

Прыкладна пяць тысяч гадоў таму **чалавек** пачаў прыручаць дзікіх катоў. Першымі **ацанілі** ўсе вартасці гэтай жывёлы старажытныя егіпцяне. І жылося катам у Егіпце тады вельмі добра. З імі абыходзіліся так, быццам толькі ад іх залежала шчасце ў кожным доме. Калі ўспыхваў пажар, катоў з дому выносілі раней за ўласных дзяцей.


Правообладатель Национальный институт образования

Менавіта кошка ўвасабляе **егіпецкую** багіню радасці і весялосці Бастэт, якая мела выгляд жанчыны з галавой гэтай жывёліны. Радзімай Бастэт лічыцца горад Бубасціс. Калі прыкладна ў дзевяцьсот пяцідзясятым годзе да нашай эры там пабываў грэчаскі гісторык Герадот, то ён убачыў цудоўны храм даўжынёй трыста метраў. Пасярод самай вялікай і прыгожай залы стаяла **метровая** статуя багіні. А вакол па ўсім храме бегалі тысячы катоў, якіх даглядаў спецыяльна прызначаны для гэтага жрэц. І таго, хто б паквапіўся* на жыццё хоць аднаго ката, самога магла чакаць смерць. Таму ж, хто спрабаваў **вывезці** ката з Егіпта ў іншыя краіны, пагражаў вельмі вялікі штраф *(Паводле А. Бадака)*.

Выпішыце з тэксту складаназалежныя сказы. Пазначце падпарадкавальныя злучнікі *(зл.)* і злучальныя словы *(зл. сл.)*. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

- Назавіце арфаграмы ў выдзеленых словах.

**109.** Выканайце інтэрактыўнае заданне па тэме «Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназалежных сказах»: размяркуйце складаназалежныя сказы па групах у залежнасці ад пастаноўкі знакаў прыпынку.

**110.** Спішыце сказы, устаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары і расстаўляючы знакі прыпынку. Падкрэсліце злучальныя словы як члены сказа.

1. Андрэй рас..казаў што скончыў музычнае вучылішча але па спецы..льнасці не працаваў *(М. Кукуць)*. 2. Лабановіч зрушыў з месца і па..шоў у той бок куды пал..цеў і зараз жа знік магутны поезд *(Я. Колас)*. 3. Я пав..рнуў галаву і ўбачыў высокую стройную дз..ўчыну з доўгімі светлымі в..ласамі якія вольна рас..ыпаліся саламяным[м] д..жджом па яе пл..чах *(М. Прохар)*. 4. Каб сабраць адзін кілаграм н..ктару пч..ле даводзіцца абл..цець да пяцідз..сяці тыс..ч кветак! *(А. Бадак)*. 5. Аляўціна мыла ..акно паглядвала на ..уліцу дзе туды-сюды насіліся прыгожыя легкавушкі *(З. Дудзюк)*. 6. Душа заўсёды пра́гне кнігі бо без яе яна абдзелен..ая *(Я. Сіпакоў)*.

- Да слоў *светлы, прыгожы* падбярыце аднакаранёвыя словы, якія адносяцца да розных часцін мовы.


Правообладатель Национальный институт образования

# § 16. Складаназалежныя сказы з дададанай азначальнай часткай (сродкі сувязі, знакі прыпынку)

**111.** Вусна адкажыце на пытанні.

Які член сказа называецца азначэннем?

На якія пытанні адказвае азначэнне?

Якімі часцінамі мовы звычайна выражаюцца азначэнні? Прывядзіце прыклады.

Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах:

Паўлік выскачыў з хаты з акрайчыкам цёплага яшчэ хлеба, шчодра пасыпанага буйной соллю *(В. Кадзетава)*.

Паўлік выскачыў з хаты з акрайчыкам цёплага яшчэ хлеба, які быў шчодра пасыпаны буйной соллю.

**Даданыя азначальныя часткі** характарызуюць прадмет ці раскрываюць прымету прадмета, пра які паведамляецца ў галоўнай частцы.

Даданыя азначальныя часткі адказваюць на пытанні я к і? я к а я? я к о е? я к і я? і звязваюцца з галоўнай часткай пры дапамозе падпарадкавальных злучнікаў ***што, каб, як, нібы, быццам*** і злучальных слоў ***які, каторы, чый, што, дзе, куды, адкуль, калі***.

Даданая азначальная частка можа знаходзіцца пасля галоўнай часткі або ў сярэдзіне яе.

Напрыклад:

1. [1]*Жыта наблізілася* ***да той*** *самай-самай маладой* ***пары́***, [2]*калі яно ўжо не трава, але яшчэ і не хлеб* (В. Казько).




2. [1]*На жаль,* ***тэрмін,*** [2]*на працягу якога шпакі радуюць нас сваімі спевамі,* [1]*даволі кароткі* (В. Зуёнак).






Правообладатель Национальный институт образования

**112.** Прачытайце складаназалежныя сказы. Назавіце ў іх галоўную і дададную часткі. Укажыце ў галоўнай частцы слова (спалучэнне слоў), якое паясняе дададная частка. Пастаўце пытанне ад галоўнай часткі да дададнай. Вызначце сродкі сінтаксічнай сувязі частак.

1. Нябачная сцежка, якой яны ішлі, прывяла да высокай зламанай бярозы над самым адхонам *(У. Караткевіч)*. 2. Яна вырашыла пайсці па тых ціхіх вуліцах, дзе яны некалі часта гулялі з Раманам *(У. Федасеенка)*. 3. Рэчка Лясная густа аплецена лазняком, адкуль толькі ў засушлівае лета адыходзіць вада *(У. Сітуха)*. 4. Быў якраз той час, калі жанчыны могуць пастаяць ля студні, пагаварыць *(У. Саламаха)*. 5. Ад рашучасці, якая з'явілася раніцай, да вечара не засталося і следу *(Т. Пяшко)*. 6. І, нягледзячы на чэрвень, у сівізне лісця вербаў, што тужліва выцягнуліся[с] ўздоўж вясковай вуліцы, праглядвала жаўцізна *(Н. Касцючэнка)*.

**113.** Перабудуйце простыя сказы з адасобленымі азначэннямі ў складаназалежныя сказы з дададзенымі азначальнымі часткамі. Запішыце, пабудуйце схемы сказаў.

1. Я адклала ўбок ліст, спісаны прыгожым настаўніцкім почыркам *(Т. Бунта)*. 2. Элегантную даўгахвостую сароку, апранутую ў чорна-белы фрак, не зблытаеш ні з кім іншым *(В. Зуёнак)*. 3. Згасалі апошнія вокны, расквечаныя фіранкамі* ўсіх фасонаў *(М. Касцюкевіч)*. 4. Над вадой, нагрэтай пасля дзённай спякоты, ледзь бачнай смугой клубілася па́ра, адбіраючы цяпло *(М. Кукуць)*. 5. На ўскрайку нерухома стаялі старыя бярозы, злёгку прыпудраныя серабрыстай шэранню *(Я. Курто)*. 6. І рака, заціснутая лёдам, не вытрымала, трэснула, уздыбіўшы грувасткія крыгі *(А. Камароўскі)*.

**114.** Прачытайце тэкст. Дайце яму загаловак, які перадаваў бы тэму тэксту.

Толькі што пра..шоў кароткі дождж. Я перачакаў яго стоячы пад клёнам што рос на беразе Свіслачы.

Над ку́палам цырка выбліснула со..нца. Яно запаліла агнём лужыну якая была ад мяне метраў за дзес..ць. Да яе *(не)*зв..ртаючы на мяне н..якай увагі валюхалася дзікая качка з трым.. качанятамі. Яны за..шлі ў лужыну і выц..гнуўшы шыі пачалі прагна піць д..жджавую в..ду.



Правообладатель Национальный институт образования

Калі ўсе напіліся качка пав..ла малых назад. На беразе яна спынілася прапусціла качанят да *(цёмна)*з..лёнай в..ды Свіслачы і паплыла за імі...

Я стаяў і гл..дзеў *(у)*след *(Паводле А. Шлега)*.

Падбярыце сінонімы да слова *валюхалася*. У якіх стылях маўлення дапускаецца яго ўжыванне?

Дайце імя герою апавядання і запішыце тэкст ад трэцяй асобы. Устаўце, дзе трэба, прапушчаныя літары, раскрыйце дужкі, пастаўце знакі прыпынку.

Пазначце лічбамі складаназалежныя сказы з дададзенымі азначальнымі часткамі, пабудуйце іх схемы.

**115.** Прачытайце тэкст. Вызначце від сувязі сказаў у тэксце.

Дзед Міхась звычайна рабіў прыпынак ля крынічкі, што паціху бруіла сярод зялёных густалістых алешын. Падышоўшы да крынічкі, дзядуля развязваў торбачку, у якой ляжаў няхітры полудзень, раскладваў яго на чыстым кужалі. Пасля даставаў з-пад алешын гліняны гладыш, напаўняў яго крынічнай вадой і з асалодай піў. Напіўшыся, дзед задаволена прыгладжваў сівую бараду, на валасках якой зіхацелі празрыстыя пацеркі-кроплі, і перадаваў гладыш Міколку.

— Пі, хлопча, ды ведай, што смачнейшай за гэту вадзіцу не знойдзеш ва ўсім белым свеце.

І Міколка піў сцюдзёную ваду, піў усмак, аж пакуль не заходзіліся ад холаду зубы *(Паводле Я. Бяганскай)*.

Выпішыце з тэксту складаназалежныя сказы з дададзенымі азначальнымі часткамі. Пабудуйце іх схемы.

Чаму збан без ручкі ў беларускай мове называецца *гладыш*?

## § 17. Складаназалежныя сказы з дададзенай дапаўняльнай часткай (сродкі сувязі, знакі прыпынку)

**116.** Вусна адкажыце на пытанні.

Які член сказа называецца дапаўненнем?

На якія пытанні адказвае дапаўненне?

Ад якога члена сказа звычайна залежыць дапаўненне?

Якімі часцінамі мовы звычайна выражаюцца дапаўненні? Прывядзіце прыклады.



Правообладатель Национальный институт образования

**Даданыя дапаўняльныя часткі** адказваюць на пытанні ўскосных склонаў.

З галоўнай часткай даданыя дапаўняльныя часткі звязваюцца пры дапамозе падпарадкавальных злучнікаў ***што, каб, як, нібы, быццам, ці*** і злучальных слоў ***што, хто, які, чый, колькі, дзе, куды, адкуль, калі, як***.

Даданая дапаўняльная частка звычайна дапаўняе дзеяслоў-выказнік галоўнай часткі. Напрыклад: [1)]*Тоня* ***зразумела****,* [2)]*што гутарка скончылася,* [1)]*і незадаволена ўздыхнула* (К. Хадасевіч-Лісавая).




Даданая дапаўняльная частка можа таксама раскрываць змест дапаўнення галоўнай часткі, выражанага займеннікам. Напрыклад: [1)]*Усё нібы ў тую раніцу спрыяла* ***таму****,* [2)]*каб мы сустрэліся з табою* (М. Стральцоў).




**117.** Спішыце сказы, расстаўляючы знакі прыпынку. У галоўнай частцы падкрэсліце як член сказа слова, якое паясняе даданая частка. Пастаўце пытанне ад галоўнай часткі да даданай. Дакажыце, што гэта складаназалежныя сказы з даданымі дапаўняльнымі часткамі.

1. Серж бачыў што Насця на вялікім перапынку[сл] нешта паклала ў парту *(К. Чорны)*. 2. Я хацеў каб Стася звярнула ўвагу на наш смех на мяне *(І. Навуменка)*. 3. Ядвіся слухае як шумяць за акном дрэвы *(М. Лынькоў)*. 4. Ніна хадзіла па хаце з кутка ў кут не ведала куды прыкласці рукі *(У. Саламаха)*. 5. Папярэдзіўшы гаспадароў кватэры што едзе да бацькоў аж да восені Максім сабраў рэчы і паехаў у вёску *(В. Шніп)*. 6. Хто ведае колькі выдатных твораў не дайшло да нас?! *(А. Клышка)*.

Знайдзіце фразеалагізм, які мае значэнне ‘заняцца чым-небудзь, пачаць рабіць што-небудзь’.


Правообладатель Национальный институт образования

**118.** Прачытайце тэкст. Абгрунтуйце яго падзел на абзацы.

## Нёман-мастак

Мне вядомыя карціны, намаляваныя не рукой чалавека. Малюе іх рака майго дзяцінства — Нёман. Немагчыма прадказаць, калі да яго прыйдзе[ф] натхненне. Але ў сярэдзіне лета варта прайсціся па пясчаным мелкаводдзі і праверыць, ці ўзяўся Нёман за пэндзаль.

Спярша на прыбярэжную паласу мастак старанна наносіць тонкі слой рачнога ілу, які паступова цвярдзее, высыхае на сонцы. Але пакуль што складана сказаць, ці будзе рака працягваць сваю працу над карцінай.

Праз некалькі дзён уся прыбярэжная паласа пакрылася сакавітай зелянінай. Па лугавіне падняліся жоўтыя кветачкі дзьмухаўцоў. Цяпер можна з упэўненасцю сцвярджаць, што раку наведала натхненне.

Калі ж вам хочацца ўбачыць карціну ва ўсёй красе, тады дайце мастаку пабыць сам-насам з сабою тыдні два-тры. Затым завітайце сюды ў самае ранне, як толькі рассеецца туман. Майстар ужо заканчвае карціну, аздабляе траўку іскрыстымі расінкамі-пацеркамі.

Калі вы надумаецеся запрасіць сяброў палюбавацца гэтым харраством, у вас можа нічога не атрымацца. Вада адыдзе ад берага ці, наадварот, залье ўсю мясціну, схаваўшы карціну. Але не варта траціць надзеі, што наступным летам мастак Нёман, натхнёны сонцам і вадою, возьмецца за стварэнне новай непаўторнай карціны *(Паводле М. Бусько).*

Выпішыце з тэксту складаназалежныя сказы з дадзенымі дапаўняльнымі і азначальнымі часткамі. Пабудуйце іх схемы.

Якія карціны, створаныя прыродай, вам даводзілася назіраць? Вусна апішыце адну з іх.

**119.** Перабудуйце сказы з простай мовай у складаназалежныя сказы з дадзенымі дапаўняльнымі часткамі, запішыце.

Узор. *«Дай мне тут павесляваць», — папрасіў унук. — Унук папрасіў, каб яму далі тут павесляваць.*

***Звярніце ўвагу!***

Пры замене сказа з простай мовай складаназалежным сказам асабовыя займеннікі і дзеясловы 1-й і 2-й асобы трэба перадаваць ад імя аўтара; зваротак або становіцца членам сказа ў галоўнай частцы, або апускаецца.


Правообладатель Национальный институт образования

1. Неўзабаве каля мяне спыніўся хлопчык гадоў васьмі і спытаў: «Што вы робіце?» *(Р. Ігнаценка)*. 2. «Захварэла я, сынок», — сказала мама *(К. Хадасевіч-Лісавая)*. 3. Пра чалавека з дрэннай памяццю кажуць: «Галава як рэшата» *(М. Маляўка)*. 4. «Косцік мне не прабачыць», — апусціўшы галаву, прашаптаў Дзімка *(Г. Скаржынская)*. 5. «Хлопцы! — крыкнуў я. — Акружайце дом» *(У. Караткевіч)*. 6. «Што вы хацелі, малады чалавек?» — спытала пажылая аптэкарка ў цёмных акулярах *(В. Гардзей)*.

Якая частка складаназалежнага сказа — галоўная ці дададая — перадае словы аўтара?

Назавіце фразеалагізмы з кампанентам *рэшата*, якія маюць наступныя значэнні: а) ‘рабіць што-небудзь безвынікова, заведама ўпустую’; б) ‘штосьці незвычайнае, неверагоднае’.

**120.** Складзіце складаназалежныя сказы з дададзенымі дапаўняльнымі часткамі па прапанаваных схемах. Запішыце.

што?
1. [дзеяслоў], (*як*…).

камy?
2. [таму, (*у каго*…), ].

каго?
3. [таго], (*хто*…).

пра што?
4. [дзеяслоў, (*каб*…), ].

## § 18. Складаназалежныя сказы з дададай акалічнаснай часткай месца (сродкі сувязі, знакі прыпынку)

**121.** Вусна запоўніце прабелы ў лінгвістычным паведамленні.

Даданы член сказа, які абазначае характар дзеяння ці розныя абставіны, пры якіх адбываецца дзеянне, называецца … . У сказе акалічнасці звычайна адносяцца да … . Паводле значэння акалічнасці падзяляюцца на наступныя віды: … .

Акалічнасць месца адказвае на пытанні … . Звычайна акалічнасць месца выражаецца прыслоўем (напрыклад, …) або спалучэннем назоўніка з прыназоўнікам (напрыклад, …).


Правообладатель Национальный институт образования

**Даданыя акалічнасныя часткі месца** ўказваюць на месца дзеяння, пра якое паведамляецца ў галоўнай частцы.

Даданыя акалічнасныя часткі месца адказваюць на пытанні д з е? к у д ы? а д к у л ь? і звязваюцца з галоўнай часткай пры дапамозе злучальных слоў ***дзе, куды, адкуль***.

Даданая акалічнасная частка месца паясняе дзеяслоў-выказнік галоўнай часткі або акалічнасць месца, выражаную прыслоўямі ***тут, там, туды, адтуль, адсюль, усюды*** і інш.

Напрыклад:

1. 1)***Закіпела*** *праца дружная,* 2)*дзе палеткі залацістыя* (А. Русак).




2. 1)*Першыя няўдачы прыйшлі* ***адтуль,*** 2)*адкуль Соня іх не чакала* (М. Кукуць).




**122.** Выпішыце складаназалежныя сказы з даданымі акалічнаснымі часткамі месца. Пабудуйце схемы сказаў.

1. На захадзе, там, дзе зусім нядаўна было відно сонца, ускочыла маленькае воблачка *(І. Чыгрынаў)*. 2. Зачаравана глядзеў я маладымі вачыма на прыгожы куток Магілёўшчыны, дзе мне давялося пачынаць сваю настаўніцкую працу *(П. Кавалёў)*. 3. Наперадзе, куды яны ехалі, зайшоўся кулямёт, моцна[м], на ўвесь лес *(І. Пташнікаў)*. 4. Не рабіце сакрэтаў там, дзе іх няма *(І. Шамякін)*. 5. У цемры шамацеў лістотай сад, дзе змешваліся вострыя пахі восеньскіх кветак *(Т. Мушынская)*. 6. Алесь углядаўся туды, дзе з-за далёкага лесу падымалася сонца *(М. Ільючык)*. 7. Там змяшчалася школа, дзе жыў і вучыў дзяцей Турсевіч *(Я. Колас)*.

У якім значэнні ўжыты прыметнік *вострыя* ў 5-м сказе? Прывядзіце прыклады ўжывання гэтага прыметніка ў іншых значэннях.



Правообладатель Национальный институт образования

**123.** Перабудуйце простыя сказы ў складаназалежныя, замяняючы выдзеленыя словазлучэнні дададзенымі часткамі. Запішыце сказы, у дужках укажыце від дададзенай часткі.

У з о р. *Птушкі штодзень прылятаюць сюды,* ***на кукурузнае поле.*** — *Птушкі штодзень прылятаюць сюды,* ***дзе раскінулася кукурузнае поле*** (дададзеная акалічнасная частка месца).

1. Палаткі раскінулі на ўскрайку сяла на прыгожым поплаве, **сярод зялёнай травы і маленькіх стракатых кветак** *(Л. Адамовіч)*. 2. Хлапчукі хуценька сцягнулі на ваду лодку і паплылі назад, **у сваю прыазёрную вёску** *(А. Капусцін)*. 3. У выхадныя дні сюды, **на гэты зялёны астравок**, прыходзіць нямала людзей — дзетвары, дарослых *(З. Прыгодзіч)*. 4. Я любіў спыняцца тут, **у канцы гэтай маленькай гарадской плошчы, каля дзвюх таполяў** *(М. Прохар)*.

**124.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

Хотите, чтобы ваше желание исполнилось? Приходите вечером на улицу Советскую в Бресте, туда, где установлены символические часы. И ждите волшебника в мундире петровских времен и с железной лестницей на плече. Это фонарщик. Загадав желание, дотроньтесь до пуговицы на мундире — и всё обязательно сбудется.

В Бресте возродили старинную традицию — зажигать на главной пешеходной улице керосиновые фонари. Необычный ритуал, который привлекает жителей и гостей Бреста, сразу стал визитной карточкой города *(По А. Митюкову)*.

## Слоўнік

фонарщик — *ліхтаршчык*
керосиновый — *гáзавы, гáзны*

У тэксце перакладу знайдзіце складаназалежныя сказы. Вызначце віды дададзеных частак.

**125.** Складзіце і запішыце складаназалежныя сказы з прыведзенымі дададзенымі часткамі. У дужках укажыце від дададзенай часткі.

1. ..., дзе раслі цюльпаны і нарцысы. 2. ..., адкуль чуліся звонкія дзіцячыя галасы, ... . 3. ..., куды імчаў цягнік, ... . 4. Дзе летась пачалося будаўніцтва стадыёна, ... . 5. ... , куды накіраваліся турысты.


Правообладатель Национальный институт образования

## § 19. Складаназалежныя сказы з даданымі акалічнаснымі часткамі часу і ўмовы (сродкі сувязі, знакі прыпынку)

**Даданыя акалічнасныя часткі часу** ўказваюць на час дзеяння, пра якое паведамляецца ў галоўнай частцы.

Даданыя акалічнасныя часткі часу адказваюць на пытанні к а л і? я к д о ў г а? д а я к о г а ч а с у? з я к о г а ч а с у? і звязваюцца з галоўнай часткай пры дапамозе падпарадкавальных злучнікаў ***калі, як, пакуль, толькі, як толькі, ледзь, ледзь толькі, пасля таго як, перад тым як, у той час як, да таго часу як.***

Даданая акалічнасная частка часу паясняе выказнік галоўнай часткі, спалучэнне выказніка са словамі ***ў той час, да таго часу, пасля таго*** або акалічнасць часу, выражаную прыслоўямі ***тады, заўсёды, датуль*** і інш.

Напрыклад:

1. [1]*Так **спрачаліся** яны,* [2]*пакуль не прайшло першае ўражанне ад няшчасця* (Я. Маўр).




2. [1]*Гэтае пытанне не давала Ярмолаву спакою нават і **тады**,* [2]*калі ён выйшаў з маленькага стандартнага вакзала і накіраваўся ў вайсковы гарадок* (А. Кулакоўскі).




**126.** Выпішыце складаназалежныя сказы з даданымі акалічнаснымі часткамі часу, пабудуйце іх схемы.

1. Здарылася гэта неспадзявана, калі з памяці пачалі ўжо сплываць паціху малюнкі дзяцінства *(А. Крэйдзіч)*. 2. І раней бывалі выпадкі, калі тут хаваліся незнаёмыя людзі *(А. Асіпенка)*. 3. Стома і сон агортваюць мяне адразу, як толькі я кранаюся галавою падушкі *(А. Васілевіч)*. 4. Святам быў дзень, калі бацька ці дзядзька[ф] Антось


Правообладатель Национальный институт образования

прывозілі ў Нясвіж торбу з сялянскім падмацункам *(М. Маляўка)*. 5. Гэта здарылася ў той час, калі людзі ваявалі з лукамі і стрэламі *(Л. Адамовіч)*. 6. Амаль адразу пасля таго, як дзверы за мачыхай зачыніліся, святло ў акенцы згасла *(І. Мележ)*.

**Даданыя акалічнасныя часткі ўмовы** ўказваюць на ўмову, пры якой адбываецца дзеянне, названае ў галоўнай частцы.

Даданыя акалічнасныя часткі ўмовы адказваюць на пытанне п р ы  я к о й  у м о в е? і звязваюцца з галоўнай часткай пры дапамозе падпарадкавальных злучнікаў ***калі, як, каб, раз.***

Даданая акалічнасная частка ўмовы звычайна паясняе ўсю галоўную частку. Напрыклад:

[1)]*Сяргейка быў бы выдатнікам,* [2)]*калі б людзі не прыдумалі на яго галаву граматыкі* (У. Шахавец).

п р ы  я к о й  у м о в е?

[ ], (*калі б*...).

**127.** Запішыце спачатку складаназалежныя сказы з даданымі акалічнаснымі часткамі ўмовы, потым — з даданымі часу. Пастаўце знакі прыпынку.

1. Самай ранічкай калі сонца ледзь-ледзь пачало паказвацца з-за гарызонту я падаўся ў лес *(Я. Галубовіч)*. 2. Калі сінічка знойдзе схованку закрытую ад ветру з усіх бакоў прачнецца здаровай і вясёлай *(М. Бусько)*. 3. У нядзельку раненька ледзь толькі зайграла чырвань[сл] на ўсходзе Лабановіч сядзеў ужо на сене ў драбінах* і выязджаў з вёскі *(Я. Колас)*. 4. Адна пчала ўскочыла нават у рот Антосю калі ён нешта гаварыў і паспела куснуць яго за язык *(С. Давідовіч)*. 5. Нават калі я хвалююся то заўсёды выглядаю знешне спакойным *(М. Прохар)*. 6. Калі б я быў мастаком і захацеў намаляваць гэты вечар дык пакарыстаўся б толькі трыма фарбамі сіняй жоўтай і трохі шэрай *(А. Федарэнка)*.

**128.** Прачытайце тэкст. Дакажыце, што ён адпавядае тыповай схеме разважання.

Жывучы побач з намі, вароны аператыўна прыстасоўваюцца да «льгот», якія людзі, самі таго не жадаючы, прапануюць птушкам.


Правообладатель Национальный институт образования

Няма матэрыялу для пабудовы гнязда? Падыдзе і алюмініевы дрот. *Няма чым перакусіць? А смеццевы кантэйнер з харчовымі адходамі? Прыціснулі маразы? Дык ёсць жа трубы цеплатрас і цёплыя каналізацыйныя люкі!* Варона знойдзе выйсце з любой сітуацыі *(Паводле С. Зуёнка)*.

Запішыце тэкст, утвараючы з выдзеленых простых сказаў складаназалежныя сказы з дадзенымі акалічнаснымі часткамі ўмовы.

Узор. *Няма матэрыялу для пабудовы гнязда? Падыдзе і алюмініевы дрот. — Калі няма матэрыялу для пабудовы гнязда, вароне падыдзе і алюмініевы дрот.*

**129.** Перабудуйце простыя сказы ў складаназалежныя, замяняючы адасобленыя акалічнасці дадзенымі акалічнаснымі часткамі. Запішыце сказы, у дужках укажыце від дадзенай часткі.

Узор. *Гледзячы на імклівую плынь ракі, Соня ўпершыню з глыбокім расчараваннем задумалася пра сваё жыццё. — Калі Соня глядзела на імклівую плынь ракі, то ўпершыню з глыбокім расчараваннем задумалася пра сваё жыццё* (дадзеная акалічнасная частка часу).

1. Цяпер, убачыўшы сонца, клёнікі цягнуліся ўгору кожнай галінкай *(М. Сліва)*. 2. Атрымаўшы атэстат, Шурка рашыла пайсці працаваць на завод *(Т. Пяшко)*. 3. Падышоўшы да хаты, мы расчаравана спыніліся *(А. Марціновіч)*. 4. Пад'ехаўшы да школы, Лабановіч выскачыў з драбінак і ўзышоў на ганак *(Я. Колас)*. 5. Зайшоўшы на двор і паклаўшы мех каля карыта, бабка заспяшалася ў хату *(В. Хомчанка)*. 6. Пераплыўшы раку, я пайшоў па сцяжынцы *(І. Пяшко)*.

**130.** Прачытайце тэкст. У якім сказе заключаецца яго асноўная думка?

Беларус за стагоддзі добра навучыўся арыентавацца ў шэрагу з'яў і падзей, якія змяняліся ў яго на вачах, і па іх прадказваць надвор'е. Ён уважліва назіраў за станам прыроды, думаў, разважаў, параўноўваў. Найперш, вядома, глядзеў на неба.

Чырвоны золак пры захадзе сонца — надвор'е пагоршыцца. Вясёлка пасля дажджу знікае хутка — можна чакаць яснага надвор'я. Зоркі зімою яркія — чакай марозу.



Правообладатель Национальный институт образования

І па расе мы вызначалі надвор’е. Ноччу выпала шмат расы — будзе яснае надвор’е. На досвітку[л] няма ні расы, ні туманаў — рыхтуйся да дрэннага надвор’я *(Паводле Я. Сіпакова)*.

Запішыце тэкст, перабудоўваючы бяззлучнікавыя складаныя сказы ў складаназалежныя.

У з о р. *З’яўляюцца дзве ці тры яркія вясёлкі адразу — дождж будзе зацяжны. — Калі з’яўляюцца дзве ці тры яркія вясёлкі адразу, дождж будзе зацяжны.*

Вызначце віды дадзеных частак у складаназалежных сказах.

## § 20. Складаназалежныя сказы з дададымі акалічнаснымі часткамі прычыны і мэты (сродкі сувязі, знакі прыпынку)

**Дададныя акалічнасныя часткі прычыны** раскрываюць прычыну таго, пра што паведамляецца ў галоўнай частцы.

Дададныя акалічнасныя часткі прычыны адказваюць на пытанні ч а м у? п а я к о й п р ы ч ы н е? і звязваюцца з галоўнай часткай пры дапамозе падпарадкавальных злучнікаў ***бо, таму што, паколькі, як, што, а то, з-за таго што, ад таго што***.

Дададная акалічнасная частка прычыны паясняе выказнік галоўнай часткі або спалучэнне выказніка са словамі ***таму, ад таго, з-за таго***.

Напрыклад:

1. [1)]*Максім* ***любіць*** *дажджлівае надвор’е,* [2)]*бо падчас дажджу ў яго заўсёды творчы настрой* (В. Шніп).




2. [1)]*А золатам нафту* ***называюць таму***, [2)]*што вельмі ж яна каштоўная і патрэбная* (У. Ліпскі).






Правообладатель Национальный институт образования

**131.** Прачытайце тэкст. Раскрыццю якой думкі ён падпарадкаваны?

### Нашы святыні

Ніякая дзяржава не можа існаваць без сваіх святынь, бо святыні — надзейны і трывалы падмурак любой дзяржавы.

Святыні вечныя, бо яны для ўсіх пакаленняў.

Святыні нельга знішчыць, бо яны ў душы.

Святыні нельга ўкрасці, бо, нават украўшы, ты ўсё роўна не будзеш іх мець. Калі нешта маеш, хочацца яго паказаць іншым. А як пакажаш украдзеную святыню?!

Таму і знікла бясследна падчас апошняй вайны ці не самая дарагая для Беларусі святыня — Крыж Ефрасінні Полацкай, зроблены Лазарам Богшам яшчэ ў 1161 годзе *(Паводле Я. Сіпакова).*

Якія святыні беларускага народа вы ведаеце?

Знайдзіце ў тэксце складаназалежныя сказы з дададзенымі акалічнаснымі часткамі прычыны. Назавіце ў іх галоўную і даданую часткі. У галоўнай частцы ўкажыце член сказа, які паясняе даданая частка.

**Даданыя акалічнасныя часткі мэты** паказваюць на мэту або прызначэнне таго, пра што паведамляецца ў галоўнай частцы.

Даданыя акалічнасныя часткі мэты адказваюць на пытанні з якой мэтай? для чаго? навошта? і звязваюцца з галоўнай часткай пры дапамозе падпарадкавальных злучнікаў ***каб, абы, для таго каб, з тым каб.***

Даданая акалічнасная частка мэты паясняе выказнік галоўнай часткі або спалучэнне выказніка са словамі ***для таго, з тым.***

Напрыклад:

1. 1)*Каб прывабіць буслоў,* 2)*гаспадар **зацягвае** на дрэва ці на край гумна старую барану* (М. Маляўка).

з якой мэтай?

(*Каб...*), [ × ].

2. 1)*Не **для таго** мы **гадавалі** дзяцей,* 2)*каб яны пад старасць нам не памагалі* (І. Грамовіч).

для чаго?

[ × ], (*каб...*).



Правообладатель Национальный институт образования

**132.** Выпішыце спачатку складаназалежныя сказы з дадзенымі акалічнаснымі часткамі мэты, потым — з дадзенымі прычыны. Пастаўце знакі прыпынку.

1. Каб чым заняць наведвальніцу прапанавала ёй Люда альбом з чорна-белымі здымкамі розных гадоў *(К. Сосна)*. 2. Стары Тамаш такія паездкі ладзіў яшчэ таму што спачуванне да Стасіка меў асаблівае *(А. Карлюкевіч)*. 3. З цяжкасцю расплюшчваю вочы бо за акном толькі пачынае світаць і бачу перад сабой у матчыных руках сподак з буйнымі[л] клубніцамі *(А. Бадак)*. 4. Раней каб перамагчы ў любой вайне трэба было абавязкова захапіць замак *(Я. Сіпакоў)*. 5. Такія студні звычайна накрываюць шчыльным драўляным або бляшаным да́шкам каб у іх не траплялі пыл дождж і снег *(М. Маляўка)*. 6. Бацькі́ прыездам сына былі задаволеныя бо дома хапала працы і каля хаты і ў полі *(В. Шніп)*.

**133.** Прачытайце тэкст. Ці ёсць у ім канцоўка?

Шурка ціха, каб нікога не разбудзіць, пайшла на кухню.

Круп, каб згатаваць якую-небудзь кашу, яна не знайшла. Нават хлеба, каб зрабіць бутэрброд, не было. Затое яна знайшла дзясятак буйных бульбін, адшукала сярод посуду і тарку*. Абабрала бульбу, памыла ў місцы, на тарцы падзерла клубні, на патэльні на алеі спякла горку дранікаў.

Потым усю ўвагу скіравала на сервіроўку. Шурцы хацелася, каб на стале стала прыгожа... *(Паводле Т. Пяшко)*.

Знайдзіце ў тэксце складаназалежныя сказы, вызначце віды дадзеных частак. Складзіце і запішыце працяг тэксту (3-4 сказы), апісаўшы сервіроўку стала. Выкарыстайце складаназалежныя сказы.

**134.** Дапішыце сказы так, каб атрымаліся складаназалежныя сказы з дадзенымі акалічнаснымі часткамі прычыны і мэты.

1. У цёмны час сутак пешаход павінен абазначыць сябе святлозваротным элементам, ... . 2. Падчас руху аўтамабіля пасажыр павінен быць прышпіленым рамянямі бяспекі, ... . 3. Нельга адцягваць увагу вадзіцеля, ... . 4. Падчас руху аўтамабіля нельга адчыняць дзверы, ... .

- Знайдзіце ў сказах назоўнікі, што ўжываюцца толькі ў форме множнага ліку.



Правообладатель Национальный институт образования

**135.** Прачытайце тэкст. Дайце яму загаловак, выкарыстоўваючы словы з тэксту.

Неяк у суботу я ўскінуў на плечы рукзак і падаўся ў лес. Цікаўная вавёрачка цэлую гадзіну скакала за мной па галінках дрэў. Каб пачаставаць яе дастаў з кішэні жменьку семак і высыпаў на пянёк.

Блукаў па лесе доўга. Стаміўся і сеў на пень каб крыху перакусіць але рукзак не паспеў зняць з плячэй. На пні дзе я прымасціўся і на іншых пнях дружнымі сямейкамі раслі апенькі з ладнымі жоўта-карычневымі шапачкамі і цвёрдымі карычнева-бурымі ножкамі. Нават восенню не заўсёды натрапіш на такое багатае грыбное царства. Праз якія паўгадзіны я набраў цэлы рукзак апенек. Прыкмеціў гэта месца каб вярнуцца сюды яшчэ раз.

Ішоў дамоў і думаў пра вавёрачку якая скакала за мною. Яна напэўна ведала дзе раслі апенькі і хацела паказаць мне тое месца. Якая разумніца! *(Паводле Я. Галубовіча).*

Спішыце тэкст, расстаўляючы знакі прыпынку. У складаназалежных сказах з дадзенымі акалічнаснымі часткамі мэты пазначце лічбамі галоўную і дадзеную часткі.

Чаму грыбы апенькі атрымалі такую назву?

Растлумачце розніцу ў лексічных значэннях слоў *цікаўны* і *цікавы*.

- Растлумачце правапіс ужытых у тэксце складаных прыметнікаў.

## § 21. Складаназалежныя сказы з дадзенымі акалічнаснымі ўступальнай і параўнальнай часткамі (сродкі сувязі, знакі прыпынку)

**136.** Вусна адкажыце на пытанні.

На якое пытанне адказвае акалічнасць уступкі?
Прывядзіце прыклад простага сказа з акалічнасцю ўступкі.

Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах.

| | |
|---|---|
| Нягледзячы на пастаянныя вандроўкі, пераезды, у кватэры Мурашкевіча заўсёды панаваў адносны парадак *(Д. Пятровіч).* | Нягледзячы на тое што Мурашкевіч пастаянна вандраваў і пераязджаў, у яго кватэры заўсёды панаваў адносны парадак. |

- Да якіх часцін мовы адносяцца словы *нягледзячы на, нягледзячы на тое што*?



Правообладатель Национальный институт образования

**Дадзеныя акалічнасныя ўступальныя часткі** паведамляюць пра з'явы і падзеі, якія адбываюцца насуперак таму, пра што гаворыцца ў галоўнай частцы.

Дадзеныя акалічнасныя ўступальныя часткі адказваюць на пытанне н я г л е д з я ч ы  н а  ш т о? і звязваюцца з галоўнай часткай пры дапамозе падпарадкавальных злучнікаў ***хоць (хаця), хай (няхай), нягледзячы на тое што***.

Дадзеная акалічнасная ўступальная частка паясняе ўсю галоўную частку. Напрыклад:

[1)]*Шурка змагла здаць экзамены,* [2)]*хаця да іх амаль не рыхтавалася* (Т. Пяшко).

н я г л е д з я ч ы  н а  ш т о?

[ ], (*хаця*...).

Падпарадкавальны злучнік *нягледзячы на тое што* можа ўваходзіць цалкам у дадзеную частку, а можа раздзяляцца ў залежнасці ад сэнсу сказа. У першым выпадку коска ставіцца перад злучнікам у поўным яго складзе, у другім — перад другой часткай злучніка (першая частка злучніка ўключаецца ў склад галоўнай часткі). Напрыклад:

1. [1)]*Усё ж час здаваўся нам бясконца доўгім,* [2)]***нягледзячы на тое што*** *ў дарозе мы амаль не змаўкалі* (А. Жук).

н я г л е д з я ч ы  н а  ш т о?

[ ], (*нягледзячы на тое што*...).

2. [1)]***Нягледзячы на тое,*** [2)]***што*** *хлопцы пасварыліся,* [1)]*яны не перасталі сябраваць* (Б. Мікуліч).

н я г л е д з я ч ы  н а  ш т о?

[*Нягледзячы на тое*, (*што*...), ].

Дадзеная акалічнасная ўступальная частка можа звязвацца з галоўнай пры дапамозе спалучэнняў слоў ***як бы ні, дзе б ні, куды б ні, хто б ні*** і інш. Напрыклад: [1)]***Як бы ні*** *развівалася тэхніка,* [2)]*конь быў і застаецца надзейным памочнікам селяніна* (У. Ліпскі).



Правообладатель Национальный институт образования

**137.** Выпішыце складаназалежныя сказы з дадзенымі акалічнаснымі ўступальнымі часткамі. Пабудуйце схемы сказаў.

1. Як ні стараўся павучок вызваліцца з пасткі, але нічога з гэтага не атрымалася *(Я. Галубовіч)*. 2. Увогуле ёй падабалася ўся іх размова, іх адносіны паміж сабой, простыя і сяброўскія, нягледзячы на розніцу ў гадах і ў становішчы, у адукацыі *(І. Шамякін)*. 3. Рыту, хоць тая была і старэйшая за мяне на два гады, пакуль ніхто не праводзіў *(Н. Касцючэнка)*. 4. Стома, заклапочанасць, нягледзячы ні на што, не сцерліся з яго твару *(У. Шыцік)*. 5. Нягледзячы на сваю празмерную паўнату, яна галантна прысела, падаючы́ пухленькую ручку *(А. Мальдзіс)*.

**138.** Вусна адкажыце на пытанні.

Чым ускладнены сказ *Метраў за пяць ад мяне ў снезе, як у пярыне, ляжаў лось* (Я. Галубовіч)?

З дапамогай якіх злучнікаў у сказ уводзяцца параўнальныя звароты?

Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах:

Ля хаты гуляюць, шчабечуць, як птушкі, дзеці *(З. Прыгодзіч)*.

Ля хаты гуляюць, шчабечуць, як птушкі вясной, дзеці.

Як адрозніць параўнальны зварот ад даданай акалічнаснай параўнальнай часткі складаназалежнага сказа?

**Даданыя акалічнасныя параўнальныя часткі** шляхам параўнання паясняюць і ўдакладняюць тое, пра што гаворыцца ў галоўнай частцы.

Даданыя акалічнасныя параўнальныя часткі звязваюцца з галоўнай часткай пры дапамозе падпарадкавальных злучнікаў ***як, чым, нібы, як бы, быццам, як быццам.***

Даданая акалічнасная параўнальная частка паясняе ўсю галоўную частку. Напрыклад:

1)*Смех у яе быў звонкі, залівісты,* 2)*быццам абудзіліся раптам тысячы малюсенькіх званочкаў* (А. Крэйдзіч).

[ × ], (*быццам…*).



Правообладатель Национальный институт образования

Даданыя акалічнасныя параўнальныя часткі трэба адрозніваць ад параўнальных зваротаў. У параўнальных зваротах няма выказніка або даданых членаў з яго саставу. Напрыклад:

1. *Усе думкі выскачылі з галавы, як спалоханыя вераб'і* (З. Бядуля). Гэта просты сказ, ускладнены параўнальным зваротам *як спалоханыя вераб'і*.

2. [1)]*Слабенькім голасам,* [2)]*як у рэшаце нядужыя кураняткі,* [1)]*ціўкалі сініцы* (В. Адамчык). Гэта складаназалежны сказ з даданай акалічнаснай параўнальнай часткай *як у рэшаце нядужыя кураняткі*, у якой ёсць даданы член з саставу выказніка — акалічнасць *у рэшаце*.

**139.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль і тып. Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары і расстаўляючы знакі прыпынку.



Пад акном цв..ла ч..ромха. Яе ствол тоўсты і чорны як мокры асфальт упарта выцярэблівaўся з бетон.. і ц..гнуўся ўвышыню. Шырокая крона б..лела нібы на ёй павісла іскрыстая снежная лавіна духмяная як сама раніца. Часам ветрык праз акно сыпаў у пакой прыгаршчы п..лёсткаў якія кружыліся ўсцілалі падлогу.

У горадзе як гэта н.. дзіўна раней чым у лесе распускаецца ч..ромха *(Паводле У. Саламахі)*.

Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.
Вусна вызначце віды даданых частак у складаназалежных сказах.
Падбярыце сінонім да дзеяслова *выцярэблівaўся*.
Выкарыстоўваючы складаназалежныя сказы з даданымі акалічнаснымі параўнальнымі часткамі, складзіце і запішыце невялікі тэкст — апісанне чаромхі ў квецені, адлюстраванай на малюнку.

**140.** Прачытайце тэкст. Абгрунтуйце яго падзел на абзацы.

Дзень быў сонечны, але без духаты, якая звычайна бывае сярод ліпеня ў вялікім горадзе. Я вырашыў пагуляць па Маскве. Паколькі


Правообладатель Национальный институт образования

першыя дні гасцявання ў сваякоў пайшлі ў мяне на знаёмства з гістарычнымі мясцінамі, то цяпер планаваў паглядзець Маскву літаратурную.

Вандруючы па горадзе, зрабіў для сябе адкрыццё: у Маскве нельга заблудзіць. І нават не таму, што язык да Кіева давядзе. Куды б ні завялі дарогі, усюды можна нырнуць у падземку. А на станцыі метро сядзеш у патрэбную электрычку і патрапіш у любы́ куток горада.

Перапоўнены высокімі пачуццямі, я крочыў па маскоўскіх вуліцах і плошчах. Наведаў літаратурныя музеі Пушкіна і Талстога. За свае сямнаццаць гадоў я не перажываў такой захопленасці прыгожым пісьменствам. Пушкін і Талстой праз сваю адданасць літаратуры пераканалі мяне, што сэнс жыцця — не толькі марыць пра цудоўнае, але і тварыць яго *(Паводле М. Пазнякова)*.

Выпішыце з тэксту складаназалежныя сказы, у дужках укажыце від даданай часткі. Пабудуйце схемы сказаў.

- Да слова *гасцяванне* падбярыце аднакаранёвыя словы (назоўнік, прыметнік, дзеяслоў, прыслоўе).

Знайдзіце ў тэксце прыказку, растлумачце яе сэнс.

Якія музеі або мясціны вы параілі б наведаць госцю з іншай краіны, калі б ён захацеў пабачыць Беларусь літаратурную?

**141.** Выпішыце складаназалежныя сказы з даданымі акалічнаснымі параўнальнымі часткамі. Пабудуйце схемы сказаў.

1. Далей уніз цягнуўся **ельнік**, сіні, як навальнічная хмара *(А. Алешка)*. 2. Вяснушкі густа абляпілі яе твар і рукі, быццам хто абпырскаў светла-карычневай фарбай *(М. Зарэмба)*. 3. Шчупак упарціўся[м], круціўся, уздымаў зубастую галаву, вырываўся, як бычок на ланцугу *(М. Бусько)*. 4. За сталом ён **сядзіць**, нібы турэцкі султан *(В. Гардзей)*. 5. А там, пад мястэчкам, над поплавам грымела, нібы ламалася і падала на зямлю вялікімі крыгамі неба *(В. Адамчык)*. 6. Бабры выхапіліся з глыбіні, як вясковыя хлопчыкі пасля зацяжнога нырца, з пырханнем, чмыханнем і плёскам *(В. Казько)*. 7. Між зялёных лістоў, нібы шарападобныя званочкі, на тоненькіх сцяблінках **звісаюць** белыя кветкі *(Я. Галубовіч)*.

- Зрабіце фанетычны запіс выдзеленых слоў.


Правообладатель Национальный институт образования

# § 22. Складаназалежныя сказы з даданымі акалічнаснымі часткамі спосабу дзеяння, меры і ступені (сродкі сувязі, знакі прыпынку)

**Даданыя акалічнасныя часткі спосабу дзеяння** паказваюць, якім чынам ажыццяўляецца дзеянне, пра якое паведамляецца ў галоўнай частцы.

Даданыя акалічнасныя часткі спосабу дзеяння адказваюць на пытанні як? якім чынам? і звязваюцца з галоўнай часткай пры дапамозе падпарадкавальных злучнікаў ***як, як бы, быццам, каб, што***.

Даданая акалічнасная частка спосабу дзеяння паясняе выказнік галоўнай часткі або спалучэнне выказніка са словам ***так***. Напрыклад:

[1]*Яна* ***павярнула*** *галаву* ***так***, [2]*што ён не мог бачыць яе твар* (Т. Мушынская).




**Даданыя акалічнасныя часткі меры і ступені** выражаюць меру або ступень праяўлення дзеяння ці прыметы, пра якія паведамляецца ў галоўнай частцы.

Даданыя акалічнасныя часткі меры і ступені адказваюць на пытанні як? як многа? у якой меры? у якой ступені? і звязваюцца з галоўнай часткай пры дапамозе падпарадкавальных злучнікаў ***што, быццам, як, нібы, аж***.

Даданая акалічнасная частка меры і ступені паясняе спалучэнне выказніка са словамі ***так***, ***столькі***, ***настолькі***, ***такі***, ***гэтакі***. Напрыклад:

[1]*За тыдзень* ***наліло столькі*** *вады*, [2]*што зямля не паспявала яе ўсмоктваць* (Я. Галубовіч).






Правообладатель Национальный институт образования

**142.** Прачытайце складаназалежныя сказы. Назавіце ў іх галоўную і дададную часткі. Укажыце ў галоўнай частцы слова (спалучэнне слоў), якое паясняе дададная частка. Вызначце віды дададных частак.

1. Музыка спявала нешта веснае, такое мяккае і страснае, што слёзы прасіліся на вочы *(У. Караткевіч)*. 2. Васіль аказаўся такім здольным, што ўсе здзівіліся *(П. Кавалёў)*. 3. І жыццё складваецца зусім не так, як хацелася некалі *(Т. Мушынская)*. 4. Птушкі настолькі ўвайшлі ў наша жыццё, што мы нават не можам уявіць сабе сад без шпака, поле без жаўрука, вясковую вуліцу без вясёлых, гарэзлівых вераб'ёў *(В. Зуёнак)*. 5. Рагаталі так, што на нас пачалі звяртаць увагу *(А. Рыбак)*. 6. Ударыў, аж здрыганулася зямля, пярун *(Я. Галубовіч)*.

**143.** Дапішыце сказы так, каб атрымаліся складаназалежныя сказы з дададнымі акалічнаснымі часткамі меры і ступені.

1. Дзяўчынка так спрытна пагналася за матыльком, ... . 2. Лютаўскія маразы былі настолькі моцныя, ... . 3. Сонца было такое яркае і прамяністае, ... . 4. На кірмаш з'ехалася столькі народу, ... . 5. Аднекуль пачуліся гукі такой журботнай мелодыі, ... . 6. Птушкі апусціліся на зямлю так блізка ад мяне, ... .

**144.** Складзіце па кожнай з прапанаваных схем тры складаназалежныя сказы з рознымі відамі дададных частак. Запішыце, у дужках укажыце від дададнай часткі.

1. [ × ], (*як*...).  2. [ × , (*што*...), ].

**145.** Прачытайце інтэрв'ю з Сяргеем Рылко, кіраўніком мастацка-пастановачнай часткі спектакля «Сон у купальскую ноч», пастаўленага паводле п'есы Шэкспіра ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы. Ці выклікае гэта інтэрв'ю жаданне паглядзець спектакль?

— *Спецыяльна для спектакля «Сон у купальскую ноч» будзе зменена пляцоўка галоўнай сцэны Купалаўскага тэатра. Як яна будзе выглядаць?*

— Мы прыбіраем тры рады крэслаў у глядзельнай зале і павялічваем даўжыню сцэны. Гэта дазваляе нам усталяваць на сцэне яшчэ


Правообладатель Национальный институт образования

150 месцаў, каб гледачы маглі прыняць непасрэдны ўдзел у аўтарскім даследаванні пачуццяў закаханых герояў.

— *Якія тэхналогіі выкарыстаны ў спектаклі?*

— Цяпер на пляцоўцы Купалаўскага тэатра мы можам ствараць высокатэхналагічныя спектаклі. Пастановачная група змагла зрабіць так, каб беларускі глядач ацаніў тэхнічныя магчымасці нашай сцэны.

У спектаклі будзе задзейнічана праекцыя на празрысты куб з чатырох бакоў. Таксама на яго будуць трансліравацца выявы ўсяго таго, што адбываецца на сцэне.

Гэты спектакль стаў магчымым яшчэ і таму, што ў тэатры ёсць вялікі парк гукавога абсталявання і высокакваліфікаваныя інжынеры. Усё гэта дапамагло агучыць артыстаў так, каб іх было добра чуваць унутры куба і па-за яго межамі.

— *Ці можна параўнаць тэхнічны патэнцыял Купалаўскага з іншымі тэатрамі?*

Тэхнічны патэнцыял Купалаўскага агромністы. Дзякуючы апошняй рэканструкцыі мы маем больш магчымасцей, чым шмат якія іншыя тэатры Беларусі і Расіі. У нас выдатная сцэнічная механізацыя.

— *Якія ўражанні застануцца ў гледача пасля спектакля?*

Важна зрабіць так, каб усё працавала ў комплексе: рэжысёрская ідэя, арыгінальнасць увасаблення, тэхнічная складанасць. Каб глядач атрымаў задавальненне, у нас, лічу, усё атрымалася (*Паводле сайта Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы*).

Каму адрасаваны тэкст інтэрв'ю? З якой мэтай ён напісаны?

Якія сказы — простыя ці складаныя — ужываюцца пры пастаноўцы пытанняў? Якімі сказамі карыстаецца С. Рылко, адказваючы на пытанні?

Зрабіце пісьмовы сінтаксічны разбор складаназалежных сказаў, ужытых у інтэрв'ю (парадак і ўзор разбору змешчаны ў Дадатку, с. 202).

Уявіце, што вам даручана ўзяць інтэрв'ю ў знакамітага артыста. Сфармулюйце і запішыце пытанні, якія вы хацелі б яму задаць.

**146.** Прачытайце тэкст. Колькі падтэм выкарыстана аўтарам для раскрыцця тэмы тэксту?

Спішыце тэкст, устаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары і расстаўляючы знакі прыпынку.

Вёска даўно ўжо карыстаецца метал..ічнымі і пластмас..авымі вёдрамі. А быў час калі в..дро рабілі з дрэва. Клёпкі сцягвалі



Правообладатель Национальный институт образования

арэхавымі ці дубовымі абручамі. Часам пр..сілі каваля каб выкаваў ж..лезныя абручы.

В..дро для студні рабілі з дуб.. . Лёс гэтага в..дра быў незайздросны бо яно стукалася аб сценкі студні ця..ка падала на дно. Таму дубовае в..дро яшчэ акоўвалі ж..лезам каб даўжэй жыло яно ў студні.

У хатніх вёдраў быў памочнік каромысел. Гэта т..ўставатая палка прамая ці крыху выгнутая. На канцах яна мела негл..бокія выемкі або драцяныя кручкі на якія ч..пляліся вёдры. Гаспадыня брала каромысел на плечы і несла поўныя вёдры дахаты так каб не распляскаць в..ду *(Паводле М. Маляўкі)*.

Зрабіце пісьмовы сінтаксічны разбор складаназалежных сказаў.

## § 23. Складаназалежныя сказы з некалькімі даданымі часткамі

**147.** Прачытайце тэкст. Які працэс у ім апісваецца? Вусна падзяліце тэкст на абзацы.

**Сняжынкі-дажджынкі**

Пад летнім сонцам высыхае раніцай ад расы трава. Лёгкі туман збіраецца над рачною і азёрнаю вадою. Вадзяная па́ра падымаецца ўгору на многія кіламетры, ператвараецца ў нябачны газ. Ён такі лёгкі і празрысты, што не замінае сонечным промням пранікаць на зямлю. На вялікай вышыні, дзе сорак градусаў холаду, вадзяны газ ператвараецца ў мікраскапічныя кропелькі. Патрэбна да мільёна такіх кропелек, каб утварылася звычайная кропелька вады. Раптоўна адна з гэтых кропелек ператвараецца ў крышталік лёду. І адразу ж крышталік прыцягвае да сябе тысячы вадзяных кропелек, якія таксама ператвараюцца ў крышталікі і вокамгненна далучаюцца да першага крышталіка. За долю секунды з крышталікаў утвараюцца сняжынкі. Іх так многа, што на зямлі магла б забушаваць сапраўдная снежная бура. Кожная сняжынка далучае да сябе новыя ледзяныя крышталікі, расце, цяжэе, пачынае апускацца да зямлі. Апускаючыся, сняжынкі сутыкаюцца з кропелькамі вадзяной пары і рассыпаюцца на дробныя часцінкі, з якіх утвараецца безліч сняжынак. Калі сняжынкі апускаюцца на той бок Зямлі, дзе стаіць лета, яны ў цёплым паветры, за некалькі


Правообладатель Национальный институт образования

кіламетраў ад Зямлі, растаюць і зноў ператвараюцца ў кропелькі. З гэтых кропелек утвараюцца аблокі. Аблокі сутыкаюцца ў небе, растуць. Кропелькі робяцца ўсё большымі і большымі. Пастунова з воблакаў утвараюцца дажджавыя хмары, якія ўрэшце не могуць болей утрымліваць у небе кроплі вады. Калі яны пачынаюць падаць на зямлю, ідзе дождж *(Паводле А. Жука)*.

Знайдзіце ў тэксце складаназалежныя сказы. Назавіце ў іх галоўную і даданую часткі.

Выпішыце складаназалежны сказ, у якім дзве даданыя часткі. Падкрэсліце іх граматычныя асновы.

У складаназалежным сказе можа быць некалькі даданых частак. Такі сказ называецца **складаназалежным з некалькімі даданымі часткамі.** Напрыклад: [1)]*Ад таты Эдзік чуў,* [2)]*што маладыя чаплі,* [3)]*як толькі навучацца трохі лятаць,* [2)]*адразу пускаюцца ў самастойныя вандроўкі па наваколлі* (В. Вольскі). У гэтым сказе да галоўнай часткі *ад таты Эдзік чуў* адносіцца даданая дапаўняльная частка *што маладыя чаплі адразу пускаюцца ў самастойныя вандроўкі па наваколлі*. Да яе, у сваю чаргу, адносіцца даданая акалічнасная частка часу *як толькі навучацца трохі лятаць.*

Гарызантальная схема сказа




Вертыкальная схема сказа





Правообладатель Национальный институт образования

**148.** Выпішыце складаназалежныя сказы з некалькімі дададзенымі часткамі. Пазначце лічбамі граматычныя часткі. У галоўных частках падкрэсліце граматычныя асновы.

1. Сёння я прыехаў у горад, каб знайсці свайго аднакласніка, які запрасіў мяне выступіць у школе, дзе ён працаваў настаўнікам *(А. Бадак)*. 2. Ён падняў галаву, каб зірнуць ёй у твар, і ўбачыў, што ў вачах яе стаяць слёзы *(Т. Мушынская)*. 3. У цягніку яны выходзілі з купэ ў вузкі калідор, гадзінамі стаялі ля акна, глядзелі на краявіды, што мільгалі перад вачыма *(Г. Васілеўская)*. 4. Марына з букетам яркіх кветак у руках ішла і думала, як зараз прыйдзе дадому, паставіць кветкі ў ваду, згатуе сабе смачны абед *(І. Грамовіч)*. 5. Бацька і пасля, калі я хадзіў у школу, у старэйшыя класы, вельмі хацеў, каб я вывучыўся на ляснічага *(І. Шамякін)*. 6. Каб справіцца з тымі[м] ворагамі, якія ў шчылінкі кары хаваюцца, садаводы мажуць ствалы дрэў вапнай* *(С. Фядотава)*. 7. Калі карэта праехала гарадскую браму, Тадэвуш пацягнуў ланцужок на шыі, дастаў і раскрыў медальён *(Я. Конеў)*.

**149.** Прачытайце нататку з газеты «Звязда». Пра які факт паведамляецца ў нататцы? Ці з'яўляецца гэты факт сацыяльна значным? Як вы лічыце, чаму загаловак нататкі мае форму сказа?

### Грамадскасці быў прадстаўлены талісман II Еўрапейскіх гульняў




Ім стала лісяня па імені Лесік. З гэтага часу менавіта Лесік — вобраз, які будзе выклікаць асацыяцыю* мільёнаў людзей ва ўсім свеце з нашай краінай, які аб'яднае вакол сябе гасцей і натхніць удзельнікаў гульняў на яркія перамогі.

Як і ва ўсіх талісманаў, у Лесіка ёсць свая легенда, якая звязана з казкай «Маленькі прынц» Антуана дэ Сент-Экзюперы. Пасля таго як Маленькі прынц пакінуў планету Зямля, лісяня засумавала. Усе думкі яго былі пра тое, як знайсці сяброў. Яно прынюхвалася і прыслухоўвалася, ад гэтага яго вушкі сталі большыя. Дзякуючы сваім вялікім вуш-


Правообладатель Национальный институт образования

кам і моцным лапкам лісяня даведалася, што ў Беларусі ёсць кветка, якая выконвае ўсе жаданні. Лесік адправіўся ў Беларусь, каб знайсці чароўную папараць-кветку. Шлях у лісяняці быў няблізкі: яму давялося зрабіць мільён крокаў. У гэтым можна пераканацца, калі паглядзець на яго фітнес-бранзалет.

Пра тое, што 2019 год вельмі яркі ў яго жыцці і ў спартыўным жыцці Еўропы, гаворыць надпіс на казырку Лесіка. Зялёны колер на футболцы талісмана азначае развіццё і гармонію, а чорныя шорты — дысцыпліну і рашучасць. Жоўтая шэрстка гаворыць пра яго жыццярадаснасць, сінія красоўкі сведчаць пра нязломнасць, а чырвоны колер адлюстроўвае энергічнасць *(Паводле А. Сазонава, Д. Лабажэвіч)*.

Якой частцы тэксту адпавядае малюнак з выявай Лесіка?

Выпішыце з тэксту складаназалежныя сказы з некалькімі дадзенымі часткамі. Пазначце лічбамі граматычныя часткі. Назавіце галоўную і даданыя часткі. Вызначце віды даданых частак.

● Праскланяйце назоўнік *лісяня*.

Талісманам якой спартыўнай падзеі, значнай для нашай краіны і ўсяго свету, быў зубр па імені Волат? Вусна апішыце яго, выкарыстоўваючы складаназалежныя сказы.



**150.** Дапішыце сказы так, каб атрымаліся складаназалежныя сказы з некалькімі дадзенымі часткамі.

1. У сярэдзіне ліпеня, калі збіраў ля Віліі чабор і запасаўся ліпавым цветам, я зноў завітаў на тую палянку, дзе... 2. Раніцою, як толькі прачнуўся, падышоў да акна і адчыніў фортку, бо... 3. На грудку́, у ямцы, што была выслана сухой травой і пухам, я ўбачыў гняздо, у якім... 4. Буйныя ясені і пірамідальныя таполі, якія растуць уздоўж дарогі, пакрыты густым серабрыстым інеем, быццам... 5. На ўзлеску, куды прывяла сцяжынка, мяне сустрэла чародка рабінак, на якіх... *(Паводле Я. Галубовіча)*.

Разбярыце па членах сказа галоўныя часткі складаназалежных сказаў.

● Да якой часціны мовы адносіцца слова *уздоўж*, ужытае ў 4-м сказе?



Правообладатель Национальный институт образования

**151.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго тэму.

Кніга — крыніца інфармацыі. Яна ўзнікла тады, калі чалавек захацеў[с] расказаць тое, што ведае, не толькі нейкаму аднаму чалавеку, з якім гутарыў, а і многім невядомым і незнаёмым субяседнікам. І яшчэ кніга пачалася тады, калі людзі навучыліся запісваць усё, што думаюць, калі ў іх з'явілася другая мова — пісьмовая.

Яны з асалодаю і апантанасцю пісалі ў свой час на сценах пячор, на гліняных таблічках, на кары бярosты.

Берасцяныя граматы — гэта пісьмы, запіскі, дакументы, якія дайшлі да нас аж з XIII—XIV стагоддзяў *(Я. Сіпакоў)*.

Выпішыце з тэксту складаназалежныя сказы з некалькімі даданымі часткамі. Пазначце лічбамі граматычныя часткі.

Растлумачце пастаноўку працяжнікаў у сказах.

## § 24. Складаназалежныя сказы з паслядоўным, сузалежным і змешаным падпарадкаваннем частак (азнаямленне), знакі прыпынку ў іх

Сярод складаназалежных сказаў з некалькімі даданымі часткамі вылучаюцца сказы з паслядоўным, сузалежным і змешаным падпарадкаваннем частак.

У **складаназалежных сказах з паслядоўным падпарадкаваннем** першая даданая частка падпарадкоўваецца галоўнай, другая даданая — першай даданай, трэцяя даданая — другой даданай і г. д. Напрыклад:

[1]*Абед быў не абед,* [2]*бо ўвесь час даводзілася памятаць,* [3]*які нож для чаго* (У. Караткевіч).









Правообладатель Национальный институт образования

**152.** Прачытайце сказы. Пабудуйце іх гарызантальныя і вертыкальныя схемы. Дакажыце, што гэта складаназалежныя сказы з паслядоўным падпарадкаваннем частак.

1. Такое пачуццё бывае толькі тады, калі чалавек глыбока верыць у тое, пра што спявае *(У. Караткевіч)*. 2. Яшчэ Вадзім пісаў, што вельмі хоча вывучыцца на праграміста, бо камп'ютар — яго самае вялікае захапленне *(Л. Кебіч)*. 3. Я думаў, што заўтра раніцай, да футбола, калі распагодзіцца[с], мы паедзем з Ленай на возера *(М. Стральцоў)*. 4. Аленка сказала, што трэба было б набраць вады ў пластыкавыя бутэлькі і ўзяць з сабою ў Мінск, каб і там можна было атрымаць асалоду ад незвычайнага водару жывой вады, набрацца сіл і энергіі ад крыніцы *(З. Калкоўская)*.

У **складаназалежных сказах з сузалежным падпарадкаваннем** ад галоўнай часткі залежыць некалькі даданых частак. Сузалежнае падпарадкаванне бывае аднародным і неаднародным.

У складаназалежных сказах з ***сузалежным аднародным падпарадкаваннем*** даданыя часткі, па-першае, адносяцца да аднаго віду, па-другое, паясняюць у галоўнай адно і тое ж слова, або аднародныя члены сказа, або ўсю галоўную частку.

Напрыклад:

1. [1)]*Андрэйка доўга **глядзеў**, [2)]як прыліпаюць да шыбы бухматыя сняжынкі, [3)]як паступова знікаюць у снежнай завірусе абрысы далёкага лесу* (Я. Галубовіч).




2. [1)]*Пасля ён **зразумеў**, [2)]што гул ідзе з шашы, [1)]і **ўбачыў**, [3)]як у цемнаце ўспыхнулі агні фар* (А. Алешка).






Правообладатель Национальный институт образования

У складаназалежных сказах з ***сузалежным неаднародным падпарадкаваннем*** дададзеныя часткі адносяцца да розных відаў і паясняюць у галоўнай або адно слова, або розныя члены сказа.

Напрыклад:

1. 1)*Калі едзеш па трасе Калінкавічы — Мазыр,* 2)*то амаль з Баравікоў бачыш,* 3)*як на гары, над фермамі* маста праз Прыпяць, вымкнуліся высотныя будынкі* (А. Бароўскі).




2. 1)*Пазней,* 2)*калі мы памірыліся і пасябравалі,* 1)*я зразумеў,* 3)*што Мікола не такі ўжо і маўчун* (З. Прыгодзіч).




**153.** Выпішыце спачатку складаназалежныя сказы з сузалежным аднародным падпарадкаваннем, потым — з сузалежным неаднародным падпарадкаваннем. Пабудуйце вертыкальныя схемы сказаў.

1. Увесну, калі бярозкі расплятаюць свае доўгія зялёныя косы, яны здаюцца хлопчыку русалкамі з дзядулевай казкі, якія пакінулі рачное дно і выбеглі пагрэцца на сонейку *(Я. Бяганская)*. 2. Ён думаў, што прыйшла пара сеяць жыта, што ён пасее яго за агародамі на былым сваім полі *(А. Алешка)*. 3. Калі расцвілі яблыні, калі не думалася аб замаразках, выпаў снег *(У. Саламаха)*. 4. Адчыніўшы^м шафу, каб схаваць сваё паліто, Грачоў заўважыў, што Га́ліна вопратка ў шафе адсутнічае *(М. Кукуць)*. 5. Вось дрэва, такое высокае, што ягоная верхавіна дастае да акон пятага паверха, і такое тоўстае, што трое дзяцей, узяўшыся за рукі, ледзь могуць абхапіць яго *(С. Фядотава)*. 6. Са здзіўленнем і страхам глядзеў я на спакойную плынь, на хвалі, што прыбівала да берага, і пашкадаваў, што не застаўся ў машыне *(І. Пяшко)*.


Правообладатель Национальный институт образования

У складаназалежных сказах са ***змешаным падпарадкаваннем*** спалучаюцца паслядоўнае і сузалежнае падпарадкаванне. Напрыклад:

[1]*Пакуль цягнік стаяў,* [2]*яна паказвала Людачцы праз акно,* [3]*якія вялікія яблыкі былі ў кошыках тых цётак,* [4]*што снавалі сюды-туды па пероне,* [5]*якія жоўтыя грушы* (А. Кулакоўскі).




**154.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль. Назавіце моўныя сродкі, характэрныя для гэтага стылю.

У невялікім агародчыку каля самай хаты раслі кветкі: ружы, флёксы, астры, гладыёлусы, вяргіні. Гледзячы на іхняе буянне, Юрый Пятровіч амаль што пазайздросціў Людачцы, якая ў кожны свой прыезд на дачу бачыць гэтыя кветкі.

Разам з унукам яны збіралі буйныя сіне-чорныя слівы. Абтрэсеныя з дрэў ветрам і дажджом, яны ляжалі ў баразёнках паміж градамі, каля высокіх сцяблін кропу, кмену, пад лісцем пятрушкі.

Усе тыя расліны, што вясной ішлі ў рост і квітнелі, што летам грэліся на сонейку і прагна чакалі дожджыку, цяпер уражвалі, цешылі душу багаццем колераў і адценняў, форм і водараў. Але і сухая, зжаўцелая лістота, якую вока заўважала ў кронах старых дрэў, і крыху падвялы бульбоўнік падказвалі, што буянне гэта не вечнае, што неўзабаве прыйдзе канец і цяплу, і лету, і шчодрасці *(Паводле Т. Мушынскай).*

Выпішыце з тэксту складаназалежныя сказы з некалькімі даданымі часткамі. Пабудуйце іх вертыкальныя схемы. Вызначце від падпарадкавання.

- Растлумачце пастаноўку двукроп'я ў першым сказе тэксту.


Правообладатель Национальный институт образования

**155.** Складзіце складаназалежныя сказы з некалькімі дадзенымі часткамі па прапанаваных схемах. Запішыце. Вызначце від падпарадкавання.




**156.** Выпішыце складаназалежныя сказы са змешаным падпарадкаваннем. Пабудуйце іх вертыкальныя схемы.

1. Калі мне было цяжка, я садзіўся адпачываць і ўяўляў сабе той дзень, калі праеду перад Эмай на каньках *(М. Лупсякоў)*. 2. Тут Сярожа ўспомніў, куды пайшла мама, і вырашыў, што Андрэйка адразу супакоіцца, калі яму сказаць пра гэта *(У. Паўлаў)*. 3. Апоўдні, калі па-вясноваму цеплаватыя промні сонца яшчэ толькі спрабавалі растапіць наледзь на шыбах Яўменавай хаты, калі на шэрых галінках ліп уселіся чырванагрудыя снегіры, з вуліцы да ганка людскімі нагамі была пратаптана глыбокая сцежка *(У. Саламаха)*. 4. Ляшкевіч адчуў, як скаланулася сэрца, як знікла бязмежная радасць, што некалькі хвілін таму перапаўняла яго, як паціху, крадучыся, бы звер, душу запаланіў смутак і боль[м] *(В. Праўдзін)*. 5. Помню, як на дыбачках, няспешна, каб не зачапіцца за ўслон ці табурэтку, мы праходзілі праз першы пакой, дзе спалі бабуля з дзедам, у другі *(Н. Касцючэнка)*.

Часткі складаназалежнага сказа з некалькімі дадзенымі часткамі р а з д з я л я ю ц ц а **коскамі**. Напрыклад: *Мы спусціліся ў хату, дзе нас ужо чакалі гарбата і толькі што звараная бульба, якая дымілася над адкрытым чыгунком смачнай парай* (Н. Касцючэнка).

Калі аднародныя дадзеныя часткі звязваюцца пры дапамозе супраціўных злучнікаў ***а, але***, перад гэтымі злучнікамі с т а в і ц ц а **коска**. Напрыклад: *Вечарам, калі спала гарачыня, **а** на стромкія вершаліны сосен пачало залаціста-малінавае*


Правообладатель Национальный институт образования

*сонца садзіцца, паставіў чубаткам каля ганка ў місачцы вады, пшанічкі пасыпаў* (Я. Галубовіч).

Калі аднародныя дадзеныя часткі звязваюцца пры дапамозе адзіночных злучнікаў ***і, ды*** (у значэнні ***і***), ***або, ці***, то паміж імі **коска** не ставіцца. Напрыклад: *Я люблю вясну, калі з трэскам ломіцца на рацэ лёд* ***і*** *гаманкія поўныя воды нясуць крыгі* (М. Лупсякоў).

Калі побач стаяць два падпарадкавальныя злучнікі (ці злучнік і злучальнае слова), то паміж імі ставіцца **коска**. Напрыклад: *Просьбаў было столькі,* ***што, каб*** *працаваў нават ноччу, усё адно не справіўся б* (А. Бутэвіч).

Але перад другім злучнікам **коска** не ставіцца, калі пасля дадзенай часткі стаіць другая частка парнага злучніка ***то, дык***. Напрыклад: *Не думайце,* ***што калі*** *Вы далёка працуеце,* ***дык*** *я Вам і пісаць не буду* (П. Кавалёў).

**157.** Прачытайце тэкст. Якія моўныя сродкі выкарыстоўвае паэт, каб перадаць захапленне гісторыяй і прыродай роднага краю?

Дзе мой край? Там, дзе вечную песню пяе Белавежа,
Там, дзе Нёман на захадзе помніць варожую кроў,
Дзе на ўзвышшах Наваградскіх дрэмлюць суровыя вежы
І вішнёвыя хаты глядзяцца ў шырокі Дняпро.
Ты ляжыш там, дзе сіняя Прыпяць ласкава віецца,
Дзе Сафія плыве над Дзвіною, нібы карабель...
Там, дзе сэрца маё з першым крокам, як молат, заб'ецца,
Калі б нават сляпым і глухім я прыйшоў да цябе...

*У. Караткевіч.*

Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку паміж часткамі складаных сказаў. Як бы вы адказалі на пытанне, сфармуляванае ў пачатку верша?

**158.** Спішыце сказы, расстаўляючы знакі прыпынку.

1. Я зразумеў што калі не ўжыву ўвесь свой спрыт я загіну *(У. Караткевіч)*. 2. Якраз у маі калі заквітнела алешына і ля рэчкі зацвілі чаромха і фіялкі я прыехаў на Вілію *(Я. Галубовіч)*. 3. Толя адразу сцяміў што калі такі пыл то там пэўна рухаецца войска *(Я. Маўр)*. 4. Вузенькаю сцежкаю што бегла праз Цурусеў надворак



Правообладатель Национальный институт образования

і якою бабы з цэлае вёскі хадзілі паласкаць бялізну яны пачалі спускацца да рэчкі *(В. Адамчык)*. 5. Толькі калі машына рушыла і крыху асеў пыл ён павярнуўся і шпарка закрочыў следам за ёй туды дзе канчаўся невялікі сасняк і адкрывалася шырокае поле *(І. Шамякін)*.

У якіх сказах у другой даданай частцы апушчаны падпарадкавальны злучнік ці злучальнае слова? Чым гэта можна растлумачыць?

Пабудуйце вертыкальную схему апошняга сказа. Вызначце від падпарадкавання.

**159.** Прачытайце тэкст. Дайце яму загаловак, які перадаваў бы тэму тэксту.

Аднойчы ў скверыку я ўбачыў *(не)*знаёмую дз..ўчыну. У белай сукенцы з белым кап..люшыкам на галаве яна мне адразу кінулася ў вочы. Яна была *(не)*падобная да дз..ўчат якіх я сустракаў *(да)*гэтуль. Трымалася яна смела *(не)*залежна і шчабеч..чы нешта в..сёлае звонка см..ялася.

Дз..ўчына кожны веч..р прыходзіла ў скверык. Яе жывыя сінія вочы вес..ла пазіралі на свет.

Адзін раз дз..ўчына пры..шла ў сквер з кветкамі. У яе руках быў бэз і белая ч..ромха. Яна трымала кветкі акуратна як трымаюць якую*(небудзь)* каштоўную рэч. Яшчэ праз колькі часу я пачуў як яна сп..вала. І вось хутка я а..чуў што мне няма куды схавацца ад сініх в..чэй *(з)*пад белага кап..люшыка ад звонкага шчэбет.. ад гэтай цудоўнай белай птушкі. Яе вобраз стаяў перад маімі вачамі дзе б я *(н..)*быў што б я *(н..)*рабіў. Я ўжо *(н..)*мог пражыць дня каб *(пад)*веч..р *(н..)*схадзіць у скверык *(н..)*пабачыць тоненькай дз..ўчыны *(Паводле І. Навуменкі)*.

Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары, раскрываючы дужкі і расстаўляючы знакі прыпынку. Пазначце лічбамі складаназалежныя сказы. У дужках укажыце від даданай часткі.

Зрабіце пісьмовы сінтаксічны разбор складаназалежнага сказа з некалькімі даданымі часткамі (гл. Дадатак, с. 203).

**160.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль. Раскрыццю якой думкі падпарадкаваны тэкст?

**Студэнцкія** канікулы Люда праводзіла ў вёсцы. Вясковай дзяўчыне надакучвала шумнае **гарадское** жыццё, да якога ніяк не магла



Правообладатель Национальный институт образования

прывыкнуць. Вабіла тая цішыня, якая панавала ў вёсцы, дзе галаву дурманіў водар травы і кветак. Людміла радавалася **бясхмарнаму** крыштальна-блакітнаму небу над галавой, чыстаму паветру. Асаблівыя ўзнёсласць і замілаванне прыходзілі вясной, калі пакрывае зямлю першая сакавітая **зеляніна**, калі апранаюць **лёгкае** белае адзенне сады. Май — зялёная маладосць года, час, калі на ўсе галасы спяваюць птушкі і ажывае кожная травіначка. А як жа прыемна, калі наляціць цёмная хмарка і пральецца цёплым дожджыкам! Так і хочацца з далоні выпіць тую святую вадзічку, якую паслалі нябёсы *(Паводле К. Сосна)*.

Выпішыце з тэксту складаназалежныя сказы з некалькімі даданымі часткамі. Зрабіце іх пісьмовы сінтаксічны разбор.

- Растлумачце правапіс выдзеленых слоў.

**161.** Спішыце сказы. Зрабіце іх пісьмовы сінтаксічны разбор.

1. Хоць мінула з нашай першай сустрэчы шмат гадоў, я добра помніла той дзень, калі ўбачыла Галю *(З. Дудзюк)*. 2. Надзя любіла сваю кватэру, свой пакой, дзе ўсё было зроблена па яе гусце, так, як яна хацела *(Т. Мушынская)*. 3. А каб быць адкрывальнікам, трэба ўмець здзіўляцца, радавацца і вельмі ж любіць зямлю, на якой упершыню ўбачыў свет, паветрам якой дыхаеш *(У. Ліпскі)*. 4. Звычайна я была ў захапленні ад надыходу вясны, радавалася кожнай лапіне адталай зямлі, ні з чым непараўнальнаму веснавому паветру, калі няма яшчэ ні лісця, ні травы, але з'яўляецца ўжо безназоўны водар абуджанай[м] прыроды, які кружыць галовы і прымушае чакаць і спадзявацца нават тых, хто перастаў чакаць і спадзявацца! *(Л. Рублеўская)*.

**162.** Перанясіце табліцу ў сшытак і запоўніце яе.

| ДАДАНЫЯ ЧАСТКІ СКЛАДАНАЗАЛЕЖНАГА СКАЗА | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Від даданай часткі складаназалежнага сказа | Пытанні, на якія адказвае даданая частка | Што паясняе даданая частка | Сродкі сувязі даданай часткі з галоўнай | Прыклад |
| | | | | |


Правообладатель Национальный институт образования

**163.** Прачытайце крылатыя выслоўі. Дакажыце, што яны ўяўляюць сабой складаназалежныя сказы. Вызначце віды дадзеных частак.

1. Мы хочам, каб мірнае неба не знала пажару вайны *(А. Бачыла)*. 2. Роднае слова — гэта першая крыніца, праз якую мы пазнаём жыццё і акаляючы нас свет *(Я. Колас)*. 3. Дзе прайшло маленства, там пачынаецца Радзіма *(К. Чорны)*. 4. Каб любіць Беларусь нашу мілую, трэба ў розных краях пабываць *(А. Ставер)*. 5. На свеце лепшага кутка няма, чым той куток, дзе маці нарадзіла *(Н. Гілевіч)*. 6. Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі! *(Ф. Багушэвіч)*.

Запішыце па памяці 3-4 крылатыя выслоўі, укажыце іх аўтараў.

**164.** Спішыце сказы, раскрываючы дужкі, устаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары і расстаўляючы знакі прыпынку. Зрабіце іх пісьмовы сінтаксічны разбор.

1. Міця м..ўчаў чуў толькі як парыпвае пад н..гамі крохкі свежы снег *(В. Адамчык)*. 2. Зака́паў дожджык цёплы і прыемны бо св..ціла со..нца *(Г. Сямёнава)*. 3. Калі к..сманаўты в..рнуліся на ранейшую сваю стаянку ноч ужо запаліла вялікі.. яркі.. зоркі *(У. Шыцік)*. 4. Непадалёку ад дома што ст..яў *(на)*водшыбе ад вёскі узвышаўся к..лодзежны журавель *(С. Валодзька)*. 5. Як вераснёўскі туман раніцай пакрывае густой шэрай павалокай Дзісну*(раку)* з яе лугамі і затокамі так ц..пер журба завалакла Соніны вочы *(М. Кукуць)*. 6. Гудкі паравозаў све..чылі што гэты зацішны куток усё ж*(такі)* звязаны з шумным светам *(Я. Майр)*.

**165.** Выканайце тэставыя заданні па тэме «Складаназалежныя сказы: будова, значэнне, ужыванне».

**166.** Прачытайце тэкст рэпартажу*. Дзякуючы чаму ствараецца «эфект прысутнасці» аўтара на месцы падзей?

### Рэпартаж з Міжнароднай летняй школы беларусістыкі

Пяць дзясяткаў студэнтаў з розных краін — ад ЗША да Японіі — на два тыдні запоўнілі аўдыторыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Нягледзячы на тое, што ўсе яны прадстаўляюць розныя культуры, агульнай для ўсіх стала беларуская мова. Менавіта дзеля яе



Правообладатель Национальный институт образования

вывучэння яны і прыехалі ў Мінск. Міжнародная летняя школа беларусістыкі — унікальны праект, які дазваляе пагрузіць замежнікаў у беларускую атмасферу.

Занятк і ў школе пачынаюцца з вечара знаёмстваў, калі ўсе расказваюць пра свае краіны пры дапамозе прэзентацый, спеваў і, вядома, традыцыйнай кухні. Удзельнікаў праекта чакае насычаная праграма, якая ўключае святкаванне Дня Незалежнасці, шматлікія экскурсіі ў разнастайныя музеі краіны.

Вось у адной з аўдыторый праходзяць чарговыя заняткі, дзе студэнты расфарбоўваюць чорна-белыя малюнкі, каб пазней расказаць, якія колеры кожны абраў для свайго малюнка. Гэта выдатны спосаб пазнаёміцца з беларускай лексікай.

Атмасфера на занятках пануе вясёлая і сяброўская. Калі беларускага лексічнага запасу не хапае, на дапамогу прыходзіць англійская мова. Увогуле, навучанне ў школе дапускае пэўную імправізацыю. Напрыклад, пасля майстар-класа па беларускіх спевах група студэнтаў па ўласнай ініцыятыве адправілася ў тэатр, бо вельмі хацела патрапіць на адзін са спектакляў.

Пасля заняткаў усе збіраюцца на кава-паўзу, каб пагутарыць па-беларуску не толькі з іншымі студэнтамі, але і з носьбітамі беларускай мовы. Навучэнцаў школы суправаджаюць валанцёры — студэнты беларускіх універсітэтаў. Іх задача — быць побач з замежнікамі, тлумачыць ім тое, што можа аказацца незразумелым *(Паводле Я. Лыскаўца)*.

Знайдзіце ў тэксце рэпартажу складаназалежныя сказы, вызначце віды даданых частак.

Зрабіце пісьмовы сінтаксічны разбор складаназалежнага сказа з некалькімі даданымі часткамі.

Уявіце сябе ўдзельнікам Міжнароднай летняй школы беларусістыкі. Пісьмова перакажыце тэкст ад першай асобы, выкарыстоўваючы складаназалежныя сказы.

**167.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль і жанр. З якой мэтай напісаны тэкст? Каму ён адрасаваны?

### У Мінску адкрыўся «разумны» павільён Белсаюздруку

[1)]11 снежня 2018 года ўвойдзе ў гісторыю беларускага друку. [2)]Насупраць мінскага Палаца спорту гасцінна адчыніў дзверы першы


Правообладатель Национальный институт образования

«разумны» павільён Белсаюздруку. [3]Хоць плошча гандлёвага аб’екта не вельмі вялікая — усяго дваццаць чатыры[м] квадратныя метры, ён змяшчае шмат цікавага.

[4]Цяпер падчас выбару свежага нумара патрэбнага выдання або піцця кавы можна падзарадзіць смартфон. [5]Калі трэба выйсці ў сеціва, да паслуг наведвальнікаў ёсць безлімітны інтэрнэт. [6]Працуе і імгненная сістэма ацэнкі прадаўцоў — так званы лайкер, які дазваляе аператыўна рэагаваць на заўвагі і прапановы аб працы як прадаўца, так і гандлёвай сеткі ў цэлым.

[7]Паклапаціліся тут і пра хуткае абслугоўванне замежных гасцей, якія не валодаюць беларускай і рускай мовамі. [8]Ім на дапамогу прыйдзе анлайн-перакладчык. [9]У павільёнах працуюць гарадскія навігатары, якія дапамагаюць замежнікам арыентавацца ў Мінску.

[10]З дапамогай «разумнага» павільёна можна выклікаць таксі або экстранныя службы, аплаціць камунальныя паслугі, заказаць квіток на канцэрт, выбраць падарункавы сертыфікат буйных універмагаў *(Паводле В. Шкленніка)*.

Дзе знаходзіцца дададная частка ў адносінах да галоўнай у 7-м сказе?
Што паясняе дададная частка ў 5-м сказе?
Вызначце від дададнай часткі ў 3-м сказе.
Колькі дададных частак у 6-м сказе?
Якім членам сказа з’яўляецца слова *якія*, ужытае ў 9-м сказе?

**КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Якія сказы называюцца складаназалежнымі? Прывядзіце прыклады.
2. Што можа паясняць дададная частка ў галоўнай? Прывядзіце прыклады.
3. Якія сродкі выкарыстоўваюцца для сінтаксічнай сувязі частак складаназалежнага сказа?
4. Які знак прыпынку ставіцца паміж часткамі складаназалежнага сказа?
5. Якія віды падпарадкавання існуюць у складаназалежных сказах з некалькімі дададнымі часткамі? Ахарактарызуйце кожны від падпарадкавання, прывядзіце прыклады.
6. У чым заключаецца адрозненне паміж складаназалежнымі сказамі з сузалежным аднародным і неаднародным падпарадкаваннем?


Правообладатель Национальный институт образования

# Бяззлучнікавыя складаныя сказы: будова, значэнне, ужыванне

## § 25. Паняцце пра бяззлучнікавы складаны сказ

**Бяззлучнікавы складаны сказ** — сказ, у якім часткі аб'яднаны ў адно цэлае сэнсава і інтанацыйна (без злучнікаў і злучальных слоў). Напрыклад: [1]*Родны край ніхто не выбірае*, [2]*выбірае родны край цябе* (Р. Барадулін).

Сродкамі сувязі ў бяззлучнікавых складаных сказах выступаюць:

- інтанацыя;
- парадак размяшчэння частак;
- формы выражэння выказнікаў (гэтыя формы, як правіла, супадаюць паводле часу і трывання). Напрыклад: [1]*На дварэ стаяла вясна*, [2]*распускаліся дрэвы*, [3]*цвіў бэз*, [4]*дацвітала чаромха*, [5]*свяціла сонца* (М. Лупсякоў). Гэта бяззлучнікавы складаны сказ, у ім часткі аб'ядноўваюцца ў сэнсава-граматычнае адзінства. Часткі звязаны тэматычна (тэма «Прыход вясны»), выказнікі выражаны дзеясловамі прошлага часу незакончанага трывання.

Бяззлучнікавыя складаныя сказы могуць характарызавацца аднатыпнасцю, раўназначнасцю частак і пералічальнай інтанацыяй. Паміж такімі часткамі можна ўставіць злучальны злучнік. У такім выпадку бяззлучнікавы сказ перабудоўваецца ў складаназлучаны. Напрыклад: [1]*Цвіла грэчка, разносячы свае пахі*, [2]*дзынкалі пчолы, пераляпаючы з кветкі на кветку* (І. Гурскі). Параўн.: [1]*Цвіла грэчка, разносячы свае пахі*, ***і*** [2]*дзынкалі пчолы, пераляпаючы з кветкі на кветку*.

Бяззлучнікавыя складаныя сказы могуць таксама характарызавацца разнатыпнасцю, калі адна частка ўдакладняе або паясняе другую. Паміж часткамі можна ўставіць падпарадкавальны



Правообладатель Национальный институт образования

злучнік (злучальнае слова). У такім выпадку бяззлучнікавы сказ перабудоўваецца ў складаназалежны. Напрыклад: [1]*Доўга не мог заснуць Міхась*: [2]*клапатлівыя думкі змянялі адна адну* (А. Пальчэўскі). Параўн.: [1]*Доўга не мог заснуць Міхась*, [2]***бо** клапатлівыя думкі змянялі адна адну*.

**168.** Прачытайце тэкст, дайце яму загаловак. Выпішыце бяззлучнікавыя складаныя сказы. Прачытайце іх і пракаменціруйце інтанацыю сказаў.

Бяззлучнікавыя складаныя сказы характарызуюцца складаным пунктуацыйным афармленнем. Адпаведна могуць узнікнуць цяжкасці пры выбары пунктуацыйнага знака: коскі, кропкі з коскай, двукроп'я або працяжніка. Таму важна выбраць паслядоўнасць у асэнсаванні матэрыялу: інтанацыя — сэнсавыя адносіны — знак прыпынку.

**Інтанацыя** — асноўны паказчык сэнсавых адносін паміж часткамі бяззлучнікавага складанага сказа.

Калі часткі ў бяззлучнікавым складаным сказе раздзяляюцца ***коскай***, яны вымаўляюцца з пералічальнай інтанацыяй з невялікім павышэннем тону голасу ў канцы кожнай часткі, за выключэннем апошняй, і раздзяляюцца невялікімі паўзамі: *Спадала гарачыня, гусцелі фарбы наваколля, духмяна пахла лугавой травой* (А. Варановіч). Умоўна гэта можна паказаць так: [↗], / [↗], / [↘].

Часткі, раздзеленыя ***кропкай з коскай***, вымаўляюцца з паніжэннем тону голасу пад канец кожнай, са значнымі паўзамі паміж імі. Часткі характарызуюцца інтанацыйнай завершанасцю і тэматычным адзінствам: *Ужо зацвілі верасы; пышнае ўбранне лісцвяных дрэў сям-там пачынала жаўцець; даспелы ліст, зрываючыся з галінак ад лёгкага подыху, трапятаўся, як матылёк* (М. Паслядовіч). Умоўнае абазначэнне: [↘]; // [↘]; // [↘].

Сказы з ***двукроп'ем*** паміж часткамі чытаюцца з невялікім паніжэннем тону голасу ў першай частцы, паўзай пасля яе і павышэннем голасу ў наступнай частцы: *Мы — тройчы дзеці ў вечным крузе: мы — дзеці роднае сям'і* (Н. Гілевіч). Умоўнае абазначэнне інтанацыі сказа: [↘]: // [↗].

Пры чытанні сказаў, часткі якіх раздзелены ***працяжнікам***, тон голасу павышаецца ў канцы першай часткі і рэзка паніжаецца



Правообладатель Национальный институт образования

ў другой: *Хацеў сказаць слова — язык не паварушыўся.* Умоўнае абазначэнне: [↗] — // [↘].

Такім чынам, чытанне з пэўнай інтанацыяй знаходзіць выражэнне ў знаку прыпынку паміж часткамі *(Паводле Н. Даўбешкі)*.

**169.** Прачытайце афарыстычныя выслоўі, прысвечаныя жанчыне. Спішыце выказванне, якое пабудавана як бяззлучнікавы складаны сказ. Прачытайце выпісаны сказ у адпаведнасці з правільным інтанацыйным афармленнем.

1. Глянуць адчужана зверху ўніз — святое жаночае права *(А. Вярцінскі)*. 2. Толькі багі судзяць гонар славянскай жанчыны *(В. Акола-ва)*. 3. Жанчына — таямніца з таямніц, пачатак шчасця і трывогі *(С. Грахоўскі)*. 4. З жанчынамі свет не старэе, ён маладзее, дабрэе *(А. Грачанікаў)*. 5. Жанчына — хараства вяршыня *(В. Жуковіч)*. 6. На беларускую дзяўчыну ніхто йшчэ каменем не кінуў і не паважыцца кідаць *(Я. Купала)*. 7. У жанчыны дзве святыні: сям'я і дзеці *(У. Рубанаў)*.

Чаму пісьменнікі так высока і прыгожа гавораць пра жанчыну?

**170.** Прачытайце тэкст. Падбярыце да яго загаловак. Абгрунтуйце свой выбар.

Язэп Драздовіч — **постаць** незвычайная ў гісторыі беларускага мастацтва, беларускай духоўнай культуры. Постаць магутная, **высакародная, прывабная.** Драздовіч быў не толькі выдатным **жывапісцам**, ён быў і таленавітым графікам, і **самабытным** скульптарам. А яшчэ ён збіраў народныя песні і запісваў словы для слоўніка беларускай мовы. Усё, чым ён займаўся, было яго прызваннем. Ён рабіў гэта **ад усёй душы.** Ён ведаў: гэта патрэбна культуры яго народа.

Біёграфы мастака **сцвярджаюць**, што ён памёр у час **вандроўкі** па роднай зямлі. Ён вельмі любіў падарожнічаць па Беларусі, асабліва па роднай яму паўночна-заходняй Віцебшчыне.

Вялікая, чыстая і святая любоў **поўніла** душу мастака і натхняла яго. Вось чым **уражваюць** нас яго творы. А яшчэ — **глыбока** гістарычным мысленнем, шырынёй інтэлектуальных **даляглядаў**, тонкім адчуваннем і выяўленнем нацыянальнага характару. Неацэнныя якасці мастака-творцы! *(Н. Гілевіч)*.

Выпішыце з тэксту бяззлучнікавыя складаныя сказы. Падкрэсліце ў іх граматычныя асновы.

Падбярыце сінонімы да выдзеленых слоў.



Правообладатель Национальный институт образования

**171.** Прачытайце тэкст. Вызначце тып выдзеленых сказаў паводле будовы. Вусна перабудуйце іх у бяззлучнікавыя складаныя сказы.

### Скарына пра Біблію і пра сябе

Імя Скарыны ведае, мабыць, кожны жыхар Беларусі. *I дарослы чалавек, і кожны школьнік скажуць, што Скарына — гэта наш беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар*[л]*, асветнік-гуманіст.* Бясспрэчна, Скарына — наша славутасць, наш гонар. Але ці ведаем мы Скарыну? Успрыняць Скарыну як асобу няпроста, нягледзячы на тое, што пішуць пра яго шмат. *Праўда, чытаць Скарыну без перакладу могуць далёка не ўсе, бо яго мова шмат у чым адрозніваецца ад сучаснай.* Але нам трэба чытаць Скарыну, уважліва ўглядацца і ўдумвацца[м] ў словы, напісаныя ім, старацца спасцігнуць яго думкі.




Многія нашы суайчыннікі памятаюць урывак з яго прадмовы да кнігі Юдзіф: «Паколькі ад прыроды звяры, якія ходзяць па пустыні, знаюць ямы свае, птушкі, якія лятаюць у паветры, ведаюць гнёзды свае, рыбы, якія плаваюць у моры і ў рэках, адчуваюць[ф] віры свае, пчолы і падобныя ім абараняюць вуллі свае, — то таксама і людзі, дзе яны нарадзіліся... да таго месца вялікую міласць маюць».

*Гэта сапраўды прыгожыя і паэтычныя словы, якія сведчаць пра любоў да сваёй краіны і свайго народа.* Гэту любоў Скарына лічыў натуральным пачуццём, уласцівым ад прыроды кожнаму чалавеку. *Сцвярджаючы любоў да сваёй радзімы, Скарына нагадвае, што родныя мясціны павінны быць дарагімі для людзей (Паводле С. Гардуна).*

● Знайдзіце ў тэксце сказы з пабочнымі словамі, зрабіце сінтаксічны разбор аднаго з іх.

Раскажыце, дзе ўстаноўлены помнікі Ф. Скарыну, у якіх гарадах свету ёсць вуліцы, названыя ў гонар беларускага першадрукара.

**172.** Спішыце сказы, устаўляючы прапушчаныя літары. Падкрэсліце граматычныя асновы і вызначце сродкі сувязі ў бяззлучнікавых складаных сказах.

1. Звонка сві..чуць шпакі, неўзабаве з'яв..цца шчабятлівыя ластаўкі *(З. Бядуля)*. 2. Усё вакол знаёма.. да болю: зб..гаюць не-


Правообладатель Национальный институт образования

забудкі да вады, сяда.. важна бусел на таполю, ад ластавак абвіслі правады *(Г. Бураўкін)*. 3. Бл..снула маланка — стала відна як удзень *(С. Грахоўскі)*. 4. Н..ма народаў малых — бываюць малыя паэты *(Р. Барадулін)*. 5. На Прывакзальнай плошчы было людна: н..даўна, відаць, пры..шоў прыгарадны ц..гнік *(В. Адамчык)*.

- Вусна вызначце часціны мовы ў сказе, ускладненым пабочным словам.

## § 26. Сэнсава-граматычныя адносіны паміж часткамі ў бяззлучнікавым складаным сказе

Сэнсавыя адносіны паміж часткамі ўплываюць на пунктуацыйнае афармленне бяззлучнікавых складаных сказаў. Паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах могуць выражацца наступныя **сэнсавыя адносіны:**

- **спалучальныя (пералічальныя).** Напрыклад: *Будзе гай на гары гаманіць, будзе плакаць у лузе каліна* (П. Трус). *Канчаецца паляна, пачынаецца бярэзнік, куп'ё* (І. Пташнікаў). Паведамляецца пра дзеянні, якія адбываюцца адначасова або паслядоўна;
- **супастаўляльныя** або **супрацьпастаўляльныя.** Напрыклад: *Крыкнуць хацелася — голас замёр* (П. Броўка). Паведамляецца пра дзеянні, якія супрацьпастаўляюцца;
- **прычынныя.** Напрыклад: *Не шукай сваіх сярод чужых: роднымі не зробяцца чужыя* (Р. Барадулін). Другая частка раскрывае прычыну дзеяння, названага ў першай частцы;
- **выніковыя.** Напрыклад: *Прыязджайце да нас — сустрэнем як родных*. Другая частка раскрывае вынік таго, пра што ідзе гаворка ў першай частцы;
- **умовы.** Напрыклад: *Хай пройдзе суткі цёплы дождж — пойдуць у рост баравікі*. Раскрываецца ўмова, пры якой дзеянне можа адбыцца;
- **часавыя.** Напрыклад: *Не прайшло і гадзіны — у сваё гняздо вярнуліся буслы* (В. Вітка). У першай частцы ўказваецца час дзеяння, пра якое паведамляецца ў другой;
- **паясняльныя.** Напрыклад: *Гісторыкі сведчаць: пра нашу Беларусь ведалі ўжо ў старажытныя часы* (Я. Пархута). Другая частка паясняе, удакладняе папярэднюю.


Правообладатель Национальный институт образования

**173.** Выкарыстоўваючы матэрыял правіла і табліцы, падрыхтуйце паведамленне пра сэнсава-граматычныя адносіны паміж часткамі ў бяззлучнікавым складаным сказе.

| СЭНСАВА-ГРАМАТЫЧНЫЯ АДНОСІНЫ ПАМІЖ ЧАСТКАМІ Ў БЯЗЗЛУЧНІКАВЫМ СКЛАДАНЫМ СКАЗЕ |
|---|
| → спалучальныя (пералічальныя) |
| → супастаўляльныя або супрацьпастаўляльныя |
| → прычынныя |
| → выніковыя |
| → умовы |
| → часавыя |
| → паясняльныя |

**174.** Прачытайце тэкст. Растлумачце значэнне выдзеленых слоў і выразаў. Знайдзіце ў тэксце бяззлучнікавыя складаныя сказы. Вызначце сэнсава-граматычныя адносіны паміж іх часткамі.

### Яўхім Карскі як пачынальнік акадэмічнага беларусазнаўства

**Спадчына**[л] акадэміка Я. Карскага яшчэ **як след** не вывучана, яго роля ў развіцці беларусазнаўства не вызначана належным чынам. Зробленае Я. Карскім дае **падставу** бачыць у яго асобе вучонага, які стварыў надзейны **падмурак** для навукі пра беларусаў. Вывучэнне розных галін дзейнасці свайго народа — гісторыі, старажытнай **пісьменнасці,** мовы, літаратуры — дазволіла раскрыць сутнасць беларускага **этнасу**, паказаць яго самастойнасць і самабытнасць.

**Манаграфія** Я. Карскага і іншыя шматлікія працы аўтара засведчылі: вывучэнне Беларусі, яе культурнай спадчыны набыло **класічны акадэмічны** характар. Вучоны **плённа** распрацоўваў і **прыкладны́я*** напрамкі беларусазнаўства. Гэта дыктавалася настойлівай патрэбай часу. **Стратэгічнымі** заставаліся **фундаментальныя** аспекты ведаў пра Беларусь. Я. Карскаму суджана было стаць **заснавальнікам** беларускага мовазнаўства, літаратуразнаўства, фальклярыстыкі, **бібліяграфіі.**

Вывучэнне беларускай мовы, яе дыялектных і літаратурных асаблівасцей заняло цэнтральнае месца ў манаграфіі Я. Карскага


Правообладатель Национальный институт образования

«Беларусы», само выданне ацэньваецца як унікальнае навуковае даследаванне. Роднае слова ў Карскага — носьбіт народнага духу са старажытных часоў, яно захоўвала і перадавала традыцыйную культуру беларусаў *(Паводле А. Пяткевіча)*.

Сфармулюйце і запішыце пытанні да тэксту, задайце іх аднакласнікам.

Запішыце апошні абзац тэксту, перабудаваўшы бяззлучнікавыя складаныя сказы ў складаназлучаныя або складаназалежныя.

- Зрабіце сінтаксічны разбор складаназалежнага сказа (гл. Дадатак, с. 202).

**175.** Прачытайце тэкст.

Чалавек павінен ведаць не толькі родную, але і іншыя мовы. Чалавек ёсць не проста homo sapiens, а homo loguens — чалавек, які гаворыць. З пяці-шасці тысяч моў мова, якая яму наканавана лёсам, на якой ён будзе гаварыць, — гэта выпадковасць[ф]. Калі б вас немаўляткам перадалі на выхаванне ў кітайскую сям'ю, вы цудоўна гаварылі б па-кітайску. З няведаннем роднай мовы страчваецца нацыянальна-культурнае светаўспрыманне: лексіка, родная мова пэўным чынам уводзяць[ф] нас у вялікі свет. У кожнага народа — самабытная карціна свету: кожная мова, як кажуць немцы, — гэта прамежкавы свет.

Вось чаму прыняты міжнародны дакумент «Сусветная дэкларацыя культурнай разнастайнасці». Захаваць культурную разнастайнасць свету — значыць захаваць і ўсе мовы, якія[ф] можна захаваць, абараніць *(Паводле А. Міхневіча)*.

Адкажыце на пытанні, выкарыстоўваючы бяззлучнікавыя складаныя сказы. *Чаму трэба ведаць родную мову? Што азначае «захаваць культурную разнастайнасць свету»?*

- Выпішыце з тэксту просты ўскладнены сказ, зрабіце яго сінтаксічны разбор.

**176.** Спішыце сказы, устаўляючы прапушчаныя літары. Вызначце сэнсава-граматычныя адносіны паміж часткамі бяззлучнікавых складаных сказаў.

1. Кранеш галінку плячом — на твар з лістоты пасыпл..цца раса. 2. У цішын.. кватэры было чуваць: на канапе[л] мурлыкаў кот. 3. Сонца прыгр..вала, лес аж звінеў а.. птушыных галасоў[сн] *(К. Чорны)*. 4. Маўчала ноч па-над палянай, з..лёны гай не гаманіў *(М. Танк)*. 5. Растае снег, б..гуць ручайкі, сп..ваюць жаўрукі[сн] *(М. Лупсякоў)*.



Правообладатель Национальный институт образования

## § 27. Знакі прыпынку паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах. Коска і кропка з коскай паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах

У бяззлучнікавых складаных сказах звычайна адна частка аддзяляецца ад другой *коскай* або *кропкай з коскай*.

**Коскай** р а з д з я л я ю ц ц а раўназначныя, аднатыпныя часткі бяззлучнікавага складанага сказа, у якіх паведамляецца пра падзеі і з'явы, што адбываюцца адначасова або паслядоўна. Напрыклад: 1)*Пасля адлігі закруціў мароз*, 2)*ударыла ў сцены завіруха*, 3)*шыпшыннік за маім акном аброс празрыстым, лёгкім лебядзіным пухам* (С. Грахоўскі).

**Кропка з коскай** паміж часткамі бяззлучнікавага складанага сказа с т а в і ц ц а:

- калі часткі маюць ускладненую будову і свае знакі прыпынку. Напрыклад: *Аціраюць тварыкі пралескі промнем, як лагодным ручніком; ля бяроз празрыстых на ўзлеску папярхнуўся сокам першы гром* (Г. Ракоца);
- калі часткі развітыя і вызначаюцца адноснай сэнсавай самастойнасцю. Напрыклад: *Месяц паціхеньку сунецца ў небе; на ўтаптаным доле варушацца нашы кароткія цені; роснай свежасцю дыхае сонны абшар* (В. Быкаў).

**177.** Прачытайце сказы з адпаведнай інтанацыяй, растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

1. Грыміць пагрозліва няблізкі гром, сінеюць воддаль хмары, быццам горы *(А. Зарыцкі)*. 2. Адлятаюць у вырай птушкі, паволі засынае прырода *(А. Шкляр)*. 3. Звініць лістапад залатымі дажджамі; ляцяць журавы над палямі, лугамі, над Прыпяццю сіняй *(П. Панчанка)*. 4. Мінулі завеі, панурыя дні; гараць на ўсходзе зарніц агні *(М. Танк)*. 5. Каля зоркі зорка ўніз глядзіць, мігціць; каля горкі горка снегам зіхаціць *(Я. Купала)*. 6. Снег рыхлы з'елі туманы, бярозавік цячэ ў збаны *(А. Бялевіч)*. 7. Сінеўся бор, цякла вада, скрозь пахла мёдам і травою *(М. Багдановіч)*.


Правообладатель Национальный институт образования

**178.** Прачытайце тэкст. Выпішыце бяззлучнікавы складаны сказ, зрабіце яго сінтаксічны разбор (парадак і ўзор разбору змешчаны ў Дадатку, с. 205).

У творах вядомага сучаснага беларускага пісьменніка Янкі Сіпакова звяртае ўвагу экспрэсіўнае функцыянаванне бяззлучнікавых сказаў. Яны дазваляюць разгортваць дзеянне ў паслядоўнасці, пералічваць падзеі, аб'ядноўваць аб'екты апісання.

Так, апісанні прыроды, афармленыя пры дапамозе складаных канструкцый, адрозніваюцца ад малюнкаў, створаных простымі сказамі. Простыя сказы называюць дэталі агульнай карціны, падаю́ць апісанне асобнымі штрыхамі. Таму такія замалёўкі ў кантэксце звычайна набываюць ролю фону, на якім разгортваюцца падзеі: *Ранні снег ужо растае. Ад зямлі ідзе густая па́ра. З-пад снегу паказваецца цёмна-зялёная, прамерзлая і таму ядраная трава* (Я. Сіпакоў).

Складаныя сказы вылучаюць на першы план менавіта сувязі, узаемаадносіны ўсіх дэталей: асобныя аб'екты наваколля выступаюць як элементы больш складанага цэлага: *Каля сонца круціцца невялікая хмарка, вільготныя барханы дыхаюць прахалодаю, павявае ветрык, ён хараша асвяжае зялёныя, як пагоркі, барханы, зялёныя краявіды...*

Прыведзены сказ дазваляе стварыць цэласны малюнак жывой прыроды *(В. Русак)*.

**179.** Прачытайце верш. Сфармулюйце яго асноўную думку, аформіце і запішыце яе як бяззлучнікавы складаны сказ.

Дала мне маці гэту мову,
каб не нямым прыйшоў[с] у свет,
дала мне маці гэту мову,
як спадчыну і запавет.
Была яна не беларучкай
і на жніве, і на сяўбе;
на глебе добрай беларускай
здабыты словы ўсе яе.
Прапахлі сонцам і падзолам,
дажджамі, сокамі раслін,
пад знак рукам яе мазольным,
што мелі толькі ў сне спачын.



Правообладатель Национальный институт образования

Дачка мая! У жыццёвай[с] прозе,
у буднях і святочным днём
не пакідай яе ў парозе,
калі ў нечы ўвойдзеш[с] дом.

*А. Пысін.*

Ахарактарызуйце кожнае чатырохрадкоўе верша як тып сказа.

Выпішыце з тэксту бяззлучнікавы складаны сказ, падкрэсліце ў ім граматычныя асновы, прааналізуйце іх паводле выражэння дзейніка і выказніка.

Падбярыце і запішыце прыметнікі-азначэнні да слова *мова*. Напрыклад: *мова родная, трапяткая*... Выкарыстайце іх для невялікага выказвання на тэму «Наша родная мова».

**180.** Прачытайце тэкст, растлумачце яго назву. Да якога стылю маўлення належыць тэкст? Каму ён адрасаваны? Назавіце словы і моўныя сродкі, характэрныя для гэтага стылю.

## Усе ведаюць, як прайсці ў гэту бібліятэку

Першае, што бачыш, заязджаючы[м] ў Мінск з боку Масквы, — «алмаз», які зіхаціць усімі гранямі. Любы́ беларус з гонарам скажа: «Гэта наша, гэта мая бібліятэка!»



«Нацыяналку» будавалі на народныя грошы: ладзілі суботнікі, праводзілі тэлемарафоны. Так у Беларусі з’явілася адно з найлепшых кнігасховішчаў у Еўропе: бібліятэка налічвае больш за дзевяць мільёнаў кніг. У чытальных залах адначасова могуць размясціцца дзве тысячы чалавек.

Усё ў будынку зроблена па апошнім слове тэхнікі — галоўнай «фішцы» могуць пазайздросціць нават самыя знакамітыя чытальні[сл] свету. «У нас аўтаматызаваныя пошук і дастаўка кніг», — з гонарам адзначаюць бібліятэкары. Вы робіце заказ, у сховішча паступае заяўка, там знаходзяць патрэбную кніжку, упакоўваюць у спецыяльны бокс-шарык. Вы не паспееце каву дапіць — кніга ўжо чакае вас.


Правообладатель Национальный институт образования

Ёсць аддалены доступ да ўсіх рэсурсаў праз інтэрнэт, для гэтага трэба зарэгістравацца на афіцыйным сайце бібліятэкі nlb.by. *(Паводле К. Хілько).*

Знайдзіце ў тэксце бяззлучнікавыя складаныя сказы. З дапамогай табліцы (практ. 173) вызначце сэнсава-граматычныя адносіны паміж іх часткамі.

На аснове тэксту складзіце і запішыце простыя, складаназлучаны, складаназалежны і бяззлучнікавы складаны сказы на тэму «Нацыянальная бібліятэка Беларусі».

Падрыхтуйце падрабязны пераказ тэксту паводле плана:
1. Гэта наша бібліятэка!
2. Адно з найлепшых кнігасховішчаў Еўропы.
3. Усё зроблена па апошнім слове тэхнікі.
4. Ёсць аддалены доступ да ўсіх рэсурсаў бібліятэкі.

**181.** Спішыце сказы, расстаўляючы прапушчаныя знакі прыпынку.

1. На зямлю сырую ціха ночка па́ла бляскам-дрыгаценнем зорка замігала *(Я. Колас)*. 2. Прайшла вясна садамі адспявалі салаўі адзванілі на пакосе адцвілі брусніц кусты *(П. Броўка)*. 3. Марозны ветрык пашчыпваў[с] шчокі і нос лёгкія паслухмяныя лыжы весела шалясцелі па снезе *(Я. Бяганская)*. 4. Птушку пазнаюць у палёце чалавека — па рабоце[сн] *(Прыказка)*. 5. Апранаюцца ў зеляніну хмызнякі зямля атуленая цяплом чакае блізкай навальніцы[сн] *(М. Лупсякоў)*.

## § 28. Двукроп'е паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах

**Двукроп'е** паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах с т а в і ц ц а, калі:

● другая частка паясняе, удакладняе, раскрывае змест першай. У такім выпадку паміж часткамі можна ўставіць злучнікі ***што, як*** або словы ***а іменна***. Напрыклад: 1)*Мы знаем:* 2)*у нашай краіне няма непрыгожай зямлі* (П. Панчанка);

● другая частка раскрывае прычыну таго, пра што гаворыцца ў першай частцы. Паміж часткамі можна ўставіць злучнікі ***бо, таму што***. Напрыклад: 1)*Як позна ліпы сёлета цвітуць:* 2)*было так доўга холадна і хмарна* (П. Панчанка);


Правообладатель Национальный институт образования

● другая частка дапаўняе выказнік першай часткі. Звычайна ў ролі выказніка выступаюць словы са значэннем успрымання ***(убачыць, пачуць, адчуць, зразумець, падумаць, успомніць, разважыць, прыслухацца)***. Паміж часткамі можна ўставіць словы ***і ўбачыў, што; і пачуў, што; і адчуў, што*** і пад. Напрыклад: [1]*Зірнеш з акна:* [2]*нібыта кветкі — на сініх вербах снегіры* (А. Вялюгін);

● другая частка разгортвае значэнне першай часткі. Як правіла, у такім выпадку першая частка афармляецца як безасабовы сказ. Напрыклад: [1]*Падумалася:* [2]*хутка прыйдзе вясна.* [1]*Стала зразумела:* [2]*дажджу не мінуць*;

● другая частка ўяўляе сабой прамое пытанне. Напрыклад: *Перад гаспадаром паўстала праблема: як камфортна размясціць гасцей?*;

● у першай частцы ёсць словы ***так, такі, адзін (адна, адно)***, змест якіх раскрываецца ў другой частцы. Напрыклад: [1]*Зробім **так:*** [2]*вы адпачняце,* [3]*я прыгатую вячэру*;

● першая частка выступае як абагульняльная ў адносінах да наступных частак, якія раскрываюць яе змест. Напрыклад: [1]*Зямля жыве:* [2]*у бераг б'юць прылівы,* [3]*у вырай адлятаюць журавы* (С. Грахоўскі).

**182.** З апорай на схемы раскажыце, калі ставіцца двукроп'е паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах.

1. [   ] : [прычына].
2. [   ] : [удакладненне, паясненне].
3. [   ] : [канкрэтызацыя выказніка].
4. [безасабовы сказ] : [разгортванне значэння].
5. [   ] : [прамое пытанне]?
6. [так (такі, адно)] : [раскрыццё зместу].
7. [абагульняльная частка] : [   ], [   ].

**183.** Прачытайце сказы, захоўваючы патрэбную інтанацыю. Пракаменціруйце пастаноўку знакаў прыпынку паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах.

1. **Серабрыцца** снег, мігацяць **незлічоныя** мільёны брыльянцістых іголак, **вецер-кусака** шчыпле за шчокі, нос *(М. Лынькоў).*


Правообладатель Национальный институт образования

2. Гарачае **сонца** пачынае парад: вясну пачынаць пара *(П. Панчанка)*. 3. Спахмурнелі ясны вочы ў хлопца маладога: ён **адказу** ад дзяўчыны не чакаў такога *(Я. Купала)*. 4. Вузенькі двор, акуратныя, зачыненыя веснічкі, каля вокнаў весела **зелянеюць** маладая ліпа і два кусты бэзу *(І. Мележ)*. 5. Над ракою **ў спакоі зацвітала** каліна; у сяле за ракою вырастала **дзяўчына** *(Я. Купала)*.

- Растлумачце арфаграмы ў выдзеленых словах.

**184.** Спішыце сказы, устаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары, раскрываючы дужкі і расстаўляючы знакі прыпынку.

1. Тут раслі магутныя сасновыя бары з..л..нелі *(не)*абсяжныя плошчы ельніку і піхтарніку залаціліся *(ў)*восень цэлыя гаі бяроз і асін *(А. Чарнышэвіч)*. 2. На вёсцы чуліся ранішнія гукі недзе скрыпнуў калодз..жны журавель бразнулі хатнія дз..веры *(А. Чарнышэвіч)*. 3. Ра..цв..тала вясна красавалі лясы ў вянках з..л..ніны купчастай на прасторах вясны пад шатрамі красы гадаваліся доля і шчасце *(П. Глебка)*. 4. Лес хутка залеч..вае свае раны ранн..й вясной ён зноў з..лёны і в..сёлы *(Р. Няхай)*. 5. А..спявала лета песні ўсе сабрала каласы пад сасонкамі на ўзлесс.. ра..цвітаюць в..расы *(Я. Пушча)*. 6. Кажуць людзі ў год раз ночкай з гуслямі дзед з кургана як снег белы выходзіць *(Я. Купала)*.

Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах.

**185.** Прачытайце тэкст. Знайдзіце ў ім запазычаныя словы, растлумачце іх значэнне. Назавіце прыметы, паводле якіх мы вызначаем гэтыя словы як запазычаныя.

## Папера супраць фармату epub

Значэнне электроннай кнігі сёння пераацаніць складана. Мы прывыклі лічыць, што гэта з'ява — асаблівасць XXI стагоддзя. Мала хто ведае: першы e-text датуецца 1971 годам. Кнігай-піянерам у электронным фармаце стала «Дэкларацыя незалежнасці ЗША». Гэта падзея паслужыла пачаткам стварэння праекта «Гутэнберг», мэтай якога стала распаўсюджванне электроннай універсальнай бібліятэкі. Што прынеслі электронныя кнігі грамадству на самай справе? У 2010 годзе ў ААН было праведзена пасяджэнне, на ім прагучаў прагноз адносна знікнення папяровых газет ужо ў 2040 годзе.


Правообладатель Национальный институт образования




Людзі прыходзяць да электронных выданняў па розных прычынах: для адных гэта спосаб бясплатна атрымаць інфармацыю, нехта аддае перавагу зручнасці і мабільнасці, некаторыя змагаюцца за экалогію і такім чынам захоўваюць лес.

На сённяшні дзень самы папулярны фармат электроннай кнігі ў Еўропе — epub. У Беларусі сітуацыя іншая: у нас большае распаўсюджанне мае фармат fb2. Хутчэй за ўсё, гэта звязана з тым, што ён чытаецца ўсімі прыладамі, нават самымі «старажытнымі». На другім месцы для беларусаў — mobi, які падыходзіць для iPhone і распаўсюджаных электронных кніг — Amazon Kindle.

Цяпер вакол электронных кніг шмат дыскусій, спрэчкі вядуцца не толькі сярод чытачоў, але і сярод пісьменнікаў. Аднак якасны літаратурны твор будзе мастацтвам на любым носьбіце. Папяровая старонка або электронны экран не мяняе сэнсу таго, што чытае чалавек. Носьбіт толькі стварае эфект. Гэта як фарматы 3D / 2D, толькі тут камфорт і мабільнасць дыктуюць адваротную дынаміку і спрашчэнне. Але факт застаецца фактам: папяровыя кнігі будуць друкавацца яшчэ доўгі час *(І. Навасельцава)*.

Выпішыце з тэксту бяззлучнікавыя складаныя сказы, падкрэсліце граматычныя асновы і вызначце сэнсавыя адносіны паміж часткамі. Пракаменціруйце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах.

Як вы мяркуеце: за якой кнігай будучыня — папяровай ці электроннай? Абгрунтуйце адказ. Аргументы афарміце з дапамогай бяззлучнікавых складаных сказаў.

Напрыклад: *Перавага застаецца за папяровай кнігай: гэтай кнізе не патрэбныя тэхнічныя сродкі падтрымкі (камп'ютар, электрычнасць) і г. д.*

- Знайдзіце ў тэксце складаназалежныя сказы, вызначце від даданых частак. Перабудуйце складаназалежныя сказы ў бяззлучнікавыя складаныя (калі гэта магчыма).
- Выпішыце з першага сказа тэксту ўсе словазлучэнні, вызначце віды сувязі паміж кампанентамі словазлучэнняў.


Правообладатель Национальный институт образования

**186.** Прачытайце тэкст. Выберыце загаловак тэксту з прапанаваных варыянтаў: *«Будзем разам!», «Беларускія эмігранты — нашы землякі», «У сталіцы прайшоў з'езд беларусаў свету», «Беларусы свету», «Беларусы замежжа», «Беларусы ўсіх краін, яднайцеся!»*. Аргументуйце свой выбар.

Каля берага Свіслачы ў Траецкім прадмесці Мінска 8 верасня 2017 года адкрылі скульптурную **кампазіцыю** «Беларусам замежжа» — трохметровы памятны знак у форме кола, **апаясанага** ручніком з нацыянальным **арнаментам.** Памятны знак сімвалізуе нялёгкі шлях дачок і сыноў Беларусі, якія праз пэўныя абставіны апынуліся ў розных месцах свету і захавалі любоў да Радзімы.

У 2017 годзе адбылася значная для ўсёй беларускай **супольнасці** падзея — VII з'езд беларусаў свету, арганізаваны Міжнародным грамадскім аб'яднаннем «**Згуртаванне** беларусаў свету "Бацькаўшчына"». У з'ездзе 15—16 ліпеня ў Мінску ўзялі ўдзел 228 дэлегатаў, з якіх 160 — прадстаўнікі беларускага замежжа з 20 краін свету. Мерапрыемства адбываецца нячаста — раз на чатыры гады. Яго можна лічыць **унікальнай нагодай** для беларускай грамады: гэта выдатная магчымасць сустрэцца і абмеркаваць пытанні супрацоўніцтва дыяспары* і метраполіі*.

VII з'езд быў прысвечаны тэме «Беларуская нацыя, беларуская дзяржаўнасць, беларускае замежжа — выклікі сучаснасці і стратэгія развіцця». Скразной лініяй з'езда праходзіла тэма мовы як асновы **ідэнтыфікацыі**, як дзяржаваўтваральнага элемента. Без мовы не можа існаваць ні дзяржава, ні нацыя *(Паводле І. Навасельцавай)*.

Растлумачце значэнне выдзеленых слоў.

Выпішыце бяззлучнікавы складаны сказ з тэксту, растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў ім.

- Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў 1-м сказе.
- Выпішыце па два колькасна-іменныя словазлучэнні з колькаснымі і парадкавымі лічэбнікамі (лічбы запішыце словамі).

**187.** Прааналізуйце схемы да правіл «Коска паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах», «Кропка з коскай паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах», «Двукроп'е паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах». Да прыведзеных схем складзіце і запішыце ўласныя прыклады.



Правообладатель Национальный институт образования

## § 29. Працяжнік паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах

**Працяжнік** паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах с т а в і ц ц а, калі:

● у першай частцы ўказваецца на ўмову або на час дзеяння, пра якія паведамляецца ў другой частцы. У такім выпадку ў першую частку можна ўставіць злучнік ***калі***. Напрыклад: [1]*Сонца паднялося вышэй* — [2]*на зямлю сышла гарачыня* (І. Мележ);

● другая частка ўтрымлівае вывад з таго, пра што паведамляецца ў першай. На месцы працяжніка можна ўставіць злучнікі ***і, аж, таму***. Напрыклад: [1]*Заспявае жаўрук* — [2]*вясна адгукаецца ў сэрцы гулам* (В. Ададурава);

● змест частак супрацьпастаўляецца або супастаўляецца. Паміж такімі часткамі можна ўставіць злучнікі ***але, ды, а***. Напрыклад: [1]*Рад бы госцю* — [2]*прысмакаў шкада*;

● у сказе гаворыцца пра хуткую змену падзей, нечаканасць. На месцы працяжніка можна ўставіць злучнік ***і***. Напрыклад: [1]*Раптам бераг адступае* — [2]*луг зялёны вырастае* (М. Танк);

● апошняя частка з'яўляецца абагульняльнай у адносінах да папярэдніх. Напрыклад: [1]*Ніжэй стала хадзіць сонца,* [2]*пажаўцела трава на паплавах,* [3]*збіраюцца стайкамі вераб'і* — [4]*усё гаворыць аб наступленні восені* (В. Хомчанка);

● другая частка з'яўляецца параўнаннем у адносінах да першай. Паміж часткамі можна ўставіць злучнікі ***як, быццам, як быццам***. Напрыклад: [1]*Князь без дружыны* — [2]*без лука страла* (В. Зуёнак).

**188.** Выкарыстоўваючы схемы, складзіце апорны канспект правіла «Працяжнік паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах». Падбярыце адпаведныя сказы-прыклады.

1. [Умова / час дзеяння] — [ ].
2. [ ] — [вывад].
3. [ ] — [ ]. (Змест супрацьпастаўляецца.)
4. [ ] — [ ]. (Хуткая змена падзей.)
5. [ ], [ ], [ ] — [абагульненне].
6. [ ] — [параўнанне].



Правообладатель Национальный институт образования

**189.** Прачытайце сказы, захоўваючы патрэбную інтанацыю. Пракаменціруйце пастаноўку знакаў прыпынку паміж часткамі бяззлучнікавых складаных сказаў.

1. Вясна мінецца — прыйдзе лета *(Я. Колас)*. 2. Жыццё шліфуе людзей, людзі шліфуюць жыццё *(Ц. Гартны)*. 3. Не каліна над вадою пахіліла голле — плача маці сярод поля, праклінае долю *(П. Трус)*. 4. Разгарнуць хачу я крылле — я ў свет вольны палячу *(Я. Колас)*. 5. За сталом на верашчаку[л] рыхтавалі ўжо атаку — на гэта хлопцы былі хва́ты *(Я. Колас)*. 6. Спакой і ціш — былінка нават не хіснецца *(Я. Колас)*.

**190.** Перабудуйце складаназлучаныя і складаназалежныя сказы ў бяззлучнікавыя. Запішыце, пастаўце знакі прыпынку, вызначце розніцу ў значэннях сінанімічных канструкцый.

У з о р. *Міхал адчуў, як на хвіліну адышла, адпусціла душу трывога* (Х. Лялько). — *Міхал адчуў: на хвіліну адышла, адпусціла душу трывога.*

1. Вопыт пакаленняў нічому не вучыць, бо кожны мае прайсці свой шлях цаною страт і набыткаў *(Г. Марчук)*. 2. Багатая душа маладая, бо старэць ёй няма калі *(Р. Барадулін)*. 3. Калі Бог захоча пакараць чалавека, ён задавальняе ўсе яго пажаданні *(А. Макаёнак)*. 4. Не прайшло і паўгадзіны, як хмары закрылі ўсё неба *(І. Мележ)*. 5. Магчыма, бывае малая любоў, але святыні малой не бывае *(В. Жуковіч)*.

**191.** Спішыце, устаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары, раскрываючы дужкі і расстаўляючы знакі прыпынку. Абгрунтуйце выбар знакаў прыпынку паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах.

1. Хочаш быць разумным бяры прыклад з разумных людзей *(А. Чарнышэвіч)*. 2. Узросту н.. мае гармонія н.. ведае межаў краса *(Н. Мацяш)*. 3. Смерці ў Паэта няма ёсць нараджэнне *(Я. Янішчыц)*. 4. Без Радзімы народ.. н..ма без народ.. н..ма Радзімы *(Р. Барадулін)*. 5. Голас *(не)*знаёмага можа з..дзівіць голас друга — на хвіліну спыніць голас любай — сагрэць со..цам лета голас маці — в..рнуць з таго свет.. *(М. Танк)*. 6. Размова — мова думак маўчан..е[сл] — мова ісціны *(А. Разанаў)*.

- Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў межах частак у 5-м і 6-м сказах.


Правообладатель Национальный институт образования

**192.** Устанавіце адпаведнасць паміж бяззлучнікавымі складанымі сказамі і правіламі пастаноўкі знакаў прыпынку паміж іх часткамі.

1. Дні прайшлі адшалясцелі зоры на гарачых крылах навальніц *(М. Танк)*.

2. Дзятлы заняты звычайнай работай яны шукаюць у кары на абед чарвякоў *(А. Якімовіч)*.

3. Хацеў сказаць не хапіла адвагі *(В. Адамчык)*.

а) Двукроп'е ставіцца, бо другая частка раскрывае прычыну таго, пра што гаворыцца ў першай частцы.

б) Коска ставіцца паміж часткамі бяззлучнікавага складанага сказа, бо выражаюцца сэнсавыя адносіны паслядоўнасці.

в) Працяжнік ставіцца, бо другая частка паказвае на вынік таго, пра што ідзе размова ў першай частцы.

г) Двукроп'е ставіцца, таму што другая частка раскрывае змест першай часткі.

д) Працяжнік ставіцца, таму што змест частак супрацьпастаўляецца.

**193.** Прачытайце выказванні пра значэнне роднай мовы ў жыцці грамадства.

1. Роднае слова — сродак духоўнай сувязі пакаленняў, паказчык самабытнасці, культурнай прыналежнасці і самастойнасці народа *(В. Протчанка)*.

2. Мова — адна з найважнейшых прымет нацыі, падмурак этнічнага самаўсведамлення народа, аснова яго культуры. Праз родную мову чалавек знаёміцца са светам, праз матчыну мову ён становіцца грамадзянінам сваёй дзяржавы, праз родную мову ажыццяўляецца непарыўная сувязь чалавека са сваім народам *(Л. Сямешка)*.

3. Мова — гэта не толькі сродак, з дапамогай якога людзі наладжваюць сувязі, абменьваюцца інфармацыяй, яна — своеасаблівае люстэрка жыцця і працы народа, яго грамадскага і культурнага развіцця. Мова адлюстроўвае жыццёвы вопыт народа, асаблівасці яго мыслення і псіхікі, маральна-этычныя і эстэтычныя нормы *(Л. Сямешка)*.



Правообладатель Национальный институт образования

4. Мова — душа народа. Як вобразнае параўнанне ўжываем мы гэты выраз. Гаворым так, каб засведчыць, што мова — тонкая, далікатная духоўная сфера, найбольш істотная прымета ў азначэнні нацыі, у вызначэнні яе сутнасці *(М. Шавыркін)*.

Ахарактарызуйце сказы паводле будовы ў выказваннях 1, 2, 4. На аснове прачытанага запішыце 4 сказы на тэму «Беларуская (родная) мова» (просты, складаназлучаны, складаназалежны, бяззлучнікавы складаны). Пабудуйце схемы запісаных сказаў.

**194.** Выканайце інтэрактыўнае заданне па тэме «Знакі прыпынку паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах»: размяркуйце бяззлучнікавыя складаныя сказы па групах у залежнасці ад пастаноўкі знакаў прыпынку.

**195.** Прачытайце тэкст. Дайце азначэнне паняццю «пераклад». Якімі сродкамі вы карыстаецеся пры перакладзе тэксту? Ці карыстаецеся вы электронным перакладчыкам? Вы перачытваеце перакладзены тэкст?

Пры перакладзе трэба памятаць: пераклад — гэта стварэнне тэксту на аснове прапанаванага сродкамі іншай мовы. Пераклад — гэта творчы працэс, ён складаецца з некалькіх этапаў:

1) уважлівага прачытання і аналізу прапанаванага тэксту-арыгінала;

2) перадачы зместу і форм яго выражэння ў адпаведнасці з нормамі мовы.

Пры перакладзе патрэбна пазбягаць памылак і недахопаў, характэрных для гэтага віду працы:

а) скажэнняў — адхіленняў зместу перакладу ад зместу арыгінала;

б) недакладнасцей — памылак, якія не дазваляюць дакладна перадаць пэўную інфармацыю.

Прычынамі сэнсавых памылак пры перакладзе звычайна з'яўляюцца няправільнае разуменне зместу арыгінала або няўменне правільна вызначыць кантэкстуальнае значэнне слова ці поўнае неразуменне яго значэння. Таму пры перакладзе патрэбна карыстацца не толькі паслугамі Google Translate, але і тлумачальнымі, перакладнымі і іншымі слоўнікамі.

Ці былі ў вас ка́зусы, смешныя выпадкі пры камп'ютарным перакладзе?



Правообладатель Национальный институт образования

Прадоўжыце сказы і запішыце іх.

Пераклад — гэта...
Пры перакладзе патрэбна пазбягаць...
Прычынамі сэнсавых памылак пры перакладзе звычайна з'яўляюцца...

Зрабіце вусны сінтаксічны разбор запісаных сказаў.

**196.** Знайдзіце ў тэксце бяззлучнікавыя складаныя сказы і запішыце іх па-беларуску. Улічвайце пры гэтым, што пераклад — праца творчая.

По отношению каждого человека к своему языку можно совершенно точно судить не только о его культурном уровне, но и о его гражданской позиции. Истинная любовь к своей стране немыслима без любви к своему языку; человек, равнодушный к родному языку, — дикарь. Его безразличие к языку объясняется полнейшим безразличием к прошлому, настоящему и будущему своего народа.

Неряшливость в одежде — это неуважение к окружающим вас людям и к самому себе. Дело не в том, чтобы быть одетым щегольски́. В щегольской одежде есть преувеличенное представление о собственной элегантности, по большей части щёголь стоит на грани смешного. Надо быть одетым чисто и опрятно, в том стиле, который больше всего вам идёт.

Язык в ещё большей мере, чем одежда, свидетельствует о вкусе человека, о его отношении к окружающему миру, к себе *(По К. Паустовскому)*.

Згадзіцеся (абвергніце думку), прывёўшы доказы, прыклады: *Па тым, як чалавек ставіцца да сваёй мовы, можна меркаваць пра яго культурны ўзровень і яго грамадзянскую пазіцыю.*

## Слоўнік

немыслимый — *немагчымы, немажлівы*
дикарь — *дзікун*
щёголь — *франт, фарсун*
щегольской — *франтаваты, фарсісты*
грань — *мяжа*


Правообладатель Национальный институт образования

**197.** Прачытайце табліцу. Падбярыце адпаведныя прыклады (сказы змешчаны пасля табліцы). Запішыце сказы, пастаўце прапушчаныя знакі прыпынку. Пабудуйце схемы сказаў.

| ЗНАКІ ПРЫПЫНКУ Ў БЯЗЗЛУЧНІКАВЫХ СКЛАДАНЫХ СКАЗАХ | | |
|---|---|---|
| **Знак прыпынку** | **У якім выпадку ставіцца** | **Прыклады, схемы сказаў** |
| Коска | 1) у частках бяззлучнікавага складанага сказа пералічваюцца пэўныя падзеі, з'явы;<br>2) паміж часткамі выражаюцца адносіны адначасовасці або паслядоўнасці | |
| Кропка з коскай | 1) паміж развітымі часткамі бяззлучнікавага складанага сказа, якія маюць свае знакі прыпынку;<br>2) часткі бяззлучнікавага складанага сказа вызначаюцца сэнсавай завершанасцю і выступаюць як адносна незалежныя ў сэнсавых адносінах | |
| Двукроп'е | 1) другая частка дапаўняе, раскрывае, удакладняе змест першай часткі;<br>2) другая частка выражае прамое пытанне | |
| Працяжнік | 1) змест частак супрацьпастаўляецца;<br>2) другая частка з'яўляецца параўнаннем у адносінах да першай | |

1. Замерлі дрэў макушкі не зварухнецца ліст пявучай самай птушкі замоўк апошні свіст *(П. Глебка)*. 2. Голас — срэбраны званочак шчочкі — ма́кавы лісткі *(Я. Колас)*. 3. Снег скрыпучы пад санямі хуткі конь мяцелі дым вецер пеніцца за намі замятаючы сляды *(М. Машара)*. 4. Выганяеш гора ў дзверы гора сунецца ў акно *(П. Броўка)*. 5. Гэта не вецер калыша лясы гэта трывогі звіняць галасы *(М. Танк)*. 6. Ты скажы мне цьма глухая доўга будзеш ты ляжаць? *(Я. Колас)*. 7. Збылася мара паэта беларусы сталі людзьмі звацца *(К. Чорны)*.


Правообладатель Национальный институт образования

**198.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго тэму і асноўную думку. Колькі падтэм у тэксце?

## Зубры

Зуброў часта называюць белавежскімі. Думаеце, зубрам там надта прывольна? Не зусім. Зубр — прыхільнік светлых лісцвяных гаёў. Аднак белавежскія мясціны сталі для зуброў надзейным прытулкам.

Тэрыторыя Еўропы раней уяўляла сабой суцэльны лясны масіў. Але з-за гаспадарчай дзейнасці лес пакрысе высякаўся. Многа лесу патрабавалася на будаўніцтва новых гарадоў, мастоў, умацаванняў — стагоддзямі не змаўкаў грукат сякеры ў еўрапейскіх лясах.[сн] А Белавежская пушча заставалася некранутым зялёным астраўком. З часам пушча стала ўлюбёным месцам жыхарства зуброў.



Але цяжка было зубру хавацца ад людзей. Так, апошні белавежскі зубр быў забіты ў 1919 годзе. Тады вучоныя забілі трывогу. У Белавежскай пушчы пабудавалі зубрагадавальнік, былі закуплены два дзясяткі зуброў.[сн] Пасля Вялікай Айчыннай вайны зноў прадоўжылася работа па ўзнаўленні папуляцыі гэтых жывёл.

Чым цікавы зубр? Па-першае, сваімі памерамі. Вага зубра дасягае тысячы кілаграмаў, даўжыня тулава — трох метраў.[сн] У яго моцныя серпападобныя рогі і калматая грыва. Калі зубра не трывожыць, ён спакойны і міралюбівы. Але ў гневе ён страшны сваёй сілай. Ён валіць сваім тоўстым ілбом дрэвы, з рыкам рые капытамі зямлю.

Зубры харчуюцца маладымі галінкамі дрэў, ахвотна ядуць кару асін, елак. Любяць рабінавыя галінкі, жалуды, грыбы. Зімой зубры харчуюцца мохам, лішайнікамі і сухой травой.

Сёння ў Беларусі больш за тры сотні магутных лясных быкоў. Усяго на Зямлі больш за дзве тысячы гэтых жывёл. Ёсць вялікая надзея, што зубр, сучаснік мамантаў, стане такім жа прывычным насельнікам беларускіх лясоў, як лось і казуля *(Паводле А. Наварыча)*.

Чаму зубры жывуць у Белавежскай пушчы, хаця любяць светлыя лісцвяныя гаі?
Выпішыце моўныя сродкі, якія выкарыстоўвае аўтар для апісання зуброў.
Складзіце план і падрыхтуйце падрабязны пераказ тэксту. Выкарыстайце бяззлучнікавыя складаныя сказы.



Правообладатель Национальный институт образования

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Назавіце агульныя прыметы, уласцівыя ўсім тыпам складаных сказаў: складаназлучаным, складаназалежным і бяззлучнікавым складаным.
2. Якімі прыметамі адрозніваюцца складаназалежныя сказы ад складаназлучаных; бяззлучнікавыя складаныя сказы — ад складаназлучаных і складаназалежных?
3. Назавіце сродкі сувязі частак у бяззлучнікавых складаных сказах.
4. Якія знакі прыпынку могуць ставіцца на мяжы частак у бяззлучнікавых складаных сказах?
5. Калі ставяцца коска і кропка з коскай паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах?
6. Калі ставіцца двукроп'е паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах?
7. Пры якіх умовах ставіцца працяжнік паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах?
8. Складзіце самастойна або выпішыце з мастацкага твора, які вывучаеце на ўроках беларускай літаратуры, бяззлучнікавыя складаныя сказы з рознымі сэнсава-граматычнымі адносінамі паміж часткамі. Назавіце гэтыя адносіны. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах. Пабудуйце схемы сказаў.

Правообладатель Национальный институт образования

# Складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак

## § 30. Паняцце пра складаны сказ з рознымі відамі сувязі частак

**Складаны сказ з рознымі відамі сувязі частак** — гэта сказ, які складаецца з трох і больш частак, звязаных паміж сабой рознымі відамі сувязі: злучальнай, падпарадкавальнай, бяззлучнікавай. Сувязь паміж часткамі такога сказа ўсведамляецца на лагічным, сэнсавым і граматычным узроўнях. Адпаведна адзінкі сказа аб'ядноўваюцца ў своеасаблівыя сэнсавыя (логіка-структурныя) часткі (блокі). Напрыклад: [1]*Была восень з апошнімі днямі спакойнай нейкай красы,* ***і*** [2]*была ва ўсім незразумелая цярплівасць адзінокага лістка,* [3]***што*** *біўся на галінцы, не хочучы ці не могучы адарвацца і ўпасці* (М. Стральцоў).

У гэтым сказе першая частка пабудавана як просты сказ. Другая і трэцяя часткі ўтвараюць складаназалежны сказ, звязаны з першай часткай пры дапамозе злучніка ***і***. Такім чынам, гэта складаны сказ з рознымі відамі сувязі частак. Яго граматычныя часткі аб'яднаны злучальнай (з дапамогай злучніка ***і***), а таксама падпарадкавальнай сувяззю (з дапамогай злучальнага слова ***што***). У сказе выдзяляюцца дзве сэнсавыя часткі: першая пабудавана як просты сказ, другая — як складаназалежны сказ з дадзенай азначальнай часткай. Схема сказа:

I — II

| [ ] |, *і* | [ ], (*што*...) |.



Правообладатель Национальный институт образования

Часткі складаных сказаў з рознымі відамі сувязі нагадваюць складаназлучаныя, складаназалежныя і бяззлучнікавыя складаныя сказы. Таму сродкамі сувязі ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі частак з'яўляюцца:

- інтанацыя;
- злучальныя і падпарадкавальныя злучнікі (злучальныя словы).

**199.** Прачытайце тэкст з энцыклапедыі «Беларуская мова».

**Тыпы складаных сказаў з рознымі відамі сувязі частак**

Складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак падзяляюцца на **тры групы:**

1) сказы, сэнсавыя часткі якіх звязаны **пры дапамозе злучальных злучнікаў**. Напрыклад: [1)]*Яны [ласі] не чуюць завірухі,* [2)]*ціш першабытная кругом,* ***і*** [3)]*выстрал,* [4)]*што ўдарыць глуха,* [3)]*ім прагучыць, як летні гром* (М. Танк).

I — II

| [ ], [ ] |, ***і*** | [ , (*што...*) ] |.

[1)]*Ідуць касцы,* [2)]*звіняць іх косы,* [3)]*вітаюць іх буйныя росы,* ***а*** [4)]*краскі ніжай гнуць галовы, пачуўшы косак звон сталёвы* (Я. Колас).

I — II

| [ ], [ ], [ ] |, ***а*** | [ ] |.

2) сказы, сэнсавыя часткі якіх звязаны **пры дапамозе падпарадкавальных злучнікаў**. Напрыклад: [1)]***Колькі б*** *мы ні хадзілі па тваіх дарогах,* [2)]***колькі б*** *вёснаў ні сустракалі пад дахам тваіх нябёс,* [3)]***колькі б*** *разоў ні наталялі смагу твае ручаіны,* [4)]*ніколі не здасца чэрствым твой хлеб і* [5)]*ніколі не будзе скупою рука твая, Бацькаўшчына!* (М. Лужанін).

I — II

| (*Колькі б...*), (*колькі б...*), (*колькі б...*) |, | [ ] *і* [ ] |.

3) Сказы, сэнсавыя часткі якіх звязаны **пры дапамозе бяззлучнікавай сувязі**. Напрыклад: [1)]*Лісічак набраў каля сцежкі-вяртухі,*



Правообладатель Национальный институт образования

[2)]*што да хаты лісінай вяла*; [3)]*падбярозавікаў — пад бярозай-шаптухай*, [4)]*дзе капэла чмяліная пела-гула* (М. Танк).

| I | | II |
|---|---|---|
| [ ], (*што*...) | ; | [ ], ( *дзе*...) . |

На якія групы падзяляюцца складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак?

З дапамогай якіх сродкаў аб'ядноўваюцца сэнсавыя часткі ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі частак?

Выпішыце сказы-прыклады да кожнай групы. Падкрэсліце граматычныя асновы. Пабудуйце схемы сказаў.

**200.** Прачытайце складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак. Вызначце ў гэтых сказах сэнсавыя (логіка-структурныя) часткі і сродкі іх сувязі.

1. Ён зірнуў на бацьку глыбокімі вачыма, яны былі цёмныя, амаль чорныя, і гэта сведчыла аб тым, што ён хвалюецца *(Б. Мікуліч)*. 2. Хмара на гарадок найшла неспадзявана: свяціла нізкае сонца, і раптам у вокнах пацямнела *(І. Чыгрынаў)*. 3. Любíць прызначана мне лёсам, я не памру, пакуль люблю *(А. Пісьмянкоў)*. 4. Душою не крыві, бо чалавечы век усё ж кароткі, і водгуллем у кожнага ў крыві азвацца могуць прашчуры і продкі *(С. Грахоўскі)*. 5. Не век, не два шукаем шлях да неба, хоць знаем: неба ў кожнага — сваё *(Т. Бондар)*. 6. Вішні ды слівы ўжо адцвіталі, але яблыні абсыпаліся самай квеценню, ад якой ноч, здавалася, спачывала ў святле пражытага дня *(В. Карамазаў)*.

**201.** Спішыце сказы, расстаўляючы знакі прыпынку. Суаднясіце сказы з прапанаванымі схемамі.

1. Хлопец гаварыў і голас яго зрываўся на дзіцячы крык у якім чуліся крыўда боль растаптаных мар спадзяванняў *(М. Лынькоў)*. 2. І пытаўся я ў сябе няўжо тады стагоддзі назад мае малапісьменныя продкі ведалі і разумелі што без Радзімы жыццё іх страціць сэнс і яны тут жа знікнуць бясследна растворацца ў свеце белым? *(В. Гігевіч)*. 3. На двары ідзе сумны дождж і дарогі раскіслі рухацца па іх цяжка *(К. Чорны)*. 4. Утульнасці тут было небагата дзьмула з вокнаў дым



Правообладатель Национальный институт образования

не хацеў ісці ў комін і расплываючыся пад нізкай столлю выядаў вочы але ўсё гэта здалося ім раем пасля той непагадзі ад якой яны схаваліся сюды *(В. Быкаў)*.

а) I [ ]: [ ], [ ] , ***але*** II [ ], (*ад якой...*) .

б) I [ ] , ***і*** II [ ], (*у якім...*) .

в) I [ ] : II [ ], (*што...*) *і* ( ) ?

г) I [ ] , ***і*** II [ ], [ ] .

**202.** Спішыце складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак, устаўляючы прапушчаныя літары і расстаўляючы знакі прыпынку. Вызначце віды сувязі паміж сэнсавымі часткамі ў сказах. Пабудуйце схемы сказаў.

1. Аселі шэрыя сумёты ляціць да долу мя..і снег а я стаю на раздарожжы ў сэрца цень тр..вожны лёг *(У. Хадыка)*. 2. Віцебск сярод беларускіх гарадоў найбольш вядомы ў свеце тут нарадзіўся Марк Шагал пакінуўшы родныя м..сціны ён заставаўся верным ім і ўсё жы..ё ствараў свой чароўны Віцебск у сін.. небе якога лунаюць закаханыя *(Л. Камінская)*. 3. Задр..млю і можа зноў прысніцца што прынесла з поплава сюды вечна маладая чараўніца прыгаршчы гаючае вады *(С. Грахоўскі)*. 4. З гадамі душа цішэе лагаднее супакойваецца але не засынае яна як і раней шукае радасці і ведае ўжо што хоча іменна яе *(М. Стральцоў)*.

**203.** Спішыце сказы, устаўляючы прапушчаныя літары і расстаўляючы знакі прыпынку.

1. Па кутах кладуцца цені за акном робіцца ўраз цёмна і маленькія фігуркі знікаюць *(Э. Самуйлёнак)*. 2. Грама..ства якое кідае каме..е ў сваіх паэтаў хворае такое грама..ства трэба неадкладна л..чыць *(Я. Сіпакоў)*. 3. Дарэмна ловіце вы ў сетку матылька каб лепей крылы разглядзець ударыўшы самне іх сецьі яркі пыл сатрэ


Правообладатель Национальный институт образования

н..спрытная рука *(М. Багдановіч)*. 4. Дарма пра песню пытацца ў глухога дарма пра сонца пытацца ў сл..пога і пра..ды шукаць у таго хто н..чога ані сц..блінкі ні дрэўца малога не пасадзіў за свой век *(М. Танк)*. 5. Ла..чыць і лечыць чалавечую душу часіна згоды ў прыродзе але найлепшая згода для чалавека згода з самім сабой са сваім сумле..ем якое даражэйшае за грошы[сн] *(М. Стральцоў)*.

**204.** Спішыце сказы, расстаўляючы знакі прыпынку. Пабудуйце схемы сказаў.

1. Любоў і праўда вечныя святыні да ісціны надзейныя ключы яны дарогу да душы адчыняць каб дабрынёю злосць перамагчы *(С. Грахоўскі)*. 2. Адшумеў лістапад адзвінелі дажджы і зіма панагнала пякучых вятроў *(П. Панчанка)*. 3. Вечар быў млосны дзённая спёка ўжо сышла але ў паветры яшчэ патыхала духменем *(І. Мележ)*. 4. Уздымацца дрэву маладому мацнець праз лета і зіму. І захаваць не проста звесткі а запавет на ўсе часы тады выстойваюць падлескі калі выстойваюць лясы *(А. Разанаў)*.

Зрабіце сінтаксічны разбор двух складаных сказаў з рознымі відамі сувязі частак (на выбар, карыстаючыся парадкам і ўзорам разбору, змешчаным у Дадатку, с. 206).

## § 31. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі частак

У складаных сказах з рознымі відамі сувязі на мяжы сэнсавых (логіка-структурных) частак ставяцца тыя ж знакі прыпынку, што і ў складаназлучаных, складаназалежных і бяззлучнікавых складаных сказах: *коска, кропка з коскай, працяжнік, двукроп'е*.

**Коска** не ставіцца паміж дзвюма сэнсавымі часткамі, звязанымі *спалучальнымі злучнікамі* ***і, ды*** (у значэнні ***і***), калі:

1) у сказе ёсць **агульная даданая частка**. Напрыклад: *Ужо сонца праглядвала праз вяршаліны хвой і пачынала адчувацца гарачыня летняга дня,* ***калі настаўнікі падышлі да ракі*** (Я. Колас);


Правообладатель Национальный институт образования

2) у сказе ёсць **агульная частка.** Напрыклад: ***Мясцовасць была невясёлая:*** *навокал раскінулася дрыгва ды моклі панурыя лясы* (Я. Колас).

**Коска** не ставіцца пры збегу *злучальнага* і *падпарадкавальнага злучнікаў,* калі:

1) пасля дадзенай часткі сказа ёсць другая частка падпарадкавальнага злучніка. Напрыклад: *Прыйшлося даказваць усім, што ён дарослы чалавек,* ***і калі*** *нехта сумняваўся ў гэтым,* ***то*** *ён глыбока памыляўся;*

2) злучальны злучнік адносіцца да дадзенай часткі, а не да галоўнай. Напрыклад: *Ён міжвольна адступіў,* ***а калі*** *потым спахапіўся, было позна.* У такіх сказах пропуск дадзенай часткі прыводзіць да скажэння сэнсу.

Заўвага. Калі злучальны злучнік адносіцца да галоўнай часткі, то **коска** ставіцца: *Пот заліваў вочы, але, каб не выдаць сваёй слабасці, хлопец не кідаў вёслаў* (І. Шамякін). Пропуск дадзенай часткі ў гэтым выпадку не парушае сэнсу сказа.

**205.** Прачытайце тэкст. Вусна вызначце тып складаных сказаў. Выпішыце сказы з рознымі відамі сувязі частак. Пабудуйце іх схемы.

За дубамі іскрылася **тысячамі** сонцаў даўгаватае люстра ракі. Самой ракі не відаць: у незапомныя часы яна **адступіла** ад лесу на добры кіламетр.

Лес тут не роўны, ён перарэзаны раўчукамі, канавамі, берагі якіх зараслі **лазняком.** На ўзгорках стаяць дубы, а ў зарэчнай далечы сінее лес, злева з-за хмызнякоў выглядаюць стрэхі хат.

Цудоўны бор — сасна ў сасну — абступаў **невялікую** паляну. Злева, бліжэй да ручая, што **аддзяляў** лес ад лугу, сосны саступалі месца **дубам-асілкам,** якіх нямнога засталося ў нашых лясах.

Кірыл лёг на спіну, палажыўшы рукі пад галаву, і доўга ўглядаўся ў лісце дуба.[сн] У гушчары **церушылі** мохам нейкія птушкі, але ён не мог убачыць іх і толькі **здагадваўся,** што гэта сініцы *(Паводле І. Шамякіна).*

- Вызначце арфаграмы ў выдзеленых словах, растлумачце іх правапіс.


Правообладатель Национальный институт образования

**206.** Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары, раскрываючы дужкі і расстаўляючы знакі прыпынку. Пабудуйце схемы сказаў.

1. Усё неба аблажыла шызая мутная хмара мерна гойдаліся в..ршаліны елак лес у..трывожана гудзеў[с] і першыя кроплі даждж.. чыркanулі паветра *(В. Быкаў)*. 2. Ран..шняе со..ца што чырваніла хвойнік *(у)*гары яшчэ не магло прабіцца *(да)*нізу зямлі і на рэдкай траве трымалася раса а на пяск.. значыліся вільготныя ц..мнаватыя плямы *(І. Мележ)*. 3. Трэба было а..пачыць але Іван а..чуваў што калі ўпадзе ў снег то напэўна болей не ўстане *(В. Быкаў)*. 4. Ён зноў усм..хнуўся і ў гэтай усмешц.. я ўбачыў законную гордасць гаспадара якому хораша што вось і ёсць ужо чым пахваліцца *(Я. Брыль)*. 5. Дзе вечная пустка была там горад паўстаў і расце а стужкай чыгунка лягла дзе ўчора стаяў лес яшчэ *(Я. Купала)*. 6. З..мля яшчэ песцілася ў сонным змроку вясенняй ночы а неба ледзь-ледзь пачынала св..тлець на ўсходзе зорамі калі маладыя настаўнікі выходзілі з Панямоні *(Я. Колас)*.

- У 2-м сказе назавіце ўсе часціны мовы.

**207.** З наступных сказаў, ужываючы патрэбныя віды сувязі, утварыце і запішыце розныя тыпы складаных сказаў. Вусна пракаменціруйце іх будову.

1. Сцёпка ўважліва разглядаў малюнкі. Цётка Марына падышла паглядзець на іх. Яны ёй вельмі спадабаліся. 2. Няма лясоў. Там пяскі разносяцца ветрам. Гіне ўраджай ад сухавеяў. 3. Вецер пасвістваў за акном. Чуваць быў шоргат бярозавых галін. Галіны дакраналіся адна да адной у цемры. 4. Толькі пачынала днець. Дождж сціх. Кроплі доўга сцякалі з дрэў і булькалі ў лужынах. 5. Апошнія дні стаяла цёплае надвор'е. Прайшлі не па-асенняму густыя дажджы. Снег сагнала дарэшты.

У з о р. Сцёпка ўважліва разглядаў малюнкі, і цётка Марына падышла паглядзець на іх, бо яны ёй вельмі спадабаліся. Гэта *складаны сказ з рознымі відамі сувязі частак*. У ім дзве логіка-структурныя часткі. Першая частка пабудавана як просты сказ, другая — як складаназалежны. Сродкам сувязі паміж логіка-структурнымі часткамі з'яўляецца злучальны злучнік ***і***.


Правообладатель Национальный институт образования

**208.** Прачытайце тэкст. Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары і расстаўляючы знакі прыпынку.

### Лета

В..сна н..прыкметна пера..шла ў лета.

Дні паплылі над з..млёй светлыя сон..чныя поўныя н..злічоных пахаў травы і кветак. Адагрэтая за в..сну з..мля наб..рала сіл і з..ляніна на ёй расла і шыр..лася з такой хуткасцю што калі прыслухацца ўважліва дык пачу..ш як выпростваюцца і ц..гнуцца каліўцы ўгору і шасцяць і п..рашэптваюцца. Жыта вы..шла ў трубку і месцамі на ім з'явіліся пя..чотныя каласкі з прыўзнятымі вусікамі. Заз..лянелі ячмень і авёс пусціла пш..ніца шырокія па́расткі загусцеў лён. І калі ўзн..кае ветр..к ён чапляецца за збажыну і гуляе ў ёй і песціцца а поле здалёк у такі час нагадвае мора што злёгку хвалю..цца і п..раліваецца то светла-з..лёнымі то цёмна-сінімі фарбамі.

Усяму жывому з..мля дор..ць шчодрасць. Зап..рэсцілі р..знакал..ровыя краскі на пожнях расце збаж..на а поруч з ёй вылазіць лапушысты асот ра..кідвае галінкі свірэпка змешва..цца з жытн..й і пш..нічнай рун..ю пырнік выцягваецца над суседз..мі іглісты хвошч. Кожнае кал..ўца імкнецца ўхапіць больш св..тла і ц..плыні *(Паводле Т. Хадкевіча)*.

Вусна перабудуйце 1-2 сказы з рознымі відамі сувязі частак у простыя сказы. Пабудуйце схему складанага сказа з рознымі відамі сувязі частак (на выбар).

Раскажыце, наколькі цікава вам чытаць апісанні прыроды ў мастацкіх творах. Чаму?

● Растлумачце правапіс складаных прыметнікаў.

**209.** Складзіце складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак, якія адпавядалі б наступным схемам.

1. I [ ] , *і* II [ ], (*бо...*).

2. I [ ], (*што...*), ***але*** II [ ], (*што...*).

3. I [ ], [ ] , *і* II [ ].

4. I [ ] , *і* II [ ], (*калі...*).



Правообладатель Национальный институт образования

**210.** Прачытайце сказы, вызначце іх граматычныя асновы. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку. Пабудуйце схемы сказаў.

1. Я чакаю, чакаю вясну, нібы вязень чакае свабоду, уваскрэсне, прачнецца ад сну гэты цуд невымоўны — прырода. 2. Яшчэ буяе зеляніна, і ліст сям-там пазалацеў, ужо зардзелася рабіна, і верас у бары цвіце. 3. Я зіму па-дзіцячы люблю, калі зоркі на снезе і ў небе і сняжынкі цалуюць зямлю. 4. Цвіце тут столькі розных кветак, каб цешыць вока чалавека, і травы лекавыя ўсе блішчаць у ранішняй расе. 5. Па летніх кветках не сумую: у кожнай з'явы ёсць свой час, старанна восень падсумуе, хто і які зрабіў запас *(В. Шпакевіч)*.

**211.** Прачытайце тэкст. Раскажыце пра вывучэнне беларускай мовы ў свеце. Растлумачце прычыны папулярнасці беларускай мовы ў замежжы.

На сённяшні дзень выхадцы з Беларусі пражываюць больш чым у 72 краінах. У 25 з іх дзейнічае больш за 220 зарэгістраваных грамадскіх арганізацый і структур беларускай дыяспары. Беларуская мова ў замежных краінах мае два асноўныя аспекты выкарыстання: прыкладны́ — ствараюцца шматлікія падручнікі па беларускай мове для вучняў і студэнтаў, выдаюцца вучэбныя граматыкі і слоўнікі; навукова-даследчы* — беларуская мова выступае як аб'ект навуковага вывучэння.

Так, у Расіі створана амаль 60 грамадскіх беларускіх арганізацый, выдаюцца бюлетэні: «Шляхам Скарыны» (у Маскве) і «Маланка» (у Іркуцку). Многія расійскія навукоўцы даследуюць актуальныя пытанні беларускай мовы.

У Вялікабрытаніі галоўнымі цэнтрамі навукова-культурнага жыцця беларусаў сталі Беларуская бібліятэка і музей імя Ф. Скарыны, Англа-беларускае таварыства. Яны арганізуюць і праводзяць разнастайныя семінары, навуковыя канферэнцыі, выстаўкі і інш.

*З 1996 года беларуская мова выкладаецца ў Славакіі. З дапамогай беларускіх выкладчыкаў, што працуюць у славацкіх універсітэтах, выдадзены дапаможнікі для студэнтаў, якія вывучаюць беларускую мову.*

Выкладанне[сл] беларускай мовы, друкаванне часопісаў[м], газет, кніг, трансляцыя беларускамоўных[сл] радыё- і тэлеперадач ажыццяў-



Правообладатель Национальный институт образования

ляецца[м] і ў іншых краінах свету: Бельгіі, Францыі, Іспаніі, Аргенціне і інш. *(Паводле П. Міхайлава).*

Перабудуйце выдзеленыя сказы ў складаны сказ з рознымі відамі сувязі частак. Зрабіце яго сінтаксічны разбор (гл. Дадатак, с. 206).

- Зрабіце вусны марфалагічны разбор ужытых у тэксце лічэбнікаў.

**212.** Спішыце сказы, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку. Зрабіце вусны сінтаксічны разбор сказаў (гл. Дадатак, с. 206).

1. Падчас і па чужых краях журуся а хопіць і куточка Беларусі каб цэлы век свой да яе ісці *(Н. Мацяш).* 2. Нас б'е па сэрцах паскарэнне сціскаюцца прастора час а матчынай зямлі карэнне ніколі не адпусціць нас *(П. Панчанка).* 3. Час робіць вялікім тое што некалі здавалася не вартым увагі але той жа час нярэдка робіць звычайным будзённым і непрыкметным тое што яшчэ зусім нядаўна лічылася вялікім і было ва ўсіх навідавоку *(Я. Сіпакоў).*

Устанавіце адпаведнасць паміж сказамі і схемамі.

а) I [[ ], (*што...*)], ***але*** II [[ ], (*што...*)].

б) I [[ ], [ ]], ***а*** II [[ ]].

в) I [[ ]], ***а*** II [[ ], (*каб...*)].

**213.** Прачытайце тэкст.

Афіцыйны (афіцыйна-дзелавы, афіцыйна-справавы) стыль рэалізуецца ў розных дакументах. Дакументамі (ад лац. *documentum* — 'доказ', 'сведчанне') называюцца адпаведным чынам складзеныя, падпісаныя і засведчаныя дзелавыя паперы, якімі афармляюцца розныя гаспадарчыя аперацыі, прававыя адносіны і дзеянні юрыдычных асоб і грамадзян. Дакумент складаецца па пэўнай стандартнай форме. Існаванне адпаведных форм для разнастайных дакументаў — істотны фактар эфектыўнасці справаводства.


Правообладатель Национальный институт образования

Па ступені рэгламентаванасці (у адпаведнасці з устаноўленымі правіламі) дакументы падзяляюцца на тры групы:

1) дакументы, якія павінны дакладна адпавядаць прынятаму стандарту, бо ў іншым выпадку яны не будуць мець юрыдычнай сілы (*пашпарт, дыплом, пасведчанне* і інш.). Гэтыя дакументы рыхтуюцца друкаваным спосабам, а той, хто выпісвае канкрэтны дакумент, павінен толькі ўнесці ў яго патрэбную інфармацыю;

2) дакументы, што афармляюцца паводле ўстаноўленай формы (*даведка, заява, дагавор, даверанасць, квітанцыя* і інш.);

3) дакументы, якія маюць грамадска замацаваны агульны прынцып укладання, а моўныя сродкі і форма выкладу ў пэўнай ступені адвольныя (*характарыстыка, рэкамендацыя, дзелавыя паперы* і інш.).

Асабістыя дакументы часцей за ўсё сустракаюцца ў нашым жыцці. Да асабістых дакументаў адносяцца *заява, аўтабіяграфія, распіска, даверанасць, характарыстыка* і інш. *(А. Губкіна)*.

Якім чынам рэалізуецца афіцыйны стыль? Якія паперы называюцца дакументамі? Чаму для разнастайных дакументаў існуюць стандартныя формы? Ці звязана гэта са стратай індывідуальнага стылю таго, хто стварае дакумент?

На якія групы падзяляюцца дакументы? Якія дакументы адносяцца да асабістых?

Падбярыце сінонімы да слова *асабісты*.

Растлумачце розніцу ў значэннях слоў *асобы, асаблівы, асобны*.

**214.** Прачытайце тэкст.

Аўтабіяграфія — гэта апісанне свайго жыцця (ад грэч. *autos* — ‘сам’; *bios* — ‘жыццё’; *grápho* — ‘пішу’). Аўтабіяграфія пішацца ад першай асобы, у ёй паведамляецца афіцыйная інфармацыя пра жыццёвы шлях чалавека.

**Структура аўтабіяграфіі**

1. Прозвішча, імя, імя па бацьку.
2. Дата нараджэння.
3. Сям’я. Занятак бацькоў.
4. Калі і дзе закончана ўстанова адукацыі.
5. Асноўнае з працоўнай і грамадскай дзейнасці.
6. Занятак таго, хто піша аўтабіяграфію, на момант напісання дакумента.
7. Дата і подпіс.


Правообладатель Национальный институт образования

## Узор аўтабіяграфіі

Аўтабіяграфія

Я, Іванова Таццяна Уладзіміраўна, нарадзілася 14 лютага 1992 года ў Мінску. Бацька — Іваноў Уладзімір Пятровіч — настаўнік фізікі ва ўстанове адукацыі «Гімназія № 23 г. Мінска». Маці — Іванова Анастасія Анатольеўна — медыцынская сястра Мінскага абласнога кардыялагічнага дыспансера.

У 1998 годзе паступіла ў першы клас сярэдняй школы № 2 г. Мінска, якую закончыла ў 2009 годзе. У гэтым жа годзе паступіла ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт на юрыдычны факультэт, які закончыла ў 2014 годзе. Пасля заканчэння ўніверсітэта працую юрысконсультам на Мінскім аўтамабільным заводзе. Не замужам.

28.08.2018 Іванова Т. У.

**215.** Прачытайце тэкст. Ці раскрываюцца ў біяграфіі рысы характару, звычкі, схільнасці, абставіны жыцця? Чаму?

### Янкоўскі Фёдар Міхайлавіч



Нарадзіўся Фёдар Міхайлавіч Янкоўскі 21 верасня 1918 года ў вёсцы Клетнае Глускага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і. Скончыўшы пачатковую школу ў родным Клетным, затым сямігодку, паступіў у Рагачоўскі педагагічны тэхнікум. Пасля яго заканчэння працаваў настаўнікам пачатковай школы ў Мінскім раёне.

Калі пачалася савецка-фінская вайна, быў прызваны ў армію. Ф. М. Янкоўскі ўдзельнічаў у баях, у адным з іх ён атрымаў цяжкае раненне. Доўга лячыўся ў шпіталях, потым па інваліднасці дэмабілізаваўся і вярнуўся на месца ранейшай працы.

У час Вялікай Айчыннай вайны быў у партызанах, дзе ўзначальваў разведку партызанскага атрада «Грозны», што дзейнічаў паблізу Мінска, зноў быў цяжка паранены.

Пасля вайны выкладчыцкую дзейнасць Ф. М. Янкоўскі спалучаў з даследчыцкай, якая была шматграннай і плённай. Большасць навуковых публікацый (а іх каля трохсот) прысвечана народнай



Правообладатель Национальный институт образования

мове, асаблівасці якой ён вывучаў усё жыццё, не пераставаў дзівіцца багаццю і арыгінальнасці беларускага слова.

**Ф. М. Янкоўскі заўсёды клапаціўся аб падрыхтоўцы маладых мовазнаўцаў-даследчыкаў, пад яго кіраўніцтвам напісана і паспяхова абаронена 16 кандыдацкіх дысертацый** *(І. Германовіч)*.

Знайдзіце ў тэксце складаныя сказы. Вусна ахарактарызуйце іх будову.

**216.** Прачытайце ацэнку зробленага для беларускай лінгвістыкі вучоным Ф. М. Янкоўскім. Ці можа гэта інфармацыя быць змешчана ў аўтабіяграфіі? Чаму?

Фёдар Міхайлавіч Янкоўскі прайшоў **нямала** цяжкіх і складаных дарог, зведаў **непамерныя** страты родных, блізкіх сяброў, голад і холад, нястачы. Ён знайшоў[с] у сабе сілы вытрымаць усё, збярог у сэрцы любасць* да роднага беларускага слова, вернасць свайму народу, адданасць любімай справе, духоўную чысціню і далікатнасць, мужнасць. І гэтая мужнасць — ад роднай зямлі, ад бацькоўскага парога, бацькоўскага полымя, перад якім ён даў **адзіную** на ўсё жыццё **клятву-прысягу**: «На **світанні** ці **змярканні**, золкаю ці ветранаю **ноччу**, хмурным ці сонечным днём — заўсёды і ўсюды **жыццё** маё будзе не дзеля кавалка хлеба, найгалоўнейшае, ад чаго не **адступлюся**, хоць апынуся ці ў акопах, ці ў шпіталі, хоць буду халодны ці галодны, — маё роднае слова, родная натура вялікага краю, родная Беларусь. Вы — мая радасць і ўцеха, вы — мая скруха і боль, вы — маё шчасце і жыццё!» Гэтай клятве Фёдар Міхайлавіч застаўся верны да самых апошніх дзён. Вучоны-лінгвіст з сусветным іменем, настаўнік і пісьменнік — усё гэта пра Фёдара Міхайлавіча *(Н. Гаўрош)*.

Пісьмова перадайце змест прыведзенай у тэксце інфармацыі з дапамогай складанага сказа з рознымі відамі сувязі частак.

- Растлумачце арфаграмы ў выдзеленых словах.

**217.** Запішыце тэкст па-беларуску.

В канцелярском делопроизводстве автобиографией называется жизнеописание какого-либо лица, которое составлено им самим в виде документа, являющегося составной частью личного дела. Автобиография может использоваться при составлении психологической


Правообладатель Национальный институт образования

характеристики работника, изучении его жизненного пути и личностных качеств. Стиль изложения, акценты на тех или иных сторонах жизни помогают судить о различных психологических особенностях человека. Главным достоинством автобиографии являются основные факты трудовой и общественной деятельности, позволяющие представить и оценить жизненный путь человека. Поэтому автобиографию нередко используют в процессе отбора кадров *(Н. Гольцова)*.

**218.** Прачытайце тэкст. Да якога стылю ён адносіцца? Прывядзіце прыклады моўных сродкаў, характэрных для гэтага стылю.

**Электронны слоўнік** — аўтаматызаваная сістэма інтэлектуальнага прызначэння з сабранымі і пэўным чынам спарадкаванымі лінгвістычнымі данымі. Электронны слоўнік пабудаваны як база даных са слоўнікавымі артыкуламі. Выкарыстанне камп'ютарнага інструментарыю дазваляе хутка знаходзіць патрэбнае слова.

У параўнанні з традыцыйнымі слоўнікамі электронныя прадукты маюць наступныя перавагі: шырокія зместавыя магчымасці слоўнікавага артыкула; магчымасць **фільтрацыі** прыярытэтнай і другаснай інфармацыі ў слоўнікавым артыкуле; выкарыстанне разнастайных лінгвістычных тэхналогій доступу да зместу слоўніка.

Адрозніваюць анлайн-слоўнікі, праграмныя слоўнікі, анлайн-праграмныя слоўнікі.

**Анлайн-слоўнікі** — разнавіднасць электронных слоўнікаў, якія функцыянуюць ва ўмовах інтэрнэт-доступу. Да гэтага тыпу адносяць Вікіслоўнік, Lingvo, Мульцітран, FreeOnlineTranslators і інш. Электронны Тлумачальны слоўнік беларускай мовы (rv-blr.com/dictionary/explanatory) змяшчае каля 37 000 адзінак і працуе ў двух функцыянальных рэжымах: 1) тлумачэнне значэння слова з рэестра*; 2) тлумачэнне слова, ужытага ў кантэксце. У інтэрнэт-прасторы размешчаны электронны корпус беларускай мовы (bnkorpus.info).

**Праграмныя слоўнікі** — разнавіднасць электронных слоўнікаў, якія інсталююцца* на персанальны камп'ютар або захоўваюцца ў выглядзе спецыяльных электронных дакументаў. Да такіх слоўнікаў належаць праект ArfaBel — беларускі праграмны слоўнік для праверкі арфаграфіі беларускамоўных тэкстаў, электронны слоўнік


Правообладатель Национальный институт образования

«Назвы азёр Беларусі» С. Шахоўскай (2014), «Беларускі камп'ютарны слоўнік» і інш.

**Анлайн-праграмныя слоўнікі** — від электронных слоўнікаў, спецыялізаваныя праграмы машыннага перакладу слоў, словазлучэнняў, сказаў, html-старонак, ini-файлаў праграм, праграмных інтэрфейсаў*. Найбольш запатрабаваным слоўнікам гэтага тыпу з'яўляецца «Белазар». Да яго асноўных магчымасцей адносяцца пераклад тэксту, аўтаматызацыя працэсу перакладу (чарнавы пераклад з варыянтамі перакладу некаторых слоў і з абазначанымі неперакладзенымі словамі і словамі з магчымымі памылкамі), аўтаматычнае пераключэнне раскладкі клавіятуры *(Паводле Д. Дзятко)*.

Раскажыце пра перавагі і недахопы (у параўнанні з традыцыйнымі выданнямі) анлайн-слоўнікаў, праграмных і анлайн-праграмных слоўнікаў.

Складзіце і запішыце складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак пра змест і асаблівасці электронных слоўнікаў.

**219.** Прачытайце тэкст. Падбярыце загаловак.

Выпішыце з тэксту просты, складаназалежны і складаны сказ з рознымі відамі сувязі частак.

Заява адносіцца да асабістых дакументаў, яе пішуць у тым выпадку, калі афіцыйна звяртаюцца да службовай асобы, ва ўстанову, грамадскую арганізацыю і інш. У заяве звычайна просяць прыняць на вучобу, на працу (перавесці ў іншы аддзел, звольніць і інш.), вырашыць пэўнае пытанне (адпусціць з заняткаў, дазволіць карыстацца пэўным прадметам і інш.). Афармляць заяву, як і ўсе афіцыйныя паперы, трэба дакладна. Калі да заявы прыкладаюцца дакументы (даведкі, пасведчанні, рэкамендацыі, акты і інш.), іх пералічваюць у канцы асноўнага тэксту.

Заява складаецца з наступных структурных частак:

найменне адрасата;

найменне дакумента;

дата;

фармулёўка просьбы (скаргі, прапановы) з кароткай, але вычарпальнай аргументацыяй;

найменне адрасанта (заяўніка);

подпіс.



Правообладатель Национальный институт образования

| | |
|---|---|
| Заява<br>03.02.2020 | Дырэктару сярэдняй<br>школы № 16 г. Полацка<br>Зімніцкай І. А.<br>вучаніцы 11 «А» класа<br>Кісялёвай Ганны |

Прашу дазволіць мне ўдзельнічаць у рэспубліканскім конкурсе работ даследчага характару вучняў па вучэбным прадмеце «Беларуская мова». Конкурс адбудзецца 28.02.2020.

Г. Кісялёва

**220.** Напішыце заяву на імя дырэктара ўстановы адукацыі з актуальнай для вас просьбай (напрыклад, прыняць у 10-ы клас, дазволіць удзельнічаць у абласной алімпіядзе, спартыўных мерапрыемствах і інш.).

**221.** Спішыце сказы, расстаўляючы знакі прыпынку. Пабудуйце схемы сказаў.

1. Я крочыў да школы а шпак усё працягваў выспеўваць радасць і хвалу восеньскаму сонцу якое шчодра дарыла апошняе цяпло *(Л. Валасюк)*. 2. Вялікая любасць да паэзіі адчуваецца на кожнай старонцы гэтай кнігі а за празрыстасцю думкі адчуваеш як многа папрацавала тут таленавітая рука перакладчыка *(М. Лужанін)*. 3. Ірына заўсёды дапамагала дарослым і калі яе прасілі паглядзець за меншымі дзецьмі ахвотна згаджалася. 4. Лес выглядаў панурым але калі свяціла сонца ён нібы ажываў. 5. Дзеці радаваліся вольным дням і дарослыя маглі крыху адпачыць калі нарэшце наступілі зімовыя канікулы.

Праверце правільнасць выканання задання з дапамогай інфармацыі, размешчанай у рубрыцы «Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі частак».



Правообладатель Национальный институт образования

**222.** Прачытайце тэкст. Ці карыстаецеся вы сацыяльным сецівам? Наколькі важнай вам бачыцца праблема, паднятая ў артыкуле? Якіх правіл інфармацыйнай бяспекі прытрымліваецеся вы, якія правілы ігнаруеце?

### Информационная безопасность в социальных сетях

Как известно, социальная сеть — это веб-сайт, который позволяет пользователям общаться друг с другом посредством размещения информации, комментариев, сообщений, изображений, видеороликов и т. п. Однако регистрация аккаунта и ввод личных данных требуют осторожности и соблюдения правил информационной безопасности. Необходимо придерживаться этих правил.

1. Контролируй информацию о себе, которая попадает в социальную сеть. Всё, что ты выкладываешь в Интернете, может прочитать любой посторонний человек — в результате информация о тебе становится общедоступной. Не следует размещать в социальной сети свой домашний адрес, номер домашнего и сотового телефонов. Не стоит демонстрировать в сети фотографии, которые впоследствии могут поставить тебя в неловкое, смешное положение.

2. Установи ограничения доступа к твоей странице. Чтобы ограничить возможность чужих людей просматривать информацию на твоей странице, необходимо установить настройки приватности — это предотвратит распространение личной информации посторонним лицам. Слово *приватность* (от лат. *privatus* — ‘частный’) буквально означает *частность, закрытость, неофициальность, секретность*.

3. Не переходи из социальной сети по подозрительным ссылкам и не соглашайся на предложения установить программы-дополнения, расширяющие возможности социальной сети. С осторожностью необходимо относиться к сайтам, которые требуют повторного входа на твою личную страницу, то есть ввода логина и пароля. Перед тем как вводить свои логин и пароль, необходимо внимательно посмотреть на электронный адрес сайта и сравнить его с настоящим адресом социальной сети: как известно, существуют сайты-двойники.

4. Относись с осторожностью к новым интернет-знакомствам. Нужно всегда помнить: виртуальный друг должен оставаться виртуальным, необходимо время, чтобы убедиться в искренности намерений новых виртуальных знакомых.


Правообладатель Национальный институт образования

5. Не оскорбляй других и не терпи оскорбления сам. Если кто-то присылает тебе в социальной сети оскорбления, лучший выход из ситуации — проигнорировать хулигана, заблокировать ему доступ к твоей странице или написать на него жалобу администрации сайта. В любой социальной сети есть специальная кнопка «Пожаловаться», нажав на которую, ты можешь кратко описать суть проблемы и отправить сообщение администратору сайта. Оставайся вежливым и не оскорбляй других пользователей, иначе жалобу могут написать на тебя самого *(По Н. Гендиной)*.

Знайдзіце ў тэксце складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак, запішыце іх на беларускай мове. Падкрэсліце граматычныя асновы ў кожнай частцы, вызначце від сувязі паміж часткамі ў складаных сказах.

**223.** Раскажыце, што азначаюць словы *анатацыя, энцыклапедыя, тэрмін, рэдкалегія, мовазнаўства, артыкул.* Пазнаёмцеся з анатацыяй на адно з новых выданняў па беларускай мове.

Энцыклапедыя для школьнікаў і студэнтаў: у 12 тамах. Том 7. Беларуская мова / рэдкал.: У. У. Андрыевіч (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2017. — 496 с.

Сёмы том энцыклапедыі ўключае больш за 290 артыкулаў, якія прысвечаны беларускай мове, яе гісторыі і сучаснаму стану, гукавому і лексічнаму складу, графіцы і арфаграфіі, марфалогіі і сінтаксісу, слоўнікам і інш.

Падрыхтаванае вядучымі беларускімі мовазнаўцамі выданне раскрывае асноўныя тэрміны і паняцці школьнай праграмы па беларускай мове. Прызначана для студэнтаў, вучняў старшых класаў сярэдніх школ, гімназій, каледжаў і ліцэяў. Можа быць карысна пры падрыхтоўцы да экзаменаў і паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы філалагічнага профілю.

Якія структурныя часткі ўваходзяць у анатацыю?

Падрыхтуйце анатацыі на выданні па беларускай мове, з якімі вы пазнаёміліся ў апошні час.

**224.** Прачытайце прадмову да энцыклапедыі «Беларуская мова» (2017). Раскажыце пра змест і характар гэтага выдання.

Беларуская мова мае асаблівае значэнне ў **жыцці** нашай краіны, яна валодае афіцыйным статусам **дзяржаўнай** мовы, які замацаваны


Правообладатель Национальный институт образования

Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і Законам «Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь». Менавіта мова адыграла вызначальную ролю ў станаўленні **нацыянальнай** ідэнтычнасці беларусаў, захаванні і развіцці нацыянальнай культуры.

Сёння беларуская мова выкарыстоўваецца ў **штодзённых** кантактах паміж **людзьмі**, сродках масавай інфармацыі, сферы адукацыі, навукі, літаратуры і інш. У адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб культуры (2016) беларуская мова прызнана **нематэрыяльнай** духоўнай **каштоўнасцю** (артыкул 69) і адным з найважнейшых фактараў фарміравання нацыянальнага менталітэту (артыкул 2). Паводле Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі (2011) **дзяржава** гарантуе грамадзянам права выбару навучання і выхавання на беларускай мове і ставарае ўмовы для рэалізацыі гэтага права, пры атрыманні агульнай сярэдняй, **прафесійна-тэхнічнай** і вышэйшай адукацыі вывучэнне беларускай мовы ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляецца абавязковым (артыкул 90).

Энцыклапедыя «Беларуская мова» адрасуецца найперш школьнікам, абітурыентам і студэнтам, але яна будзе карыснай самаму шырокаму колу зацікаўленых чытачоў, паколькі яе прызначэнне — не толькі прапанаваць інфармацыю навуковага характару, але і выпрацаваць творчы падыход да **асэнсавання** моўных **з'яў**.

Мовазнаўства ўяўляе **сёння** складаную сістэму, што **аб'ядноўвае** мноства навук, якія ў сукупнасці даюць нам дастаткова поўныя веды пра ўсе аспекты чалавечай мовы.

Тэарэтычныя высновы навукоўцаў **пацвярджаюцца** дастатковай колькасцю моўных фактаў, выбраных пераважна з твораў мастацкай літаратуры. Крыніцай ілюстрацый паслужылі тэксты прызнаных майстроў слова (Я. Коласа, Я. Купалы, М. Багдановіча, У. Караткевіча, В. Быкава, Я. Брыля і інш.).

Аўтарскі калектыў спадзяецца, што энцыклапедыя «Беларуская мова» паспрыяе выхаванню павагі да нацыянальнай мовы, паглыбленню лінгвістычнай падрыхтоўкі чытачоў *(Паводле Д. Дзятко)*.

Выпішыце з тэксту складаназалежны, бяззлучнікавы складаны сказы, складаны сказ з рознымі відамі сувязі частак. Зрабіце іх сінтаксічны разбор (гл. Дадатак).

- Растлумачце арфаграмы ў выдзеленых словах.



Правообладатель Национальный институт образования

**225.** Перакладзіце адзін абзац тэксту (на выбар) на беларускую мову. Назавіце моўныя сродкі арганізацыі навукова-папулярнага тэксту. Чым ён адрозніваецца ад строгага навуковага тэксту?

Лексика — наиболее подвижная, изменчивая часть языка. Она чутко откликается на все изменения во внешней действительности: в материальной и культурной жизни общества. Но значит ли это, что словарь текуч, неустойчив, что темп изменений в нём параллелен темпу общественных перемен?

Если в текстах двухсотлетней давности сопоставить процент непонятных или отличающихся по смыслу слов с процентом слов, значения которых ясны нашим современникам, то понятного в таких текстах больше. А ведь времени прошло немало, и сколько событий свершилось в жизни народа! Как это объяснить?

Дело в том, что язык по своей природе консервативен. Изменение в словаре происходит медленнее, чем изменения в окружающей нас жизни. Такой консерватизм — одно из достоинств языка. Относительная стабильность средств обеспечивает взаимопонимание между поколениями, культурами.

И всё-таки изменения в словаре происходят. Появляется в жизни новое — оно требует нового слова. И наоборот, выходит из употребления слово, если перестаёт существовать то, что оно называло *(Энциклопедический словарь юного филолога)*.

**226.** Прачытайце тэкст. Сфармулюйце яго асноўную думку.

Ці ёсць чалавек, якога б не ўзрушылі[с] ку́палы храмаў, ці застаецца хто абыякавым, ступіўшы[с] пад скляпенні, дзе з абразоў глядзяць вочы святых праведнікаў?

Наша Беларусь — краіна даўняй і багатай культуры. Тут склаліся самабытныя, высокамастацкія традыцыі культавага дойлідства. Архітэктура храмаў, як ніводны помнік мастацтва, нясе адбітак духоўнай спадчыны нацыі, сведчыць аб невычэрпным таленце, эстэтычным мысленні народа.

*У храмабудаўніцтве, якое сінтэзавала архітэктуру, жывапіс і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва*[с]*, народ увасабляе свае лепшыя ідэалы і пачуцці, выяўляе разнастайнасць мастацка-стылістычных асаблівасцей, якія характэрны выключна для Беларусі.* У дрэва і цэглу дойліды ўкладалі характар, веліч і непаўторнасць[с]


Правообладатель Национальный институт образования

беларускай душы, што надало яскравую адметнасць культаваму дойлідству Беларусі.

У новым тысячагоддзі храмы вяртаюць сваю спрадвечную гістарычную і грамадскую сутнасць, аднаўляюць духоўную моц, становяцца[с] сапраўднымі цэнтрамі духоўнасці і культуры, уздымаюць людзей над будзённасцю *(Паводле А. Кулагіна)*.

Спішыце выдзелены сказ. Зрабіце яго пісьмовы сінтаксічны разбор (гл. Дадатак).

**227.** Напішыце сачыненне пра сваё дзяцінства і аўтабіяграфію. Параўнайце стыль напісанага вамі сачынення і афіцыйнага дакумента. Назавіце характэрныя рысы кожнага тэксту.

**228.** Растлумачце значэнне слоў, якія называюць розныя віды дакументаў.

Абанемент, атэстат, анкета, дыплом, заява, кодэкс, мемарандум, рэзалюцыя, сертыфікат, хадайніцтва.

**229.** Ці згодны вы з выказваннем Г. М. Малажай, што «фразеалагізмы ствараюць нацыянальнае аблічча мовы»? Падбярыце да наступных рускамоўных фразеалагізмаў беларускія адпаведнікі. Параўнайце граматычную будову беларускіх і рускіх фразеалагізмаў.

Смотреть в оба, нелёгкая принесла, два сапога пара, как ни в чём не бывало, уши прожужжать, в кои веки, пустить по миру, белены объелся, дать маху, плестись в хвосте, у чёрта на куличках, из уст в уста, оказать милость.

Для даведкі: давесці да торбы, ліха прынесла (бура прыгнала), у віру́ на калу́ (у лясу́ на верасу́), з вуха на вуха, абое рабое (роўны з роўнага цешыцца), вушы праесці, гады́ ў рады́, як нічога ніякага, глядзець на ўсе вочы, воўчага маку (блёкату) наесціся, даць пудла, казу пасвіць, ласку зрабіць.

**230.** Прачытайце. Ці можна гэты тэкст назваць «Канспект»? Чаму? Сфармулюйце пытанні да тэксту, задайце гэтыя пытанні аднакласнікам.

Канспект (ад лац. *conspectus* — ‘агляд’) — кароткі, сціслы запіс зместу лекцыі, артыкула, прамовы, твора. Канспект — гэта разнавіднасць тэксту, які ствараецца ў выніку перапрацоўкі пэўнай


Правообладатель Национальный институт образования

інфармацыі. Мэта канспектавання — выяўленне, сістэматызацыя і абагульненне найбольш каштоўнай для слухача (чытача) інфармацыі.

Асноўнае правіла канспектавання — зразумець логіку падачы матэрыялу, запісаць істотнае, самае значнае, што неабходна для разумення праблемы. Агульнапрынятыя спосабы канспектавання заключаюцца ў наступным:

1) адбор інфармацыі з улікам яе навізны і значнасці. У выніку адбору змяншаецца аб'ём інфармацыі (шляхам выключэння паўтораў, аднатыпных прыкладаў, аб'яднання фактаў). Даслоўна варта запісваць фармулёўкі азначэнняў, правіл, законаў, асноўныя характарыстыкі, уласцівасці, функцыі прадмета, з'явы, падзеі і інш.;

2) перафармулёўка прачытанага (пачутага) у форме тэзісаў шляхам перакanструявання сказаў, скарачэння слоў, выкарыстання абрэвіятур.

Як падрыхтаваць канспект

1. Уважліва прачытайце тэкст, канспект якога трэба падрыхтаваць.

2. Перачытваючы кожны абзац, выдзяляйце ў ім асноўную думку. Пры гэтым да кожнага абзаца можна задаваць пытанне: *Пра што расказваецца ў гэтай частцы тэксту?*

3. Адказваючы на гэта пытанне, фармулюйце асноўныя палажэнні тэксту.

4. Запішыце асноўныя думкі кожнага абзаца, пацвердзіце іх прыкладамі.

5. Пры канспектаванні тэксту важна захаваць сэнс аўтарскага выказвання.

**231.** Прачытайце тэкст. Знайдзіце ў ім складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак. Зрабіце іх сінтаксічны разбор. Сфармулюйце ўласныя правілы захавання душэўнага камфорту.

**Хочаш быць паспяховым? Пазбягай песімістаў**

У старажытнасці існавала адзіная навука, якая вывучала агульныя законы развіцця прыроды, грамадства і чалавечага мыслення, — філасофія. З часам яна перажыла шмат адгалінаванняў, якія афармляліся ў самастойныя дысцыпліны. Ужо ў XX стагоддзі чалавек стаў аб'ектам вывучэння сацыялогіі, этыкі, эстэтыкі, педагогікі, псіхалогіі, біялогіі, фізіялогіі і іншых навук.



Правообладатель Национальный институт образования

Акмеалогія — гэта навука аб законах развіцця чалавека, фізічным, псіхічным, інтэлектуальным, прафесійным самаўдасканаленні і руху наперад. Паводле паводзін, культуры маўлення можна вызначыць характар, тэмперамент, схільнасці і таленты чалавека, можна высветліць, якая прафесія найбольш яму падыходзіць. Асноўная задача акмеалогіі — давесці да росквіту асобу і яе прафесійнае майстэрства ў пэўнай галіне на аснове схільнасцей і таленту, закладзеных прыродай.

Даказана, што чалавек, які пастаянна знаходзіцца ў стане духоўна-інтэлектуальнага напружання, можа пражыць да 120 гадоў, але для гэтага трэба быць актыўным, дзейсным, захопленым сваёй любімай справай. Быць чалавекам, які ўмее слухаць, думаць, разважаць, кантактаваць з іншымі, любіць чытаць і абмяркоўваць прачытанае, а таксама не забываецца на пасільныя фізічныя нагрузкі.

Перыядычна мы сутыкаемся з людзьмі, пагружанымі ў змрочныя, дэпрэсіўныя думкі, і «заражаемся» ад іх песімістычным настроем, звычайна пасля кантактавання з такімі псіхалагічнымі «вампірамі» ўзнікае адчуванне, нібы з вас высмакталі ўсе сілы. Як засцерагчы сябе і захаваць душэўны камфорт?

Па-першае, па магчымасці пазбягаць зносін з такімі асобамі, імкнуцца кантактаваць з вясёлымі, аптымістычнымі, жыццярадаснымі людзьмі. Па-другое, навучыцца кіраваць сваімі эмоцыямі і захоўваць добры настрой. Па-трэцяе, кантактуючы з рознымі людзьмі, пераймаць у іх толькі станоўчае: веды, прыгожыя манеры, прывабныя рысы характару *(З газеты «Звязда»)*.

Складзіце канспект тэксту.
Знайдзіце ў тэксце запазычаныя словы, назавіце іх прыметы.

**КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Якія сказы называюцца складанымі сказамі з рознымі відамі сувязі частак?
2. Пералічыце сродкі сувязі частак у складаных сказах з рознымі відамі сувязі.
3. На якія групы падзяляюцца складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак?
4. Якія знакі прыпынку ставяцца на мяжы частак у складаных сказах з рознымі відамі сувязі?
5. Растлумачце логіку і паслядоўнасць сінтаксічнага разбору складаных сказаў з рознымі відамі сувязі частак.


Правообладатель Национальный институт образования

# Сінтаксічныя канструкцыі з чужой мовай: будова, значэнне, ужыванне

## § 32. Спосабы перадачы чужой мовы. Асаблівасці будовы сінтаксічных канструкцый з простай мовай. Знакі прыпынку ў сказах з простай мовай

Выказванні той ці іншай асобы, якія аўтар уключае ў тэкст, называюцца **чужой мовай.** У залежнасці ад дакладнасці перадачы зместу і формы выказвання аўтар тэксту можа выбраць наступныя спосабы перадачы чужой мовы: простая мова і ўскосная мова.

**Простая мова** — гэта чужое выказванне, якое перадаецца даслоўна, з захаваннем зместу і формы, граматычных і стылістычных асаблівасцей. Напрыклад: *Нездарма мудрыя кітайцы кажуць: «Нават найгоршае чарніла больш надзейнае за лепшую памяць»* (К. Камейша).

Прыведзены сказ складаецца з дзвюх частак: слоў аўтара і ўласна простай мовы.

У саставе слоў аўтара найчасцей ужываюцца дзеясловы, якія:

- перадаюць агульны характар чужога выказвання: *гаварыць, расказваць, звяртацца, падумаць* і інш.;
- раскрываюць сувязь чужога выказвання з канкрэтнай сітуацыяй маўлення: *адказаць, дадаць, не вытрымаць, перабіць, уставіць, заўважыць* і інш.;
- абазначаюць, прадугледжваюць пытанне: *спытаць, перапытаць, удакладніць, запярэчыць* і інш.;
- перадаюць пачуцці, эмоцыі, унутраны стан чалавека: *здзівіцца, пакрыўдзіцца, жахнуцца, закрычаць.*


Правообладатель Национальный институт образования

**Ускосная мова** — гэта чужое выказванне, якое перадаецца не даслоўна, а толькі з захаваннем асноўнага зместу сказанага. Звычайна такія канструкцыі афармляюцца як складаназалежныя сказы. Галоўная частка такіх сказаў адпавядае словам аўтара, а даданая — чужому выказванню. Напрыклад: *Нездарма мудрыя кітайцы сцвярджаюць, што нават найгоршае чарніла бывае больш надзейным за лепшую памяць.*

**232.** Прачытайце тэкст. Падбярыце да яго загаловак. Чаму Беларусь называюць краінай фестываляў.

Беларусь улетку ператвараецца ў сапраўдную фестывальную Меку*. Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» — галоўная падзея ў гэтым шэрагу. Жыхары Віцебска прызнаюцца: «Чвэрць **стагоддзя** назад ніхто з нас не мог уявіць, што першыя фестывальныя сустрэчы перарастуць[с] у вялікую музычна-тэатральную тэрыторыю мастацтва[сл]». За апошнія гады фестываль істотна пашырыў свае межы. На гасціннай віцебскай зямлі ўжо пабывалі артысты з 70 краін.

Жыхары Александрыі Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці перакананы: «Фестываль “Александрыя збірае сяброў” — самае значнае свята для нас». Фестываль прысвечаны традыцыйнаму народнаму святу — Купаллю — у яго сучаснай інтэрпрэтацыі.

На Глыбоччыне расказваюць: «“Вішнёвы фестываль”, які прапісаўся ў **невялікім** беларускім горадзе Глыбокае, можна назваць маладым, але перспектыўным». Усе, хто быў на гэтым свяце, падкрэсліваюць, што гэта вясёлае, яркае свята, прысвечанае кісла-салодкай ягадзе, набывае шмат сяброў.

Хочацца, каб было ў нашай Беларусі мноства фестываляў — цікавых, вясёлых, з гумарам.[сн] Яны абавязкова дапамогуць зрабіць наша жыццё больш разнастайным, духоўна багатым *(Паводле В. Харкова)*.

Сказы з простай мовай перабудуйце і запішыце як канструкцыі з ускоснай мовай. Назавіце арфаграмы ў выдзеленых словах.

Які фестываль вы прапанавалі б правесці ў вашых родных мясцінах? Чаму ён можа быць прысвечаны?



Правообладатель Национальный институт образования

У залежнасці ад месца, якое займаюць у сказе словы аўтара **(А, а)** і простая мова **(П, п)**, ставяцца адпаведныя знакі прыпынку.

### 1. Простая мова пасля слоў аўтара

| | |
|---|---|
| **А: «П».**<br>Простая мова мае ***апавядальную інтанацыю*** | *Адказ суровы, ды справядлівы: «Там толькі бываем шчаслівыя, дзе любім, дзе любяць нас»* (А. Вярцінскі). |
| **А: «П?»**<br>Простая мова мае ***пытальную інтанацыю*** | *Сын падышоў бліжэй і спытаўся з трывогай: «Мама, табе нездаровіцца?»* |
| **А: «П!»**<br>Простая мова мае ***клічную інтанацыю*** | *Яна настойліва паўтарала: «Напішы мне!»* |

### 2. Простая мова перад словамі аўтара

| | |
|---|---|
| **«П», — а.**<br>Простая мова мае ***апавядальную інтанацыю*** | *«Прынясіце мне, цётка Кацярына, галінку бэзу», — ціха папрасіла Клава* (І. Мележ). |
| **«П?» — а.**<br>Простая мова мае ***пытальную інтанацыю*** | *«Хіба можна забыць родныя карані?» — здзіўлена пыталася мая субяседніца.* |
| **«П!» — а.**<br>Простая мова мае ***клічную інтанацыю*** | *«Жадаю вам дабра!» — шчыра ўсклікнула дзяўчына.* |

**233.** Прачытайце, растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах. Выпішыце па адным сказе на розныя выпадкі пастаноўкі знакаў прыпынку, калі простая мова знаходзіцца перад словамі аўтара.

1. «Добры дзень, школа!» — кажу я моўчкі, ступіўшы на ганак школы. 2. «Я патупаю тут, каля машыны, а ты ідзі на той бок дарогі», — сказаў Канстанцін Міхайлавіч. 3. «Ну, дачушка, у добры шлях!» — бацька кажа. 4. «Грыб! Паглядзі, як цікава расце!» — крычыць Міколка. 5. Дачка весела спытала: «Ведаеш, мама, каго я прывяла? Гэта той самы хлопец, з якім я хацела вас пазнаёміць».



Правообладатель Национальный институт образования

6. «Дзе ты прападаеш, сын?» — спытала маці. 7. «Стой, брат Алесь, ты паглядзі, што за слаўнота», — сказаў Лабановіч, захоплены спакоем раніцы *(Я. Колас)*. 8. «Гэта крушына. Мы яе сушылі, а цяпер возім здаваць», — растлумачыў Косця. *(І. Навуменка)*.

### 3. Словы аўтара ў сярэдзіне простай мовы

| | |
|---|---|
| **«П, — а, — п».** Словы аўтара раздзяляюць простую мову на месцы ***коскі, кропкі з коскай, двукроп'я, працяжніка*** або ***там, дзе не было ніякага знака прыпынку*** | *«Не кепска тут хлапчыне, — прамовіць часам гаспадыня, — а ўсё ж дамок свой моцна цягне, і кожны к матцы сваёй прагне»* (Я. Колас). |
| **«П, — а. — П».** Словы аўтара раздзяляюць простую мову на месцы ***кропкі*** | *«Значыць, мудрэем, — сказаў сябра. — Усё ж мудрасць — гэта набытак сталасці».* |
| **«П? — а. — П».** **«П! — а. — П».** Словы аўтара раздзяляюць простую мову на месцы ***пытальніка*** або ***клічніка*** | *«Вы не памыліліся? — спыталася жанчына. — Прабачце, я не магу Вас прыпомніць».* *«Прывітанне! — энергічна паціснуў руку мужчына. — Давайце паабедаем разам».* |
| **«П... — а. — П».** Словы аўтара раздзяляюць простую мову на месцы ***шматкроп'я*** | *«Сябры мае... — задуменна пачынае прамову выступоўца. — Давайце паразважаем».* |
| **«П? — а: — П».** У словах аўтара ёсць **два дзеясловы маўлення**, адзін з іх адносіцца *да першай часткі* простай мовы, другі — *да другой часткі*. Пасля слоў аўтара ставяцца двукроп'е і працяжнік. Першае слова другой часткі простай мовы пішацца з вялікай літары | *«Мы не пойдзем у тэатр? — спытала Васіліна і разгублена дадала: — Я ж білеты купіла».* |


Правообладатель Национальный институт образования

### 4. Простая мова ў сярэдзіне слоў аўтара

| | |
|---|---|
| **А: «П», — а.**<br>**А: «П?» — а.**<br>**А: «П!» — а.**<br>**А: «П...» — а.**<br>Калі простая мова знаходзіцца ў сярэдзіне слоў аўтара, то перад ёй ставіцца двукроп'е, пасля яе — коска і працяжнік.<br>Калі простая мова заканчваецца ***пытальнікам, клічнікам*** або ***шматкроп'ем***, то коска не ставіцца | *Васіліна сказала: «Мы пойдзем у тэатр», — і пачала збірацца.*<br>*Васіліна перапытала: «Мы пойдзем у тэатр?» — і з радасцю пачала збірацца.*<br>*Васіліна разгублена прамовіла: «Я так спадзявалася, што мы пойдзем у тэатр, але...» — і незадаволена падышла да стала.* |

**234.** Прачытайце сінтаксічныя канструкцыі з простай мовай. Пракаменціруйце пастаноўку знакаў прыпынку ў іх.

1. «Як здорава, хлопцы, летам! — сказаў Васіль. — Сапраўды, залатая пара́...» 2. «Што казаць! — зазначае бацька і пасля кароткай паўзы дадае: — Дзе б ні працаваў, а старацца трэба». 3. «Пачакайце, — кажа ён, — знішчыць малады лес можна скора, а як жа нялёгка вырасціць яго!» *(В. Каваль)*. 4. «Нічога, браце, — разважаў дзед, — усё неяк уладкуецца, пойдзе на лепшае». 5. Цяпер сястра жыве далёка, і часам я ў лістах прашу, калі мне вельмі адзінока: «Хоць словам адагрэй душу!» *(С. Грахоўскі)*. 6. «Паехалі! — закамандаваў шафёр. — І так доўга прастаялі». 7 «Хто ж госцю не радуецца? — здзіўлена запыталася гаспадыня і ветліва запрасіла: — Праходзьце, калі ласка». 8. «Не шабля, а чапля, — паблажліва паправіў Эдзік малую і з сур'ёзным выглядам знаўцы растлумачыў: — Можа, яна паляцела дамоў, на гняздоўе за балотам» *(В. Вольскі)*. 9. «Скажыце, будзьце ласкавы, — звярнуўся настаўнік да некаторых сялян, — ці не ведаеце, дзе б тут знайсці каго з вы́ганаўскіх?» *(Я. Колас)*.

**235.** Спішыце сказы, правільна афармляючы іх на пісьме.

1. Стой *(С/с)*ярод гарадскога густога грукату ўстрывожана крыкнула сястра *(Г/г)*лядзі не спяшайся *(У. Мяжэвіч)*. 2. Выбачайце *(У/у)*сміхнулася жанчына дружалюбна паглядзеўшы на


Правообладатель Национальный институт образования

афіцэра і сказала як бы жартам *(А/а)*ле ж я здаецца не на допыце і не абавязана вам адказваць *(У. Паўлаў)*. 3. Урэшце ён кінуў некалькі грэблівых[л] слоў: Я не збіраюся рабіць перад вамі справаздачы! — і яўна наважыўся пайсці далей *(М Лынькоў)*. 4. Мяркуйце пра чалавека па яго справах *(С/с)*казаў дзядуля *(А/а)* не па прыгожых словах.

**236.** Спішыце, правільна афармляючы сказы з простай мовай. Пабудуйце схемы сказаў. Вусна пракаменціруйце пастаноўку знакаў прыпынку.

1. Эх, каб дожджык! *(Н/н)*е раз думаў Аляксей, з надзеяй пазіраючы на неба *(В/в)*ось было б добра! 2. І хто з двара ў дом ні прыходзіць пра холад гутарку заводзіць *(Н/н)*у ж і мароз — аж нос зрывае! А як на ўсходзе чырвань грае! *(Я. Колас)*. 3. Косы пад пракосы — самі на абед, людзі добрыя! *(Г/г)*укнуў гаспадар, схаваўшы касу пад скошаную траву *(А. Асіпенка)*. 4. У структуры ска́заў з рознымі відамі сувязі выразна вылучаюцца дзве сэнсавыя часткі *(С/с)*казаў настаўнік і дадаў *(І/і)*х можна назваць логіка-структурнымі часткамі. 5. Няўжо няма ні аднаго блізкага мне чалавека *(С/с)*пытаўся Іван *(Н/н)*і адной блізкай душы? 6. Ён задумліва сказаў *(С/с)*апраўднае каханне з часам не слабее а набіраецца сілы-моцы.

**237.** Знайдзіце сказы, у якіх дапушчаны пунктуацыйныя памылкі. Запішыце выпраўленыя сказы.

1. «Цікава, чым усё гэта скончылася?» — нецярпліва спытаў нехта *(В. Адамчык)*. 2. «Толькі два дні мінула, — разважаў Мірон, — а мне здаецца, нібы некалькі тыдняў мы тут жывём» *(Я. Маўр)*. 3. «Тут жа цэлае багацце! — усклікнуў Павел, зірнуўшы на кніжкі. — Я не магу іх узяць, яны каштуюць грошай» *(А. Чарнышэвіч)*. 4. «Скончыш добра школу, абяцаў мне бацька. — Адпусцім вучыцца ў сталіцу». 5. «Заўтра, гаварыла мама. — Дзед Мароз прынясе вам падарунак». 6. «Дабро — адзіная сіла, здольная зрабіць чалавека высакародным» — гаварыла мне маці. 7. «А я хачу быць доктарам, — кажа малодшы сын і дадае — Хачу людзей лячыць, дапамагаць ім». 8. Ігар Васільевіч выслухаў нас уважліва, пасля ўсё ж запытаўся: — «Вы нічога не пераблыталі?»


Правообладатель Национальный институт образования

**238.** Прачытайце тэкст. Растлумачце напісанне слоў з прапушчанымі арфаграмамі.

### Слова пра хлеб

З даўніх часоў хлеб быў славай, гонарам, прадметам галоўнага клопат.. чалавека. Гаспадар мой бацюшка — спявалі на с..лянскім вяселл.. . На в..чарынках вялі карагодам: Каравай каравай каго хоч..ш выбірай. Хлеб на чыстым ру..ніку па..носілі самаму дарагому госцю і той прымаючы яго, ц..лаваў духмяны бохан.



На зажынках у першы дзень жніва ў вёску з пес..нямі неслі сноп, перавіты васількамі. Яго ставілі ў хаце на по́куц.. — сноп увасабляў дабрабыт гаспадара надзею на дастатак і шчасце. Хлеб усяму галава гаворыцца ў прыказцы. Шмат іншых яскравых прыказак пра хлеб складз..на народам.

Многія людзі ведаюць словы К. А. Ціміразева пра тое, што скібка добра прапеча..ага хлеба складае адно з найв..лікшых вынахо..стваў чалавечага розум.. . А першаа..крывальнік Сусвет.. Юрый Гагарын законч..ўшы свой гістарычны палёт стаў на калені пацалаваў з..млю ад радасці і сказаў Больш за ўсё я люблю зямлю на якой можна любіць працаваць выро..чваць хлеб *(Паводле А. Сілянкова)*.

Выпішыце сказы з простай мовай. Пракаменціруйце пастаноўку знакаў прыпынку ў іх.

**239.** Складзіце або выпішыце з мастацкай літаратуры па два сказы на кожную схему.

| | |
|---|---|
| 1. «П, — а, — п». | 4. «П, — а. — П». |
| 2. «П?» — а. | 5. «П, — а: — П». |
| 3. А: «П!» | 6. «П? — а. — П». |

**240.** Запішыце сказы, правільна іх аформіце.

1. Вучыцца нам, брат, яшчэ трэба многа, зазначыў Турсевіч. Я, напрыклад, думаю ў інстытут падавацца. 2. Хто б гэта мог быць? — падумаў гаспадар. — І чаму ён не зайшоў да мяне? 3. Чытай, мой



Правообладатель Национальный институт образования

хлопчык... — пачынаў свае павучанні стары: — Кнігі многае даюць, яны вучаць, як трэба жыць. 4. Лабановіч падумаў: А добра гаворыць, — і ўпотайку пазайздросціў яго красамоўству. 5. Чаго ты крычыш? — абазвалася пакрыўджаная буфетчыца, — сам кату па пяту, а распараджаецца. 6. «Напалеон, — Прадставіўся госць і дадаў з усмешкай, пабачыўшы ў вачах суразмоўцы здзіўленне. — Орда». 7. «Зоркі — гэта лёсы людзей — сказаў малады чалавек і дадаў: давайце шукаць свае зоркі».

## § 33. Маналог.
## Дыялог, яго афармленне на пісьме

**Маналог** (ад грэч. *monos* — 'адзін', *logos* — 'мова', 'маўленне') — гэта выказванне, звернутае да самога сябе або да іншай асобы, якое не разлічана на адказ, на моўную рэакцыю іншых.

**Дыялог** (ад грэч. *dialogos* — 'размова', 'гутарка') — гэта простая мова, якая перадае гутарку дзвюх і больш асоб. Выказванні кожнай асобы ў дыялогу называюцца **рэплікамі**. Кожная рэпліка дыялогу, як правіла, запісваецца з чырвонага радка, перад ёй ставіцца працяжнік. Напрыклад:

Дыялог паміж маці і дачкой раніцай.

*— Ты бутэрброды ўзяла? — пытае маці.*

*— Не, абыдуся. У буфеце перакушу́, — адказвае дачка-пяцікласніца.*

*— А мабільнік?*

*— Ой... Ён таксама дома застаўся... Трэба вярнуцца.*

*Без сувязі, выходзіць, як без рук. І горш, чым без хлеба...* (Л. Арабей).

Калі дыялог запісваецца ў радок, то словы кожнай рэплікі бяруцца ў двукоссе, паміж рэплікамі ставіцца працяжнік. Напрыклад: *«Бачыш?»* — *«Што?»* — *«Штосьці белае, лапіна нейкая».* — *«Дзе?»* — *«Пад дзічкай»* (К. Чорны).

**241.** Вусна растлумачце значэнне слоў.

а) манаграфія, манокль, монакультура, маналіт, манапаліст, манатонны;

б) полівітаміны, паліглот, паліграфія, паліклініка, палімеры.



Правообладатель Национальный институт образования

**242.** Выпішыце азначэнні дыялогу і маналогу, прапанаваныя мовазнаўцам А. Я. Міхневічам. Параўнайце гэтыя азначэнні з ужытымі ў правіле. Што іх аб'ядноўвае і адрознівае?

**Маналог** — гэта адзінае, як бы ні з кім не падзеленае слова (маўленне), а дыялог — падзеленае слова, узаемнае маўленне. У нямецкай мове ўтвораны вельмі ўдалыя сінонімы да грэчаскіх слоў: маналог — *Selbstgespräch* (па-беларуску прыкладна 'самаразмова', 'аднаразмова'), дыялог — *Zweigespräch* ('двухслоўе', 'двухразмова'). *Такім чынам, этымалагічна маналог — гэта гаворка, якую вядзе адзін чалавек, а дыялог — дзве асобы ці болей.*

З гістарычнага пункту погляду дыялагічнае маўленне, бясспрэчна[сл], першасная форма моўных паводзін людзей. Сапраўды, чалавек вядзе пастаянную, нават спрадвечную, бясконцую размову (параўнайце: дыялог) — з другім чалавекам, з самім сабой, з прыродай. Таму маналог, нават калі ён і вельмі вялікі, і, на першы погляд, цалкам самастойны, усё роўна прызначаны для каго-небудзь. Ён з'яўляецца як бы рэплікай у вялікім несканчоным дыялогу «ўсіх з усімі», ён звернуты да нейкага суразмоўніка, хай сабе і аддаленага прасторай ці часам або нават уяўнага.

Паразважайце, чаму гэты артыкул у энцыклапедыі «Беларуская мова» названы *«Дыялог і маналог»*, а не *«Маналог і дыялог»*.

- Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў выдзеленым сказе.

**243.** Прачытайце. Чым адрозніваецца дыялог у мастацкім тэксце ад дыялогу ва ўласна гутарковым маўленні? Як «прысутнасць» аўтара адбіваецца на характары дыялогу ў мастацкім творы?

Вяселле. Усе, хто як можа і ўмее, весяляцца: танцуюць, гарланяць, цалуюцца. А ён, ціхі ды працавіты чалавек, маўчыць. Гаспадар непакоіцца[ф]:

— Як ты там, браце Юрка?

— Ды вось грушу ем. Усё — вельмі добра.

І харошая ўсмешка *(Я. Брыль)*.

* * *

Чытаю прозу Петэфі. З той самай асалодай, «на той самай струне», як перачытваў нядаўна Бёрнса.


Правообладатель Национальный институт образования

Перапыніўся, каб пазваніць старэйшаму, даўно любімаму сабрату па пяру, які занядужаў.

— Ну, як ты там сябе адчуваеш?

— Ды ўжо, брат, за сталом. Не пішацца... Сяджу, уздыхаю, як конь над пустым цэбрам*...

Як жа запахла мне Беларуссю![сн] *(Я. Брыль)*.

Адзін з дыялогаў запішыце ў радок. Пракаменціруйце, як мяняюцца пры гэтым знакі прыпынку.

**244.** Складзіце дыялог на адну з тэм: «Сустрэча з аднакласнікам», «У кнігарні», «Пасля спектакля».

**245.** Прачытайце табліцу. Падрыхтуйце паведамленне пра афармленне дыялогу на пісьме. Запішыце свае прыклады дыялогаў.

| АФАРМЛЕННЕ ДЫЯЛОГУ | |
|---|---|
| **Рэплікі запісваюцца з чырвонага радка** | |
| — $\text{П}_1$?<br>— $\text{П}_2$. | |
| У дыялогу простая мова кожнай асобы пачынаецца з новага абзаца | — Адкуль вы?<br>— З-пад Мазыра.<br>— Ого, здалёк. А ў сталіцу па якой справе?<br>— У камандзіроўку *(У. Шыцік)*. |
| — $\text{П}_1$? — а.<br>— $\text{П}_2$, — а. | |
| Калі простая мова мае пры сабе словы аўтара, яны выдзяляюцца на аснове агульнага правіла | — Дзеці, якія памылкі дапусціў наш Лёня? — запытаўся настаўнік.<br>— Кенгуру водзяцца ў Аўстраліі, — растлумачыла з апошняй парты Люба.<br>— А пінгвіны жывуць у Антарктыдзе, — дадаў нехта.<br>— Вось бачыш, Лёня, — з дакорам прамовіў Васіль Пятровіч *(М. Даніленка)*. |



Правообладатель Национальный институт образования

| **Рэплікі запісваюцца ў радок** | |
|---|---|
| **«$П_1$?» — «$П_2$». — «$П_1$?» — «$П_2$».** | |
| Калі простая мова розных асоб у дыялогу ўжываецца без слоў аўтара і пішацца ў адзін радок, то рэпліка кожнай асобы бярэцца ў двукоссе з адпаведным яе будове і інтанацыі знакам прыпынку і аддзяляецца адна ад другой працяжнікам | «Дзе старшыня?» — «Не прыехаў». — «Чаму?» — «Работы ў яго шмат» *(І. Пташнікаў)*. |
| **«$П_1$», — а. А: «$П_2$».** | |
| Калі мова адной асобы аддзелена ад мовы другой асобы словамі аўтара, то працяжнік паміж імі не ставіцца | «Я пайду адна», — сказала Зоська. Антон адказаў: «Не, адну я цябе не пушчу» *(В. Быкаў)*. |

**246.** Прачытайце верш. Якая роля дыялогу ў раскрыцці асноўнай думкі верша?

### Ты, першае слова, адкуль?

— Ты, першае слова, адкуль?
— Ад жытняга коласа ў полі,
Ад вёскі, дзе родны твой кут
І неразгаданая доля.
— Ты, першае слова, адкуль?
— Ад матчынай[м] песні жытнёвай.
І колькі на гэтым вяку
Я ўцешыла праўдай жыццёвай.
— Ты, першае[м] слова, адкуль?
— Ад ценяў дарогі сустрэчных.
І той, хто не знае пакут,
Пытаць пра мяне будзе вечна.

*В. Аколава.*

Як назва верша праграмуе дыялагічную форму твора?
Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў тэксце.
Напішыце сачыненне-мініяцюру на тэму «Дзе нараджаецца роднае слова».



Правообладатель Национальный институт образования

**247.** Выканайце інтэрактыўнае заданне па тэме «Знакі прыпынку ў канструкцыях з чужой мовай»: размяркуйце канструкцыі з чужой мовай па групах у залежнасці ад пастаноўкі знакаў прыпынку.

## § 34. Сказы з ускоснай мовай

**Ускосная мова** — гэта чужая мова, якая перадае толькі асноўны змест выказвання асобы ад імя аўтара (апавядальніка), без захавання лексічных, граматычных і інтанацыйных асаблівасцей маўлення пэўнай асобы. Ускосная мова афармляецца як *складаназалежны сказ.*

**248.** Выпішыце спачатку сказы з простай мовай, а пасля — з ускоснай. Растлумачце розніцу ў пастаноўцы знакаў прыпынку ў сказах.

1. «А ў нас, Валянціна Іванаўна, у класе новенькі вучань!» — радасна паведаміла Ларыса. 2. Міша запытаў: «**Хочаш** марожанага?» 3. **Дзядзька** Алесь сказаў, што дрэўца трэба хутчэй пасадзіць. 4. Сястра з упэўненасцю гаварыла мне, што я геній. 5. «Калі, унучак, **прыйдзеш** наступны раз?» — **з надзеяй** запытала бабуля. 6. Гаварыла мама-птушка: «Верабейку, ветрык, гушкай. Хай маленькі спіць даўжэй — будзе падрастаць хутчэй» *(Н. Галіноўская)*. 7. Настаўнік параіў Сцёпку: «Не пакідай навукі!» *(Я. Колас)*.

- Растлумачце арфаграмы ў выдзеленых словах.

Пры замене простай мовы на ўскосную трэба кіравацца наступнымі правіламі:

**1.** Калі простая мова ўяўляе сабой *апавядальны сказ*, то яна замяняецца даданай *дапаўняльнай часткай* са злучнікам ***што***:

| | |
|---|---|
| *Маці патлумачыла: «Гэты гасцінец ад цёткі Наташы».* | *Маці патлумачыла, **што** гэты гасцінец ад цёткі Наташы.* |

**2.** Калі простая мова ўяўляе сабой *пытальны сказ* з пытальнымі займеннікамі ***хто, што, які, чый, колькі***, прыслоўямі ***калі,***



Правообладатель Национальный институт образования

***куды, дзе, адкуль***, то яна замяняецца дададай *дапаўняльнай часткай* з выкарыстаннем гэтых займеннікаў і прыслоўяў у якасці злучальных слоў:

| | |
|---|---|
| *Раптам дачка спыталася ў таты: «Што ты мне прывёз?»* | *Раптам дачка спыталася ў таты, **што** ён прывёз ёй.* |

**3.** Калі простая мова ўяўляе сабой *пытальны сказ* без пытальных займеннікаў і прыслоўяў або з пытальнай часціцай ***ці***, то яна замяняецца даданай дапаўняльнай часткай са злучнікам ***ці***:

| | |
|---|---|
| *Дзядзька спытаўся: «Ці не пусціце пераначаваць нас?»* | *Дзядзька спытаўся, **ці** не пусціць гаспадар іх пераначаваць.* |

**4.** Калі простая мова ўяўляе сабой *пабуджальны сказ*, то яна замяняецца даданай дапаўняльнай часткай са злучнікам ***каб***:

| | |
|---|---|
| *Марына яшчэ раз напомніла сяброўкам: «Прыходзьце ў нядзелю абавязкова!»* | *Марына яшчэ раз напомніла сяброўкам, **каб** яны прыходзілі ў нядзелю абавязкова.* |

**5.** Асабовыя і прыналежныя займеннікі, дзеясловы 1-й і 2-й асобы адзіночнага ліку перадаюцца ад асобы аўтара:

| | |
|---|---|
| *«Мама, я цябе добра разумею», — па-даросламу сказала дачка.* | *Дачка па-даросламу сказала маці, што добра разумее яе.* |

**6.** Звароткі пры замене простай мовы на ўскосную становяцца членамі галоўнай часткі складанага сказа або апускаюцца, выключаюцца:

| | |
|---|---|
| *Унучка раптам запыталася: «Дзядуля, ці начуе сонца ў лесе?»* | *Унучка раптам запыталася ў дзеда, ці начуе сонца ў лесе.* |

**7.** Выклічнікі, часціцы, выклічнікавыя фразеалагізмы ***вось табе і маеш, вось як, божа мой*** і інш. пры замене простай мовы на ўскосную апускаюцца:

| | |
|---|---|
| *«Ого, дзядзька Павел, Вы хітруеце», — сказаў Андрэй.* | *Андрэй сказаў, што дзядзька Павел хітруе.* |



Правообладатель Национальный институт образования

**249.** Прачытайце тэкст і раскажыце, выкарыстоўваючы ўскосную мову, што раяць дзяўчыне яе бацькі і сяброўка. Перабудуйце сказы з простай мовай у сказы з ускоснай мовай, запішыце іх.

Васіліна — з Віцебска. Яна паступіла ў гэтым годзе ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Дзяўчына вучыцца на філалагічным факультэце і з дапамогай выкладчыкаў-прафесіяналаў спазнае сакрэты роднай мовы і беларускай літаратуры.

Бацькі і сябры часам пішуць Васіліне пісьмы і СМС, часта званяць. Кожны з іх дае свае парады. Бацька кажа: «Займайся сур'ёзна, рыхтуйся да заняткаў у бібліятэцы. Наогул, не сядзі дома, наведвай тэатры і музеі». Мама піша: «Не забывайся нам званіць. Апранайся цёпла, абедай у сталоўцы. Купі сабе руска-беларускі слоўнік, будзе лягчэй вывучаць мову». Малодшая сястра просіць наведаць кнігарню і купіць ёй дапаможнік па фізіцы. Лепшая сяброўка дае настойлівыя парады: «Абавязкова прымай актыўны ўдзел у студэнцкім жыцці, з дзяўчатамі ў пакоі жыві дружна».

**250.** Складзіце або выпішыце з мастацкай літаратуры па 3 сказы з простай і ўскоснай мовай. Зрабіце сінтаксічны разбор гэтых сказаў (гл. Дадатак).

**251.** Спішыце сказы, расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку.

1. Чалавек да таго часу малады пакуль сам хоча ім быць пісаў вядомы пісьменнік. 2. Часта задаюць пытанне ці можна навучыцца правільна і прыгожа гаварыць 3. Вучоныя лічаць што асноўнымі якасцямі культуры маўлення з'яўляюцца правільнасць дакладнасць лагічнасць чысціня і выразнасць. 4. І стала прасіць маладое насенне каб вецер узяў яго з сабою *(Я. Колас)*. 5. Часта пыталася маці ў мяне Куды падзеліся зоркі? *(П. Панчанка)*. 6. Што было самым галоўным у маім жыцці? рана ці позна задае пытанне сабе кожны чалавек.

**252.** У якіх прыкладах парушаны правілы замены простай мовы на ўскосную? Адрэдагаваныя сказы запішыце правільна.

1. «Чаму зачынены вароты?» — здзівіўся гаспадар. — Гаспадар здзівіўся, чаму зачынены вароты. 2. «Пераходзьце вуліцу правільна!» — у чарговы раз напомніла дзецям маці. — Маці ў чарговы раз напомніла дзецям, каб яны пераходзілі вуліцу правільна.


Правообладатель Национальный институт образования

3. Я гляджу на яго спакойны твар і кажу: «А вы шчаслівы чалавек». — Я гляджу на яго спакойны твар і кажу, што вы шчаслівы чалавек. 4. «Расступіцеся!» — крыкнулі ў натоўпе. — У натоўпе крыкнулі, каб усе расступіліся. 5. «Што Вы хочаце ад мяне?» — не вытрымала субяседніца. — Субяседніца не вытрымала і спыталася, што вы хочаце ад мяне.

**253.** Прачытайце тэкст. Сказы з простай мовай перабудуйце ў сказы з ускоснай і запішыце.

### Сустрэча сяброў у Александрыі

Купалле — старажытнае славянскае свята, прысвечанае сонцастаянню. З Купаллем звязана мноства магічных традыцый і абрадаў. У купальскую ноч беларусы шукалі кветку шчасця, замаўлялі траву і вянкі, каб яны дапамаглі вырашыць праблемы з каханнем, прынеслі ў дом удачу.




Сёння свята з маштабам адзначаецца ў многіх беларускіх гарадах і вёсках. Больш за ўсё гасцей збіраецца ў Александрыі Магілёўскай вобласці.

Адзін з запрошаных гасцей расказаў нам: «Александрыя стала месцам сяброўскіх сустрэч і пляцоўкай для народнай дыпламатыі. Паважаць не толькі сваю культуру, але і творчыя дасягненні іншых народаў — гэта рыса беларускага нацыянальнага характару». Другі госць прызнаўся: «У вас усё вельмі ярка, квяціста, у нас усё больш сціпла». Гаспадары расказвалі: «На свяце арганізаваны экскурсійны маршрут “Александрыйская вандроўка”, працуе старажытная друкарня. Прэзентуюцца беларуская кніга, нацыянальная кухня, музыка і фальклор».

Прадстаўнік Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь зазначыў: «Гэты фестываль асаблівы для нашай краіны, нашай культуры. Гэта важна, бо душа народа — у песні, у кнізе, у слове» *(Паводле М. Яўсеева)*.

Зрабіце сінтаксічны разбор аднаго сказа з ускоснай мовай (на выбар).
- Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах першага абзаца.
- Праз якія элементы малюнка перадаецца нацыянальны каларыт свята?


Правообладатель Национальный институт образования

## § 35. Цытаты, іх роля ў выказванні, афармленне на пісьме

**Цытата** — даслоўная вытрымка з чужога выказвання, мастацкага, навуковага або публіцыстычнага тэксту. Аўтары выкарыстоўваюць цытаты для пацвярджэння ўласных думак, меркаванняў, сцвярджэнняў. У пісьмовым маўленні цытаты, як правіла, заключаюцца ў двукоссе.

Цытаты ўзбагачаюць змест і структуру аўтарскага тэксту, дазваляюць спалучаць чужое маўленне і аўтарскую пазіцыю. Стылістычныя функцыі цытавання (выкарыстання цытат) разнастайныя: цытаты ўтрымліваюць інфармацыю, неабходную для развіцця сюжэта, дапамагаюць раскрыць вобраз персанажа, маўленчыя паводзіны літаратурных герояў.

Цытаваны тэкст павінен быць тоесным першакрыніцы. Лексічная і граматычная форма цытаты павінна поўнасцю адпавядаць арыгіналу.

**254.** Прачытайце тэкст. Складзіце і запішыце яго план. Перакажыце тэкст з дапамогай плана.

### Асноўныя спосабы ўключэння цытат у тэкст і іх афармленне на пісьме

а) Цытата можа суправаджацца словамі аўтара. Пры такім спосабе цытавання знакі прыпынку такія ж, як і ў сказах з простай мовай. У словах аўтара выкарыстоўваюцца дзеясловы *пісаць, сказаць, адзначыць, нагадаць, прапанаваць* і інш., якія паказваюць, каму належыць цытата: *У адным з вершаў Янка Купала пісаў: «Без шчасця кахання — долі няма на зямлі»*;

б) цытата можа ўводзіцца ў аўтарскі тэкст як частка сказа пры дапамозе падпарадкавальных злучнікаў. У такіх выпадках цытата бярэцца ў двукоссе і пішацца з малой літары: *Якуб Колас пісаў пра тое, што «задача пісьменніка — у адборы лепшага, у прывядзенні мовы да літаратурных нормаў»*;

в) для ўвядзення цытаты ў тэкст могуць выкарыстоўвацца пабочныя канструкцыі *(як гаварыў, паводле слоў, па словах, на думку, як лічыў)*: ***На думку Якуба Коласа,*** *«добра быць у дарозе, якую ты сам сабе выбіраеш»*.



Правообладатель Национальный институт образования

Пры афармленні цытат трэба памятаць, што:

- калі цытата прыводзіцца часткова, то пропуск часткі тэксту абазначаецца шматкроп'ем (у пачатку, у сярэдзіне, у канцы цытаты): *Стары настаўнік з рамана І. Шамякіна гаворыць, звяртаючыся да сваіх вучняў: «...Не верце, калі хто скажа, што хоць адна дарога ў жыцці будзе лёгкая»*;
- цытаты ў вершаванай форме ў двукоссе не бяруцца:

*У патрыятычным вершы «Не шукай» Янка Купала, звяртаючыся да моладзі, пісаў:*

*Не шукай ты шчасця, долі*
*На чужым, далёкім полі.*

Вершаваная цытата выдзяляецца двукоссем, калі пачынаецца на тым жа радку, што і словы аўтара: *Аб упартай працы над вершам Максім Багдановіч пісаў: «Трэба з сталі каваць, гартаваць гібкі верш, абрабіць яго трэба з цярпеннем»* (Паводле А. Каўруса).

**255.** Аформіце выказванні, выкарыстоўваючы розныя спосабы цытавання.

Узор. Кожны народ сам сабе пан *(Янка Купала)*. — Янка Купала як сын свайго народа з гонарам сцвярджаў: «Кожны народ сам сабе пан» (спосаб цытавання: цытата суправаджаецца словамі аўтара).

Янка Купала быў перакананы, што «кожны народ сам сабе пан» (спосаб цытавання: цытата ўводзіцца як частка сказа).

На думку Янкі Купалы, «кожны народ сам сабе пан» (спосаб цытавання: выкарыстоўваюцца пабочныя словы).

1. І харашэе з году ў год мой родны вольны край *(А. Русак)*. 2. Слова любіць, каб над ім падумалі... *(Я. Скрыган)*. 3. Дзяды і бацькі нашу мову стваралі, каб звонка звінела, была як агонь *(П. Броўка)*. 4. Няхай ведаюць ворагі міру, што ім сонца не пагасіць скавытаннем сваім *(М. Танк)*. 5. Хто не спадзяецца на сябе, той заўсёды бывае слабы *(Я. Колас)*. 6. Ніхто спрачацца з тым не будзе, што ўсюды шмат мясцін прыгожых *(У. Дубоўка)*.

**256.** Прачытайце афарыстычныя выслоўі. Ці згаджаецеся вы з аўтарамі гэтых выказванняў?

1. Ад шчасця слёзы ў дзяцей не льюцца, ад шчасця хочацца спяваць *(Н. Гілевіч)*. 2. Без чалавечай і буслінай вернасці няма


Правообладатель Национальный институт образования

ні дабрыні, ні характва *(П. Панчанка)*. 3. Відаць, там шчасце не канчаецца, дзе ёсць прычыны для трывог *(А. Пысін)*. 4. Вялікія людзі нашчадкам у генах заўжды завяшчалі любоў *(Е. Лось)*. 5. Каханне і веру не трэба ўсім выстаўляць напаказ: душу чуе толькі неба *(А. Лойка)*.

Запішыце выказванні, выкарыстоўваючы розныя спосабы цытавання.
2-3 выслоўі, якія вам найбольш спадабаліся, запішыце па памяці.

**257.** Прачытайце тэкст — прадмову да кнігі «Афарыстычныя выслоўі беларускіх пісьменнікаў» аўтараў Н. В. Гаўрош і Н. М. Нямковіч. Сфармулюйце і запішыце пытанні да тэксту. Звярніцеся з гэтымі пытаннямі да аднакласнікаў, ацаніце іх вусныя адказы.

Цікавасць да лацінскіх і грэчаскіх прыказак, крылатых выслоўяў[сл] тлумачыцца не толькі тым, што яны прайшлі праз вякі, яны прынеслі нам святло мудрасці. Менавіта ў антычных афарызмах адлюстраваліся душа, розум і сіла слова мінулых пакаленняў; нам і сёння блізкія многія іх маральныя, этычныя і эстэтычныя ідэалы.

Афарызмы ніколі не характарызуюць аднаго чалавека, яны маюць дачыненне да многіх і многага, калі не да ўсіх і да ўсяго. Нягледзячы на сваю ўніверсальнасць, даволі часта афарыстычны выраз можа падказаць, якому народу ён належыць. Прыгадаем: *Навошта каласы, калі няма васількоў?* (М. Багдановіч). *Міхал лічыў Нясвіж Парыжам* (Я. Колас). *Беларусу і ў Парыжы сняцца белізна бяроз і сосен медзь* (П. Панчанка). *У выраі далёкім аднаго для птахаў не стае — тых дубоў, наднёманскіх, высокіх, дзе ім трэба гнёзды віць свае* (М. Арочка). *Толькі праз родную мову чалавек можа стаць беларусам, бо ў ёй хімія і фізіка, гісторыя і батаніка, эканоміка і культура таго, што называецца нацыяй, народам* (Я. Сіпакоў).

Як бачым, афарыстычныя выслоўі нашы — беларускія — па месцы нараджэння, мудрасць жа, заключаная ў іх, сусветная.

Выпішыце сказы-цытаты з тэксту. Зрабіце іх сінтаксічны разбор.
Перачытайце прыведзеныя ў тэксце афарызмы і раскажыце пра характар беларусаў.
- Знайдзіце ў тэксце складаныя сказы і дайце ім вусную характарыстыку.



Правообладатель Национальный институт образования

**258.** Прачытайце ўрыўкі з сачыненняў кітайскіх студэнтаў на тэму «Мая цудоўная вандроўка ў Беларусь». З кожнага выказвання выберыце тэзіс, які перадае асноўную думку, і афарміце яго як цытату, выкарыстоўваючы розныя спосабы цытавання.

**Чжао Б.** Беларусы вельмі адкрытыя і сардэчныя. Быў выпадак: мы не здолелі адшукаць дарогу «дадому» — да інтэрната, у якім жылі. І два беларускія студэнты інтэлігентна прапанавалі нам сваю дапамогу. Яны высветлілі наш адрас і праводзілі нас, баючыся, што мы зноў згубімся. Незнаёмыя людзі размаўлялі з намі, як з сябрамі, распытвалі пра Кітай, з гонарам паказвалі нам свой горад. А на развітанне пажадалі нам палюбіць Мінск.

**Ян К.** Хоць я тут была толькі паўмесяца, ужо глыбока і шчыра ўлюбёная ў Беларусь і беларусаў: тут я вывучала мову, каштавала смачныя нацыянальныя стравы, захаплялася прыгажосцю прыроды, пасябравала з беларускімі студэнтамі. Дзякуючы гэтаму я зразумела цябе, Беларусь!

У Мінску паўсюль на будынках ёсць рэльефы, выкананыя прыгожа і стылёва. Вісяць шыльды з партрэтамі вядомых людзей Беларусі. Гэта сведчыць пра багатую культуру і гісторыю краіны. Я атрымала яркае ўяўленне пра культурнае жыццё Беларусі.

**Ван С.** Гэта падарожжа змяніла маё ўяўленне пра краіну. На занятках выкладчыца расказвала нам пра Беларусь. Мы ведалі пра яе і з кніг, але гэта веданне было павярхоўнае. Раней Мінск уяўляўся мне маленькім ціхім горадам, хаця я ведала, што гэта — сталіца Беларусі. Цяпер у мяне іншае ўяўленне пра гэты горад. Я палюбіла ваш цудоўны Мінск. Палюбіла яго чыстае паветра, сіняе неба і акуратныя вуліцы, на якіх паўсюдна цвітуць кветкі *(З часопіса «Маладосць»)*.

● Выпішыце з тэкстаў складаны сказ з рознымі відамі сувязі частак. Пабудуйце яго схему.

На аснове тэксту стварыце выказванне на тэму «Беларусы ўмеюць сябраваць».

**259.** Прачытайце афарызмы, прысвечаныя мове. Падрыхтуйце сачыненне пра духоўную сілу роднага слова. Уключыце ў тэкст прыведзеныя выказванні ў форме цытат.

1. Абломкі крыўдных слоў сядзяць у душы, як стрэмкі *(П. Панчанка)*. 2. Адным словам можна шмат выказаць або тым жа словам


Правообладатель Национальный институт образования

нічога не сказаць *(К. Чорны)*. 3. Слова павінна прарастаць, як насенне, слова павінна прарастаць, даваць усходы, рунець, красаваць *(А. Вярцінскі)*. 4. Думкі чалавека — вы святло зор, што змоўклі рана ў вышыні *(Я. Сіпакоў)*.

На аснове выказвання *Абломкі крыўдных слоў сядзяць у душы, як стрэмкі* падрыхтуйце дыскусійныя выступленні на тэму «Як трэба правільна рэагаваць на крыўдныя словы?»

## § 36. Эпіграф

**Эпіграф** — выслоўе, кароткая цытата, якая з'яўляецца своеасаблівым аўтарскім тлумачэннем асноўнай ідэі твора, тэксту, сачынення. Напрыклад, эпіграфам да рамана «Людзі на балоце» Іван Мележ выбраў такія простыя і такія шматзначныя словы: *Бацьку, маці, бацькоўскай зямлі.*

Эпіграф звычайна размяшчаецца з прававага боку ў пачатку твора. Эпіграф не бярэцца ў двукоссе. На наступным радку пад эпіграфам таксама з правага боку даецца спасылка на крыніцу.

Да выдання «Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы» вядомы мовазнаўца, пісьменнік, настаўнік настаўнікаў Фёдар Міхайлавіч Янкоўскі напісаў эпіграф-запавет:

*Настаўнікам Беларусі прысвячаецца.*
Ф. М. Янкоўскі.

**260.** Прачытайце тэкст.

Па словах літаратуразнаўца Вячаслава Рагойшы, эпіграф (ад грэчаскага слова *epigraphe* — 'надпіс') — гэта цытата, крылатыя словы, якія пішуцца пасля загалоўка ці перад асобнымі раздзеламі твора і раскрываюць іх сутнасць.

Выкарыстанне эпіграфаў у паэзіі звязана з творчай асобай паэта і са стылем канкрэтнага аўтара. Крыніцамі эпіграфаў у паэзіі з'яўляюцца вусная народная творчасць (прыказкі, песні), афарызмы


Правообладатель Национальный институт образования

вядомых асоб, творчасць пісьменнікаў усіх краін і эпох. Як правіла, у творчасці кожнага сучаснага пісьменніка прысутнічаюць звароты да вядомых папярэднікаў, дзеячаў нацыянальнай гісторыі і культуры, да іх творчасці, іх заслуг перад народам.

Напрыклад, паэт Віктар Шніп часта ўжывае цытаты з творчасці класікаў беларускай літаратуры для ўзмацнення вобразнасці выказанай думкі. У эпіграфах да яго твораў утрымліваецца інфармацыя пра аўтарскі тэкст, які ідзе пасля яго. Напрыклад, словы Уладзіміра Караткевіча «На Беларусі Бог жыве», выкарыстаныя ў якасці эпіграфа да «Балады Турава», выяўляюць ідэю твора: Бог любіць беларускую зямлю — і таму «Беларусь жыве», бо «на Беларусі Бог жыве».

Такім чынам, асноўная функцыя эпіграфа ў баладах В. Шніпа — *інфарматыўная*: эпіграф задае тэму, якую працягвае тэкст балады, фармулюе галоўную думку. Акрамя гэтага, эпіграф дапамагае раскрыць праблему твора, актывізаваць чытацкую думку, выклікае пэўныя асацыяцыі і вызначаецца лаканічнасцю, афарыстычнасцю *(Н. Базар)*.

Пісьмова адкажыце на пытанні:

1. Якое азначэнне дае паняццю «эпіграф» літаратуразнаўца Вячаслаў Рагойша?
2. Што з'яўляецца крыніцамі эпіграфаў у паэзіі?
3. З якой мэтай Віктар Шніп ужывае ў якасці цытат радкі з твораў класікаў беларускай літаратуры?
4. Якая асноўная функцыя эпіграфа ў баладах Віктара Шніпа?

**261.** Прачытайце тэкст. Раскажыце па-беларуску, чаму эпіграф называюць уваходам у тэкст, прыступкай да разумення тэксту.

Многие смотрят на эпиграф как на нечто случайное, необязательное, проскакивают мимо него, не понимая, что эпиграф, так же как и заголовок, — это «входная дверь» текста, «пусковой» момент на пути к главной мысли. Иногда в произведении со сложной структурой есть эпиграфы не только после заголовка всей книги, но и перед каждой главой. Это помогает читателю выстроить иерархию основных мыслей и основных событий.

Эпиграфы могут выражать не только содержание, но и «тональность», эмоциональную окраску текста. Прочитав эпиграф, прежде


Правообладатель Национальный институт образования

всего спросите себя: какую роль играет эпиграф, как он связан с содержанием того, что предстоит прочесть? После того как вы сделаете такой прогноз, начинайте проверять свои ожидания: подтвердилось ли то, что вы предполагали?

Эпиграфами часто пользуетесь и вы, создавая собственные тексты: сочинения, доклады, рефераты. А значит, нужно научиться не только правильно подбирать их, но и правильно оформлять на письме.

Запомните: эпиграф пишется без кавычек, а инициалы и фамилия автора (или другой источник высказывания) без скобок.

Надеемся, что теперь вы не станете пропускать эпиграф и будете почтительно относиться к этой «входной двери» текста *(Л. Андреева)*.

**262.** Прачытайце выказванні вядомых беларускіх пісьменнікаў. У сачыненнях на якія тэмы яны могуць быць выкарыстаны ў якасці эпіграфаў?

1. А глянеш навокал — такая краіна: дзе ступіш — то рэха, то казка, быліна. *(М. Танк)*. 2. Ад вёскі адбіўся, у палац не папаў *(Я. Купала)*. 3. Адны жабракі могуць праз усё жыццё толькі браць *(М. Багдановіч)*. 4. Браткі! Тут зямля такая!.. *(М. Танк)*. 5. Гордасць — таксама, мабыць, жаночае характво *(Я. Скрыган)*. 6. І спрэчку тым яны канчалі, што гэту скварку разразалі *(Я. Колас)*. 7. Рупная пчала ўмее ў соты мёд сабраць і з горкіх кветак *(М. Багдановіч)*.

**263.** Карыстаючыся сайтам Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (укладка «Выслоўі, выказванні, афарызмы беларускіх песняроў»), падбярыце эпіграф і выказванні, якія можна скарыстаць як цытаты да сачынення «Кніга XXI стагоддзя: папяровы або электронны фармат?».

**КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Якія спосабы перадачы чужой мовы існуюць?
2. Якія асаблівасці будовы маюць сінтаксічныя канструкцыі з простай мовай? Прывядзіце прыклады сказаў і пабудуйце іх схемы.
3. Што такое маналог і дыялог?
4. Якая мова называецца ўскоснай? Раскажыце аб правілах замены простай мовы на ўскосную.
5. Дайце азначэнне цытаты. Ці можна назваць цытату простай мовай? Абгрунтуйце сваё меркаванне.
6. Што такое эпіграф? Як афармляецца эпіграф на пісьме?



Правообладатель Национальный институт образования

# Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага за год

**264.** Вусна закончыце выказванні.

1. Сінтаксіс — гэта … .
2. Асноўныя адзінкі сінтаксісу — … .
3. Словазлучэнне — гэта … .
4. Адрозніваюць наступныя віды сінтаксічнай сувязі слоў у словазлучэнні … .
5. Сказы паводле мэты выказвання падзяляюцца на … .
6. Паводле інтанацыі сказы бываюць … .
7. Сказы, у якіх граматычная аснова складаецца з дзейніка і выказніка, называюцца … .
8. Развітым называецца сказ … .
9. Паводле будовы сказы падзяляюцца на … .

**265.** Выпішыце словазлучэнні. Вызначце від сінтаксічнай сувязі. Чаму астатнія прыклады не з'яўляюцца словазлучэннямі?

Праслухаць у запісе, сонца пераліваецца, дваццаць першы, кінуцца урассыпную, вельмі каларыйны, актавая зала, ён мужны, першы званок, будзе рыхтавацца, гучна спяваць, пафарбаваная падлога, малое кацяня, жаданне дапамагчы, на працягу тыдня, няхай пачакаюць, кніга казак, нашы бацькі́.

Вызначце ў запісаных словазлучэннях назоўнікі, род якіх не супадае ў рускай і беларускай мовах. Прывядзіце свае прыклады такіх назоўнікаў.

**266.** Перакладзіце словазлучэнні на беларускую мову.

Ухаживать за собакой, напоминать о мероприятии, читать про себя, заболеть ангиной, насмехаться над неудачей, похожа на мать,



Правообладатель Национальный институт образования

благодарить друга, жениться на Жанне, три дерева, два пирога, пойти за хлебом, заботиться о родителях, отдыхать у озера, ходить за грибами.

З трыма словазлучэннямі (на выбар) складзіце сказы.

**267.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго тып. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку. Выпішыце словазлучэнні з першага сказа, вызначце від сінтаксічнай сувязі.

Вясна даўно **прыйшла** ў горад, але ў горадзе найлепшая вясна, калі яна яшчэ нясмелая і маладая, калі **нанач** замярзаюць на тратуары лужыны, калі доўга ружавее **ўвечары** неба і калі стаіць над вуліцамі сіні туман, а чырвоныя **агеньчыкі** машын ірдзеюць ярка, нібы гронкі калінавых ягад.

Быў пачатак мая, і я **пайшоў** паглядзець на вясну за горад.

**Дзьмуў свежы** вецер, на **падсохлым** асфальце ўжо курыўся пыл, і гулка ляскалі ў **пад'ездах** дзверы.

Вясною заўсёды бывае праторна ў горадзе: і шум машын, і перазвон трамваяў чуваць далёка, бо вясною бывае, можа, самае маладое рэха *(Паводле М. Стральцова)*.

- Растлумачце правапіс выдзеленых слоў.

Назавіце словы, у якіх вымаўленне не супадае з напісаннем.

**268.** Прачытайце верш А. Вярцінскага. Вызначце асноўную думку.

Любоў адкрывае скарбы,
абсягі новых зямель.
Варожасць кідае на скалы,
нянавісць садзіць на мель.
Любоў і лад узвышаюць,
вядуць за далягляд.
Варожасць і злосць прыніжаюць,
адкідваюць назад...

Ці згодны вы з меркаваннем аўтара? Абгрунтуйце свой адказ.
Назавіце аднародныя члены ў сказах. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры іх.


Правообладатель Национальный институт образования

**269.** Складзіце сказы з аднароднымі членамі па наступных схемах:

1. ◯ або ◯.
2. ◯, і ◯, і ◯.
3. ⊙: ◯, ◯, ◯.
4. ◯, ◯, ◯ — ⊙.

**270.** Спішыце, устаўце прапушчаныя літары ***у*** або ***ў***.

Прэзіды..м, бра..нінг, со..с, а..л, ва ..ніверсітэце, ва ..краіне, па-..чарашняму[с], па..за, дыназа..р, аквары..м, ла..рэат, гучнае «..ра», фра.., жанчына-..рач, рады..с, са..на, ..ладзіслаў Сыракомля, новыя ..нты, а..кцыён, ва ..нісон, ма..залей, Вольга ..льянаўна, стра..с, ба..л, у «Выбраныя творы» ..вайшлі, аквана..т, сімпозі..м, руска-..краінскі, каля ..ніверсальнага магазіна, фа..на, Брэсцкая ..нія, ток-шо.., рыбало.., мане..ры, а..тастрада, кантрольна-..лікoвы.

**271.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Вызначце яго стыль.

Беловежская пуща — огромный заповедный лесной массив Европы, который находится на пограничных территориях Беларуси и Польши, на водоразделе Балтийского и Чёрного морей. Пуща представляет собой остатки гигинтского лесного массива, который в XII в. простирался от Балтийского моря до Буга и от Одера до Днепра. Сейчас общая площадь Беловежской пущи более 150 тыс. га, из них на территории Беларуси — 87,5 тыс. га.

Наиболее раннее документальное упоминание о Беловежской пуще (Ипатьевская летопись) относится к 983 г. Первые ограничения на охоту в пуще были введены в XIII в. С 1541 г. в Беловежской пуще охраняется её ценнейшее животное — зубр.

Длина тела зубра — 3,5—3,75 м, высота в холке — до 1,8 м, средняя масса — 800 кг, а масса самцов достигает 1000—1200 кг. Это сильное, внешне неуклюжее животное уверенно передвигается по лесу, быстро бегает, хорошо плавает и проходит топи болот. Живут зубры до 30 лет…

В Беловежской пуще ведутся научные исследования по экологии животных, по рациональному использованию растительного покрова, охране ценных растений и правильной организации лесного хозяйства.


Правообладатель Национальный институт образования

Составлен список 110 редких растений пущи, которые подлежат особой охране.

В белорусской и польской частях заповедного массива действуют музеи природы, проложены туристические маршруты. В 2009 г. заповеднику исполнилось 600 лет *(В. Кисель)*.

**272.** Спішыце словы, устаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары.

Імгнен..е, развод..е, кал..екцыя, калос..е, Іл..я, мадон..а, багац..е, кіпен..е, гнездаван..е, падарож..а, маз..ю, палоз..е, рал..я, мас..аж, ван..а, узбярэж..а, ламач..а, ноч..у, цярпен..е, навакол..е, раўнадуш..а, прамен..е, адзен..е, нал..ю, сол..ю, тысячагод..е, ман..а, ім..унітэт, пан..а, ал..ея, прагрэс..іўны.

Складзіце тры складаныя сказы, выкарыстоўваючы запісаныя словы (на выбар).

**273.** Вусна запоўніце пропускі ў схеме. Прывядзіце прыклады складаных сказаў розных тыпаў.

**Тыпы складаных сказаў**






Правообладатель Национальный институт образования

**274.** Выпішыце спачатку простыя сказы, затым — складаныя. Расстаўце знакі прыпынку і аргументуйце іх пастаноўку.

1. Тоячы ў душы зябкую трывогу Іван спярша азіраўся і ўслухоўваўся баючыся каб немцы не пусцілі сабак але ішоў час а навокал усё было ціха *(В. Быкаў)*. 2. Плывуць воблачкі карагодзяць з блакітам зліваюцца нікнуць і тонуць у пяшчотных хвалях сонечных *(М. Лынькоў)*. 3. У кожнага народа ёсць святыні якімі мацней за жыццё даражылі мудрыя прашчуры і якія нібыта нязгасныя паходні асвятляюць шляхі іх нашчадкам *(У. Ягоўдзік)*. 4. Паранейшаму звіняць ручайкі і гэты звон у палявой цішыні асабліва меладычны *(Т. Хадкевіч)*. 5. Ад спякоты пабялелі выліналі пяшчотныя і халаднавата-мяккія пялёсткі валошак на ўзмежках і пры дарогах *(А. Жук)*. 6. Там дзе еднасці і згоды няма ў людзей праца іхняя заўсёды марна прападзе *(Я. Купала)*. 7. Паветра напоенае пахамі хвоі навісла шызаватай смугой *(М. Лынькоў)*. 8. Сонца то хавалася ў рэдкіх светла-шэрых хмарах то весела выглядала з-за іх *(А. Федарэнка)*.

**275.** Разгледзьце табліцу. Падрыхтуйце вуснае выказванне на тэму «Асноўныя сродкі сувязі граматычных частак у складаным сказе».

| АСНОЎНЫЯ СРОДКІ СУВЯЗІ ГРАМАТЫЧНЫХ ЧАСТАК У СКЛАДАНЫМ СКАЗЕ | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Тып складанага сказа | Сродкі сінтаксічнай сувязі граматычных частак | | | |
| | інтанацыя | злучальны злучнік | падпарадкавальны злучнік | злучальнае слова |
| складаназлучаны | + | + | | |
| складаназалежны | + | | + | + |
| бяззлучнікавы | + | | | |

**276.** Выпішыце сказы па групах: а) складаназлучаныя; б) складаназалежныя; в) бяззлучнікавыя складаныя сказы; г) складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак. Расстаўце знакі прыпынку, аргументуйце іх пастаноўку. Падкрэсліце ў сказах граматычныя асновы.

1. Памяць гэта непадкупны і непадуладны суддзя і ён час ад часу напамінае людзям пра тое пра што не трэба забываць *(А. Кудравец)*.


Правообладатель Национальный институт образования

2. У цішыні пачулася як мякка і глуха ўсё роўна бы па жывым целе ўдарылі па глыбокім цёплым дарожным пыле першыя кроплі *(А. Жук)*. 3. Непрыкметна прайшоў час і настаў дзень экзаменаў *(Я. Колас)*. 4. Як мары белыя бярозы пад сінявой начной стаяць у небе зоркі ад марозу пахаладзеўшыя дрыжаць *(М. Багдановіч)*. 5. Прыпадзі да зямлі цёмнай ніцма да ўзоранай плугам раллі ты пачуеш як б'еццa крыніцай сэрца вечна жывое зямлі *(А. Звонак)*. 6. Жыта выйшла ў трубку і месцамі на ім з'явіліся пяшчотныя каласкі з прыўзнятымі[м] вусікамі *(Т. Хадкевіч)*. 7. Ледзь прыкметна пакачваўся паравоз аднастайна пастуквалі рэйкі гуло ў топцы *(М. Лынькоў)*.

● Знайдзіце дзеепрыметнік, ужыты ў форме, якая не ўласціва сучаснай літаратурнай мове.

**277.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго асноўную думку. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

У казках гаворыцца, што пры нараджэнні дзіцяці над калыскаю ягонай нахіляюцца добрыя варажбіткі, якія адорваюць дзіця рознымі талентамі. А ў адной я чытаў, што, калі ў нейкай сям'і нарадзіўся хлопчык, усе **жадалі** яму стаць і **багатым**, і вучоным, і **змагаром**, і толькі адна асоба пажадала хлопчыку вырасці проста чалавекам.

Калі нараджаўся Купала, пры калысцы, мусіць, стаялі дзве варажбіткі: адна адарыла яго імем Чалавека, а другая — талентам паэта. Абедзве гэтыя годнасці так перапляліся ў Купалы, што цяжка іх адну ад адной адарваць. Ды і не трэба... *(Паводле М. Шчаглова)*.

Выпішыце складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак, зрабіце іх сінтаксічны разбор.

Падбярыце сінонімы да выдзеленых слоў.

**278.** Прачытайце тэкст. Ці згодны вы з аўтарам у тым, што «вышэй за ўсё і перш за ўсё — чалавечнасць»?

Я магу памыляцца шмат у чым. У жыцці маім было нямала меншых і большых памылак, але адно я ведаю цвёрда: вышэй за ўсё і перш за ўсё — чалавечнасць.


Правообладатель Национальный институт образования

Я веру ў гэта ўсё сваё жыццё, і толькі гэта засталося б у мяне, каб прыйшло найбольшае[ф] ці апошняе гора *(Я. Брыль)*.

Спішыце. Пабудуйце схемы сказаў.

**279.** Падрыхтуйце паведамленне на адну з лінгвістычных тэм.

1. Асноўныя адзінкі сінтаксісу і іх характарыстыка.
2. Галоўныя і даданыя члены сказа.
3. Ускладнены просты сказ.
4. Тыпы складаных сказаў.
5. Складаназлучаны сказ.
6. Складаназалежны сказ.
7. Бяззлучнікавы складаны сказ.

**280.** Падбярыце з арфаграфічных слоўнікаў словы-прыклады па тэме «Правапіс прыставак на ***з*** і ***с***, на ***д*** і ***б***».

**281.** Прачытайце табліцу. Калі паміж часткамі ў бяззлучнікавым складаным сказе ставіцца коска (кропка з коскай, двукроп'е, працяжнік)? Назавіце адпаведныя нумары радкоў табліцы.

| ПАСТАНОЎКА ЗНАКАЎ ПРЫПЫНКУ Ў БЯЗЗЛУЧНІКАВЫМ СКЛАДАНЫМ СКАЗЕ | | |
|---|---|---|
| | **Сэнсавыя адносіны паміж часткамі, будова частак** | **Паміж часткамі можна ўставіць** |
| 1 | Змест адной часткі супрацьпастаўляецца зместу другой | супраціўныя злучнікі ***а, але*** |
| 2 | Другая частка дапаўняе першую, развіваючы дзеяслоў-выказнік | злучнікі ***як, што***; словы ***і ўбачыў, што; і пачуў, што; і адчуў, што*** |
| 3 | Другая або апошняя частка абагульняе папярэднія | |
| 4 | Пералічваюцца падзеі, з'явы, што адбываюцца адначасова ці паслядоўна; часткі раўназначныя, аднатыпныя | |
| 5 | Часткі паказваюць на хуткую змену падзей або другая частка паказвае на вынік | злучнікі ***аж, і*** |



Правообладатель Национальный институт образования

| Сэнсавыя адносіны паміж часткамі, будова частак | | Паміж часткамі можна ўставіць |
|---|---|---|
| 6 | Другая частка раскрывае прычыну таго, пра што гаворыцца ў першай частцы | злучнікі ***таму што, бо*** |
| 7 | Часткі маюць ускладненую будову і свае знакі прыпынку | |
| 8 | Другая частка паясняе, раскрывае ці ўдакладняе першую частку | словы ***а іменна*** |
| 9 | Першая частка паказвае на ўмову або час таго, пра што гаворыцца ў другой частцы | злучнік ***калі*** |
| 10 | Сэнсавая сувязь паміж часткамі не надта цесная, часткі вызначаюцца адноснай самастойнасцю | |

**282.** Спішыце сказы, раскрываючы дужкі, устаўляючы прапушчаныя літары, расстаўляючы знакі прыпынку. Растлумачце правапіс арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку.

1. *(Н..)*здарма кажуць людзі чалавек на рабоце харашэе *(П. Броўка)*. 2. Яна паспрабавала ўсміхнуцца *(н..)*чога *(н..)*выйшла толькі ў куточках губ як матылькі трывожна затрымцелі маршчынкі *(А. Кудравец)*. 3. А надвячоркам пачынала халадаць ярка і суха у стылай зеленаватай вышыні выступалі зоркі *(А. Жук)*. 4. Звыклыя гукі напаўнялі лясныя гушчары у галлі заварушылася сонная птаха піскнуў заяц бязгучна мільгануў кажан *(М. Лынькоў)*. 5. Жураўлі ляцяць высока зіма яшчэ далёка *(Прыказка)*. 6. Мацей здагадаўся *(н..)*хта збіваў на дрэве сухія хрумсткія сучкі *(М. Стральцоў)*. 7. *(Н..)*дзе ўгары свяціла *(н..)*гарачае сонца вяршаліны елак ціха гарэлі ў ягоных бліскучых промнях[сн] *(В. Быкаў)*.

**283.** Прачытайце прыказкі і прымаўкі, захоўваючы правілы літаратурнага вымаўлення. Растлумачце сэнс прыказак, згрупуйце іх па тэмах.

1. Хто ўлетку спіць, той узімку не есць. 2. Нічога само не зробіцца. 3. Сем разоў адмерай, адзін адрэж. 4. Найсмачнейшы хлеб ад сваёй працы. 5. Свет не без добрых людзей. 6. Кніжка чалавеку, што ліпа пчолцы. 7. За справу бярэшся — не бойся і не хваліся.


Правообладатель Национальный институт образования

8. Не той сябра, хто мёдам мажа, а той, хто праўду кажа. 9. Набытая мазалямі капейка перацягне лёгкі рубель. 10. Не таму слава, хто на язык лёгкі, а таму, хто ў справе стойкі. 11. Кожны праўду знае, ды не кожны яе любіць. 12. Што ведаеш, насіць няцяжка. 13. Той не можа быць другам, хто ў бядзе абыдзе кругам.

**284.** Прачытайце тэкст. Складзіце тэзісы да тэксту. Пры афармленні тэзісаў выкарыстайце пераважна бяззлучнікавыя складаныя сказы.

Напрыклад: *Вывучэнне беларускай мовы ў Польшчы мае даўнюю традыцыю: у 1956 годзе была створана кафедра беларускай філалогіі.*

### Беларуская мова за мяжой

Вывучэнне беларускай мовы ў Польшчы на ўзроўні вышэйшай школы мае даўнюю традыцыю. Яшчэ ў 1956 годзе на філалагічным аддзяленні Варшаўскага ўніверсітэта была створана кафедра беларускай філалогіі. На той час гэта быў адзіны ў Польшчы навучальны цэнтр, які рыхтаваў настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры.

У 90-я гады XX стагоддзя ў Польшчы ўзмацнілася цікавасць да Беларусі, яе гісторыі, літаратуры, культуры. У гэты час у многіх польскіх ВНУ (Вроцлаўскім, Ягелонскім, Вармінска-Мазурскім і іншых універсітэтах) беларуская мова пачынае вывучацца на факультатыўнай аснове. У Люблінскім каталіцкім універсітэце, Люблінскім універсітэце імя Марыі Кюры-Складоўскай, Беластоцкім універсітэце адкрываюцца асобныя напрамкі беларускай філалогіі.

З 1992 года ў Беластоцкім універсітэце адкрылася аддзяленне беларускай філалогіі, пазней — кафедра беларускай філалогіі. У 1999 годзе пачаўся набор на спецыяльнасць «Беларусістыка». Большасць абітурыентаў — навучэнцы ліцэяў і сярэдніх школ Беласточчыны з дадатковым вывучэннем беларускай мовы. Ужо адбылося 8 выпускаў па спецыяльнасці «Беларусістыка», падрыхтавана больш за 90 спецыялістаў. Яны працуюць настаўнікамі, журналістамі, рэдактарамі на радыё «Беласток», перакладчыкамі ў розных фірмах, супрацоўнікамі ўрадавых, памежных службаў і г. д.

Беларускую мову вывучаюць не толькі ў Польшчы (Варшаўскі, Люблінскі, Беластоцкі ўніверсітэты), але і ў Альдэнбургу, Лейпцыгу (Германія), у Будапешцкім універсітэце (Венгрыя), у Прэшаве


Правообладатель Национальный институт образования

(Славакія), у Бялградскім універсітэце (Сербія), у Карлавым універсітэце ў Празе (Чэхія). Некаторыя студэнты прыязджаюць у Беларусь, каб паляпшаць маўленчую практыку *(Паводле І. Гапоненка)*.

З дапамогай падрыхтаваных тэзісаў перадайце змест тэксту.

Растлумачце змест паняццяў *беларуская лінгвістыка, беларуская філалогія, беларусістыка, беларусазнаўства.*

**285.** Пазнаёмцеся з выступленнем на навуковай канферэнцыі вядомага беларускага вучонага прафесара Адама Яўгенавіча Супруна. Тэзісы, якія раскрываюць нормы этычных паводзін асобы, аформіце як сказы з простай мовай (простая мова стаіць пасля слоў аўтара, перад словамі аўтара, словы аўтара стаяць у сярэдзіне простай мовы). Для ўключэння простай мовы ў сказ выкарыстоўвайце словы для даведкі.

Узор. *Вядомы лінгвіст адзначае: «Трэба любіць сваю родную мову, ніколі не саромецца яе».*

Для даведкі: вучоны, вядомы лінгвіст, знакаміты прафесар, мовазнаўца, моваавед, спецыяліст у галіне лінгвістыкі; падкрэслівае, напамінае, сцвярджае, заўважае, звяртае ўвагу (на што?), выказвае думку, нагадвае і інш.

У лінгвістычнае выхаванне ўваходзіць фарміраванне пэўных этычных норм маўленчых паводзін у розных выпадках нашага жыцця. Можна сфармуляваць некаторыя нормы, але яны, зразумела, ніяк не прэтэндуюць на вычарпа́льнасць:

- любі сваю родную мову, ніколі не саромейся яе;
- авалодвай усім багаццем сваёй мовы, вывучай іншыя мовы;
- паважай усе мовы, у тым ліку мову твайго субяседніка. Мова — не асабістая ўласнасць, яна — уласнасць цэлага народа, дрэнных народаў не бывае. Разам з тым, кожная мова — частка агульначалавечай скарбніцы ведаў і культуры;
- ніколі не выказвай адмоўных ці зняважлівых ацэнак чужых моў: яны прынцыпова памылковыя, бо кожная мова мае свае адэкватныя сродкі перадачы з'яў рэчаіснасці ці можа пры неабходнасці іх развіць;
- імкніся карыстацца мовай народа, сярод якога жывеш ці часова знаходзішся. Калі гэта немагчыма, шукай агульную мову (лепей нейтральную);


Правообладатель Национальный институт образования

- не навязвай сваёй мовы іншым. Яна заслугоўвае любові і павагі, а не прымусу;
- імкніся да ўзаемаразумення, не адмаўляйся зразумець твайго нават выпадковага субяседніка;
- імкніся да правільнасці мовы. Іншаземцы прабачаць табе агрэхі ў сваёй мове, а землякі не даруюць іх, калі ты будзеш звяртацца да іх на чужой мове. Да сваіх трэба звяртацца на агульнай роднай мове, нават не пазбаўленай памылак.

**286.** Спішыце, устаўляючы, дзе трэба, мяккі знак ці апостраф.

З..біральнік, дзевяц..сот, дз..ве, дз..ме, рэдз..ка, дз..весце, піс..мовы, пас..пешлівасць, радас..цю, камен..чык, стан..це, куп..істы, ледз..ве, камус..ці, растрэс..ці, любан..скі, восен..скі, чэрвен..скі, барац..біт, чытал..ня, сляз..мі, аб..ездзіць, карэн..не, карэн..чык, прыгожан..кі, інтэрв..ю, завез..ці, людз..мі, застан..ся, прыгледз..ся, цвіс..ці, мен..шы, бол..шы, мядз..ведзь, чац..вер, сем.., уз..несціся, чац..вёрты.

**287.** Прачытайце тэкст. Як вы разумееце сэнс першага і апошняга сказаў?

### Самы цяжкі на свеце крыж

Праўда самы цяжкі на свеце крыж. Не кожнаму стае сілы несці яго праз усё жыццё. Колькі светлых душ адмаўлялася яго несці спасылаючыся на бессэнсоўнасць намаганняў і гэтым самым апраўдваючы[м] сваю духоўную немач! Колькі людзей гэты крыж прыгнуў да зямлі колькі раструшчыў а колькі скідалі яго з плячэй на паўдарозе! І мабыць толькі адзінкі ўпарта праз пакуты і боль знявагу і прыніжэнне ад тых жа дзеля каго і нясецца гэты крыж крок за крокам крывянячы ногі і душы падымаюцца ўсё вышэй і вышэй. Падымаюцца загадзя ведаючы што нясуць свой уласны крыж на сваю ўласную галгофу.

Не бывае рознай праўды рознай бывае хлусня (*Паводле А. Дударава*).

Спішыце тэкст, расстаўляючы знакі прыпынку, і аргументуйце іх пастаноўку. Растлумачце сэнс і паходжанне фразеалагізмаў *несці свой крыж, узысці на галгофу*.



Правообладатель Национальный институт образования

**288.** Прачытайце выказванні беларускіх аўтараў. Ці згодны вы з іх меркаваннямі?

1. На зямлі столькі добрага, прыгожага, столькі любові разліта, што не паспяваеш наталіць душу і напалову *(Г. Марчук)*.

2. Усё даецца чалавеку на радасць, а каб ён усвядоміў гэту радасць, часам пасылаецца і гора *(Г. Марчук)*.

3. Ох, нездарма чалавек даўно ўжо назваў сябе толькі госцем на гэтай зямлі, і не салодка было яму прыйсці да гэтай думкі *(Я. Брыль)*.

4. Вялікі доктар усялякай хворасці ў чалавечай душы — час — мае вечнага свайго памочніка — працу *(К. Чорны)*.

5. А ўсё золата, якое толькі ёсць на свеце, — нікчэмная драбяза і непатрэбшчына перад самім жыццём *(К. Чорны)*.

Напішыце міні-сачыненне (разважанне), выкарыстоўваючы адну з цытат.

**289.** Выканайце тэставыя заданні. Адказы запішыце ў сшытку.

1. Адзначце правільна напісаныя словы:
1) глатаць; 2) почырк; 3) крапасны; 4) рэцэпт; 5) рэмонт.

2. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца ***я***:
1) дз..вяты; 2) м..дуніца; 3) к..раміка; 4) роўн..дзь; 5) леб..дзь.

3. Адзначце памылкова напісанныя словы:
1) паук; 2) оптам; 3) шэрая імгла; 4) водсвет; 5) усны.

4. Адзначце словы, у якіх дапушчаны памылкі:
1) сбягаць; 2) здзіўленне; 3) безказырка; 4) бесшумна; 5) расшчодрыцца.

5. Адзначце словы, напісанне якіх не супадае з вымаўленнем:
1) дрозд; 2) барацьба; 3) дзянькі; 4) пераплётчык; 5) без рук.

6. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць ***ь***:
1) вішан..; 2) з..мена; 3) воз..ме; 4) сядз..це; 5) хатын..скі.

7. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць апостраф:
1) л..юць; 2) Дзям..ян; 3) Вікенц..евіч; 4) п..яўка; 5) салаў..і.



Правообладатель Национальный институт образования

**290.** Запішыце словы, раскрываючы дужкі, растлумачце напісанне.

*(У)*двух, *(на)*лева, *(руска)*беларускі, *(на)*памяць, калі*(сьці)*, *(паў)*дарогі, *(па)*мойму, *(па)*блізу, дзе*(небудзь)*, *(як)*раз, *(мароза)*устойлівы, *(паўднёва)*усходні, *(на)*хаду, *(раз)*пораз, *(высока)*высока, дзе*(нідзе)*, так*(сама)*, *(па)*старому, *(на)*адварот, *(што)*год, *(па)*першае, *(па)*ціху, *(абы)*як, усё*(роўна)*, *(ярка)*чырвоны, *(на)*заўсёды, *(паў)*Еўропы, *(у)*бок поля, *(светла)*зялёны, *(па)*французску.

**291.** Запішыце схемы сказаў з простай мовай, расстаўляючы знакі прыпынку. Пракаменціруйце іх пастаноўку.

1. А П.
2. П? а.
3. П а п.
4. А П!
5. П а П.
6. П а: П.

Складзіце і запішыце сказы-прыклады да кожнай схемы.

**292.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго асноўную думку.

Калі ён **ўранні** прачнецца а мама яшчэ не ўстала ды нікуды не пайшла **трохгадовы** малы бяжыць да яе пагрэцца і пагаварыць.

Апошнім часам ён мнагавата гаворыць пра Дзіяну двухгадовую дзяўчынку якая **нядаўна** з’явілася на іхнім двары. Гаворыць так неабыякава што мама нарэшце пытаецца

Ты яе любіш?

Люблю.

Такую малую смаркатую плаксу зусім непрыгожую?

Малы на нейкі момант задумваецца а потым гаворыць...

Наіўная і мусіць **падсвядомая** дзіцячая мудрасць што ў перадачы дарослых гучыць не так **кантрасна:**

Яна прыгожая бо я яе люблю! *(Паводле Я. Брыля).*

Спішыце, расстаўляючы знакі прыпынку. Аргументуйце іх пастаноўку.

- Растлумачце правапіс выдзеленых слоў.

Складзіце тэкст-разважанне на тэму «Прыгожы чалавек. Які ён?»


Правообладатель Национальный институт образования

**293.** Прачытайце тэкст, вызначце яго стыль і тып.

Жураўлі ці журавы як яшчэ іх часам называюць надзвычай прыгожыя птахі. Усе як адзін рослыя дужыя самавітыя. І бадай *(най)*лепшыя танцоры ў птушыным свеце. Асабліва хораша яны танцуюць на світа*(н/нн)*і калі ўзыходзіць сонца. Прыляцяць на ціхую балацявіну *(з/с)*бяруцца ў карагод і пускаюцца ў скокі па..пяваючы с..бе гарэзлівым курлыканнем. А колькі ў тых скоках в..сялосці! Журавы то кланяюцца адзін аднаму то ра*(з/с)*пускаюць крылы то ходзяць *(у)*прысядку то бегаюць па лугавіне *(на)*выперадкі. Птушыны цырк, дый годзе! Убачыць *(з)*блізку журавоў *(н..)*проста бо яны жывуць на глухіх непраходных балотах. Гнёзды свае ладзяць сярод травы на высокіх сухіх купінах. Звычайна жураўліха а..кладвае[с] ў гняздо два яйкі. Калі птушаняты праклюнуцца і падужэюць надыходзіць час птушынай навукі. Бацькі *(жураўлі)* вучаць малых знаходзіць пад імхом чарвякоў жучкоў лавіць у вадзе жабак іншую дробную вадзяную жыўнасць паказваюць як лаўчэй скакаць з купіны на купіну хавацца ад *(шмат)*лікіх ворагаў. Асабліва *(н..)*лёгка даводзіцца маладым жоравам калі ў іх а..растаюць крылы. Тады бацькі *(настаўнікі)* *(н..)*хвіліны *(н..)*даюць ім спакою — прымушаюць махаць крыламі па..скокваць *(у)*гору пералятаць з аднаго месца на другое *(У. Ягоўдзік)*.

Падзяліце тэкст на абзацы. Спішыце, раскрываючы дужкі, устаўляючы прапушчаныя літары і расстаўляючы знакі прыпынку.

Падбярыце сінонімы да слова *журавель*.

Правообладатель Национальный институт образования

# Тлумачальны слоўнік

**Адмысло́вы**, -ая, -ае. 1. Адметны, своеасаблівы. 2. Спецыяльны, асобага прызначэння. 3. Выдатны, цудоўны.

**Алю́зія**, -і, *ж*. Стылістычны прыём, які заключаецца ў выкарыстанні намёку на рэальны агульнавядомы палітычны, гістарычны ці літаратурны факт.

**Апанта́ны**, -ая, -ае. 1. Нястрымны, захоплены чым-небудзь (пачуццямі, думкамі, імкненнямі і пад.). 2. Душэўна ўзрушаны.

**Арніто́лаг**, -а, *м*. Спецыяліст, які вывучае птушак.

**Асацыя́цыя**, -і, *мн*. -і, -цый, *ж*. 1. Аб'яднанне асоб або ўстаноў аднаго роду дзейнасці. 2. Сувязь паміж асобнымі ўяўленнямі, калі адно з уяўленняў выклікае другое.

**Ва́пна**, -ы, *ж*. Вокіс кальцыю — рэчыва белага колеру, якое здабываецца з вапняку.

**Драбі́ны**[1], -бі́н. Лесвіца (прыстаўная).

**Драбі́ны**[2], -бі́н. 1. Каляска. 2. Бакавая абрашотка (у калясцы; разм.).

**Дыя́спара**, -ы, *мн*. -ы, -пар, *ж*. Пражыванне часткі народа (этнічнай супольнасці) па-за межамі той краіны, дзе жыве асноўная маса гэтага народа (этнічнай супольнасці).

**Інсталява́ць**, -люю, -люеш, -люе; -люй; *зак*. і *незак*. Устанавіць/устанаўліваць (пра камп'ютарную праграму).

**Інтэрв'ю**, нескл., *н*. Прызначаная для друку, радыё, тэлебачання гутарка з якой-небудзь асобай.

**Інтэрфе́йс**, -у, *м*. Набор сродкаў, якія выкарыстоўваюцца для ўзаемадзеяння чалавека і камп'ютарнай сістэмы.

**Лю́басць**, -і, *ж*. 1. Пачуццё глыбокай прыхільнасці да каго-, чаго-небудзь, адданасці каму-, чаму-небудзь; замілаванне кім-, чым-небудзь. 2. Любата.

**Марнава́ць**, -ную, -нуем, -нуе; -нуй; незак. 1. *што*. Траціць без карысці, марнатравіць. 2. *каго*. Мучыць, стамляць.



Правообладатель Национальный институт образования

**Ме́ка** — горад у заходняй Саудаўскай Аравіі, размешчаны на адлегласці прыкладна 80 км ад Чырвонага мора. З'яўляецца цэнтрам паломніцтва для мусульман.

**Метрапо́лія**, -і, *мн.* -і, -лій, *ж.* Дзяржава ў адносінах да калоній, якімі яна валодае.

**Навуко́ва-дасле́дчы**, -ая, -ае. Які заняты распрацоўкай і даследаваннем пытанняў якой-небудзь навукі.

**Ната́тка**, -і, *ДМ* -тцы, *мн.* -і, -так, *ж.* Кароткі запіс або інфармацыя ў друку пра што-небудзь.

**Ну́дны**, -ая, -ае. 1. Невясёлы, маркотны, сумны. 2. Які наганяе нуду, сум. 3. Які трывожыць бесперастанку (пра боль і інш.).

**Паква́піцца**, -плюся, -пішся, -піцца; *зак.*, *на каго-што*. Пасягнуць на што-небудзь, займець жаданне завалодаць чым-небудзь.

**Папуля́цыя**, -і, *мн.* -і, -цый, *ж.* (спец.). Сукупнасць асобін аднаго віду, якая доўга існуе дзе-небудзь.

**Пастаме́нт**, -а, *М* -нце, *мн.* -ы, -аў, *м.* Аснова, фундамент помніка, калоны, статуі.

**Прыкладны́**, -ая, -ое. Які мае практычнае значэнне, прымяняецца на практыцы.

**Расста́йны**, -ая, -ае. У паэзіі: які мае адносіны да расстання, звязаны з расставаннем.

**Рата́й**, -я, *мн.* -і, -яў, *м.* (уст.). Араты.

**Рэе́стр**, -а, *мн.* -ы, -аў, *м.* Вопіс, пісьмовы пералік.

**Рэпарта́ж**, -у, *мн.* -ы, -аў, *м.* Паведамленне пра мясцовыя падзеі, пра падзеі дня, інфармацыя (па радыё, тэлебачанні, у друку).

**Та́рка**, -і, *ДМ* -рцы, *мн.* -і, -рак, *ж.* Прадмет кухоннага ўжытку ў выглядзе пласцінкі з праколатымі дзіркамі, прызначанымі для раздраблення, расцірання чаго-небудзь.

**Фе́рма**[1], -ы, *мн.* -ы, ферм, *ж.* 1. Жывёлагадоўчая гаспадарка ў калгасах і саўгасах. 2. Прыватнае сельскагаспадарчае прадпрыемства, прыватная гаспадарка, заснаваныя на ўласнай або апрацаванай зямлі.

**Фе́рма**[2], -ы, *ж.* (спец.). Збудаванне, канструкцыя са злучаных між сабой металічных ці драўляных брусоў.

**Фіра́нка**, -і, *ДМ* -нцы, *мн.* -і, -нак, *ж.* Заслона з тонкага матэрыялу або з карунак на вокны, дзверы і пад.


Правообладатель Национальный институт образования

**Цалі́к**, -у, *м.* Няходжаная, няезджаная прастора, звычайна снежная.

**Цэ́бар**, -бра, *мн.* цэ́бры, -аў і цабры́, -оў, *м.* Шырокая драўляная пасудзіна з асобных дошчачак для бакавых сценак, з двума вушкамі.

**Цэп**, -а, *мн.* цапы, цапоў, *м.* Прылада для малацьбы збожжа ручным спосабам у выглядзе доўгай палкі (цапі́льна) з прымацаваным да яе гужыкам драўлянага біча (ударнай часткі).

**Чэ́злы**, -ая, -ае. Які слаба расце, хілы (пра расліны).

**Шкада́**. 1. Пра пачуццё жалю, спагады і пад. 2. Пра нежаданне аддаць, страціць і пад.

**Шко́да**[1], -ы, *ДМ* -дзе, *ж.* 1. Пашкоджанне, страта, урон. 2. Страта, прычыненая жывёлай, патрава і месца на зямлі, дзе жывёла можа зрабіць патраву.

**Шко́да**[2]. Тое, што і шкада́.

Правообладатель Национальный институт образования

# СІНТАКСІЧНЫ РАЗБОР СКЛАДАНАЗЛУЧАНАГА СКАЗА

## Парадак разбору

1. Падкрэсліць граматычныя асновы, абазначыць лічбамі граматычныя часткі складаназлучанага сказа.

2. Вызначыць сродкі сувязі частак у сказе: злучальныя злучнікі *(спалучальныя, супраціўныя, размеркавальныя)* і інтанацыя.

3. Вызначыць сэнсавыя адносіны паміж граматычнымі часткамі: спалучальныя *(адначасовасці, паслядоўнасці дзеянняў, прычынна-выніковыя адносіны)*, супраціўныя *(супастаўлення, супрацьпастаўлення)*, размеркавальныя (*пералічэння* ці *чаргавання з'яў, падзей, дзеянняў*).

4. Пабудаваць схему сказа.

5. Растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку.

6. Зрабіць сінтаксічны разбор кожнай граматычнай часткі як простага сказа.

*Наліліся сокам спелыя брусніцы, і каля дарогі выраслі грыбы* (С. Грахоўскі).

## Узор вуснага разбору

Складаназлучаны сказ; складаецца з дзвюх граматычных частак: першая частка — *наліліся сокам спелыя брусніцы*; другая частка — *каля дарогі выраслі грыбы*.

Галоўным сродкам сувязі частак з'яўляецца супраціўны злучнік ***і***, а дадатковым — інтанацыя.

Паміж часткамі выражаюцца спалучальныя сэнсавыя адносіны са значэннем адначасовасці (з'явы, пра якія паведамляецца ў сказе, адбываюцца ў адзін час): *наліліся сокам спелыя брусніцы, і каля дарогі выраслі грыбы*.

Часткі адна ад адной аддзяляюцца коскай, якая ставіцца перад спалучальным злучнікам ***і***.

*Наліліся сокам спелыя брусніцы* — частка пабудавана па схеме простага, двухсастаўнага, развітага, поўнага, няўскладненага сказа. (Ш т о?) *брусніцы* — дзейнік, выражаны назоўнікам ж. р., мн. л., Н. скл.; *брусніцы* (ш т о з р а б і л і?) *наліліся* — просты дзеяслоўны



Правообладатель Национальный институт образования

выказнік, выражаны дзеясловам у форме абв. л., пр. ч., мн. л.; *брусніцы* (якія?) *спелыя* — дапасаванае азначэнне, выражанае прыметнікам у форме мн. л., Н. скл.; *наліліся* (чым?) *сокам* — дапаўненне, выражанае назоўнікам м. р., адз. л., Т. скл.

(Такім жа спосабам робіцца сінтаксічны разбор другой граматычнай часткі складаназлучанага сказа.)

### Узор пісьмовага разбору

[1)] *Наліліся сокам спелыя брусніцы*, *і* [2)] *каля дарогі выраслі грыбы.*

[ ═══ ——— ], *і* [ ═══ ——— ].

## СІНТАКСІЧНЫ РАЗБОР СКЛАДАНАЗАЛЕЖНАГА СКАЗА

### Парадак разбору

1. Падкрэсліць граматычныя асновы, абазначыць лічбамі граматычныя часткі складаназалежнага сказа.
2. Вызначыць, што паясняе даданая частка ў галоўнай *(словы, словазлучэнне, усю галоўную частку)*.
3. Вызначыць від даданай часткі.
4. Пабудаваць схему сказа.
5. Растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку.
6. Зрабіць сінтаксічны разбор кожнай граматычнай часткі як простага сказа.

*Ваня раней лёг спаць, каб хутчэй надышла доўгачаканая субота* (К. Хадасевіч-Лісавая).

### Узор викнага разбору

Складаназалежны сказ; складаецца з дзвюх граматычных частак: галоўная частка — *Ваня раней лёг спаць*; даданая частка — *каб хутчэй надышла доўгачаканая субота*.

Даданая частка паясняе ў галоўнай частцы спалучэнне выказніка *лёг спаць* з акалічнасцю *раней*: *лёг спаць* (з якой мэтай?), *каб хутчэй надышла доўгачаканая субота*.

Даданая акалічнасная частка мэты.

Паміж галоўнай і даданай часткамі перад падпарадкавальным злучнікам ***каб*** ставіцца коска.



Правообладатель Национальный институт образования

*Ваня раней лёг спаць* — частка пабудавана па схеме простага, апавядальнага, няклічнага, двухсастаўнага, развітага, поўнага, няўскладненага сказа. (Х т о?) *Ваня* — дзейнік, выражаны назоўнікам м. р., адз. л., Н. скл.; *Ваня* (ш т о з р а б і ў?) *лёг спаць* — састаўны дзеяслоўны выказнік, выражаны інфінітывам *спаць* і дапаможным дзеясловам *лёг* у форме абв. л., пр. ч., м. р., адз. л.; *лёг спаць* (к а л і?) *раней* — акалічнасць часу, выражаная прыслоўем у форме вышэйшай ступені параўнання.

(Такім жа спосабам робіцца сінтаксічны разбор даданай часткі складаназалежнага сказа.)

### Узор пісьмовага разбору

1)*Ваня раней лёг спаць*, 2)*каб хутчэй надышла доўгачаканая субота*.

з якой мэтай?

[ × ], (*каб*...).

## СІНТАКСІЧНЫ РАЗБОР СКЛАДАНАЗАЛЕЖНАГА СКАЗА З НЕКАЛЬКІМІ ДАДАНЫМІ ЧАСТКАМІ

### Парадак разбору

1. Падкрэсліць граматычныя асновы, абазначыць лічбамі граматычныя часткі складаназалежнага сказа.
2. Вызначыць, што паясняе кожная даданая частка ў галоўнай або ў папярэдняй даданай частцы (*слова, словазлучэнне, усю частку*).
3. Вызначыць віды даданых частак.
4. Вызначыць від падпарадкавання даданых частак: паслядоўнае, сузалежнае (*аднароднае, неаднароднае*), змешанае.
5. Пабудаваць схемы сказа (вертыкальную і гарызантальную).
6. Растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку.
7. Зрабіць сінтаксічны разбор кожнай граматычнай часткі як простага сказа.

*І вось сёння за акном імжыў дождж, які не радаваў гарадскую госцю, але вельмі цешыў вяскоўцаў, бо не трэба будзе паліваць агародніну* (М. Кукуць).


Правообладатель Национальный институт образования

## Узор вуснага разбору

Складаназалежны сказ з некалькімі даданымі часткамі; складаецца з трох граматычных частак: *і вось сёння за акном імжыў дождж* — галоўная частка; *які не радаваў гарадскую госцю, але вельмі цешыў вяскоўцаў* — даданая частка; *бо не трэба будзе паліваць агародніну* — даданая частка.

Даданая частка *які не радаваў гарадскую госцю, але вельмі цешыў вяскоўцаў* паясняе ў галоўнай частцы дзейнік *дождж* (які?). Даданая частка *бо не трэба будзе паліваць агародніну* паясняе ў папярэдняй даданай частцы выказнік *цешыў* (па якой прычыне?).

Першая даданая частка — даданая азначальная; другая — даданая акалічнасная частка прычыны.

Від падпарадкавання даданых частак — паслядоўнае.

Паміж часткамі складаназалежнага сказа ставяцца коскі.

*І вось сёння за акном імжыў дождж* — частка пабудавана па схеме простага, апавядальнага, няклічнага, двухсастаўнага, развітага, поўнага, няўскладненага сказа. (Што?) *дождж* — дзейнік, выражаны назоўнікам м. р., адз. л., Н. скл.; *дождж* (што рабіў?) *імжыў* — просты дзеяслоўны выказнік, выражаны дзеясловам у форме абв. л., пр. ч., м. р., адз. л.; *імжыў* (калі?) *сёння* — акалічнасць часу, выражаная прыслоўем; *імжыў* (дзе?) *за акном*— акалічнасць месца, выражаная назоўнікам н. р., адз. л., Т. скл. з прыназоўнікам.

(Такім жа спосабам робіцца сінтаксічны разбор іншых даданых частак складаназалежнага сказа.)

## Узор пісьмовага разбору

1)*І вось сёння за акном імжыў дождж,* 2)*які не радаваў гарадскую госцю, але вельмі цешыў вяскоўцаў,* 3)*бо не трэба будзе паліваць агародніну.*

### Вертыкальная схема сказа






Правообладатель Национальный институт образования

Гарызантальная схема сказа

я к і?  п а  я к о й  п р ы ч ы н е?

[ дождж ], (*які*... *цешыў*...), (*бо*...).

## СІНТАКСІЧНЫ РАЗБОР БЯЗЗЛУЧНІКАВАГА СКЛАДАНАГА СКАЗА

### Парадак разбору

1. Падкрэсліць граматычныя асновы, абазначыць лічбамі граматычныя часткі бяззлучнікавага складанага сказа.

2. Вызначыць характар сэнсавых адносін паміж часткамі сказа (*спалучальныя (пералічальныя), супастаўляльныя* або *супрацьпастаўляльныя, прычынныя, выніковыя, часавыя, паясняльныя, адносіны ўмовы*).

3. Пабудаваць схему сказа.

4. Растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку.

5. Зрабіць сінтаксічны разбор кожнай граматычнай часткі як простага сказа.

*Сцяжынка збягае ў восень: кароткае лета прайшло* (С. Грахоўскі).

### Узор вуснага разбору

Бяззлучнікавы складаны сказ; складаецца з дзвюх граматычных частак: першая частка — *сцяжынка збягае ў восень*; другая частка — *кароткае лета прайшло*.

Паміж часткамі выражаюцца прычынныя адносіны.

Паміж часткамі ставіцца двукроп'е, паколькі ў другой частцы тлумачыцца прычына падзеі, пра якую паведамляецца ў першай частцы.

*Сцяжынка збягае ў восень* — частка пабудавана па схеме простага, апавядальнага, няклічнага, двухсастаўнага, развітага, поўнага, няўскладненага сказа. (Ш т о?) *сцяжынка* — дзейнік, выражаны назоўнікам ж. р., адз. л., Н. скл.; *сцяжынка* (ш т о  р о б і ц ь?) *збягае* — просты дзеяслоўны выказнік, выражаны дзеясловам у форме



Правообладатель Национальный институт образования

абв. л., цяп. ч., 3-й ас., адз. л.; *збягае* (к у д ы?) *у восень* — акалічнасць месца, выражаная назоўнікам ж. р., адз. л., В. скл. з прыназоўнікам.

(Такім жа спосабам робіцца сінтаксічны разбор другой граматычнай часткі бяззлучнікавага складанага сказа.)

### Узор пісьмовага разбору

[1)]*Сцяжынка збягае ў восень:* [2)]*кароткае лета прайшло*.

[ ——— ═══ ] : [ ——— ═══ ].

## СІНТАКСІЧНЫ РАЗБОР СКЛАДАНАГА СКАЗА З РОЗНЫМІ ВІДАМІ СУВЯЗІ ЧАСТАК

### Парадак разбору

1. Падкрэсліць граматычныя асновы, абазначыць лічбамі граматычныя часткі складанага сказа з рознымі відамі сувязі частак.
2. Вызначыць віды сувязі паміж граматычнымі часткамі (*злучнікавая: злучальная* або *падпарадкавальная; бяззлучнікавая*).
3. Вызначыць сэнсавыя (логіка-структурныя) часткі, указаць сродак сінтаксічнай сувязі паміж імі.
4. Пабудаваць схему сказа.
5. Зрабіць сінтаксічны разбор кожнай сэнсавай (логіка-структурнай) часткі.
6. Растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку.
7. Зрабіць сінтаксічны разбор кожнай граматычнай часткі як простага сказа.

*Нарэшце дзённыя і начныя турботы змарылі хлопцаў, і яны заснулі так моцна, што, мусіць, цяпер іх не разбудзіў бы ні гром, ні мароз* (Я. Маўр).

### Узор вуснага разбору

Складаны сказ з рознымі відамі сувязі частак; складаецца з трох граматычных частак: першая частка — *нарэшце дзённыя і начныя турботы змарылі хлопцаў*; другая частка — *яны заснулі так моцна*; трэцяя частка — *што, мусіць, цяпер іх не разбудзіў бы ні гром, ні мароз*.



Правообладатель Национальный институт образования

Граматычныя часткі звязваюцца злучнікавай (злучальнай і падпарадкавальнай) сувяззю.

Сказ складаецца з дзвюх сэнсавых частак: першая — *нарэшце дзённыя і начныя турботы змарылі хлопцаў*; другая — *яны заснулі так моцна, што, мусіць, цяпер іх не разбудзіў бы ні гром, ні мароз*. Сэнсавыя часткі звязаны паміж сабой злучальнай сувяззю (сродак сінтаксічнай сувязі — спалучальны злучнік ***і***).

Першая сэнсавая частка пабудавана як просты сказ. Другая сэнсавая частка пабудавана як складаназалежны сказ з даданай акалічнаснай часткай меры і ступені.

Паміж граматычнымі часткамі складанага сказа ставяцца коскі перад спалучальным злучнікам ***і***, падпарадкавальным злучнікам ***што***.

*Нарэшце дзённыя і начныя турботы змарылі хлопцаў* — частка пабудавана па схеме простага, апавядальнага, няклічнага, двухсастаўнага, развітага, поўнага, ускладненага аднароднымі азначэннямі сказа. (Што?) *турботы* — дзейнік, выражаны назоўнікам ж. р., мн. л., Н. скл.; *турботы* (што зрабілі?) *змарылі* — просты дзеяслоўны выказнік, выражаны дзеясловам у форме абв. л., пр. ч., мн. л.; *турботы* (якія?) *дзённыя, начныя* — дапасаваныя азначэнні, выражаныя прыметнікамі ў форме мн. л., Н. скл.; *змарылі* (калі?) *нарэшце* — акалічнасць часу, выражаная прыслоўем; *змарылі* (каго?) *хлопцаў* — дапаўненне, выражанае назоўнікам м. р., мн. л., В. скл.

(Такім жа спосабам робіцца сінтаксічны разбор кожнай граматычнай часткі складанага сказа з рознымі відамі сувязі частак.)

## Узор пісьмовага разбору

[1)]*Нарэшце дзённыя і начныя турботы змарылі хлопцаў, і* [2)]*яны заснулі так моцна,* [3)]*што, мусіць, цяпер іх не разбудзіў бы ні гром, ні мароз* (Я. Маўр).






Правообладатель Национальный институт образования

## СІНТАКСІЧНЫ РАЗБОР СКАЗА З ПРОСТАЙ МОВАЙ

### Парадак разбору

1. Вызначыць простую мову і словы аўтара. Указаць месца знаходжання простай мовы ў адносінах да слоў аўтара.

2. Пракаменціраваць пастаноўку знакаў прыпынку.

3. Зрабіць сінтаксічны разбор простай мовы (як простага ці складанага сказа).

4. Зрабіць сінтаксічны разбор (слоў аўтара) як простага сказа.

*«Час — лепшы лекар», — любіла паўтараць мая мудрая мама.*

### Узор вуснага разбору

Сказ з простай мовай. Простая мова: *час — лепшы лекар*. Словы аўтара: *любіла паўтараць мая мудрая мама*. Простая мова стаіць перад словамі аўтара.

Простая мова бярэцца ў двукоссе. Пасля простай мовы ставіцца коска (замест кропкі) і працяжнік; словы аўтара пішуцца з малой літары.

Простая мова ўяўляе сабой просты, апавядальны, няклічны, двухсастаўны, развіты, поўны, няўскладнены сказ. Дзейнік і выказнік выражаны назоўнікамі, таму паміж імі ставіцца працяжнік. (Ш т о?) *час* — дзейнік, выражаны назоўнікам м. р., адз. л., Н. скл.; (ш т о г а в о р ы ц ц а п р а ч а с?) *лекар* — састаўны іменны выказнік, іменная частка выражана назоўнікам *лекар* м. р., адз. л., Н. скл.; дапаможная частка выражана нулявой звязкай; *лекар* (я к і?) *лепшы* — дапасаванае азначэнне, выражанае прыметнікам м. р., адз. л., Н. скл., ужытым у простай форме вышэйшай ступені параўнання.

(Такім жа спосабам робіцца сінтаксічны разбор слоў аўтара.)

Схема сказа: **«П», — а.**

Правообладатель Национальный институт образования

# Спіс выкарыстаных крыніц


*Багдановіч, М.* Збор твораў : у 2 т. / М. Багдановіч. — Мінск : Выд. АН БССР, 1968.

*Бадак, А. М.* Як рассмяшыць папугая : аповесці, казкі, апавяданні, вершы / А. М. Бадак. — Мінск : Звязда, 2015.

*Броўка, П.* Збор твораў : у 2 т. / Я. Брыль. — Мінск : Дзяржвыд. БССР, 1960.

*Бусько, М. І.* У бары жывуць сябры : казка, апавяданні / М. І. Бусько. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2017.

*Быкаў, В.* Выбраныя творы : у 2 т. / В. Быкаў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1974.

Вальс пад журлівымі таполямі : аповесці, апавяданні / уклад. В. Праўдзін. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2008.

*Васильев, Б.* И был вечер, и было утро : романы, повести / Б. Васильев. — М. : Советский писатель, 1989.

Вясёлка : вершы, апавяданні, казкі, п’есы, песні / уклад. М. А. Маляўка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2012.

*Галубовіч, Я.* Дзівосы роднай прыроды : апавяданні і казкі для дзяцей / Я. Галубовіч. — Мінск : Пачатковая школа, 2012.

*Гаўрош, Н. В.* Афарыстычныя выслоўі беларускіх пісьменнікаў / Н. В. Гаўрош, Н. М. Нямковіч. — Мінск : Вышэйшая школа, 2012.

*Гілевіч, Н. С.* Святлынь : кніга васьмірадкоўяў / Н. С. Гілевіч. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1964.

*Грахоўскі, С.* Выбраныя творы / С. Грахоўскі. — Мінск : Кнігазбор, 2007.

*Дамаронак, Т. І.* Казкі сінявокай зямлі : для мал. шк. узросту / Т. І. Дамаронак. — Мінск : Беларусь, 2016.

*Жданович, В.* Берег белых аистов : фотоальбом / В. Жданович. — Минск, 1979.

*Жук, А.* Над чыстым полем / А. Жук. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1999.

*Зуёнак, С. В.* Птушкі. Крылатая песня зямлі : нарысы / С. В. Зуёнак. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2004.

Зямля бацькоў, святая... : зборнік вершаў пра малую радзіму / уклад. В. Шніп. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2018.




Правообладатель Национальный институт образования

І ўзімку лілеі цвітуць... : аповесці, апавяданні / уклад. В. Праўдзін. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2007.

*Ігнаценка, Р.* Лісце / Р. Ігнаценка // Слова аб роднай прыродзе / уклад. С. М. Грабчыкаў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2005.

*Казько, В.* Правільны няправільны дзень / В. Казько // Вясёлка. — 2015. — № 4.

Каляндар школьніка : тэматычны зборнік прозы, паэзіі, драматургіі, эсэ / уклад. А. Бадак. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2016.

*Камароўскі, А. А.* Пенальці : аповесці і апавяданні. — Мінск : Ураджай, 2000.

*Караткевіч, В. Г.* Жыве на свеце шчасце : казкі для дзяцей і дарослых / В. Г. Караткевіч. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2010.

*Караткевіч, У.* Збор твораў : у 8 т. / У. Караткевіч. — Т. 8. Кн. 2 : З жыццяпісу, нарысы, эсэ, публіцыстыка, постаці, крытычныя творы, інтэрв'ю, летапіс жыцця і творчасці. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1991.

*Кисель, В.* Памятники всемирного наследия / В. Кисель. — Минск : Беларусь, 2010.

Кніга пра расліны / пер. з рус. і апрац. С. У. Фядотавай. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2004.

*Кожина, М. Н.* Стилистика русского языка : учебник для студ. пед. университетов. — 2-е изд., перараб. и доп. — М. : Просвещение, 1983.

*Кудравец, А.* Познія яблыкі / А. Кудравец. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1999.

*Купала, Я.* Збор твораў : у 7 т. / Я. Купала. — Мінск : Дзяржвыд. БССР, 1972—1976.

*Ліпскі, У. С.* Гомельск ая зямля — Радзіма твая і мая : дзецям пра Гомельшчыну / У. С. Ліпскі. — Мінск : Выдавецкі дом «Звязда», 2013.

*Ліс, А.* Браніслаў Тарашкевіч / А. Ліс. — Мінск, 1966.

*Ліцвінка, В. Д.* Слова міма не ляціць : беларускія народныя прыказкі і прымаўкі / В. Д. Ліцвінка. — Мінск : Універсітэцкае, 1985.

*Лынькоў,* М. Выбраныя творы / М. Лынькоў. — Мінск : Беларуская думка, 2013.

Лучынка : сінанімічныя ўзоры, моўны этыкет, вершы, проза, замовы, крылатыя выслоўі, смяшынкі, беларускі народны гумар / уклад. З. І. Кустава, В. А. Салаўёва. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2013.

*Маляўка, М. А.* Спадчына, або Каб не стаць манкуртам : абразкі з жыцця нашых продкаў / М. А. Маляўка. — Мінск : Народная асвета, 2018.

*Марчук, Г.* Казкі. П'есы. Навелы / Г. Марчук. — Мінск : Беларусь, 2009.



Правообладатель Национальный институт образования

Пад ветразем надзеі : сучас. беларус. паэзія : для ст. шк. узросту / склад. В. А. Шніп. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1989.

*Панчанка, П.* Жытнёвы звон : выбранае / П. Панчанка ; уклад. З. К. Панчанкі. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2002.

Песня пра хлеб : зб. паэзіі : для ст. шк. узросту / уклад. В. Шніп. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2012.

*Прыгодзіч, З.* Журба мая светлая : аповесці, апавяданні, лірычныя абразкі, мініяцюры / З. Прыгодзіч. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2002.

*Радзікевіч, А.* Сучасная сцэна / А. Радзікевіч // Вясёлка. — 2015. — № 4.

Самая чароўная кветка : аповесці, апавяданні / уклад. А. Лесавік. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2010.

*Санько, З.* Малы руска-беларускі слоўнік прыказак, прымавак і фразем. — Мінск : Навука і тэхніка, 1991.

*Сіпакоў, Я.* Зялёны лісток на планеце Зямля : эсэ / Я. Сіпакоў. — Мінск : Харвест, 2006.

*Скрыпка, М. А.* З сэрцам і перцам : байкі, вершы, фельетоны, мініяцюры / М. А. Скрыпка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1987.

*Стральцоў, М.* Выбранае / М. Стральцоў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1987.

*Танк, Максім.* Збор калосся : вершы. 1983—1989 / Максім Танк. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1989.

У храме зямнога кахання : аповесці, апавяданні / уклад. А. Лесавік. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2009.

*Федарэнка, А.* Шчарбаты талер. Афганская шкатулка / А. Федарэнка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2010.

*Хадкевіч, Т.* Творы : у 2 т. / Т. Хадкевіч. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1982.

Час, жыццё, людзі... Беларускі літаратурны афарызм. — Брэст : Выдавец Лаўроў С. В., 2001.

*Чорны, К.* Выбраныя творы / К. Чорны. — Мінск : Беллітфонд, 2000.

*Шабовіч, М. В.* Патрыятычнае выхаванне сродкамі сучаснай беларускай паэзіі : дапаможнік / М. В. Шабовіч. — Мінск, 2007.

*Шпадарук, І. П.* Чаму мы так гаворым / І. П. Шпадарук, В. В. Рудакоўскі. — Мінск : Народная асвета, 1985.

*Ягоўдзік, У.* Свята летаўца / У. Ягоўдзік. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 1996.

*Янішчыц, Я. І.* Пачынаецца ўсё з любві... : вершы, паэмы / Я. І. Янішчыц. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2008.



Правообладатель Национальный институт образования

# Змест

§ 1. Беларуская мова ў сям'і славянскіх моў і моў народаў свету ........ 3

ТЭКСТ

§ 2. Тэкст, яго асноўныя прыметы (паглыбленае паўтарэнне).............. 8
§ 3. Сінтаксічная сінаніміка ..................................................... 13

ПАЎТАРЭННЕ ВЫВУЧАНАГА Ў V—VIII КЛАСАХ

§ 4. Слова, словазлучэнне, сказ як асноўныя моўныя адзінкі .............. 17
§ 5. Тыпы простых сказаў паводле мэты выказвання, інтанацыйнага афармлення (апавядальныя, пытальныя, пабуджальныя; клічныя і няклічныя)............................................................................ 21
§ 6. Тыпы простых сказаў па будове (двухсастаўныя, аднасастаўныя, няпоўныя, ускладненыя) ................................................... 24

СТЫЛІ МАЎЛЕННЯ

§ 7. Паглыбленне паняцця пра стылі маўлення. Стылеўтваральная роля моўных сродкаў ........................................................ 31

СКЛАДАНЫ СКАЗ: БУДОВА, ЗНАЧЭННЕ, УЖЫВАННЕ

§ 8. Паняцце пра складаны сказ ................................................ 38
§ 9. Сродкі сувязі частак у складаных сказах. Тыпы складаных сказаў 42

СКЛАДАНАЗЛУЧАНЫЯ СКАЗЫ: БУДОВА, ЗНАЧЭННЕ, УЖЫВАННЕ

§ 10. Паняцце пра складаназлучаны сказ. Сродкі сувязі частак у складаназлучаных сказах ............................................... 48
§ 11. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназлучаных сказах ........ 53
§ 12. Складаназлучаныя сказы са спалучальнымі злучнікамі ............... 58
§ 13. Складаназлучаныя сказы з супраціўнымі злучнікамі................... 62
§ 14. Складаназлучаныя сказы з размеркавальнымі злучнікамі ............ 66

СКЛАДАНАЗАЛЕЖНЫЯ СКАЗЫ: БУДОВА, ЗНАЧЭННЕ, УЖЫВАННЕ

§ 15. Паняцце пра складаназалежны сказ........................................ 73
§ 16. Складаназалежныя сказы з даданай азначальнай часткай (сродкі сувязі, знакі прыпынку) ........................................... 80
§ 17. Складаназалежныя сказы з даданай дапаўняльнай часткай (сродкі сувязі, знакі прыпынку) ........................................... 82
§ 18. Складаназалежныя сказы з даданай акалічнаснай часткай месца (сродкі сувязі, знакі прыпынку) ........................................... 85



Правообладатель Национальный институт образования

§ 19. Складаназалежныя сказы з даданымі акалічнаснымі часткамі часу і ўмовы (сродкі сувязі, знакі прыпынку) ........................... 88
§ 20. Складаназалежныя сказы з даданымі акалічнаснымі часткамі прычыны і мэты (сродкі сувязі, знакі прыпынку)........................ 91
§ 21. Складаназалежныя сказы з даданымі акалічнаснымі ўступальнай і параўнальнай часткамі (сродкі сувязі, знакі прыпынку)........... 94
§ 22. Складаназалежныя сказы з даданымі акалічнаснымі часткамі спосабу дзеяння, меры і ступені (сродкі сувязі, знакі прыпынку) 99
§ 23. Складаназалежныя сказы з некалькімі даданымі часткамі ......... 102
§ 24. Складаназалежныя сказы з паслядоўным, сузалежным і змешаным падпарадкаваннем частак (азнаямленне), знакі прыпынку ў іх .... 106

## БЯЗЗЛУЧНІКАВЫЯ СКЛАДАНЫЯ СКАЗЫ: БУДОВА, ЗНАЧЭННЕ, УЖЫВАННЕ

§ 25. Паняцце пра бяззлучнікавы складаны сказ............................... 117
§ 26. Сэнсава-граматычныя адносіны паміж часткамі ў бяззлучнікавым складаным сказе .................................................................... 121
§ 27. Знакі прыпынку паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах. Коска і кропка з коскай паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах ................................................................ 124
§ 28. Двукроп'е паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах ... 127
§ 29. Працяжнік паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах 132

## СКЛАДАНЫЯ СКАЗЫ З РОЗНЫМІ ВІДАМІ СУВЯЗІ ЧАСТАК

§ 30. Паняцце пра складаны сказ з рознымі відамі сувязі частак ........ 140
§ 31. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі частак ............................................................. 144

## СІНТАКСІЧНЫЯ КАНСТРУКЦЫІ З ЧУЖОЙ МОВАЙ: БУДОВА, ЗНАЧЭННЕ, УЖЫВАННЕ

§ 32. Спосабы перадачы чужой мовы. Асаблівасці будовы сінтаксічных канструкцый з простай мовай. Знакі прыпынку ў сказах з простай мовай ................................................................. 163
§ 33. Маналог. Дыялог, яго афармленне на пісьме.............................. 170
§ 34. Сказы з ускоснай мовай.......................................................... 174
§ 35. Цытаты, іх роля ў выказванні, афармленне на пісьме................. 178
§ 36. Эпіграф.................................................................................. 182

ПАДАГУЛЬНЕННЕ І СІСТЭМАТЫЗАЦЫЯ ВЫВУЧАНАГА ЗА ГОД (185)

*Тлумачальны слоўнік* ................................................................ 199
*Дадатак* ................................................................................. 202
*Спіс выкарыстаных крыніц* ........................................................ 210


Правообладатель Национальный институт образования

Вучэбнае выданне

**Валочка** Ганна Міхайлаўна
**Васюковіч** Людміла Сяргееўна
**Зелянко** Вольга Уладзіміраўна і інш.

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

Вучэбны дапаможнік для 9 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *Г. І. Бандарэнка*
Рэдактар *Л. Ф. Леўкіна*
Вокладка мастака *З. П. Болцікавай*
Мастакі *З. П. Болцікава, Д. А. Рафальская, А. М. Брыкет*
Мастацкі рэдактар *Л. М. Рудакоўская*
Камп'ютарная вёрстка *А. М. Брыкет*
Карэктары *Д. Р. Лосік, К. В. Шобік*

Падпісана да друку 11.06.2019. Фармат 70×90 $^1/_{16}$. Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 15,8. Ул.-выд. арк. 12,0. Тыраж 130 400 экз. Заказ

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/263 ад 02.04.2014.
Вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск

ААТ «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа». Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 ад 04.10.2013.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, г. Мінск

Правообладатель Национальный институт образования

(Назва і нумар установы агульнай сярэдняй адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |

Правообладатель Национальный институт образования

# Парадак марфалагічнага разбору часцін мовы

## НАЗОЎНІК

**1.** Часціна мовы.
**2.** Пачатковая форма *(Н. скл., адз. л.)*.
**3.** Агульны ці ўласны, адушаўлёны ці неадушаўлёны, асабовы ці неасабовы, канкрэтны ці абстрактны, зборны, рэчыўны.
**4.** Нязменныя марфалагічныя прыметы: а) род; б) скланенне *(1, 2, 3-е, рознаскланяльны, нескланяльны)*.
**5.** Зменныя марфалагічныя прыметы: а) лік; б) склон.
**6.** Сінтаксічная роля.

## ПРЫМЕТНІК

**1.** Часціна мовы.
**2.** Пачатковая форма *(Н. скл., адз. л., м. р.)*.
**3.** Разрад паводле значэння *(якасны, адносны, прыналежны)*.
**4.** Форма *(поўная, кароткая)*.
**5.** Ступень параўнання (калі ёсць) (*вышэйшая — простая* ці *складаная* або *найвышэйшая — простая* ці *складаная*).
**6.** Марфалагічныя прыметы: а) род (у адзіночным ліку); б) лік; в) склон.
**7.** Сінтаксічная роля.

## ЗАЙМЕННІК

**1.** Часціна мовы.
**2.** Пачатковая форма (*Н. скл., м. р.* (калі змяняецца па родах), *адз. л.* (калі змяняецца па ліках)).
**3.** Нязменныя марфалагічныя прыметы: а) разрад паводле значэння *(асабовы, зваротны, прыналежны, указальны, азначальны, пытальны, адносны, адмоўны, няпэўны (неазначальны))*; б) асоба (для асабовых).
**4.** Зменныя марфалагічныя прыметы: а) склон; б) лік (калі ёсць); в) род (калі ёсць).
**5.** Сінтаксічная роля.

## ЛІЧЭБНІК

**1.** Часціна мовы.
**2.** Пачатковая форма (*Н. скл., м. р.* (калі змяняецца па родах), *адз. л.* (калі змяняецца па ліках)).
**3.** Разрад паводле значэння (*колькасны* (абазначае пэўную ці няпэўную колькасць, дробавы, зборны) або *парадкавы*).
**4.** Разрад паводле будовы *(просты, складаны, састаўны)*.
**5.** Марфалагічныя прыметы:
- для колькасных: а) род (калі ёсць); б) лік (калі ёсць); в) склон;
- для парадкавых: а) род; б) лік; в) склон.

**6.** Сінтаксічная роля.

## ДЗЕЯСЛОЎ

**1.** Часціна мовы.
**2.** Пачатковая форма *(неазначальная форма дзеяслова)*.
**3.** Асновы дзеяслова (*цяперашняга* або *будучага простага часу, інфінітыва, прошлага часу* (калі асновы інфінітыва і прошлага часу не супадаюць)).
**4.** Нязменныя марфалагічныя прыметы: а) зваротны ці незваротны; б) асабовы ці безасабовы; в) трыванне *(закончанае, незакончанае)*; г) спражэнне (*I, II* ці *рознаспрагальны*).
**5.** Зменныя марфалагічныя прыметы: а) лад *(абвесны, умоўны, загадны)*; б) час (для дзеясловаў абвеснага ладу); в) асоба (для дзеясловаў цяперашняга і будучага часу абвеснага ладу і загаднага ладу); г) род (для дзеясловаў прошлага часу абвеснага ладу і дзеясловаў умоўнага ладу); д) лік.
**6.** Сінтаксічная роля.

## ДЗЕЕПРЫСЛОЎЕ

**1.** Часціна мовы *(нязменная форма дзеяслова)*.
**2.** Пачатковая форма *(неазначальная форма дзеяслова)*.
**3.** Нязменныя марфалагічныя прыметы: а) зваротнае ці незваротнае; б) трыванне *(закончанае, незакончанае)*.
**4.** Сінтаксічная роля.

# Парадак марфалагічнага разбору часцін мовы

## ДЗЕЕПРЫМЕТНІК

1. Часціна мовы *(форма дзеяслова)*.
2. Пачатковая форма *(Н. скл., адз. л., м. р.)*.
3. Ад якой асновы дзеяслова ўтвораны.
4. Форма *(поўная, кароткая)*.
5. Нязменныя марфалагічныя прыметы: а) трыванне *(закончанае, незакончанае)*; б) стан *(залежны, незалежны)*; в) час *(цяперашні, прошлы)*.
6. Зменныя марфалагічныя прыметы: а) род (у адзіночным ліку); б) лік; в) склон (для дзеепрыметнікаў, ужытых у поўнай форме).
7. Сінтаксічная роля.

## ПРЫСЛОЎЕ

1. Часціна мовы.
2. Марфалагічныя прыметы: а) нязменнае слова; б) разрад паводле значэння (азначальнае: *якаснае, меры і ступені, спосабу дзеяння*; акалічнаснае: *месца, часу, прычыны, мэты*); в) невытворнае ці вытворнае *(ад якой часціны мовы ўтворана)*; г) ступень параўнання (калі ёсць) (*вышэйшая — простая* ці *складаная* або *найвышэйшая — простая* ці *складаная*).
3. Сінтаксічная роля.

## ПРЫНАЗОЎНІК

1. Часціна мовы. Значэнне (*прасторавае, аб'ектнае, азначальнае, часавае, прычыннае, мэтавае* і інш.).
2. Марфалагічныя прыметы: а) нязменнае слова; б) разрад паводле паходжання (*вытворны* ці *невытворны*); в) разрад паводле будовы *(просты, складаны, састаўны)*; г) з якім склонам назоўніка (займенніка, лічэбніка) ужыты ў сказе.
3. У састаў якога члена сказа ўваходзіць.

## ЗЛУЧНІК

1. Часціна мовы.
2. Марфалагічныя прыметы: а) нязменнае слова; б) разрад паводле значэння (злучальны: *спалучальны, супраціўны, размеркавальны*; падпарадкавальны: *часавы, прычынны, мэтавы, умоўны, уступальны, параўнальны, тлумачальны*); в) разрад паводле паходжання (*невытворны* ці *вытворны*); г) разрад паводле будовы (*просты* ці *састаўны*); д) разрад паводле спосабу ўжывання (*адзіночны, паўторны* ці *парны*).
3. Якія сінтаксічныя адзінкі звязвае *(члены сказа, часткі складанага сказа)*.

## ЧАСЦІЦА

1. Часціна мовы.
2. Марфалагічныя прыметы: а) нязменнае слова; б) разрад паводле значэння (сэнсавая: *указальная, удакладняльная, абмежавальная*; мадальная: *сцвярджальная, адмоўная, пытальная*; эмацыянальна-экспрэсіўная: *клічная, узмацняльная*; формаўтваральная).
3. Роля часціцы *(надае слову, словазлучэнню або сказу сэнсавае, мадальнае ці экспрэсіўнае адценне або служыць для ўтварэння форм слова)*.

## ВЫКЛІЧНІК

1. Часціна мовы.
2. Марфалагічныя прыметы: а) нязменнае слова; б) разрад паводле паходжання (*невытворны* ці *вытворны* (ад якой часціны мовы паходзіць)).
3. Роля выклічніка *(выражае пачуццё, настрой, пабуджэнне, адносіны да выклічнікаў этыкету)*.